Валеры Скакун

# За зацяненнем Поўначы



**Валеры Скакун**

# За зацяненнем Поўначы

**Проза**

Мінск
«Галіяфы»
2015

УДК 821.161.1(476)-821
ББК 84(4Беи)
С42

Аўтар уступнага артыкула В. Корбут

**Скукун, В. У.**
С42 За зацяненнем Поўначы : проза / Валеры Скакун ; аўтар уступ. арт.: Вячаслаў Корбут – Мінск : Галіяфы, 2015. – 312 с., ілл.

ISBN 978-985-7021-88-8

У чарговую кнігу пісьменніка і паэта Валеры Скакуна «За зацяненнем Поўначы» уключаны новыя аповесці гэтага аўтара. У іх Валеры распавядае пра нялёгкую працу людзей на далёкай Поўначы.

Немалую частку кнігі складае аўтабіяграфічная аповесць-расповеды «Не сцірае час сляды» пра беларускіх спартсменаў-лыжнікаў розных часоў.

Кніга насычана мноствам гісторый і падзей на розны густ з напружанымі сюжэтамі і жыццёвымі фактамі. Яна будзе цікавая шырокаму колу чытачоў.

УДК 821.161.1(476)-821
ББК 84(4Беи)

**ISBN 978-985-7021-88-8**

© Скакун В.У., 2015
© Корбут В.Я., уступны артыкул, 2015
© Афармленне. ПВУП «Галіяфы», 2015

## *У зацяненні выпрабаванняў лёсу*

Многа людзей на зямлі марыць пабачыць свет і заглянуць на патаемныя сцяжыны нашай планеты, каб зразумець яе веліч і багацце, хараство і небяспеку, што хаваюцца за яе гарызонтамі. У аўтара гэтай кнігі Валерыя Скакуна «За зацяненнем Поўначы» з дзяцінства развіваліся два захапленні, гэта спорт і прага да падарожжаў, да нязведанага. Апошняя вылілася ў творчую камбінацыю: Скакун – паэт, бард, пісьменнік. Але напачатку з яго, як з чалавека, біў струмянём Скакун-спартсмен, упарты, рашучы і вельмі працавіты. Ён выхоўваўся ў вясковым асяроддзі, дзе працаваць і адказваць за даручаную справу вучылі з маленства. Пасля было захапленне лыжамі, не звычайнае захапленне, а на ўсё жыццё. Гэта сёння ён шмат можа распавесці пра лыжныя гонкі, а тады Скакун-юнак літаральна фанацеў ад гэтага віду спорту. Так у сваёй дакументальнай аўтабіяграфічнай аповесці-расповедах «Не сцірае час сляды», якая размешчана ў кнізе «За зацяненнем Поўначы» ён сабраў вялікі факталагічны матэрыял пра сваіх першых настаўнікаў, спартсменаў, сяброў, з якімі не аднойчы выступаў на розных спаборніцтвах, многія з якіх сталі славутымі спартсменамі, а таксама ёсць успаміны пра славутых расійскіх лыжнікаў, з якімі Валерыю Скакуну прыходзілася выступаць ці назіраць за іх выступленнямі. У гэтай аповесці праявіўся дух беларуса-лыжніка, вольны і непераможны, асабліва, калі гэта тычылася пяцідзесяцікіламетровых марафонскіх дастанцый. Такія адолеюць і сёння не многія здольныя спартсмены без якаснай падрыхтоўкі.

Але вернемся да назвы кнігі, якая нясе ў сабе код загадкавасці з магіяй суровай паўночнай існасці. Пачынаецца кніга паўраматнычнай, з элементамі палітычнай гісторыі, аповесцю «Выпадковы сведка». Гэтая аповесць не пра вясельнага сведку, хутчэй пра маладога чалавека, які апынуўся нечакана ў гарніле

буйных палітычных падзей. Сёння гэта ўспрымаецца, як важкі этап нашага жыцця, а тады, тады нават аб важкасці пераменаў, якія адбываліся ў сталіцы СССР, ніхто да рэшты не разумеў. Наступныя аповесці «Яны», «Калымскі вернісаж», «Добазычлівасць расамахі» даволі ёмкія па сюжэце і вельмі блізкія па тэматыцы, бо ва ўсіх ідзе гаворка пра працаўнікой Поўначы Расіі, людзей розных прафесій, характараў, нават звычак і традыцый. Але аўтар з цікаўнасцю нам распавядае пра недарэчнасці, у якія трапляюць героі, з элеметамі драматызму і, нават, гумару.

Найбольш значная аповесць, якая дала назву кнізе – аповесць «За зацяненнем Поўначы». Гэта сапраўды грунтоўная праца Валерыя Скакуна, з мноствам сюжэтных калізій, напружаная часам па змесце, з героямі featureрознага калібру. Сюжэт аповесці даволі вядомы для літаратуры: калі група людзей трапляе ў замкнёную і адарваную ад цывілізацыі прастору, адкуль не збяжыш і нікуды не дзенешся. Прагматызм сюжэту ўскладнены тым, што героям трэба ў даведзены час выканаць па плане будаўнічыя работы. Падзеі разгортваюцца на ўзбярэжжы якуцкай ракі Чона, з маляўнічымі краявідамі, дзе галоўны герой аповесці Фёдар, практычна герой-адзінотнік, вымушаны змагацца з абставінамі і недабразычліўцамі па той прычыне, што ён чужак таму асяродку, у якім апынуўся, як па духу, так і па паводзінах. І самае адметнае, што ён беларус, моцны і непахісны, як старажытныя ліцвіны.

Новая, цікавая і змястоўная, насычаная шматлікіміі фотаздымкамі і добра ілюстрыраваная кніга Валерыя Скакуна «За зацяненнем Поўначы» дазволіць чытачам дакрануцца як да новых уражанняў дзяцінства і дарослага жыцця аўтара-спартсмена, так і да цікавых мастацкіх твораў, дзе галоўныя героі – мужчыны, якім падуладны любыя выпрабаванні далёкай Поўначы.

*Вячаслаў Корбут,*
*паэт, пісьменнік, журналіст.*

# Выпадковы сведка

*Аповесць*

1.

– Сяргей, ты што, з Месяца зваліўся, у краіне такія падзеі, а ты пытаеш, што здарылася і чаму ўсе навокал такія пахмурныя?

– Ну, на самой справе, ды што адбылося? Штосьці я не разумею, – Сяргей глядзеў на выпадкова сустрэтага на чыгуначным вакзале сталіцы сябра Яўгена, на ўзроўні падсвядомасці спрабуючы асэнсаваць незразумелае выказванне таго наконт дзяржаўнага перавароту і як вынік стварэння кімсьці нейкага ДКНС.

– Які яшчэ пераварот, ты што, Яўген, з глузду з'ехаў? Ці магчыма ў нашай дзяржаве такое? У нас жа зараз перабудова. Як гаворыць Гарбачоў, краіна рухаецца па новых рэйках развіцця да светлага будучага.

– Братка, за апошнія тры дні знайшліся стрэлачнікі, якія перавялі рэйкі развіцця, што вядуць да светлай будучыні на іншы, пакуль не зразумелы, невядомы накірунак. Рэвалюцыя. – Яўген глядзеў на сябра наўшырку, як падалося Сяргею, вылупленымі вачыма. – Дзе ты так хаваўся апошнія тры дні, што так добра сябе адчуваеш, нібыта і сапраўды ў краіне нічога не здарылася?

– Схаваўся... – Сяргей прызадумаўся. – У мяне падзея: я атрымаў уласную аднапакаёвую кватэру ў нашым паселішчы. Займаўся навядзеннем парадку, каб у хуткім часе ад бацькоў з вёскі мэблю і рэчы свае перавезці. Харчу набраў на тры дні і нікуды не выходзіў з кватэры, не было часу. – Размаўляючы з Яўгенам, гледзячы то на сябра, то на людзей, што мітусіліся на прывакзальнай плошчы, аглядаючы іх задуменныя, то заклапочаныя твары то насцярожаныя погляды, Сяргей падсвядома пачаў разумець, што і сапраўды ў краіне адбываецца нешта важнае.

– Жылі сабе жылі і далей будзем жыць, прыстасуемся і да іншых умоваў, – Яўген, супакоіў свае эмоцыі, павіншаваў сябра з такой значнай падзеяй, як атрыманне новай ўласнай кватэры.

– Я гэтым часам падамся да бацькоў у вёску, а ўвечары на Маскву цягніком рушу, білеты тыдзень таму ўзяў, – Сяргей пакапошыўся ў дарожнай сумцы, – сёння туды, назаўтра назад – матануся-крутануся.

– А-а, зразумела, усё сохнеш па сваёй зазнобе. Каханне – справа сур'ёзная. Ну, давай, трэба і мне спяшацца на сустрэчу. Вернешся, тады патэлефануй: пабачымся ды пасядзім у якой-небудзь кавярне. – Яўген, падаўшы сябру руку на развітанне, хутка пашыбаваў да прыпынку тралейбуса.

Паспеўшы на прыгарадны аўтобус ужо праз паўгадзіны Сяргей быў у вёсцы, што раскінулася амаль пад бокам вялікага горада. Увайшоўшы ў двор, заўважыўшы, што маці займаецца на агародзе, праз веснічкі прайшоў садам, павіталіся.

– Ой, сыночак, – маці пусціла слязу, – глянула, ты, добра што з'явіўся, а я ўжо там думала, што ў цябе новага, дзе ты?

– Ды ўсё добра, мама. Што са мной здарыцца? Я ненадоўга. Сёння ўвечары на Маскву адбуду, а назаўтра ўвечары – дадому. З Таццянай дамовіліся назаўтра сустрэцца, яна з начной змены вяртацца будзе. Сустрэнемся, паговорм, апасля яна – на электрычку, а я – на цягнік.

– Якая Масква, ты што? Паглядзі па тэлебачанню, што там зараз творыцца. Там жа вайна, барацьба за уладу. Навошта табе гэтакія прыгоды? Патэлефануй, калі яна зараз на працы, скажы, што потым сустрэнецеся, няхай там усё супакоіцца. Не едзь калі ласка, прашу, мяне пашкадуй.

– Ды якое ліха, якая вайна, тыдзень таму мы дамовіліся назаўтра сустрэцца, білеты набыў. З чаго мне адкладваць, яна чакае, трэба ехаць, бо так дамовіліся.

Сяргей павярнуўся і накіраваўся праз сад убок хаты. Мама хутка перастала прычытаць, моўчкі пайшла следам, разумеючы, што гэта той самы выпадак, калі намеры сына не пераіначыць, трэба пагадзіцца.

2.

– Усё скончылася, нам далі адбой і сягодня, ў другой палове дня адпусцілі на звальненне ў горад да вечару, – два курсанты адной вайсковай навучальнай установы, рыхтаваліся да выхаду на прыпынку гарадскога маршрутнага аўтобуса супакоілі дзвюх седзячых перад імі жанчын, што ў паўголаса, хвалюючыся, гаварылі між сабой пра падзеі ў Маскве. Усё закончылася, вось як бывае, а Сяргей і не ведаў, што на палітычнай мапе краіны рабілася. І ён вырашыў, што назаўтра пры сустрэчы Таццяна дакладней распавядзе пра падзеі  ў сталіцы ці ў навінах потым па тэлебачанню здолее пачуць. Паглядзеўшы ў бок выходзячых з аўтобуса двух курсантаў, Сяргей падыйшоў да выхаду. Шчыльна зачыніліся дзверы і вадзіцель аб'явіў наступны прыпынак – Чыгуначны вакзал. Раніцай наступнага дня Масква сустрэла Сяргея звычайнай мітуснёй Беларускага вакзала. Падсілкаваўшыся ў буфеце гарачай кавай з бутэрбродам, ён выйшаў з будынка вакзала, мінаючы ўваход у метро, павярнуў па тратуары ўправа і накіраваўся да невялікага кірмашу, каб набыць кветак для іх першай з Таццянай сустрэчай. Гандлярка кветкамі, маладжавая поўнагрудая кабета, ветліва ўсміхаючыся, гучна лямантавала, прапаноўваючы Сяргею дзеля будучага сямейнага шчасця набыць сем чырвоных ружаў. Разумеючы, што той да ягонага сямейнага шчасця няма аніякай справы, гэта яе хлеб, Сяргей, маючы ў кішэні дастаткова грошай, пагадзіўся. Набыўшы сем чырвоных ружаў, ветліва падзякаваў за пажаданні, развітаўся з поўнагрудай узрадаванай кабетай і пайшоў да прызначанага месца спаткання. Праз хвілін сорак з боку прыгарадных білетных касаў павінна была з'явіцца яна.

– Таццяна, а што тут у вас адбылося за апошнія тры дні? У нас людзі ўсе заклапочаныя, што надалей будзе з дзяржавай, разважаюць пра перамены накірунку развіцця, – Сяргей усё ж вырашыў спытаць у сяброўкі, ідучы побач з ёй скверам непа-


БЕЛОРУССКИЙ ВОКЗАЛ

далёку ад чыгуначнага вакзала, – я, па праўдзе кажучы, й няведаю амаль нічога. Атрымаў уласную аднапакаёвую кватэру і, тры дні запар нікуды не вылазячы з яе, наводзіў марафет, каб ў хуткім часе засяліцца.

– О-о, выдатна, віншую, уласнае жытло – гэта проста супер, – Таццяна вырвала левую руку з Сяргеевай правай і, прыціскаючы да сябе сваёй правай рукой букет з сямі чырвоных ружаў, закруцілася ў вальсе на дарожцы сквера. – Па-рам, па- рам, па- рам, па-рам! – Сяргей, ускінуўшы рэмень дарожнай сумкі цераз левае плячо, прыладкаваўшы яе на спіне, падскочыўшы, абняў Таццяну. Прахожыя з вясёлымі ўсмешкамі на тварах расступаліся перад кружачымі ў вальсе на дарожцы сквера маладымі людзьмі. – Па-рам, па-рам.

– Ой, Сяргей, я таксама не ведаю нічога пра падзеі апошніх трох дзён, – Таццяна, аддыхваючыся, нахінулася папрравіць сукенку, – я ж суткі працую, а потым двое дома адпачываю. У гэта во дзяжурства ў нас нарадзіліся чатыры дзіцяці: два хлопчыкі і дзве дзяўчынкі. За немаўлятамі даглядаць патрэбна належна, каб з імі ўсё добра было. Два дні, што дома была, напачатку адпачывала ад мінулага дзяжурства, а потым займалася з бацькамі па гаспадарцы. Я ў Падмаскоўі пражываю, а там у нас ўсё ціха, без аніякіх зменаў. Тэлебачання не было калі глядзець, – лета ж зіму корміць.

Надалей, вырашыўшы завітаць на Чырвоную Прэсню, Сяргей з Таццянай прайшлі да ўваходу ў метро. Узяўшыся за рукі, радасна-усхвалявана па эскалатары заглыбіліся ў нутро падземкі. Калі хадзілі потым па алеях парку, Сяргей прапанаваў, як і два месяцы таму, крыху пашвэндацца па гандлёваму дому, а потым завітаць ў рэстаран.

Утульная вялікая зала рэстарана, напоўненая наведвальнікамі на процэнтаў семдзесят, авалодала настроем месца адпачынку. Каля сцэны, з якой выступаў інструментальны ансамбаль, весела адпачывала кампанія інтэлігентных людзей

па ўзросце, са знешнега выгляду, гадоў пад сорак. Мужчыны, жанчыны, віншуючы адзін аднога з нагоды нейкай урачыстасці, прапаноўвалі тосты, заказывалі ў гонар сваіх сяброў і сяброўак песні для выканання спевакам і музыкам інструментальнага ансамбля. Тыя з задавальненнем падтрымлівалі праз мікрафон на ўсю залу вясёлую кампанію і выконвалі пажаданыя песні. Сяргей з Таццянай, прыемна бавячы час за асобным столікам, узгадвалі, як у мінулы раз былі ў гэтым рэстаране і адпачывалі тады разам з сяброўкай Таццяны і яе сябрам.

– Праз месяц у іх вяселле, яны запрашаюць і цябе, Сяргей. Пакінь свой новы адрас, дашлюць табе запрашэнне.

– Выдатна, – Сяргей дастаў з сумкі ліст паперы, ручку, запісаў на ім новы хатні адрас і перадаў Таццяне, – значыць, і сустрэча наша адбудзецца не пазней, чым праз месяц .

– Мне патрэбна дадому, бацькі будуць хвалявацца. Я іх папярэджвала, што мы сустрэнемся з табой у Маскве, што буду пазней, мне патрэбна выпраўляцца. – Таццяна, ідучы побач з Сяргеем па тратуары, трымала кветкі левай рукой, прыціскаючы да сябе, а правай папраўляла доўгія, ніспадаючыя на плечы валасы.

– Так, добра, нам на Бегавую, я не забыўся, – Сяргей гучна засмяяўся, – пасаджу цябе на электрацягнік, а там і мне на Беларускі вакзал, увечары цягніком дадому.

Развітаўшыся з Таццянай, маючы крыху часу да вечара, Сяргей вырашыў патрапіць на Чырвоную Плошчу, дзе не аднойчы ўжо давялося пабываць, і накіраваўся да ўваходу ў метро.

3.

Стрэлка на цыферблаце курантаў тарганулася, і мелагучны бой абвясціў аб пачатку наступнай гадзіны дня. Стоячы з боку ГУМа, тварам да Крамля, насупраць вежы з курантамі,захапляючыся веліччу крэпасных сценаў, Сяргей заўважыў, што прахожыя рухаюцца па плошчы чамусьці ў адным накірун-

ку – адносна яго з левай рукі па правую. Ленавата павярнуўшы галаву направа, гледзячы ўслед ідучым паўз яго людзям і прыкмеціўшы, што напрыканцы плошчы перад спускам уніз з правага боку храма Васілія Блажэннага збіраецца натоўп. Каб змарнаваць шчэ крыху вольны час, ён пацягнуўся туды. Прайшоўшы ў натоўпе дзесьці на сярэдзіну спуска, спыніўшыся, Сяргей убачыў, што пасярод плошчы ў натоўпе на бронетранспарцёры, бы на трыбуне, у светла-шэрым касцюме, павярнуўшыся да спуску правым бокам, тварам да будынку ЦК КПСС, стаіць Барыс Мікалаевіч Ельцын. Узняўшы правую руку, матляючы ёй у бок будынку ЦК, Барыс Мікалаевіч працягваў сваё выступленне.

– Мы створым новую ўладу, уладу для народа!

– Гоў, гоў, – загула плошча, запоўненая людзьмі, – гоў, гоў.

Барыс Мікалаевіч узняўшы абедзве рукі ўгору, затрос імі пакручываючы тулавам па баках.

– Гоў, гоў, – шчыравала плошча, выказывачы давер новаму лідару-правадыру.

Натоўп людзей на спуску крыху пацясніўся ўправа. Сяргей, павярнуўшы галаву ў левы бок, заўважыў, як маладыя расіяне расцягнулі расійскі трохкалорны, белаблакітначырвоны сцяг вялікага памеру, і, трымаючы яго па ўсіх чатырох баках, панеслі ўніз на плошчу. Амаль насупраць месца, дзе ў натоўпе стаяў Сяргей, на левым баку, каля храма аператар здымаў на кінакамеру гэта дзеянне. Сяргей пачынаў разумець, што сапраўды ў апошнія тры дні ў Маскве адбывалася штосьці сур'ёзнае. Натоўп услед за распрасцёртым трохкалорам пацягнуўся па Васільеўскім спуску ўніз на плошчу. Сяргей, выпадкова патрапіўшы ў гэтакую падзею, застаўся стаяць непрыкаяным, трымаючы дарожную сумку на правым плячы, паглядаючы ўслед сыходзячым на плошчу людзям. Метрах у дваццаці ад яго ўніз, крыху улева, засталіся стаяць на месцы тры мужчыны росту вышэй сярэдняга, спартыўнага целаскладу, плечы ў цэлую сажань, апранутыя ў цёмныя касцюмы з адтапыранымі каўнерамі



пінжакоў, знешне гадоў крыху за трыццаць. Мужчыны, ціха вядучы між сабой гаворку, паволі пазіралі наўкола.

– Ну што, усё, здаецца, скончылася, – сказаў адзін.

– Але трэба быць пільнымі, каб не было шчэ якіх правакацый, – другі паглядзеў у бок Сяргея, як бы ні пры справах стаяўшага непрыкаяным, матлянуў галавой таварышам.

«Э-э-э, Сяргей Уладзіміравіч, – Сяргея апантала думка, – тут і сапраўды адбылася сур'ёзная падзея. Трэба неяк зараз сыйсці адсюль, па-анёльску прыгожа, каб не патрапіць у якую недарэчнасць».

Патупаўшы на месцы з нагі на нагу, Сяргей павярнуўся паволі на сто восемдзесят градусаў і нетаропка пашыбаваў угору, у накірунку да ГУМа. У магазіне ўсё было звычайна: нетаропка праходзячы праз аддзелы, пакупнікі трацілі свае грошы, набываючы патрэбнае...

4.

Вярнуўшыся дадому, Сяргей пра нядоўгі час перавёз свае рэчы ад бацькоў у новую кватэру і пачаў абсталёўваць сваю атрыманую аднапакаёўку. Ненаўмысна стаўшы сведкам гістарычнай падзеі, Сяргей час ад часу цікавіўся з тэлевізійных навінаў і прэсы аб ходзе далейшага развіцця краіны, наладжваючы ўтульнасць і прыстойны быт у сваім жытле.

Неўзабаве ад сяброўкі Таццяны і яе выбранніка прыйшла на новы адрас запрашальная паштоўка на вяселле. Сяргей мроіў і існаваў у чаканні хуткай сустрэчы з Таццянай...

# Яны

*Аповесць*

1.

Вечаровы прыцемак, зацяніўшы наваколле прыхаваўшымся на захадзе сонцам, застанецца на небакраі чырвонай стужкай да раніцы наступнага дня. Палярны дзень Паўночнага лета, пры якім у час ночы хоць газету чытай ці грыбочкі збірай па тайзе альбо вудзь рыбу на рацэ, з цягам часу тэрміну вахты за сярэдзіну не так ужо абуджаў хлопцаў на якійсьці здзяйсненні пасля працоўнага дня. Нехта выбіраўся павудзіць рыбы альбо пашвэндацца каля базы, каб падыхаць чыстым паветрам і пазбіраць грыбочкаў, ды ў асноўным бавілі час на месцы пражывання, хаваючыся за размовамі пад час адпачынку ад надакучлівых розных кусачых насякомых.

– Я вось з гэтай вахты як прыбуду, то на зробленыя грошы мэблю ў хаце памяняю на новую, – распавёў гаворку той, што часцей за астатніх за размовамі распавядаў пра сваё жыццё-быццё, – з мінулай вахты дзверы памяняў, падлогу перасцяліў, у мяне не кватэра, а ўласны дом у райцэнтры.

Той, што распавёў гаворку, паглядзеў убок мужчыны, што праз ложак сядзеў на сваім ложку, абапёршыся спіной на падушку, прыхіленую да спінкі, сашчапіўшы разам рукі перад сабой, паволі бесклапотна круцячы па баках галавой, і абыякава, моўчкі паглядаў на суразмоўцаў.

– Я сваёй сказаў, што калі за час маёй адсутнасці ў яе якія шуры-муры завядуцца, то адразу пойдзе да сваіх бацькоў, – той, што распавёў гаворку, усё паглядаў у бок мужчыны на ложку, бы жадаючы штосьці спытаць.

– Цябе во, у адрозненні ад нас, гэтакія пытанні і не хвалююць? – спытаў урэшце рэшт.

– А з чаго яны мяне будуць хваляваць, калі ў мяне, – і мужчына, устаўшы з ложка, падыйшоў да стала, дзе закіпела ў электрачайніку вада. Ён заліў кіпень у кубак з засыпаным чаем, лыжачкай закінуў цукару, узяў кубак і вярнуўся да свайго ложка, а

потым прымасціўся спіной да падушкі. – У мяне для хваляванне не маецца аніякай падставы.

– Усё бабылём пажываеш?

– Бабылём.

– У адной парсюкоў папасеш, у другой загоніш, – першы суразмоўца развёў у бакі рукамі, седзячы на сваім ложку, ногі паставіўшы на падлогу. Ён адкінуўся тулавам назад, задраў галаву, напужыў выцягнуты наперад падбародак і прыкрыў вейкамі брамкі вачэй, – а пасля цябе хто там заганяе альбо пасе перад табой, як з гэтым саўладаеш?

– А чаго мне з гэтым саўладаць, – і мужчына, трымаючы перад сабой абедзвюма рукамі кубак з прыастыўшым чаем, сербануў араматнага напою, – перада мной альбо пасля – гэта ім вырашаць, ім жа самім відавочна, – і ён, заўсміхаўшыся, зноў сербануў з кубка, – гэта іхняя справа.

– Ну, а зараз ў цябе дзве-тры ёсць? – першы ўсё не ўнімаўся.

– Ёсць, – мужчына, зноў заўсміхаўшыся, сербануў з коноўкі такога смачнага і ўжо прывычна духмянага напою.

– Ну, заўсёды гэтак не будзе, калісьці і адно штосьці ўжо выявіцца, – першы нахінуўся наперад, паставіўшы локці на калені, і сашчапіў далоні, прыпусціўшы долу галаву.

– Усё ва ўладзе Госпада, гэта ўжо, як Бог дасць, гэтак і будзе, – і мужчына, зразумеўшы, што ўрэшце рэшт ад яго пачулі, што і жадалі, заняўшыся за сваёй гаворкай гульнёй у падкіднога, паволі сёрбаў прыастыўшы смачны напой і заглыбіўся ў думках у далёкія і не вельмі ўспаміны...

2.

Прыбыўшы з папярэдняй вахты дадому, ён патэлефанаваў ёй. Сустрэліся ў яе паселішчы. Аўтобусам ён дабраўся да месца, адкуль праз лес уздоўж лініі электраперадач да яе садовага таварыства пайшлі пешшу. Ішлі па шырокай дарозе моўчкі,

метрах у двух адзін ад аднога, абодва адчувалі дыскамфорт ад таго становішча, што склалася само па сабе і абодва ў думках шукалі выйсце.

– Мы што, так і будзем ісці на адлегласці двух метраў, – і яна, усміхнуўшыся, выцягнуўшы у бок правую руку, пацягнулася да яго. Ён, выцягнуў левую да яе насустрач, наблізіўся. Матляючы сашчэпленымі рукамі, нібыта ўзрадаваныя падлеткі, гэтыя два чалавекі далей ішлі побач.

– А я во тыдзень таму вярталася ўвечары дадому на ровары, – распавядала яна, ідучы з ім па сцежцы, калі звярнулі з дарогі, – месяц свеціць, зорачкі на небе відаць, хораша. Кручу педалі ды й напяваю сабе песеньку Антонава пра месячную дарожку і вось тут во, – яна і ён прыпыніліся паміж высокіх дрэваў, дзе на сцежцы вытаркаюцца вялікія карані, – тут, на гэтых каранях пярэдняе кола ровара казырнула. Я як бразнулася вось тут. Узнялася, зашыблася трохі, блага, што не раздзёрла нічога аб карані, што тырчалі даволі небяспечна. Далей ужо цішэй, павольней паехала на сваім ровары, каб яшчэ якая недарэчнасць не атрымалася.

Ён распавядаў ёй пра цікавае, што адбывалася на вахце, асабліва аб прыродзе таёжнага краю, і яны, трымаючыся за рукі, дайшлі да яе дачнага доміка.

– Учора, як і сёння, выдатнае надвор'е было, сонейка, цёпла. Я бліжэй да абеду градкі прапалывала. Сусед, ужо ў гадах мужчына, выйшаў з дому на ганак, павітаўся. Усміхаецца, гледзячы на мяне, ды й кажа, маўляў, суседка вы сёння такая сэксуальная. А я і кажу яму, што я жанчынка мініяцюрная, дагледжаная, сачу за сабой і заўсёды, штодзень сэксуальная, – так яна за вячэрай, прывабна ўсміхаючыся, распавядала яму.

– Сусед мне зноў будзе казаць што сягодня вы, суседка, ну, асабліва сэксуальная. Так я градкі прапалываю, прысеўшы на кукішкі, ды ўсё адказываю суседу на ягоныя кампліменты, што



я заўсёды такая – во, – яна гучна засмяялася, – ну, такая вось, сэксапільная, – маладзіца зноў заўсміхалася.

– Далей мне градкі матыкай трэба было апрацаваць, каб прапалоць. Ну, я ўзяла матыку, блага яна заўёды пад рукою. Стоячы да суседа спіной матычу паволі, нахінуся, левай рукой падтрымліваючы інструмент, правай траву выбіраю. А сусед тым часам, стоячы на ганку, ведаеш, што прамовіў? – яна заўсміхалася, седзячы побач з Сяргеем, захістаўшыся па баках:

– Суседка змяніце позу, бо я з ганку звалюся.

– Я якраз нахінулася долу, траву выбіраючы, галаву так павярнула, гляджу знізу левым бачком, падвярнуўшыся да суседа, ды й кажу, маўляў, сусед, вы мужчына шчэ дужы, моцны, калі й будзеце з ганку валіцца, то ўтрымаецеся, а ён мне тады і кажа, – яна зноў засмяялася.

– Не, суседка, альбо мяняйце позу, альбо, калі звалюся з ганку, то я ўжо не ўтрымаюся.

– Ну, я засмяялася ды пайшла ў дом, каб крыху адпачыць, чаю папіць. Глянула на сябе ў люстэрка, а ў мяне левая грудзь, я ў майцы была ХБ без станіка, бо спякотна, ды ў шортах, дык вось, левая грудзь вывалілася і боўтаецца адкрытая, а я працую і не адчуваю, і не заўважаю. Мне смешна стала. Палю во і думаю, з чаго гэта ў суседа настрой такі бадзёрысты.

Тут яны абодва разам, седзячы побач, засмяяліся.

Дамовіўшыся сустрэцца праз тыдзень бліжэй да вечара, бо ўдзень шмат розных хатніх клопатаў, едучы электрацягніком да патрэбнай станцыі, ён прыхапіў з сабой ровар. Кіламетры чатыры нетаропка вечаровым прыцемкам пакруціўшы педалі, удыхаючы свежае, напоўненае азонам пасля невялікага дожджыка паветра, не заўважыўшы яе за працай на градках, ён узыйшоў па прыступках на ганак і ціхенька пагрукатаў у дзверы. На водгук, «уваходзьце», Сяргей адчыніў дзверы і прайшоў у пакой калідорчыка.

– А я, ведаеш, запрацавалася, добры вечар, – адказала яна на прывітанне, – трэба мне крыху асвяжыцца, – яна ўсміхалася, шчабятала, бы птушачка, прысеўшы на кукішках перад вялікай міскай з падагрэтай вадой, апранутая ва ўсю сваю мініяцюрную галізну.

– Я зараз і хуценька, – усміхалася, шчабятала яна, склаўшы далоні, накідываючы, нібы апранаючыся, паверх на сябе плёсткі падагрэтай вады.

Ён прайшоў праз адчыненыя дзверы цераз прыхожую на кухню, выкладваючы з сумкі на стол прывезеную з сабой да вячэры ежу, і, час ад часу паглядаючы на яе легкі прывабны стан, падтрымліваў гаворку.

– Каб я быў мастаком, намаляваў бы з вас малюнак, – ён усміхаўся, слухаючы, як яна, шчабечучы, нібы птушачка, на кукішках, быццам апранаючыся, пырскала сашчэпленымі сваімі далонькамі на сябе з міскі цёплай вадой, – гэта быў бы шэдэўр.

– Згодна з вамі, – яна заўсміхалася і ўвайшла, апранаючыся, на кухню, – нездарма жа ў шмат каго з вядомых мастакоў штосьці падобнае лічыцца сусветнай класікай мастацтва...

3.

Мужчына, устаўшы з ложка, падыйшоў да стала, заварыў яшчэ кубак чаю, наліў кіпеню з падагрэтага гуляючымі ў карты хлопцамі электрачайніка, вярнуўся на сваё месца. Свежапрыгатаваны чай бадзёрыў смакам і духмянасцю.

Хутка ўжо дадому, так у думках ён вярнууся крыху далей, на пачатак мінулай восені. Па вяртанню дамоў, зтэлефанаваўся з ёй, дамовіўся сустрэцца. Яна зможа прыехаць. Выдатна. Яны сустрэнуцца...

Яны сустрэліся ў вызначаны час. Вясёлая, гаманлівая, яна падаравала яму маленькага плюшавага казярожка, адпаведна ягонаму месяцу нараджэння па ўсходнім календары, паставіўшы таго на паліцу секцыі над барнай дзверцай навідавоку.

Зноў дамовіліся сустрэцца праз два тыдні. Такая ж вясёлая, гаманлівая, яна зноў з'явілася, зараджаючы яго сваім адкрытым, даверлівым поглядам вачэй. Ён дапамог ёй распрануць паліто, зняўшы чаравікі, жанчына паволі прайшла ў залу да той знаёмай усім паліцы, на якой два тыдні таму пакінула свой падарунак. Прыпыніўшыся, матлянуўшы крыху па баках галавой, прыпусціла погляд уніз, глянула на стаяўшы на сваім месцы яе падарунак. Пракол, ён зразумеў адразу, бо ў вынік ўсё зноў пераблытаў, выстаўляючы падарунак на месца. Заместа плюшавага маленькага казярожка карычневага колеру, якіх звычайна дораць мужчынам іхнія жанчыны, на паліцы стаяў такі ж самы плюшавы, карычневага колеру бычок. «Вось табе на, і як жа гэта я?» Звычайна выціраючы пыл, прыбраўшы часова ўсё, што на паліцы ў напалову свабодную шуфляду, выстаўляючы на месца, ён пераблытаў месцамі падарункі.

Яна адчувала, што ён паглядае на яе з калідора праз адчыненыя дзверы, разумеючы, што гэта падарунак іншай жанчыны, згодна з годам яго нарджэння. Прайшоўшы наперад да вакна, яна націснула кнопку тэлевізара, уключыла яго.

– Сёння ўвечары юбілейны канцэрт у Палацы з'ездаў, рэкламавалі, будзе цікава, – павярнуўшыся тварам да дзвярэй увахода ў залу, яна ветліва ўсміхнулася яму, стаяўшаму ў калідорчыку, праз адчыненыя дзверы, усміхаючыся, глядзеўшаму на яе.

Ён палічыў не тлумачыць ёй, што той другі падарунак Сяргей атрымаў ў мінулым годзе ад адной сяброўкі, што завітала, каб звычайна пагаманіць і, што тыдзень таму, тая проста шчэ завітала, каб па-сяброўску пабачыцца, а ён выставіў на тым тыдні падараваны калісьці той сувенір. Так на гэтым тыдні, чакаючы яе і прыбіраючыся ў кватэры, ён не задумваючыся пра падобны казус, пераблытаў падарункі.

Наступным разам сустрэліся зноў у яго. Яна, усміхаючыся, загаманіўшы, зняўшы капялюшык, чаравічкі, не здымаючы паліто, кранаючыся рукой прыадчыненыя дзверы ў залу, са сло-



вамі: «Што тут у нас новенькае?» – рупліва і хуценька прайшлася ўздоўж секцыі да тэлевізара. Націснуўшы кнопку, уключыла. Павярнуўшыся тварам да дзвярэй уваходу ў пакой, праз якія з калідорчыка ёй усміхаўся ён, яна таксама ўсміхнулася. На паліцы плюшавых сувеніраў ужо не было, бо ён, заблытаўшыся, прыхаваў усіх ў шуфлядзе.

4.

Дапіўшы духмяны чай, мужчына паставіў кубак на падлогу побач з ложкам, паглядзеў у бок таварышаў, што ціха, але азартна гулялі ў падкіднога, а потым, утульна абапёршыся спіной на падушку, сашчапіўшы рукі перад сабой і задрамаў. Калі заглыбляўся ў сон, яму прыгадалася, як напярэданні ад'езду на цяпершнюю вахту, капітальна прыбіраючы кватэру, ён знайшоў у канапе, за спінкай, дзе звычайна кладуць для адпачынку падушкі, адну жаночую залатую завушніцу. Так ніхто з яе уладальніц так і не адазваўся, і тая загадка засталася неразгаданай. Разважаючы, але не ўзгадаўшы, кім і ў які час было пакінута ўпрыгожванне, ён нетаропка і моцна заснуў.

Мужчына не адчуваў сябе заблукаўшым у трох соснах, бо цяпер у яго была адна Яна. Ён мроіў аб хуткай сустрэчы...

# Калымскі вернісаж

*Аповесць*

1.

Вецер, перамяніўшыся, адцясніў далей маразы за пяцьдзесят градусаў паўночней, на Арктычную прастору Ледавітага акіяна. Ад крыху пацяплешага засвяціўшага ў бязвоблачным небе сонца ў наваколлі пачаў адчувацца хуткі надыход Калымскай вясны. Неўзабаве з лістоўніцы, якая складала асноўную расліну Калымскай тайгі, рэдкія дрэвы якой знаходзіліся адна ад адной на адлегласці, пачалося пераўвасабленне навакольных краявідаў. З надыходам вясны першыя прагаліны ад падтаенага пад сонцам снегу з’явяцца менавіта наўкол ствалоў дрэў і выступаючых з рэльефнай мясцовасці камянёў. З-пад растаяўшага снега ўздымецца з долу хмызняковая расліна кедравага сланніка, што кладзе кожную восень свае парасткі на зямлю, каб на зіму, накрыўшыся снежнаю коўдрай, зберагчыся ад лютых маразоў. Забруяць, зазелянеюць парасткі лазы, хмызняк чорнай і чырвонай смародзіны. Напрыканцы маю наваколле расквітнее ружовымі кветкамі ландышаў, памерам разы ў два болей за сваіх суродзічаў сярэдняй паласы Расіі. Прырода дэмабалізуе ўсе свае наяўныя рэсурсы, каб за кароткі тэрмін Паўночнага лета належным чынам прайсці свой адпаведны цыкл змены пары года.

– Так, на маім тэрмометры мінус сорак дзевяць і дзевяць па Цэльсію, – кіраўнік арцелі Дрожжын, мужчына за сорак гадоў, росту вышэй сярэдняга, паўнаваты, выйшаўшы з памяшкання адміністрацыйнай пабудовы на ганак, агледзеў гаспадарчы двор.

– Мінус сорак дзевяць і дзевяць, не болей, – Дрожжын, праводзячы далонню правай рукі па вытыркаючаму з-пад скураной курткі,зашпіленую толькі на верхні гузік, пузу, прыхаваным пад швэдрам, звярнуўся да бадзяўшыся недалека ад застыўшага ў задуменні БелАЗа некалькіх працаўнікоў арцелі.

– А дзе ж наш галоўны на сягодня, без якога праца не заладзіцца? Дзе наш бульдазерыст, які Алег Латышаў?



– А вунь там ён, – хлопцы паказалі на бульдозер, стояўшы на адлегласці метрах у ста дваццаці ад купкі людзей

– Па-а-зваць.

Зразумеўшы, што хлопцы махаюць рукамі яму, Алег, займаўся аглядам бульдозера, зачыніўшы дзверцу кабіны, шпарка накіраваўся да ганку адміністрацыйнай пабудовы.

– Так, хлопцы, – Дрожжын звярнуўся да сабраўшыхся, водзячы далонню правай рукі па пузу, – мой тэрмометр паказвае што мароз спаў, паабедаць бы добра. Ну, і, – Дрожжын, жэстыкулюючы перад сабой далонямі абедзвюх рук, дадаў, – за працу!

Паглядзеўшя на падбегшага да гурта з боку бульдозера Алега Латышава, Дрожжын звярнуўся да таго.

– Алег, ты, значыцца, курсы па эксплуатацыі цяжкай тэхнікі, добрую падрыхтоўку, значыць, прайшоў. Зараз давай газуй з хлопцамі да пасёлка на БелАЗе, на абед, значыць. Потым адпачнеш да вечара і выйдзеш на працу ў начную змену на бульдозер КАМАТСУ. У начную змену будзеш займацца ўскрыццём золатаноснага палігона. Справу гэту ведаеш, мне цябе не павучаць, – даўшы загад выпраўляцца ўсім па справам, ён паблажліва зноў правёў далонню правай рукі па сваім пузе, а тым часам Дрожжын хутка знік за дзвярыма адміністрацыйнага будынка.

2.

Вадзіцель БелАЗа, маючы прывілею ў дадзеным выпадку, уладкаваўся па-свойску ў кабіне таварыша, каб прыемней было ехаць. Алег, глянуў на стаяўшы непадалёку бульдозер, дзе на гусеніцы пакінуў свае цёплыя рукавіцы, але паленаваўся падбегчы за імі, а палез па лесвіцы саракатонніка на пляцоўку рухавіка пад казырок кузава. Вадзіцель упэўнена павёў сваю магутную машыну па свайму маршруце. Спачатку руху адчуўшы холад, што ахоплівае далоні, Алег нацягнуў на іх рукавы і абедзвюма рукамі трымаўся пры руху машыны за поручань пляцоўкі. Праз пятнаццаць кіламетраў, дабраўшыся да пасёлка,

вадзіцель прыпыніў магутную машыну каля будынка сталовай. Пры сходзе па лесвіцы з пляцоўкі рухавіка Латышава ахапіў жах ад убачаных белых сваіх далоняў. Вадзіцель, заўважыў, што здарылася за пятнаццаць кіламетраў дарогі і дрыготкім голасам загадаў Алегу хутчэй бегчы ў фельчарскі пункт, што месціўся непадалёку, бо яму патрэбна была тэрміновая дапамога.

Увайшоўшы ў калідор вагончыка фельчарскага пункта, Алег праціснуўся ў прыадчыненыя дзверы кабінета з шыльдай «Фельчар», трымаючы перад сабой белыя, абмерзлыя далоні абедзвюх рук. Медыцынскі спецыяліст, прывабная белакурая кабета, займалася сваімі справамі, штосьці перабіраючы ў шкляной шафе з медыкаментамі. Павярнуўшы ў бок дзвярэй галаву, яна толькі й паспела войкнуць і ад убачанага відовішча страціла прытомнасць і з громам бразнулася на падлогу, перакульваючы падаючым тулавам стул і зрушыўшы з месца працоўны стол. Латышава апантала думка, што толькі гэтага яму не хапала. Нахінуўшыся над беспрытомнай фельчаркай, Алег паспрабаваў прывесці яе ў нармальны стан і пахлопаў абмерзшымі далонямі па твары. Наліўшы з графіна вады ў стакан, што стаяў у вугле на тумбачцы, памакнуўшы у ім свае збялелыя пальцы правай рукі, апырскаў фельчарцы твар. Удыхнуўшы поўнымі грудзьмі паветра, падзьмуў раз-другі, ізноў пахлопаў яе па твары збялелымі ад мароза далонямі. Але дарма. Тады ён паўтарыў та працэдуру, больш шчодра акрапіўшы яе вадой, удыхнуўшы паветра, падзьмуў хлопаючы па твары беспрытомна ляжачую на падлозе жанчыну. Во табе на, мо паклікаць каго на дапамогу? Толькі хацеў было падацца да дзвярэй, як адкрылся вочы фельчаркі, тая апрытомела. Нібыта вінаватая, папрасіўшы прабачэння, яна пачала ўздымацца з падлогі.

– Вам дапамагчы? – Алег паспрабаваў абмерзшымі белымі далонямі дапамагчы той узняцца.

– Не, не, вам нельга, я сама. Зараз вам перавязку зраблю, толькі не хвалюйцеся, усё будзе з рукамі ў вас добра, – фельчар-

ка, паднялася з падлогі, паправіла стол, паставіла яго на месца, падняла стул і прынялася падрыхтоўваць патрэбныя лекі.

Зрабіўшы перавязку абмерзлых далоняў, фельчарка накіравала Латышава назаўтра з'ездіць аўтобусам са школьнікамі ў горад Сусуман для кансультацыі спецыялістаў гарадской бальніцы. Прыйшоўшы ў інтэрнат адпачываць, напарнік па працы параіў Алегу зайсці ў краму, дзе працуе яго жонка, і тая выдзяліць яму з-пад палы дзве бутэлькі гарэлкі. Продаж спіртных напояў на прыіску пад забароненай, але патрэбнае заўсёды знойдзецца.

– Гэта табе, Алег, як будзеш класціся спаць, то ўсё і вып'еш адзін, – напарнік, даўшы параду, узняўся з-за стала і накіраваўся да дзвярэй.

– Як мне столькі адразу выпіць? – Алег, выставіўшы дзве бутэлькі на стол, распрануўшы куртку, прысеў на свой ложак, – давайце разам зараз і прымем патрошкі, – прапанаваў напарніку ды двум таварышам, з якімі пражываў у адным пакоі.

–Увечары вып'еш, і адпачываць. Раніцой пабачыш, навошта табе столькі, – напарнік Колька, спяшаючыся дадому, развітаўшыся, выйшаў з пакоя.

Акурат увечары, перад тым, як класціся спаць, на абмерзшых, перавязаных далонях узмацніліся боль і зуд. Латышаву быў дваццаць адзін год, пасля службы ў войску ён ажаніўся, у яго нарадзіўся сын, і падаўся малады бацька зарабляць грошы на Калымскія прасторы. Так па парадзе старэйшага, больш вопытнага таварыша, Алег прыняў спіртны напой і хутка заснуў. Зраніцы прачнуўся, не адчуваючы болю, пабачыў свае далоні без павязак, у язвах. Алег спытаў у таварышаў, куды павязкі падзеліся. Таварышы растлумачылі яму, што ён сам іх пазрываў, не прачынаючыся, скрыгочачы зубамі, таму і патрэбна было на сон выпіць адразу дзве бутэлькі гарэлкі.

Назаўтра Латышаў прыбыў аўтобусам са школьнікамі ў горад Сусуман. У гарадской бальніцы доктар зрабіў яму перавяз-



ку, а потым, выпісываючы бальнічны ліст, закачаў галавой і дадаў, што яшчэ кіламетраў пяць такім дубарам пракаціўся бы на тым БелАЗе Алег, і давялося б аднімаць па локці абедзве рукі, каб не атрымалася гангрэна, небяспечная для жыцця. У дадзеным выпадку пашанцавала. Месяц трэба прымаць лекі, рабіць перавязкі, і ўсё будзе добра.

3.

Верталёт, прызначаны для адпраўкі грузаў да арцелі, куды патрэбна было патрапіць і двум пасажырам, вяртаўшыхся з адпачынку: Алегу Латышаву і яго сябру Мікалаю Карпенку, – чакаць давялося два дні, засяліўшыся ў гасцініцу. Алега Латышава пасля праходжання курса лячэння кіраўніцтва арцелі адправіла ў адпачынак за адпрацаваны належным чынам час. Блага, што адпачынак за працу атрымлівалі рабочыя працяглы, так і Алег вяртаўся на Калымскую прастору летняй парой ачуняўшым, у добрым, прыўзнятым настроі шукальніка прыгод са спадзевам зноў зарабіць дастаткова грошай, маючы для гэтага грунтоўныя падставы. Па суседству ў нумары пражывалі пілот і штурман верталёта, што павінны ляцець да арцелі, і ўвечары сабраліся хлопцы ўчатырох у нумары пілотаў, каб пагаманіць разам за жыццё, кульнуць па чарачцы каньячку.

– То ж мы, хлопцы, тры дні таму, пралятаючы непадалёку ад вашай арцелі заўважылі з вышыні мужыка, ідучага па тайзе са стрэльбай і з рукзаком за спіной, – пілот, запаліўшы цыгарэту, утульна размясціўшыся ў крэсле, працягваў сваю гаворку, – а крыху на адлегласці, ззаду мужыка, мядзведзя. Мужык той мядзведзя, што шкандыбае за ім, прыхоўваючыся, за раслінамі, зразумела, не бачыць. Пляцоўкі, каб пасадзіць нам сваю вінтакрылую машыну, не пашкодзіўшы вінты аб дрэвы, паблізу няма. Ну і вырашылі мы таго мядзведзя адагнаць верталётам. Заруліўшы, прайшліся нізка над ім. Пайшлі на разварот, заўважаем, што мужык падаўся ўлева, нібы ўцякаю-

чы ад нас, а мядзведзь той роўна за ім. Заходзім ізноў, але цяпер над мядзведзем, каб адагнаць таго. Мінаючы, заўважаем, што мужык падаўся ўправа, паскорыўшы хаду, а мядзведзь – следам. Мы ідзем на разварот, атакуем мядзведзя. Мужык са сваёй стрэльбай ды рукзаком за плячыма, уцякаючы ад нас, падаецца ўлева, мядзведзь – зноў следам. На чацвёртай васьмёрцы нашай спробы адагнаць таго мядзведзя мужык, прыхаваўшы стрэльбу ў прыкметным месцы на сопцы, дзе паваленыя вывернутыя з каранямі тры вялікія дрэвы, даецца ад нас наўцёкі бягом. Ну, мы, зразумела, уцямліваем што стрэльба не зарэгістравана і паляўнічага білета не маецца, і мужык той, прыняўшы наш верталёт за верталёт прыродаахоўы, ператварыўся з левага паляўнічага ва ўцекача, – хлопцы, слухаючы расповед, зарагаталі, а пілот, запаліўшы шчэ адну цыгарэту, працягваў.

– То ж нам да гэтага няма аніякай справы. Ад таго, што мядзведзь за ўцекачом падаўся таксама бегчы, нас ахапіў жах. Урэшце рэшт, на шостай нашай васьмёрцы мядзведзь-такі прыпыніўся, мо, стаміўся бегчы за тым мужыком. Пайшоўшы на разварот, мы зноў над мядзведзем прайшліся і, набіраючы вышыню, каб ляцець далей па вызначаным маршруце, рагаталі ў кабіне верталёта, надрываючы жываты, як і чацвёра нашых пасажыраў на борце. Сапраўды было смешна пабачыць, як мужык той з рукзаком за плячыма ды мядзведзь імчаць на ўсіх парах, пятляючы паміж лістоўніцамі і хмызняком кедравага сланніка ў процілеглых накірунках. Смех, ды й годзе, – пілот, узняўшы прапанаваную Латышавым румку каньяку, перакуліўшы, не прыкусваючы, засмяяўся разам з хлопцамі.

– Шаноўны, – звярнуўся Латышаў да пілота, седзячы за сталом на табурэтцы каля акна з выглядам на тайгу, – а стрэльба якая была ў таго мужыка, адна ці двуустволка?

– Стрэльба – аднастволка. Гэта мы прыкмецілі, як знізіліся першы раз паспрабаваць адагнаць таго мядзведзя.

– Аднастволка – значыць, мая. – Латышаў перакуліў румку каньяку і прыкусіў хлебам з салам.

4.

Прыбыўшы да месца прызначэння ў суботу ў першай палове дня, Латышаў з Карпенкам ды падыйшоўшымі да верталёта хлопцамі, адпачываючымі ў выхадны дзень, каб не затрымліваць верталёт, хутка выгрузілі дастаўленае абсталяванне ды запасныя часткі. Запусціўшы рухавік і разагнаўшы вінты, пілот са штурманам, узняўшы верталёт вышэй вершалінаў дрэваў, традыцыйна абляцеўшы кругам над базай, узялі патрэбны накірунак, набіраючы вышыню, зніклі за небакраем.

– Алег, ну як твае далоні, паправіўся, – механік ў добрым настроі падыйшоў да гурта і павітаўся з усімі за руку.

– Так, во, – Латышаў нахіліўся было, каб узяць свае дзве сумкі з рэчамі, але выпрастаўся, трымаючы рукі перад сабой, і пакруціў далонямі, – поўны парадак, па працы ўжо й засумавалі.

– Ну, і добра, хутка ўжо будзе табе і праца, – механік агледзеў хлопцаў, што сабраліся каля верталётнай пляцоўкі, – зараз, хлопцы, бярэм рэчы нашых прыбыўшых і заходзім да іх у апартаменты. Мы сёння ў іх, так сказаць, пагасцюем.

– Выдатна, – Карпенка ўскінуў рукі ўгору, – мы жа з матэрыка прыбылі не з пустымі рукамі, з пачастункамі.

– Ды з парожнімі кішэнямі зноў наведаліся сюды, у Калымскі край, за доўгім рублём, – хтосьці з хлопцаў падкінуў жарцік, і ўсе разам зарагаталі, уваходзячы ў жытло, куды прыбыўшыя засяляліся.

За нетаропкай размовай, перакуліўшы па чарачцы ды прыкусіўшы хатнім салам, Латышаў звярнуўся з пытаннем да хлопцаў:

– А дзе жа Малёк, няма? Мо шчэ з працы не вярнуўся ці мо ў адпачынку?



– Тут ён, – механік паглядзеў праз акно, быццам штосьці жадаючы пабачыць, – зараз павінен з'явіцца. На тыдні вырашыў па тайзе пабадзяцца, прыхапіўшы з сабой тваю стрэльбу, Алег.

– Ну і як атрымалася бадзянне? – Латышаў уважліва паглядзеў на механіка, наўрад ці Малёк праўду распавядзе.

– Пайшоў ён ў тайгу, натрапіў на белыя грыбы, набраў гэтак унушальна, што стрэльбу тваю пакінуў на сопцы – там, дзе тры вывернутыя з каранямі дрэвы. Далёка зайшоў, цяжка адтуль несці. Сягоння з раніцы выбраўся за стрэльбай.

Латышаў з Карпенкам не ўтрымаліся ад смеху. Хлопцы паглядалі на іх, як на дзівакоў, а механік здзіўлена прамовіў:

– Чаго тут смешнага, грыбоў шмат прытарабаніў, рукзак і два пакеты вялікія. Ад'еліся, ўвечары прыгатаваўшы.

– Ма-лай-чы-на, што паспеў шчэ й грыбоў набраць, во хітрун, – ажно заходзячыся смехам, Латышаў з Карпенкам, крыху супакоіўшыся, прапанавалі перакуліць шчэ па адной. Пасля хлопцы распавялі гісторыю верталетчыкаў ды што адбылося на самой справе і чаму Малёк прыхаваў стрэльбу ў прыкметным месцы.

– Так, таварышы, цішыня і твары пасур'ёзней. Малёк вярнуўся, са стрэльбай, – механік, заўважыўшы стомлена ідучага Малька, прыўзняўся са свайго месца з-за стола і, адчыніўшы дзверы, аклікнуў таго зайсці ў памяшканне.

– О-о, Алег, Цімоха! Хлопцы, прывітанне. З прыбыццём на Калымскую зямлю, – Малёк паставіў каля дзвярэй стрэльбу, зняўшы амаль парожні рукзак, падышоў да стола і падаў на прывітанне ўстаўшым з месца двум прыбыўшым руку, – як адпачылі, як дабраліся?

– Ды ўсё па вышэйшаму пілатажу, – Алег жэстам рукі прапанаваў Мальку  прысесці за стол. Узняўшы напоўнены кіліш, прапанаваў выпіць за сустрэчу, Малёк глынуў адным махам і апаражніў шклянку.

– Ну, як там, каля схова, Малёк, сёння не сустрэў гаспадара тайгі? – механік спытаў, не ўтрымаўшыся ад смеху, аглядаючы павесялеўшую кампанію.

– Ды якога гаспадара, штосьці я не разумею, аб чым размова? – седзячы за сталом, Малёк з-пад ілба агледзеў таварышаў.

– Ды размова, братка, аб тым, – Латышаў скрозь смех спрабаваў распавесці, – аб тым размова, братка, – га- га га. Размова аб тым, – супакоіўшыся, Латышаў распавёў далей.

– Верталёт той, што на гэтым тыдні за табой ганяўся наразаючы колы ў паветры над тайгой, быў не з прыродааховы, а з нашай геолагавыведкі. І не цябе яны пільнавалі са стрэльбай тваёй, а адганялі мядзведзя, што ішоў за табой следам, якога ты й не бачыў.

– Во справы, во це на, – Малёк з пабялеўшым тварам, вылупіўшы вочы, паглядаў на Алега, уважліва слухаючы расповед таго.

– Ды нічога, братка, – механік, паляпваючы Малька па плячы левай рукой, наліў таму ў шклянку гарэлкі, – тут братка, Калыма, і людзі па магчымасці заўсёды дапамогуць. Давай – за верталётчыкаў.

– Так, за верталётчыкаў. То сёння, значыць, той экіпаж быў. Дзякуй ім, хлопцы – хоць куды, – Малёк адным глытком апаражніў налітае спіртное і агледзеў таварышаў, што ўжо ўгаманіліся ад смеху.

–Так, хлопцы, – механік устаў з-за стала, падыйшоў да дзвярэй выхаду, прыадчыніў іх і прамовіў, – пайду пагляджу, чым рамонтнікі займаюцца. Запцацкі нам даставілі, сёння ды за заўтрашні дзень рэмбрыгада тэхніку адрамантуе. З панядзелка праца закіпіць, назаўтра яшчэ адпачывайце, – і механік выйшаў з памяшкання і пашыбаваў да гаража. Хлопцы выйшлі следам, каб папаліць тытуню.

З раніцы ў нядзелю Латышаву з Карпенкам закарцела, узяўшы з сабой стрэльбу, выбрацца пабадзяцца крыху па тайзе.

Малёк і адзін з вадзіцеляў БелАЗа па мянушцы Казанова набіліся пайсці разам. Выбраліся ўчатырох, папярэдзіўшы хлопцаў, што акурат падчас абеду вернуцца.

– Казанова, – Латышаў звярнуўся да таварыша, – а што гэта цябе калі-нікалі шчэ й Рабінзонам называюць? Усё хацеў спытаць, ды праца, праца, неяк часу й не знаходзілася.

– Рабінзонам, – Казанова прыпыніўся каля хмызняку кедравага сланніка, мацаючы рукамі і разглядаючы маладыя шышкі, набіраючыя моц, – то гэта за тое, што два гады таму, калі працаваў я шчэ на буравых, два месяцы давялося мне «рабінзоннічаць» на адным пакінутым, закансерваваным аб'екце.

– І з якой нагоды табе давялося яшчэ на пакінутай буравой застацца? Ты што, адзін там быў?

– Так, адзін.



*Паселішча Сылгыбастах. Калымскі паўвостраў*

5.

Латышаў з Казановай, адыйшоўшы ад хмызняку кедравага сланніка, пацягнуліся, размаўляючы, побач за ідучымі наперадзе таварышамі.

– Працаваў я памочнікам буравога майстра. У пачатку красавіка мяне з буравой верталётам адправілі ў адпачынак тэрмінам на два месяцы. Паперу далі, дзе было напісана, што прыступіць мне да працы васемнаццатага чэрвеня. Ну, я, зразумела, падаўся ў адпачынак на ўвесь тэрмін на Радзіму. Вярнуўся назад за тры дні да выхаду на працу.

– Ну і як далей цябе так закруціла, што патрапіў на пакінутую закансерваваную буравую? – Латышаў папраравіў рамень стрэльбы на правым плячы, нахінуўся долу і далонню левай рукі сарваў некалькі спелых чарніцаў.

– А закруціла мяне, Алег, тое, што я, калі прыбыў у аэрапорт ды сыйшоў па трапу самалёта, убачыў ідучых да верталёта пілота са штурманам ды гурт з васьмі чалавек і завёў з імі гаворку.

– Якую гаворку? Ты што, ведаў кагосьці з іх?

– Ды якое, ведаў, – Казанова заўсміхаўся, – павітаўся ды спытаў, маўляў, на які накірунак, шаноўныя, мо й мяне з адпачынку падкінеце да месца майго прызначэння.

– Ну, і як, падкінулі? – Алег зноў нахіліўся і далонню левай рукі нарваў чарніцаў.

– Так, згадзіліся. Якраз у тым накірунку паўночней за буравой чатырох геолагаў высаджвалі. Потым, пайшоўшы ўлева, – астатніх, і вярталіся на базу.

– Казанова, казкі заліваеш, знайшоў свабодныя вушы, – Малёк, вырашыўшы пажартаваць, падкінуў кпіну, калі ўсе ўчатырох нетаропка ішлі побач па тайзе ў накірунку базы.

– Тут, братка, быль, я болей рэаліст. Казкі ў нас ты мастак заліваць. Пра грыбы, што назбіраў, усё тлуміў нам галовы, а пра верталёт ды з якой прычыны стрэльбу прыхаваў, і не абмовіўся.

– То ў мяне становішча такое ўтварылася, што каб расказаць, як усё на самой справе атрымалася, патрэбна было вытрымаць паўзу, – Малёк выкруціўся, не маргнуўшы вокам.

– Пра паўзу праўду кажаш, – згадзіўся Казанова, – вось і мне патрэбна было ў кантору з'явіцца, і я, праявіўшы ініцыятыву выскачыў амаль на хаду з верталёта на палянцы перад буравой сваёй. Пілоты знізілі машыну, я й выскачыў са сваёй невялікай сумкай. На развітанне памахаў рукой, а мне мужыкі праз ілюмінатары памахалі, маўляў – удачы.

– Ну, і як з удачай, атрымалася? – Латышаў паправіў стрэльбу на правым плячы і пераскочыў цераз невялікі ручай, што іскрыў промнямі сонца ў чысцюткай вадзе.

– А з удачай так атрымалася, – Казанова, увайшоўшы ў кураж свайго расповеду, пайшоў нетаропка, нібыта з кожным крокам штосьці вымерваючы, жэстыкулюючы рукамі, – зайшоў на тэрыторыю буравой, і мне стала не па сабе. Упершыню ў жыцці спытаў такое хвалюючае адчуванне трывогі, што й цяпер памятаю. З буравой па заканчэнні ўсіх патрэбных работ знялі людзей, забраўшы й каштоўнае абсталяванне, толькі бытавыя памяшканні засталіся. Асэнсаваўшы, у якую недарэчнасць я патрапіў, толькі й паглядзеў я ўслед знікаючаму з відавоку на небакраі верталёту. О, матка Боска, што ж мне рабіць далей? У сумцы ў мяне, апрача нейкіх рэчаў з адзежы, крыху харчу, чатыры бутэлькі гарэлкі два блокі цыгарэт ды дзесяць карабкоў запалак. Гарэлкі ўзяў, каб было хлопцаў пачаставаць пасля адпачынку, – традыцыя.

Казанова, выйшаўшы крыху наперад, на момант павярнуўся тварам да таварышаў, развёў па баках рукамі і працягваў свой расповед. – Усё бывае, як бывае. Абыйшоўшы бытавыя памяшканні, заўважыўшы што дзверы аднаго з іх закрытыя не на замок, а на засаўку, я зразумеў, што маё ўратаванне менавіта тут.

– А чаму ты зразумеў, што там уратаванне і ў чым? – Малёк, звярнуўшыся да Казановы нахіліўся за чарніцамі.



– Таму і зразумеў, што хлопцы пакінулі там неабходнае для выжывання якогасьці заблукаўшага валацугі, і не памыліўся. У тым памяшканні я знайшоў прыпасы солі, цукару, чаю, сухароў, наробленых з хлеба, кілаграмаў з дзесяць крупаў сечкі, цыгарэты ды запалкі. Мне нічога не заставалася, як, наладжваючы свой быт таёжнага Рабінзона, не губляючы надзеі, чакаць, бы які цуд на выпадкова пралятаючы паблізу верталёт.

– Ну, і як, пашанцавала? – спытаўшы, Малёк сур'ёзна, з павагай, паглядзеў на таварыша.

– Акурат праз два месяцы, у мяне ў блакноце запісана, пятнаццатага жніўня. Прыгатаваў абед, падтрымліваючы вогнішча, падкідваючы туды, апрача сухіх дроваў, каб стварыць дыму, сырыя, а потым з усходу з'явіўся на небакраі верталёт.

– Ну, і адкуль ён узяўся, той верталёт ды шчэ акурат да цябе на буравую з той бязмежнай паветранай прасторы? – Латышаў у чарговы раз паправіў стрэльбу на плячы, ідучы побач з Казановай і ўважліва слухаючы ягоны расповед.

– Ды так атрымалася, што на адной з дзеючых буравых паламала пальцы на правай назе памочніку буравога майстра, калі сарвалася ўзнятая лябёдкай труба. Па рацыі выклікалі верталёт з брыгадай медыкаў. Верталёт той і дастаўляў таго хлопца з буравой да аэрапорта. На даляглядзе заўважыўшы дым ад вогнішча, той хлапец і паведаміў экіпажу, што, відаць, камусьці ля таго вогнішча патрэбна таксама дапамога. Тады верталётчыкі і завіталі, так сказаць, на агеньчык.

– Ну, а гарэлкай, што браў з сабой з адпачынку, ты мо мядзведзяў там частаваў, што заходзілі на агеньчык, які ты падтрымліваў, – жартаўнік Малёк, не ўпусціўшы момант падкінуць кпінку ўбок таварыша.

– Мядзведзь, каб і завітаў які на агеньчык, то мне пачаставаць было б чым, – Казанова хітравата паглядзеў улева, убок таварыша і, прыжмурыўшы вочы, дадаў, – а вось чым бы ты частаваў на мінулым тыдні гаспадара тайгі, чым бы задобрыў, прыхаваўшы



*Алег Латышаў. Калымскі паўвостраў, пачатак 1980-х гг.*

стрэльбу, каб верталётчыкам не ўдалося адагнаць яго ад цябе? – хлопцы, ідучы побач, заўсміхаліся.

6.

Латышаў паправіў рэмень стрэльбы на правым плячы, што споўз на край, і замер у нерухомасці выставіўшы ўбок левую руку, паказаўшы таварышам знак. Воўк-прыгажун, ішоўшы ў насустрач, у накірунку гаманлівага гурта людзей, прыпыніўшыся ў метрах трыццаці наперадзе, ўважліва, з асэнсаваннем свайго гонару, разглядаў выпадкова сустрэтых ім людзей.

Неўзабаве зрабіўшы штуршок пярэднімі нагамі адносна свайго накірунку ўправа, воўк павярнуўся левым бокам да хлопцаў, стоячых нерухома, акінуў тых з недаверам, павярнуўшы галаву ўлева, сваім непрабітным воўчым позіркам і паволі пацягнуўся прэч, не хвалюючыся за сваю бяспеку, нібыта дэпутат з дэпутатскай недатыкальнасцю.

Моўчкі правёўшы поглядам знікаючага з відавоку за таёжнымі раслінамі ваўка, хлопцы нетаропка рушылі на базу, ўзяўшы крыху ўправа ад звычайнага маршрута. Нейкі час ішлі моўчкі, успрымаючы сустрэчу з ваўком, бы якое відовішча, супакойваючы ў думках сябе тым, што пазбеглі непрыемнасці.

– Казанова, скажы шаноўны, а як ты, на той буравой адзін-адзінюткі знаходзіўся, ды два месяцы ў адзіноце, а сябры

мядзведзі і ваўкі не гасцявалі? – Карпенка, парушыўшы маўчанне, звярнуўся да таварыша.

– Вось так і працягнуў, за мядзведзяў ды ваўкоў надта не хваляваўся. За год, што там працаваў, іх там не сустракалася. Затое зайцоў там шмат, пападаліся ў расстаўленыя з дроту пяцёлкі заўсёды. Кашку-сечку гатаваў, у рачулцы, што працякала непадалёку, рыбу вудзіў.

– Ну, а як з псіхалагічным адчуваннем, стрэсавыя ўмовы уплываюць на мазгі? – Карпенка, круцячы галавой па баках, нібыта спрабуючы штосьці выглядзець па тайзе, распытываў таварыша.

– Ад стрэсу ў яго жа гарэлкі было дастаткова, улічваючы, што Казанова болей падкі на дзяўчат, чым да зялёнай змяі, антыстрэсавага напою, яму акурат і хапіла на два тых месяца, – Латышаў, заўсміхаўшыся, пахлопаў Казанову па плячы.

– Усё адбылося добра з тае прычыны, што я ўлетку патрапіў у гэтакую во недарэчнасць, – углядаючыся у наперадзе навідавоку узнікшыя пабудовы базы, Казанова працягваў свой расповед, – у зімовы перыяд шанец на выжыванне там дзесьці быў бы пяцьдзесят на пяцьдзесят, складаней чым летам.

– Слухай, братка, то ты потым і звольніўся з той буравой пасля гэтага здарэння? – Латышаў, зняўшы стрэльбу з пляча, перазарадзіў патрон са шротам, што на пярнатых ды зайцоў, на патрон з карцеччу.

– Ды не, яшчэ год працаваў у той жа вахце, толькі на іншай, новай буравой бульдазерыстам. Потым мне адзін таварыш падсабіў, дапамог уладкавацца на курсы па падрыхтоўцы вадзіцеляў БелАЗаў. Вось так пасля атрымання пасведчання я сюды і патрапіў. Тут заробак болей, і болей, што казаць, значна.

– Хлопцы, ну, дзе вы падзеліся? Алег, пайшлі, пайшлі хутчэй, – двое слесараў рамонтнай брыгады Іван і Веніямін, Ваня ды Веня, як іх тут усе называлі, кінуўшы рамантаваць машыну УРАЛ з адкрытым капотам рухавіка, падбеглі да вярнуўшыхся з



тайгі хлопцаў, праходзячых каля майстэрні ў трыццаці метрах у накірунку да бытавых памяшканняў, і паказвалі правымі рукамі ў накірунку за тэрыторыю базы, дзе на водшыбе пад навесам быў змайстраваны тэльфер для рамонта тэхнікі. Усе паглядзелі туды.

– Алег, у цябе патрон карцеччу зараджаны? – спяшаючыся за Ваняй, спытаў Веня, матлянуўшы рукой, маўляў, за намі.

– Так, карцеччу, – нічога не разумеючы Алег ды астатнія трое хлопцаў пацягнуліся ўслед за зазывaламі.

– Дзе вы бадзяліся са сваёй стрэльбай, нічога не падстрэліўшы? – Ваня паказаў далонню правай рукі на пясок каля змайстраванага пад навесам тэльферам, – вось, бачыце, сляды мядзведзіцы з медзведзянём. Прайшлі хвілін дваццаць таму, не болей. З раніцы мы тут Урал рамантавалі, рухавік тэльферам падняць патрэбна было. З паўгадзіны назад завялі ды перагналі да майстэрні, ключы гаечныя тут пакінулі. Веня хвілін дзесяць таму за ключамі вярнуўся і ўбачыў тыя сляды, відаць, нядаўна прайшлі яны, бо сляды на пяску свежыя, – Ваня, шчэ раз матлянуўшы далонню правай рукі, паказаў на пясок.

– Хадзем па слядах, тут во семдзесят метраў і тайга, хадзем, – Веня рушыў, за ім следам Ваня і астатнія. Яны ішлі ўчатырох, а наперадзе ўсіх, папраўляючы раз-пораз стрэльбу на правым плячы, ішоў Алег.

Дайшоўшы да ўскрайку тайгі, Веня з Ваням, прыпыніўшыся, павярнуліся на сто восемдзесят градусаў, чакаючы следам ідучых чатырох таварышаў.

– Мы зараз хадзем сустрэнем іх, яны дзесьці тут недалёка, – сцішаным голасам ды й не так азартна Веня звярнуўся да Латышава, – Алег, а стрэльба ў цябе зараджана шротам альбо кар-цеч-чу?

– Стрэльба, братка, карцеччу, – Латышаў, паглядзеўшы на разгубленыя твары Вені ды Вані, перакінуў погляд на ўскраіну тайгі, дзе павінна непадалёка блукаць са сваім медзведзянём мядзведзіца. У мазгах, бы на кінастужцы, пракруцілася

адбыўшаяся хвілін сарак таму выпадковая сустрэча ў тайзе з ваўком-прыгажуном, – сустрэнем, братка, і што? – Алег напружаным поглядам акінуў разгублены выраз Венінага твару.

– І што? – сцішана, неўпапад прамовіў той.

– А тое, братка Веня, – Алег, ускінуўшы правай рукой рэмень, паправіў стрэльбу на плячы, – калі па тваёй прапанове, як ты кажаш, сустрэнем. Ну, ды й што? Ну, ды й праспяваем ёй, той мядзведзіцы з яе малым песню з рэпертуара Валерыя Лявонцьева пра вернісаж, дзе сустрэў я вас, так?

Усе шасцёра чамусьці пераглянуліся паміж сабой, потым, углядаючыся, з ускрайку ў тайгу перавялі свае позіркі на будынкі базы.

– Яна нам гэтакую сустрэчу арганізуе, абараняючы свайго малога, што не дапаможа нам шасцярым і мая стрэльба-аднастволка, зараджаная карцеччу. Як гаспадыня гэтай прасторы, яна ў імгненне арганізуе нам свой, Калымскі вернісаж, ды такі, што ці ўвалачомся ад яе жывымі, – Латышаў, у чарговы раз трасянуўшы рэмень, папраўляючы стрэльбу на правым плячы, зрабіў некалькі крокаў у накірунку базы, прыпыніўшыся, павярнуўся на сто восемдзесят градусаў да чамусьці застыўшых каля ўскрайку тайгі таварышаў, – пайшлі, братва, тут прыгоды сабе шукаць не патрэбна, тут яны самі нас знойдуць... Пайшлі, да абеду акурат шчэ па сто пяцьдзесят нам засталося. Адпачыць, ну, а з панядзелка, як сказаў учора механік, праца закіпіць, – і



*Моцная тэхніка Поўначы*

Латышаў паволі, нетаропка накіраваўся праз аблог да бытавых памяшканняў базы.

Хлопцы, стоячы на ўскрайку тайгі, акінулі поглядам наваколле, быццам спрабуючы штосьці таемнае запрыкмеціць, пацягнуліся следам.

7.

Праз дваццаць гадоў, па патрэбе часу і ў жаданні зарабіць грошай для годнага жыцця, Алег Латышаў уладкаваўся на працу экскаватаршчыкам вахтавым метадам па сорак пяць сутак і патрапіў у Новы Урэнгой. Працаваў на адсыпцы дарог. Па заканчэнні саракапяцісутачнай вахты вырашыў адзначыць адбыццё дадому для чарговага адпачынку. Хлопцы сабраліся, накрыўшы ў сауне агульную «паляну».

– Чаму ты карыстаешся выразам «на Мацярык»? Адсюль жа, з Урэнгоя, пры адбыцці карыстаюцца выразам «на Вялікую Зямлю», – спытаў Алег у таварыша, седзячага за сталом, амаль насупраць, з зацікаўленасцю паглядаючы на таго.– Выраз «на Мацярык» – гэта ж з Калымы, Чукоткі ды Сахаліна. Табе што, у свой час даводзілася дзесьці там працаваць, мо ты дзе на Калыме шукаў прыгоды калісьці, мо, як і я ў маладыя гады, блукаў не толькі за грашыма, але, як у песні Юрыя Кукіна, шчэ й «за туманамі»?

– Даводзілася, у Сусумане.

– І я ў Сусумане працаваў. Пачатак васьмідзесятых, пасёлак Сылгыбастах.

– Алег, гэта ты? Дык я ж Уладзімір!

Абодва, ускочыўшы, выбеглі з-за стала. Даўнія сябры моцна цiснулі адзін аднаму рукі ад радасці сустрэчы, за плечы тузалі адзін аднаго, прыгаворваючы, што і трэба ж было такому адбыцца, што адзін з Беларусі, а другі з Арэнбурга сустрэліся во, праз дваццаць гадоў, на бязмежнай прасторы Сібіры ў Новым Урэнгоі!

# Добразычлівасць расамахі

*Аповесць*

1.

У святле ліхтара паветра, набрынялае вільгаццю, калі прыгледзецца, падавалася Міколу дробным імжыстым дожджыкам. Ён абварваў канструкцыю вагончыка-бытоўкі, што мацавалася на трубах-валакушах, час ад часу адрываўся ад зваркі, і тады Міколу даводзілася, зняўшы зварачную маску, праціраць запацеўшае ад вільгаці шкло. Чамусьці, невядома з-за чаго, падступала час ад часу трывога. Спаліўшы чарговы электрод, узняўшы зварачную маску, Мікола глянуў на гадзіннік – дзве гадзіны начы. «Да раніцы акурат паспею,» – падумаў ён. Як даводзіў галоўны механік, у восем гадзін раніцы прыйдзе з кар'еру бульдозер і пацягне адрамантаваны вагончык-бытоўку для патрэбаў брыгады распрацоўшчыкаў, што працуюць на кар'еры.

Спаліўшы электрод, ён узняў левай рукой зварачную маску, прыладзіў чарговы ў трымальнік, пaглядаючы на яшчэ разагрэты зваркай чырвоны метал, і тут пачуў за спіной рычэнне. Седзячы на чурбаку каля патрэбнага месца зваркі, Мікола азірнуўся. Божа, ратуй! У дзесяці метрах ззаду, каля вагончыка, у якім знаходзіўся такарны станок, заблытаўшыся задняй правай нагой у стружку металу, пакінутую такарамі каля майстэрні, з рычэннем вышчэрваючы зубы, да яго імкнулася дацягнуцца, грэбаючы пярэднімі лапамі зямлю, чорнага колеру жывёліна. Крыху позаду гэтай невядомай істоты з вышчэрынымі зубамі і з вострай мордай, падобнай да лісіцы, стаяў, аглядаючы наваколле, круцячы галавой, такі ж самы нязванец крыху большых памераў, вышчэрваючы час ад часу з рычэннем сваю пастку. Хто гэта? Мо якія сібірскія ваўкі? У імгненне сарваўшыся з месца, Мікола падаўся наўцёкі, каб захавацца ў бытоўцы слесараў-рамонтнікаў, што ў пятнаццаці метрах ад месца зваркі. Заскочыўшы ў памяшканне, зачыніўшы за сабой дзверы на засаўку, ад ахінуўшага яго жаху нетаропка прысеў на падлогу, датыкнуўшыся левым бокам тулава да дзвярэй.

Сэрца калацілася на ўсю моц, тулава трэслася, нібыта ад ліхаманкі. «Во блін, во блін,» – аддыхваючыся, Міколавы мазгі адбівалі чачотку: «Во блін, во блін... Не паспееш тут і капейчыну зарабіць, як цябе ўжо схаваюць гэтыя во з мордай лісіцы чорныя сібірскія ваўкі, во блін, во блін». Супакоіўшыся, ён прысеў на адно калена, назіраючы за дваром гаспадарчай тэрыторыі базы праз дзірку замочнай шчыліны, з якой быў выдраны замок. Мікола ў свеце пражэктара ўжо больш дакладна разгледзеў гэтых дзвюх небяспечных істотаў. Тая, што меншых памераў, напэўна самка, выпутаўшы нагу з металічнай стружкі, падышла да месца працы чалавека і абнюхала яшчэ гарачы, звараны Міколам стык. Другі, большых памераў звер, трымаючыся непадалёку ад меншай, з асцярогай, бы вартавы, паглядаў наўкола на асветленай пражэктарам пляцоўцы, пільна сочачы за бяспекай. У хуткім часе самка нетаропка падалася, абнюхваючы, аглядзець тэрыторыю.

2.

Вокны бытоўкі, дзе схаваўся Мікалай, былі закалочаныя звычайным рубероідам з дапамогай драўляных рэек і рабілі яго безабаронным перад гэтымі во, як Мікола разважаў, сібірскімі ваўкамі. Адно супакойвала думка, што ў жывёлін няма на гэты выпадак розуму, каб прарваць гэткія сціплыя перашкоды. Падышоўшы да Міколавай схованкі, самка працяжна зарычэўшы, вышчэрылася лісінай мордай, агаліўшы вострыя клыкі ніжняй і верхняй сківіцы, дэманструючы чалавеку добразычлівы намер дагэтуль не бачаных ніколі жывёлінаў.

«Не, гэта не ваўкі, гэта штосьці іншае, для чалавека больш небяспечнае,» – і Мікола адкінуўся ад дзвярэй, адпоўз на сярэдзіну бытоўкі, устаў на ногі і замер у нерухомасці. «Не ўцямяць, не ўцямяць, у іх не такія мазгі, – супакойваў ён сябе, – трэба перачакаць». Ад зноў ахінуўшага яго жаху чамусьці захацелася завыць па-воўчы. Падрапаўшы кіпцюрамі па сцяне бытоўкі,

гучна, адчайна рыкнуўшы, вышчэрыўшы зубы пасткі ад немагчымасці з-за такой перашкоды дабрацца да здабычы, галодная самка патупала да будынка майстэрні, каля якой й зачапілася лапай за металічную стружку.

Мікола, прысеўшы на калена каля дзвярэй, шчэ амаль дзве гадзіны назіраў праз дзірку замочнай скважыны, як гэтыя дзве істоты то пад святлом пражэктара, то на неасветленай тэрыторыі гаспадарчага двора арцелі шнyралі ў пошуках любой здабычы. Больш вынюхвала і аглядвала тэрыторыю меншая, напэўна самка. Большы, гэткі сапраўдны самец, ходзячы на адлегласці, пільна назіраў за наваколлем, варочаў па баках галавой, час ад часу вышчэрваючы з рыканнем сваю страшэнную зубаста-клыкастую пастку.

З пачатку світання, у чатыры гадзіны раніцы загрукатала тэхніка на распрацоўцы кар'еру. Праз дзірку ў дзвярах замочнай скважыны Мікола ўбачыў, як гэтыя дзве сібірскія істоты, бадзяючыяся па гаспадарчым двары, на кароткі тэрмін застылі ў нерухомасці, выскаліўшы незадаволена-пагрозліва свае клыкі, а потым моўчкі падаліся за вагончыкам такарнай майстэрні, адкуль і з'явіліся дзве гадзіны таму, у тайгу. Крыху супакоіўшыся, не адчыняючы адразу дзвярэй уваходу, прысеўшы на табурэт, час ад часу назіраючы за гаспадарчым дваром праз дзірку замочнай скважыны, у палове пятага раніцы заўважыўшы з'явіўшагася на тэрыторыі галоўнага механіка Кірылавіча, Мікола адчыніў нарэшце засаўку і выйшаў з бытоўкі.

3.

– Гэй, Кірылавіч, гэй, – Мікола аклікнуў таго.

Не заўважыўшы Міколу на працоўным месцы, Кірылавіч накіраваўся было ўлева да сцежкі, што вяла праз тайгу да кар'еру.

– Мікола, а што так, праца не завершана і не працуеш? – набліжаючыся насустрач да аклікнуўшага яго зваршчыка, зразу-



меўшы па выразу твару таго, што ўначы штосьці здарылася неардынарнае, болей нічога пакуль не кажучы, не распытваючы, Кірылавіч падаў руку на прывітанне.

– І што гэта вы, Кірылавіч, вывялі ў начы мяне аднаго рамантаваць такую разваліну (працаўнік паказаў рукой на вагончык), цяпер вязіце мяне да бабкі-шаптухі якой, – Мікола далонямі строс са шчокаў выступаючыя слёзы.

– Да якой бабкі, Мікола, ну, што ты тут выдумляеш? – Кірылавіч, не ўцямліваючы, да чаго вядзецца такая размова, крыху разгублена агледзеў гаспадарчы двор, заўважыў адчыненыя дзверы бытоўкі і спытаў:

– Ну, дык што тут адбылося ўначы? Распавядай, толькі супакойся, толькі не хвалюйся.

– Ды мяне тут у дзве гадзіны ночы ледзь не схавалі сібірскія ваўкі.

– Якія сібірскія ваўкі? – здзіўлена спытаў Кірылавіч, які ўсё жыццё пражыў у Краснаярскім краі і пра такіх ваўкоў ніколі тут не чуў.

– Ну, такія во, чорныя, з мордай лісіцы, во такіх во памераў, – Мікола, жэсцікулюючы рукамі ў паветры, паказаў прыкладны памер тых звяроў, змахнуўшы долонямі з твару нанава выступіўшыя слёзы. Потым, крыху супакоіўшыся, працагваў:

– Вязіце мяне да бабкі якой, я спужаўся, дзве гадзіны хаваўся вунь у бытоўцы, назіраючы за тымі чорнымі пачварамі. Вязіце мяне да бабкі.

– Мікола, ды кінь ты, гэта ж Краснаярскі край. Ад нашай базы да бліжэйшага паселішча – трыста кіламетраў, – Кірылавіч, зразумеўшы, што гэта за сібірскія чорныя ваўкі, распавёў:

– Мікола, чорныя, як ты кажаш, з лісінай мордай – гэта не ваўкі сібірскія, гэта расамахі.

– Як, як кажаце, расамахі? – Мікола, затупаўшы на месцы з нагі на нагу, разгублена паглядзеў у бок такарнай майстэрні

на тайгу, адкуль тыя расамахі з’явіліся ды потым зніклі там жа, затым рэзка заявіў:

– Так Кірылавіч, болей у начную змену мяне не выводзьце на працу. Ці аднога, ці з памочнікам якім, я не пайду. Зблатавалі мяне сюды, прыязджай, грошай заробіш. Тут мо хутчэй во якія пачвары з’ядуць цябе, чым грошы тыя атрымаеш. У начную не пайду, годзе.

– Мікола, ды тут табе абварваць шчэ шмат працы. Мы табе стрэльбу дадзім, аднастволку, – спрабуючы супакоіць хлопца, Кірылавіч пахлопаў таго па плячы, – гэтыя, як ты кажаш, сібірскія ваўкі, мабыць, галодныя былі, таму бадзяліся ў нас па наваколлю ў пошуку чым-небудзь падсілкавацца. Не знайшоўшы нічога, яны болей сюды не зойдуць, яны ў пошуку, ужо дзесьці далёка. Тэхніку я падганю назаўтра раніцай, каб бытоўку гэту да месца затраляваць. Шчэ адна начная змена, і ты ўсё даварыш, і пойдзеш працаваць, дзе й працаваў, на сваё месца.

Мікола, развважаючы, патупаў на месцы, шчэ раз глянуўшы на тайгу – туды, адкуль расамахі з’явіліся ды потым праз дзве гадзіны зніклі. Затым ён сцішана прамовіў.

– Не, Кірылавіч, ведаю я пра вашу стрэльбу. Яна, калі што, мяне не ўратуе, толькі раз’юшыць тых пачвараў і тады мне сапраўды крышка. Давайце так, да заканчэння змены, да васьмі гадзін звару па максімуму, а там, зноўку у начную працаваць не выйду.

4.

– Чаго вы так рагочаце ўсе, што ажно пузы ў вас ірвуцца ад напругі? Дванаццаць гадзін дня, адпачываць пасля начной змены патрэбна, пабудзілі во сваім рогатам, – абураўся Мікола прачнуўшыся ад таго, што дваццаць два хлопцы, адпачываючы ў пакоі пасля начной змены, усеагульным гучным рогатам пабудзілі яго, – чаго вы ўсе рагочаце?

– Га-га-га. Га-га-га! – чарговая хваля ўсеагульнага рогату, пакаціўшыся, уздрыганула абмежаваную прастору пакоя.

– Мікола, а што табе зараз прыснілася, – спытаў скрозь смех, крыху зладзіўшы з эмацыянальнасцю, адзін з малойцаў.

– Мне снілася, ды ваўкі сібірскія, ліха іх бяры. Быццам зноў прыйшлі, во блін, – Мікола, падкінуўшы падушку да спінкі ложка, крыху прыўзняўшыся, прысеў, прыхіліўшыся да яе спіной.

– Мікола, то ты жа нас і пабудзіў усіх завыўшы ў сне па-ваўчынаму, – распавёў усё той жа хлопец і, смяючыся, спытаў, –Мікола, а як яны табе тыя сібірскія ваўкі прысніліся? Распавядзі нам, Мікола.

Усе хлопцы прыціхлі, з зацікаўленасцю паглядаючы на Міколу, у спадзяванні пачуць цікавы роспавед.

– Як прысніліся, вось так і прысніліся. Даварваю, значыць, рамантую ў начы я тую развáліну-бытоўку, што з кар'еру прыцягнулі, і так на маю бяду, ды час ад часу наўкола пагдядаю, назіраючы за наваколлем, асветленую пражэктарам. Як і ў мінулай начы, у дзве гадзіны падымаю зварачную маску. Паглядзеў на такарную майстэрню: няма, ніхто не з'явіўся. Хацеў было далей варыць, ды перавёў погляд у бок пражэктара і жахнуўся. Стаіць перада мной у метрах дзесяці яна, тая самая, а сябра яе крыху позаду, справа ад яе, збоку, значыць, бытоўкі як бы адхон мне перакрывае. Ну, думаю сабе, канец мне. Што рабіць? – Мікола, развеўшы рукамі па баках, замоўк у задуменні.

– Ну, а далей што, Мікола, ну, а далей? – спытаў усё той жа хлопец.

– Далей, – Мікола прызадумаўся,– далей гэта падла і кажа мне чалавечым голасам, – Мікола, прыўзняўшы правую руку матлянуў далонню, – і кажа мне: «Мікола, ты сягоння наш, адыход табе перакрыты, сягоння не захаваешся ад нас. Мы наўмысна з боку пражэктара да цябе падыйшлі, каб ты не заўважыў нас, ён цябе асляпляе». І гэтая сібірская расамаха, вышчэрыўшы

сваю зубаста-клыкастую пастку, з рычэннем паволі пачала падбірацца да мяне, – Мікола ўвайшоў у кураж расповеду, седзячы на ложку спіной, абапёршыся на падушку і заграбаў у паветры перад сабой рукамі, дэманструючы пачатак руху расамахі.

– Ну, а ты што, Мікола? – спытаў хтосьці з хлопцаў.

– А я што, каля мяне труба ляжала, дваццаць пятая, даўжынёй метра тры. Ухапіў трубу тую абедзвюма рукамі і як тая пачвара наблізілася да мяне правым бокам болей, то я ў бачыну яе дзяўбаць пачаў, у бачыну, – Мікола дэманстратыўна, па-акторску выставіў перад сабою абедзве рукі, правую далонню ўніз, левую ўверх, нібыта трымаючы тую трубу і два разы матлянуў імі ўперад. Хлопцы зарагаталі.

– Ну, а далей, Мікола, далей, – зноў запытаўся хтосьці, тым самым падбадзёрваючы Міколу працягваць свой расповед.

– Тая павярнулася на сто восемдзесят градусаў ды, набліжаючыся да мяне левым бокам, вышчэрыла зубы сваёй страшэннай чарнай пасткі, а кавалер яе з боку бытоўкі вышчэрваецца, што лявей за мяне. Я прыладзіўся, піхануўшы падлу ў бок, узняў трубу ды з замаху як рэзануў ёй па спіне. Узрычэла падла, адскочыла, управа ад мяне рухаецца, спіну выпраўляе ды рычыць, вышчэрываючы зубы. Заўважаю, што кампаньён яе, дужа азвярэўшы, пачаў рухацца на мяне з боку бытоўкі, а гэта пачварына, адыйшоўшы ад болю, бярэ правей і таксама на мяне.

– А далей, далей Мікола, – нехта са смяяўшыхся хлопцаў падкінуў яшчэ жарку.

– А далей мне і падумалася, з дзвюма не справіцца, уцякаць няма куды. Мне адно ўратаванне, як мага грамчэй завыць па-ваўчынаму – магчыма, ваўкоў гэтыя пачвары пабойваюцца.

– І што ты, завыў, Мікола, – хлопец з суседняга ложка, спытаўшы, ўтыкнуўся тварам у падушку. Стрымліваючы рогат, прыціхлі і астатнія хлопцы.

– Завыў, як той Маўглі з мульціка, куды падзенешся, калі цябе гэтак прыпруць такія вось пачвары.

– А як? – скрозь смех спытаў хлопец з суседняга ложка. Астатнія ў надыходзе фіналу ад расповеду Міколы ледзь стрымлівалі сябе, каб не ўзарвацца ўсеагульнай хваляй рогату.

– Ды, вось так, – Мікола, седзячы на ложку, выпраміў спіну, выцягнуў перад сабой абедзве рукі, нібыта трымаючы тую трубу, узвыў, што меў моцы, па-воўчы, – ву-уў-уў-у, ву-уў-уў-у, ву-уў-уў-у.

Ад ахапіўшага пакой рогату ўсе хлопцы, што адпачывалі пасля начной змены, ажно заходзіліся, лежачы на сваіх ложках, ледзь не рвалі жываты.

5.

Ад рэзка адчыненых ў пакой дзвярэй, што груклулі дужа гучна аб сцяну, на імгненне ўсе прыціхлі. З вылупленымі вачыма і выразам моцнага здзіўлення на твары ў пакой увайшоў Кірылавіч.

– Хлопцы, што тут у вас адбываецца, чаму стаіць такі ўсеагульны рогат, чаго не адпачываецца пасля начной змены? – заўважыўшы Міколу, седзячага на ложку з выстаўленымі перад сабой рукамі, ён зразумеў, ад каго гэты рогат сыходзіць. Кірылавіч толькі і паспеў да таго звярнуцца, сказаўшы толькі адно слова «Мікола», і чарговая хваля ўсеагульнага рогату зноў ускалыхнула пакой з дапаўненнем гучнага барытона Міколы.

Кірылавіч толькі і матлянуў па баках галавой, і на ягоным твары з’явілася ветлівая ўсмешка.

# За зацяненнем Поўначы

*Аповесць*

1.

Хуценька давай збірайся, праз паўгадзіны пасля вячэры адпраўка УАЗікам да горада. Назаўтра з раніцы кудысьці верталётам на нейкую раку Чону, што мяжуе Якуцію з Іркуцкай вобласцю, аб існаванні якой нават і не чуў. Чагосьці болей непатрэбнага менавіта зараз Фёдару і не ўяўлялася. Першы намеснік боса асабіста падбіраў кандыдатаў па запатрабаваных спецыяльнасцях з разлікам на тое, што там, у абмежаванай тайгой прасторы, дванаццаць чалавек здолеюцуь бесканфліктна, без высвятлення адносінаў паміж сабой у дакладны тэрмін выканаць даручаную працу.

«І трэба ж было мне падацца заму боса гэткай бесканфліктнай асобай, што і я патрапіў туды,» – Фёдар у думках шаптаў сабе, утаймоўваючы сваю раздражнёнасць. Збіраючы рэчы ў сумку, час ад часу як бы незнарок паглядаў ўбок збіраўшага свае пажыткі праз два ложкі незнаёмца, будучага таварыша па працы, адабранага таксама туды, Фёдар падумаў, што не тыя ты, братка, чытаеш кніжкі, прыкмеціўшы раздражненыя погляды мужчыны ў свой бок. Магчыма, мала блукаў яшчэ па свеце і не разумееш, што паміж людзьмі, акрамя розных там зносінаў ды адносінаў, існуе такая з'ява, як нясумяшчальнасць па знешняму выгляду. Калі хоць адзін з такіх нясумяшчальных разумее аб існаванні гэтакай з'явы, то і працэс псіхалагічнага дыскамфорту праходзіць амаль без напругі ў адносінах.

За часы блуканняў па свеце ў пошуку якойсьці сваёй ісціны ды заробку грошай, у Фёдара ўжо меўся свой напрацаваны безатказны варыянт. Звычайна апанент па знешняй нясумяшчальнасці, каб неяк разабрацца ў сваім псіхалагічным дыскамфорце, пачынаючы падкідваць кпіны, натыкаецца на непрабіўную заслону, асаджваючую на сваё месца сэнсам таго, што часам за вытанчанаю дасціпнасцю праглядваецца пашыраная вузкалобасць. Дзейнічае безатказна, як аўтамат Калашнікава, выкліка-

ючы ў апанента жаданне хутчэй рэціравацца. Склаўшы рэчы ў сумку, як бы незнарок глянуўшы ў бок збіраючага пажыткі незнаёмца і заўважыўшы ў поглядзе таго неўтаймаваную псіхалагічную ўзбуджанасць, адвёўшы погляд на працуючы тэлевізар, Фёдар заўсміхаўся.

– Дзядзя Фёдар, а дзядзя Фёдар, ты як бы і задаволены, што зматваешся адсюль. І з кім жа я надалей буду ганачкі майстраваць, – таварыш па працы, з якім Фёдар па прыбыццю на вахту майстраваў ганкі новых карпусоў дзіцячага лагеру адпачынку прысеў на табурэт каля тумбачкі пры ложку, на які на дорожку Фёдар прылёг адпачыць, звесіўшы ногі на падлогу і заклаўшы рукі пад галаву на падушцы.

– А ты, Колька, жартаўнік, – Фёдар, кінуўшы погляд на прысеўшага на табурэт сябра, пачасаў далонню правай рукі патыліцу, – толькі вось збіраюся, а напраг які, – абодва зарагаталі, хлопцы, што пасля вячэры сабраліся ў пакоі, паглядалі на іх, як на дзівакоў.

– Так, братка, так, я прыкмеціў. Як чуткі ідуць, то вас туды бесканфліктных адабралі, – Колька паглядзеў у бок адбываючага з Фёдарам незнаёмца, што, складваючы пажыткі, неадэкватна круціў галавой па баках, прыкмячаючы, як на яго паглядаюць астатнія, якім да яго не маецца аніякай справы.

– Ну, ты там, дзядзя Фёдар, трымайся, стрымлівай сябе, – Колька не ўнімаўся, – а ўсё таму, што ведаю цябе па папярэдняй працы з табой на вахтах, тваю вытрымку і ступень узроўню зрыву. Дзядзя Фёдар, стрымлівай сябе.

– Так, шкада, Колька што тэрмін тваёй вахты праз месяц заканчваецца, а то бы мы там удваіх надвор’е трымалі, бы ў сваіх руках, на патрэбным нам накірунку.

– Так, вопыт ў нас з табой, дзядзя Фёдар, багаты, – Колька паглядзеў на задумліва гледзячага ў столь таварыша, заўсміхаўся, – вам жа сказалі, што на дзесяць дзён, як вернешся, распавядзеш.

– Якія гэта будуць дзесяць дзён, ты і сам разумееш. Набралі з апошняй вахты, лічы, усіх ды крыху з папярэдняй, што дзвюма тыднямі раней прыбыла, – Фёдар, не аднімаючы рук з-пад галавы, зрабіў напраг прэсам, узняўся, прысеў на ложку, паклаўшы далоні рук на калені, і пaглядзеў на гадзіннік на левай руцэ, – праз хвіліны тры УАЗік пабібібкае, і лічы, што, дзядзя Коля, – Фёдар з націскам выразна назваў таварыша дадаў, – гэтая мая адысея працягнецца да заканчэння маёй вахты. Казку, дзядзя Коля, я табе паведамлю ўжо на наступнай, калі сустрэнемся.




*САХА-ЯКУЦІЯ,*
*г. Мірны*

2.

Даставіўшы чатырох адабраных працаўнікоў, што назаўтра выправяцца верталётам у невядомасць, у горад да інтэрната вадзіцель пагнаў УАЗік на базу да месца дыслакацыі тэхнікі. Шныр, начны дзяжурны, у чые абавязкі ўваходзіла зрабіць пе-

раклічку працаўнікоў перад адбоем па пакоях, дзе тыя пражываюць, удакладніў наяўнасць захварэлых, давёў да працаўнікоў пра змены па месцам працы на наступны дзень, правёўшы траіх хлопцаў у пакой на першым паверсе, паказаўшы ім тым свабодныя ложкі, паклікаў Фёдара за сабой на другі паверх.

– Вось тут, – шныр паказаў на дзверы пакоя з калідору насупраць лесвіцы, – як зойдзеш, адразу ўправа – свабодны ложак, размяшчайся, адпачывай. Толькі ціхенька, бо хлопцы ўжо спяць, назаўтра ім на працу.

Шныр, сыйшоўшы на тры прыступкі ўніз, прыпыніўся, павярнуў галаву і звярнуўся да Фёдара

– Калі папаліць цыгарэту, то сыйдзі па лесвіцы на першы паверх па калідоры ўправа, потым налева. На зіму адведзены асобны пакой. Красавік ужо, а тут маразы яшчэ ціснуць за дваццаць градусаў.

Увайшоўшы ў пакой папаліць цыгарэту, Фёдар прыладзіўся на драўляную лаву за дзвярыма ўваходу ўлева ўздоўж сцяны. Насупраць дзвярэй каля вакна трое паліўшых тытунь хлопцаў, размаўляючы між сабой, чамусьці прыцішылі гаворку. Як бы незнарок, акінуўшы тых поглядам, запаліўшы цыгарэту, адчуўшы агульную стомленасць, Фёдар у думках адзначыў, што выпаліць толькі адну, і трэба ісці адпачываць.

– Ты назаўтра з намі? – Фёдар, ленавата павярнуўшы галаву крыху ўлева, зразумеў, што да яго звяртаецца па ўзросце старэйшы з траіх, седзячы злева ад таварышаў сярэдняга целаскладу мужчына з завіхастым выразам твару, з непадпітай са знешняга выгляду фізіяноміяй, але гэта толькі таму, што ў гэтай установе ўжываць спіртныя напоі пад час працы катэгарычна забаронена. Фёдар спытаў:

– Куды гэта з вамі?

– Заўтра на Чону, з намі? – зноў спытаў завіхасты.

Фёдар, зацягнуўшыся цыгарэтай, стомлена нетаропка выдыхаючы дым тытуню, абыякава глянуў на будучых таварышаў

па працы, што чамусьці, ўпершыню ўбачыўшы яго, напружылі твары і поглядамі вачэй засяродзілі на ім увагу, прыпыніўшы сваю гаворку.

– Заўтра, на Чону, – Фёдар, каротка зацягнуўшыся, выдыхаючы дым тытуню, дадаў, – з вамі.

Завіхасты, узбуджана ўскочыўшы, нярвова кінуў недапаленую незатушаную цыгарэту ў вядро, прыладкаванае пад попельніцу пасярод пакоя, і падаўся спрытна да дзвярэй на выхад. Двое яго маладзейшых таварышаў драбнейшага целаскладу яшчэ не з такімі прапітымі фізіяноміямі, ускочыўшы з месца пакідаўшы, як бы хвалюючыся, у попельніцу незатушаныя цыгарэты, зніклі следам за дзвярыма налева па калідоры.

«То ж мне, пыжы знайшліся, – заўсміхаўся ў думках Фёдар, запаліўшы яшчэ адну цыгарэту. – Мне жа з вамі, урэшце-рэшт, усяго толькі давядзецца нейкі тэрмін разам папрацаваць. Разам папрацаваць – гэта ж не пагуляць выбрацца ў рэстаран…»

3.

За гадзіну сорак хвілін палёту ў чэраве грузапасажырскага верталёта МІ-8 Фёдар, спрабуючы закімарыць, калі-нікалі павяртаў погляд да ілюмінатара, углядаўся ў заснежаныя ўнізе краявіды тайгі, скаваныя прыродай на зімовы перыяд маразамі. Не прыкмеціў ён з вышыні палёту нідзе вынікаў жыццядзейнасці чалавека і быў уражаны некранутасцю дзікай прыроды, прыцягальнасцю і



*Аўтар Валеры Скакун, п. Арылах. САХА-ЯКУЦІЯ*

адштурхоўваючай сіле невядомасці. Пасля ўзніклага жадання на нейкі тэрмін апынуцца там, пабыць адзін на адзін са створанымі тысячагоддзямі таёжнымі ландшафтамі, да мазгоў костак адчуць сябе дзіцём прыроды, на імгненне ахопліваў жах. Як выжыць аднаму ў прыцягальна-чаруючай невядомасці даўніны вякоў?

Для працуючых у таёжнай цішы, адасоблена ад свету, людзей прыбыццё верталёта – заўсёды падзея. Па месцы прызначэння на верталётнай пляцоўцы прыбыўшых сустракалі ўсе, хто ў дадзены момант знаходзіўся ў гэтым прыгожым, маляўнічым месцы: заўгаспадаркі, брыгадзір, повар, трое працаўнікоў ды механік-генератаршчык. Пасля спынення вінтоў хлопцы, выносячы свае рэчы з верталёта і прыбыўшыя прадукты харчавання, працоўны інструмент, складваючы ўсё гэта на пляцоўку, круцілі наўкола галовамі, пазіраючы, куды патрапілі. Навакольныя маляўнічыя краявіды ўзбадзёрвалі, уздымалі настрой. Прыбыўшыя верталетам першы нам. боса, прараб, павітаўшыся з заўгаспадаркай ды брыгадзірам, пацягнуліся разам з тымі, размаўляючы між сабой, да так званага гасцявога дома, што метрах у васьмідзесяці ад верталётнай пляцоўкі, паклікаўшы за сабой трох сустрэўшых верталёт працаўнікоў. Прыпыніўшыся каля рэшткаў згарэлай лазні, як было зразумела назіраўшым з боку верталётнай пляцоўкі, пачалі разборку палётаў. Хлопцы гуртом у дванаццаць чалавек, сустрэўшы іх повар ды механік-генератаршчык запалілі па цыгарэце, каб перачакаць, пакуль не вельмі прыемныя высвятленні перакінуцца ў пабудову гасцявога дома.

4.

Поўдзень Якуціі, на тым беразе ракі Чона на тэрыторыі Іркуцкай вобласці бераг палогі. Тайга, адступіўшы ад берага метраў на дваццаць-трыццаць, густа паросшая невялікімі бярозкамі ды хмызняком. Рака Чона на даляглядзе з правага павароту па цячэнню, прыкладна з кіламетр адлегласці выходзячы



*Верталёт над таёжнай прасторай*

перпендыкулярна крутога высокага берага, абжытога месца, паварочвае ўлева на дзевяноста градусаў і доўжыцца метраў на семсот правым высокім, пятнаццаць-дваццаць метраў, Якуцкім берагам, паросшым да абрыву тайгой і левым палогім Іркуцкай вобласці. Затым, робіць паварот улева амаль на дзевяноста градусаў праз кіламетар паварочвае абодвума палогімі берагамі управа і знікае з відавоку на даляглядзе тайгі.

Паліўшыя цыгарэты каля верталётнай пляцоўкі хлопцы, размаўляючы між сабой, аглядалі навакольныя краявіды, выказваючы ўслых свае ўражанні. Верталётная пляцоўка знаходзілася на распрацаваным участку тайгі метраў васьмідзесяці ўшырку, цягнуўшымся ўздоўж берага метраў на сто-сто дваццаць. Па хадзе ад верталётнай пляцоўкі, метрах у васьмідзесяці, перад пабудовай гасцявога дома, знаходзілася тая самая прычына засылкі працоўнага дэсанту, – пабудова згарэўшай лазні. Неўзабаве двое хлопцаў, што пакліканы былі на разборкі, накіраваліся

да верталёта. Нам. боса, заўгас, прараб, брыгадзір ды адзін з траіх, працаваўшых тут, накіраваліся да гасцявога дома. Адзін за адным па прыступках узняўшыся на ганак, праз дзверы уваходу знікалі з відавоку.

– Што тут атрымалася, з якой гэта прычыны згарэла лазня, ды так што і не адрамантаваць яе? Толькі і засталося, што парацягаць галавешкі ды нанова адбудаваць, – звярнуўся завіхасты Віцёк да двух хлопцаў, падыйшоўшых да верталётнай пляцоўкі.

– Хлопцы, ды часу мала, давай перанясём рэчы вашы, прыпасы, – шыракаплечы мужчына, гадоў сорак узростам, росту вышэй сярэдняга, дзябёлага целаскладу, ухваціўшы каробку з прадуктамі харчавання, накіраваўся да гасцявога дома, узяўшы крыху правей да раслін тайгі, – мы дэмбелі, верталёт хутка адляціць, і мы з ім. Зараз разборка палётаў закончыцца, і той як з’явіцца, наш таварыш, то калі вам будзе цікава, няхай ён вам і распавядзе, што ён тут утварыў.

Прайшоўшы ўздоўж згарэлай лазні ды пабудовы дома, звярнуўшы крыху ўправа праз расліны тайгі, семдзесят метраў пратарабаніўшы свае ношы, хлопцы прыпыніліся каля дзвух добраўпарадкаваных балкоў. Адпачываючы, запалілі па цыгарэце.

– Гэта вось балок для пражывання, а той, – Мішка-повар паказаў, правай рукой трымаючы запаленую цыгарэту, – там ў нас кухня ды сталовая.

– Вы чаго сюды прыбылі, працу выконваць, што патрабуецца, за што і грошы атрымаеце, альбо выстаўляць выпяндрос тут свой адзін перад адным, – брыгадзір Мікалаевіч, які пятнаццаць гадоў запар працаваў ужо па вахтах, пабачыў за сваё брыгадзірства усялякага featureзнага кантынгенту, назіраючы чацверты дзень, як працуюць новапрыбыўшыя, прыглядзеўшыся да раскладу ў адносінах паміж працаўнікамі, узяўся непасрэдна за свае абавязкі.

– З заўтрашняга дня альбо пачынаеце працаваць, як патрэбна, альбо будуць прыняты адпаведныя меры па замене вас

іншымі. Кожны вечар з базай па рацыі я на сувязі, – Мікалаевіч, стоячы паміж будынкам дома і згарэўшай лазні, рухаўся ўздоўж сцяны метраў пяць туды-сюды, пакачваючы галавой, паглядаючы на працаваўшых хлопцаў, з-пад ілба даводзіў, карэктыруючы, пастаўленую задачу, – тэрміны падціскаюць, праз месяц лазня павінна стаяць вунь там, у поўнай баявой гатоўнасці, – Мікалаевіч паказаў правай рукой на месца перад верталётнай пляцоўкай лявей адносна дома, – вунь за бярозкамі – пляцоўка. Віцёк, з заўтрашняга дня забіраеш з сабой палову людзей, снегу няшмат, праб'еце дарогу газонам пяцьдзесяттройкай, падцягнеце бярвенні вунь, што за верталётнай пляцоўкай, да месца будучай лазні. Астатнім назаўтра закончыць разбіраць гэтыя абгарэлыя галавешкі, потым там, за бярозкамі, распрацаваць пляцоўку і перацягнуць адсюль гэты вось лафет з трубаў, на якім лазня стаяла, і там на ім пабудуецца новая.

– А чаму на лафеце, Мікалаевіч? – звярнуўся да брыгадзіра малады, высокага росту хударлявы хлопец.

– А таму, братка, што ты тут напэўна па першым разе і не ведаеш, што тут адвечная мерзлата і ўсё будуецца не на фундаментах, а на сваях альбо на лафетах, як гэта наша лазня на лафеце з трубы дыяметрам чатырыста дваццаць шэсць міліметраў.

5.

Канец красавіка, і на поўдні Якуціі адчувалася па надвор'і, што ўжо вясна. Удзень пад сонцам снег падтайваў, і тыя з хлопцаў, што захапляліся зімовай рыбалкай, увечары пасля працы імкнуліся хоць крыху ды пабавіць час за сваім хобі. Прабурваючы лёдабурам на замерзшай рацэ лункі, вудзілі шчупакоў даўжынёй па шэсцьдзесят-восемдзесят сантыметраў. Калінікалі даводзілася пашыраць лункі, разбіваючы лёд ломікам, каб здолець выцягнуць патрапіўшую на снасць вялікую рыбіну. Акрамя шчупакоў добра вудзіліся плотка ды мянтуз, што таксама былі ўнушальных памераў.

Тыя хлопцы, што не захапляліся бавіць вольны ад працы час за гэтым заняткам, з зацікаўленасцю назіралі за рыбакамі, калі тыя, выклаўшы свой улоў на кухні ў розныя тазікі ды вялізныя міскі, выдзеленыя ім поварам Мішкай, спрачаліся між сабой, мераючы рыбін рулеткай ды ўзважваючы іх на шалях. Гэткія спрэчкі часам даходзілі да, збоку назіраючы, смешных высвятленняў адносінаў паміж рыбакамі-заўзятарамі, што безумоўна накладвала свой адбітак і на адносіны па абавязках працы.

– Так, зараз стану вось тут, каля вас і буду дзень тут побач стаяць, і тады не тое, што папаліць цыгарэтку, а наогул спіны за дзень не расправіце, – Мікалаевіч, падыйшоўшы да звяна, што пасля разборкі спаленай лазні, займаліся распрацоўкай пляцоўкі для пабудовы новай, дастаў лісток паперы са спісам працуючых, – трэба бліжэй пазнаёміцца, прозвішчы ведаць, хто тут ёсць хто. Называю па прозвішчу, дакладна даводзіце мне, па якой спецыяльнасці прыняты на працу. Мне патрэбна ведаць, што каму даручаць выконваць.

Падцягнуўшы чарговае бервяно ГАЗонам з заместа кузава прыладкаваным кунгам, Віцёк, быўшы за рулём аўто, вылазячы з кабіны, падышоў да Мікалаевіча.

– Мікалаевіч, сягоння да вечара перацягнем астатнія бярвенні. Чым потым займацца?

– Віцёк, назаўтра з раніцы перацягнем лафет сюды, – Мікалаевіч паказаў рукой на месца распроцоўкі пад новую лазню, – вось за гэты радок бярозак, што ад верталётнай пляцоўкі ўздоўж дарожкі з насціла з дошак. Выставім, і за працу, трэба пасяшацца, бо тэрміну няшмат, – Мікалаевіч, глянуў за верталётную пляцоўку, дзе хлопцы рыхтавалі чарговае бервяно дзеля трылёўкі, звярнуўся да Віцька, – адзін з тваіх – з табой, паклікай астатніх чацвёра, трэба знаёміцца бліжэй з усімі і растлумачыць далейшыя задачы.

Віцёк завіхаста свіснуўшы, нібыта салавей-разбойнік, даючы сваім хлапцам знак рукой, прайшоў агледзець пляцоўку пад рапрацоўку.

– Будзем назаўтра, значыць, лафет цягнуць адтуль, – Віцёк паказаў на будынак гасцявога дома, – значыць вось гэта, што накідалі сюды пры распрацоўцы, патрэбна адкінуць па баках і на выездзе, – Віцёк паказаў на процілеглы бок, – таксама ўсё па баках адкінуць, каб потым вунь паміж тымі бярозкамі газон прайшоў, бо тут не развярнуцца.

Па наезджанай ГАЗонам дарозе да гурта падышлі чатыры працаўніка з Віцьковага звяна.

– Так хлопцы, усе сабраліся. Зараз па спісе ўдакладнім, хто ёсць хто для далейшага раскладу, – на прозвішчы Драгожын Мікалаевіч прыпыніўся, – як вас, Ярослаў Філіпавіч?

– Якаў Філімонавіч, – Драгожын стаяў, абапёршыся на шуфель, а тут затупаў на месцы

– Якаў Філімонавіч, шуфель – гэта працоўны інвентар, і ім, вядома, шуфляваць патрэбна, – Мікалаевіч, нахіліўшы галаву з-пад ілба паглядзеў на затупаўшага на месцы Драгожына, – як я заўважаю, вы з шуфлём у руках час працы болей праводзіце за нейкімі размовамі. Тут, братка, – Мікалаевіч, павёўшы галавой па баках, агледзеўшы ўсіх сабраўшыхся, распавёў, – тут, чым болей нашуфлюеш, тым болей і грошай заробіш. Крылаты выраз: хто балбоча, той і мае – тут не праходзіць.

Скончыўшы пераклічку, удакладняючы, якое чыё прозвішча ды якія па раскладзе спецыяльнасці, Мікалаевіч звярнуўся да электрыка:

– Так, фаза, пасля абеду бяры з сабой Андруху і там у генератарнай, – Мікалаевіч паказаў правай рукой на невялікую пабудову, дзе змайстраваны два фінскай і адзін расійскай вытворчасці дызельгенератары, – ёсць цыркулярны станок. Прыцягніце яго сюды, падключыце кабель, з заўтрашняга дня ён спатрэбіцца. Назаўтра ў першай палове дня прыбудзе верталёт з прарабам і дошкамі на борце. Дошкі трэба будзе габляваць, заўтра давяду, хто гэтым зоймецца. Сягоння да вечара задача максімум павінна быць выканана – кожным звяном свая, – Мікалаевіч глянуў на

гадзіннік, – усё, рыхтуйцеся да абеду, па паху з боку кухні адчуваецца, што сягоння Мішаня-повар штосьці смачнае прыгатаваў.

6.

– Філімонавіч, ну, ты цалкам, на маю думку, настолькі сэксуальна заклапочаны, што я не ведаю, што табе і параіць, – Фёдар абураўся, калі працавалі на распрацоўцы пляцоўкі пад лазню, – ты гавары і шуфлюй адначасова, шуфлюй, бо кожным кідком цэнты капаюць. І што ў цябе за звычка такая, гэтыя твае дотыкі рукой да суразмоўцы, цябе пачуюць і на адлегласці.

– Ды, я не заклапочаны, але, думкі розныя находзяць, разумееш, – Філімонавіч, прыпыніўшы працу, трымаючы перад сабой шуфель левай рукой, правай датыкнуўся да левага пляча працаваўшага побач Фёдара, – з мінулай вахты як прыбыў дадому, то мяне неяк па-асабліваму сустрэлі, таму эмацыянальна-узбуджаны.

Фёдар, падчышчаўшы на пляцоўцы снег, адкідываючы той на бруствер, незнарок глянуў у бок пабудовы дома і заўважыў, што Мікалаевіч, уладкаваўшыся ў драўлянай бяседцы за гасцявым домам, бліжэй да абрывістага берага ракі, паглядаў то на раку, то на працуючых хлопцаў. З такім гаваруном толькі ў непрыемнасці патрапіш. Каб адшыць надакучлівага суразмоўцу, Фёдар спытаў:

– Братка, а ты калі з мінулай вахты прыбыў дадому, ты загадзя патэлефанаваў, паведаміў прыкладна, у які тэрмін з’явішся, – Фёдар, узняўшы на шуфель глыбу снегу, адкінуў тую за бруствер далей, трымаючы шуфель перад сабой, і заўважыў, як Філімонавіч, унікаючы ў сэнс ягонага выразу, расслабіўся знешнім выглядам, напрог мазгі.

– Не, ты ведаеш, не паведамляў, – Філімонавіч, нязручна падсунуўшы шуфель пад глыбу снега, спрабуючы адкінуць за бруствер, пры кідку вагануўся наперад ад таго, што пры пад’ёме перад кідком глыба зляцела з шufля долу, – а навошта?

– А на тое яно, так сказаць, што я кожны раз паведамляю прыкладна, у які час прыбуду, і мяне з усіх вахтаў сустракаюць, як і патрэбна, з радасцю, надзеяй і спадзяваннем, – прыпыніўшы працу, вырашыўшы крыху адпачыць, запаліўшы цыгарэту, Фёдар паціху патупаў, цягнуўшы за сабой трымаючы левай рукой шуфель, да процілеглага боку пляцоўкі – туды, дзе патрэбна расчысціць выезд з пляцоўкі ГАЗона пасля ўстаноўкі лафета.

– Што, і цябе дастаў гэты разумнік сваёй філасофіяй? Мне ён учора лапшы на вушы столькі панавешваў, што сягоння я трымаюся далей магчымасці чуць ягоную тую ахінею, – Андруха, малады хлопец, якога Фёдар упершыню ўбачыў у курылцы інтэрната пад час збору вось гэтага працоўнага дэсанта, дастаўшы з кішэні цыгарэту, папрасіў у падышоўшага Фёдара запалкі, – мы ўдвох з табой, Фёдар, да вечара акурат і распрацуем выезд, а хлопцы вунь астатняе ўпарадкаваюць, – Андруха, запаліўшы цыгарэту, паглядзеў у бок ракі, – во глядзі, снег растае, і ўжо там паверх лёду вада набіраецца, хутка лёд пачне ўздымацца, цікава будзе пагледзець.

– Так, цікава, – Фёдар паліў цыгарэту, абапёршыся на шуфель, і паглядзеў у бок дома на бяседку, дзе ўладкаваўся брыгадзір Мікалаевіч, – напачатку, як лёд ўздымецца, пойдуць вялікія крыгі, а потым шуга, ідовішча ўраджвае. Па маладосці на Поўначы працаваў, даводзілася гэта бачыць на рацэ Іжма.

7.

– Аляксандравіч, тут у мяне адзін працаўнік да размоваў занадта ахвочы, ты забяры яго з сабой на базу, – Мікалаевіч паказаў рукой у бок верталётнай пляцоўкі, дзе хлопцы выгружалі з вінтакрылай машыны дастаўленыя дошкі, – вунь, бачыш, ну, прама, як у школе нам даўно калісьці байку чыталі ды пра тое, што ў дошкі не маецца трэцяга канца.

Прараб Аляксандравіч, прыбыўшы верталётам, разхаджваючы з брыгадзірам па тэрыторыі, абмяркоўваў бліжэйшыя



планы правядзення работ, трымаючы папку з паперамі перад сабой, займеў здзіўлены выраз твару.

– Мікалаевіч, ды работы шмат тут, куды забіраць, тэрміны. Ён па спецыяльнасці аддзелачнік-чырвонадрэўшчык, як потым без яго давядзецца…

– Давядзецца, ды без гэтага спяца лепей, чым з ім, – Мікалаевіч не даў дагаварыць Аляксандравічу сваю думку, – пакуль тая аддзелка пачнецца, то ты ж бачыш, што тут патрэбна яшчэ шмат зямлі перашуфляваць ды бярвенняў перацягаць, каб зруб змайстраваць. Ну, ты і сам бачыш, што гэты труцень да такой працы звычкі аніякай не мае. Мужыкі ўсё зробяць, спяцоў тут хапае.

– Так, добра, – разумеючы, што тут, на аб'екце, галоўны брыгадзір, на ім тут уся адказнасць, Аляксандравіч пагадзіўся, – з дошкамі там прыбыў інструмент розны ды краны, вентілі, трэба ў гасцявым доме наладзіць работу душавой, умывальнікаў з усёй сантэхнікай разам. Ёсць тут хто з працаўнікоў тваіх, каб даручыць гэту справу?

– Ёсць, Фёдар, пайшлі падыдзем да верталёта, усё яму там і даручыш, а я там свой расклад давяду.

Падыходзячы да верталётнай пляцоўкі, Мікалаевіч з Аляксандравічам заўважылі выязджаючы з таёжнай дарогі на тэрыторыю ўсюдыход УАЗік на дутых колах.

– Вось і Яўсеевіч з палявання вярнуўся, учора выбраўся, якраз да часу. Астатнія пытанні з ім вырашыш, ён тут заўгаспадаркай, яму лепей ведаць, што яшчэ даставіць сюды патрэбна, – Мікалаевіч накіраваўся да працуючых каля верталёта хлопцаў, пакінуўшы Аляксандравіча сустрэць пад'язджаючага на аўто Яўсеевіча.

– Так, хлопцы, – Мікалаевіч, падыйшоўшы да верталёта МІ-8, заглянуў ў адкрыты ззаду грузапасажырскі салон і прамовіў, – работы няшмат па выгрузцы. Філімонавіч, ты давай збірайся, ідзі, без цябе управяцца, пасля абеду з верталётам ды

прарабам адбываеш на базу. Каб ты на мяне па заканчэнні вахты не крыўдаваў, што мала тут грошай зарабіў, бо тут ты ў мяне са сваёй руплівасцю анічога не заробіш, паспрабуеш там – магчыма, там у цябе атрымаецца.

Філімонавіч стаяў, абапёршыся аб борт верталёта, і паліў цыгарэту, у знак згоды ён матлянуў галавой.

– А ты, Фёдар, – звярнуўся Мікалаевіч, паказваючы рукой на картонную каробку з застаўшыміся дошкамі каля кабіны пілотаў, – пасля выгрузкі вунь тую каробку аднясеш на ганак гасцявога дома, пасля абеду пыдыйдзеш да Яўсеевіча, ён табе давядзе, што патрэбна там адладзіць. Галоўнае, не спяшайся, каб усё было на мазі і без аніякіх на потым пераробак.

– Ну, як, Яўсеевіч, што-небудзь напаляваў? – Мікалаевіч падыйшоў ад верталёта да размаўляючых каля УАЗіка Аляксандравіча ды Яўсеевіча, падаў таму руку, павіталіся.

– Ды, двух зайцоў, бачыш і напаляваў, – Яўсеевіч адчыніў заднюю левую дверцу аўто і паказаў здабычу, – нядрэнна, акурат перад лінькай, футра выдатнае. – Яўсеевіч зачыніў дверцу, – пярнатых яшчэ няма, вось-вось павінны з'явіцца. На тыдні рака ўздымецца, вады поверх лёду ўжо шмат ад растайвання снегу.

Яўсеевіч, невысокага росту хударлявы якут, як падалося Мікалаевічу з Аляксандравічам, уважліва-праніцальна, натхнёна заглядзеўся на раку, нібыта чакаючы яе хуткага вызвалення з лядовага палону. Яно і зразумела, Яўсеевіч – мясцовы жыхар, гэта ягонае, роднае, ад каранёў продкаў.

– Так, Аляксандравіч, з Яўсеевічам пытанні вырашылі, значыць, хадзем да кухні, паабедаем. Мішаня-повар нас чымсьці смачным абяцаў пачаставаць, гатаваў персанальна да твайго прыбыцця, – Мікалаевіч матлянуў рукой у бок кухні, Яўсеевіч ад УАЗіка пашыбаваў да гасцявога дома, прыхапіўшы з сабой дзвух напаляваных зайцоў.

– Сягоння, здаецца, не чацвер, а аўторак, а ў вас, хлопцы, сапраўдны рыбны дзень, – Аляксандравіч, завітаўшы на кухню,

адразу адрэагаваў на прыемны пах з густам прыгатаванай свежай рыбы, – вось гэта шчупакі, гэта тут такія вудзяцца?

– Ды, пасля працы ёсць у нас аматары, хадзілі нашыя хлопцы на раку, лункі бурылі так і вудзілі, – Мішаня-повар, выстаўляючы на стол ежу для Аляксандравіча з Мікалаевічам, паказаў рукой на правы вугал ад дзвярэй, – вунь, Аляксандравіч, шчупакі ў ночвах, нібыта парсюкі, а на абед у нас сягоння – смажаны мянтуз.

– Ну, дзякуй, вялікі дзякуй, сягоння мяне і сапраўды дэлікатэсам пачаставалі, – Аляксандравіч піў гарбату, пазіраючы ў вугал на засоленых у ночвах шчупакоў, сантыметраў па восемдзесят даўжынёй, ды побач ва эмаліраванай місцы крыху меншых памераў трох мянтузаў, звярнуўся да повара, – Мішаня, а там на базе прарабы пыталі, што, можа, я рыбы падвязу. Магчыма, хлопцы вудзяць там?

– Аляксандравіч, no problem, трох шчупакоў ды двух мянтузаў выдзялім. У нас у склепе яшчэ замарожаныя маюцца, – повар паглядзеў на гадзіннік і замітусіўся каля пліты, – надыходзіць хлопцам час абеду.

– Не, замарожанай не трэба, рака хутка адкрыецца ад лёду, тут у Яўсеевіча прылада для вэнджання маецца, – Аляксандравіч засвяціўся, моргаючы вачыма, пазіраючы ў вугал на шчупакоў у ночвах, – потым, па магчымасці, каб крыху вэнджанай туды на базу, прарабам пачаставацца.

–Ты, гэта, наконт вэнджанай з Віцьком тут дамаўляйся, ён ў мяне тут за зама, а па вудзенню рыбы ён галоўны кіраўнік, – Мікалаевіч адкінуўся на спінку стула, левую руку трымаючы на абедзеным стале, паволі махаючы ўзнятай угору правай рукой, распавёў далей, – калі зайцоў тым прарабам патрэбна, то з Яўсеевічам дамовіцца магчыма, альбо наконт дзічы, птушкі хутка з'явяцца, – Мікалаевіч зарагатаў, падкінуўшы жарцік ці то Аляксандравічу, ці то ахвочым тым з базы прарабам.



Аляксандравіч, валодаючы добрым пачуццём гумару, заўсміхаўся, седзячы за сталом насупраць Мікалаевіча, калі піў гарбату.

– Не, Мікалаевіч, зайцоў ды птушак не трэба, толькі, калі магчыма, воблы.

8.

Раніцай трэцяга дня пасля прыбыцця-адбыцця верталёта пасля сняданку, ідучы да месца працы майстраваць далей зруб лазні, хлопцы звярнулі за гасцявым домам управа да берага ракі. Відовішча, што адкрылася чалавечаму воку з высокага берага, уразіла і эмацыянальна абудзіла вялікія пачуцці. З-пад лёду ўзнялася рака, пачаўшы штогадовы веснавы крыгаход. Па ўзнятаму ад раставання снега паверхні ракі Чона, нібыта адкульсьці ды кудысьці, ішлі па вадзе ўніз па цячэнню вялізныя крыгі лёду. На даляглядзе, наперадзе, паволі, нібыта строем, датыка-



*Аўтар Валеры Скакун. Крыгаход на рацэ Чона. САХА-ЯКУЦІЯ*

ючыся адна да адной, перад абжытым месцам паварочываючы ўлева на дзевяноста градусаў, бліжэйшыя да Якуцкага берага крыгі выштурхоўваліся на стромны схон, нібыта імкнучыся прыпыніцца, пакідаючы на беразе адмеціны-рытвіны ад сваёй вагі пад націскам ідучых наступных за імі, спрабуючых зачапіцца за адхон берага, падпіхнутыя наступнымі, ідучымі правым берагам па цячэнню, і плылі далей па рэчышчы ракі, мінаючы адлегласць абжытай тэрыторыі да навідавоку павароту ручва ракі ўлева.

– Мікалаевіч, – Яўсеевіч звярнуўся да брыгадзіра, седзячы разам з тым у бяседцы за гасцявым домам каля берага ракі, назіраючы за крыгаходам, – снег вось сыходзіць, дарога да паляўнічай хаткі пакуль трымаецца, хутка развязе, і пэўны тэрмін, пакуль не падсохне, гразка будзе. Дах там каля коміна падцякаў з восені, выдзялі мне на сягоння каго матлянуцца туды, адрамантаваць.

Мікалаевіч, буркнуўшы, павярнуў галаву управа, пагляддзеўшы на крыху расхваляваны выраз твару Яўсеевіча, седзячага справа ад яго, назіраючы за крыгаходам, абапёршыся спіной аб бяседку, павярнуўшы галаву позіркам на крыгаход, звярнуўся да Яўсеевіча;

– Глядзі, Яўсеевіч, цікавае відовішча. Гэта ж дзесьці неяк вунь тая ўзмасцілася  на дзве крыху меншых памераў, сапраўднае відовішча, глядзі, – Мікалаевіч зірнуў управа на Яўсеевіча, потым на раку, паказваючы далонню правай рукі, – глядзі, узмасцілася жа і вандруе сабе пасярод цячэння ракі да свайго прызначэння, вось дзіва, які цуд, – Мікалаевіч, трымаючы рукі перад сабой ў бяседцы на стале, перавёў погляд  улева на майстраваўшых лазню хлопцаў, – вунь, бяры, Яўсеевіч, Рэйнджэра. Бачыш, вунь, высокі малады ў сцёганай фуфайцы чорнага колеру ды шапачцы спартыўнай чорнай.

– Сярогу.

– Так, Сярогу, я яго Рэйнджэрам клічу, адклікаецца, – Мікалаевіч, павярнуўшы галаву ўправа, глянуў на Яўсеевіча, – ён

усё песеньку сабе напявае пра нейкіх там Рэйнджэраў, – Мікалаевіч засмяяўся, – бачыш во, здаецца, добры хлопец, але неяк сябе паводзіць, што быццам не ведае, да каго прымкнуць тут, ды крыху лянаваты.

– Чаму лянаваты, з Жэнькам вунь маім, генератаршчыкам, абгарэлыя бярвенні лазні ў імгненне парасцягалі, упарадкавалі квадрацыклам, – Яўсеевіч заступіўся за хлопца.

– То гэта ж, Яўсеевіч, маладняк. Што твой Жэнька, што мой Рэйнджэр, ім было цікава з тэхнікай працаваць. Дзе яшчэ ім на такой пагойсаць? – Мікалаевіч, заклаўшы далоні рук за галаву, лянавата зевануўшы, пацягнуўся, – а дзе гэта Жэнька падзеўся? Штосьці ўчора не бачна было, ды і сягоння з раніцы.

– Ды зараз па плану, Мікалаевіч, прафілактычныя работы ў дызельгенератарнай. Там мой Жэнька зараз і займаецца.

9.

Паволі моўчкі дабіраючыся УАЗікам-усюдыходам на вялікіх дутых колах, Яўсеевіч, кіруючы аўто, сачыў за дарогай, што ішла праз нявысокую дробную тайгу. Сярога Рэйнджэр з зацікаўленасцю ўглядаўся у краявіды, што адкрываліся перад ягонымі вачыма, час ад часу варочачы галавою, паглядаў на задняе сядзенне, дзе сярод кускоў металачарапіцы, абрэзкаў дошак, цэменту ды яшчыка з цвікамі, з правага боку стаяў карабін. «Зброя – гэта цікава, зброя – гэта клас!» – думалася Сярогу. Узнікшае жаданне пальнуць захапляла.

– Пад’язджаем, – Яўсеевіч парушыў маўчанне, – на даху снегу ўжо няма. Пакуль, Сярога, будзеш каля коміна ладзіць металачарапіцу, я раствор прыгатую, цэмент з пяском, інструмент неабходны маецца. Прыладзім, прымажам, ды і назад на базу.

– Яўсеевіч, – звярнуўся з пытаннем Сярога, увайшоўшы за тым у пабудову дома, – а чаго гэта тут за прыпасы такія, – Сярога паказаў правай рукой на паліцу на сцяне каля печы, управа ад уваходу, – і цукар тут, і соль, і гарбата. А гэта што? – Сярог,

узяўшы з паліцы папяровы пакет, развярнуўшы, пабачыў, – во, Яўсеевіч, крупы, цікава. Цыгарэты во, запалкі, ды тут лісткі паперы ды алоўкі.

– Усё гэта патрэбна, Сярога, для паляўнічых. Тут, у тайзе і прамыславікі ёсць, і шмат хто выбіраецца сюды на паляванне ў вольны час. У асноўным папутнымі верталётамі прыбываюць, дамаўляюцца аб часе, і верталётам вяртаюцца, напаляваўшыся. Падбіраюць іх апасля геолагавыведка ды вахтавыя брыгады, усё адладжана, – Яўсеевіч, крутануўшыся каля печы, звярнуў увагу на паліцу, – цыгарэт, бачыш, дзве пачкі засталося, а цукару ды гарбаты прыбавілася, цыгарэт было сем пачак. Хтосьці, быў паблізу на паляванні заходзіў сюды адпачыць, бачыш гэта, – Яўсеевіч паказаў на паліцу, што вісела побач, – посуд памыты ды не так стаіць, як два тыдні таму, калі я тут быў.

Выправіўшыся вяртацца назад, Яўсеевіч, кіруючы аўто, сачыў за дарогай, на якой ад падтайвання снегу з'явіліся выбаіны і лужыны. Сярога-Рэйнджэр, пакуль было магчыма, паглядаў праз задняе шкло машыны на драўляную пабудову хаткі паляўнічага памерам шэсць на сем метраў з абсталяванай печчу, кухонным сталом, лавамі ды драўлянымі нарамі ўздоўж сценаў для адпачынку заўзятараў палявання ды прамыславікоў. Таёжная дарога, паволі ўздымаючыся ўгору ды пашоўшы паволі ўніз, прытаміўшы, убаюкала Сярогу.

– Во глядзі, наперадзе ваўчара, – Яўсеевіч, кіруючы аўто, тарганыў Сярогу за левае плячо, – глядзі, ваўчара наперадзе на дарозе.

Уздрыгануўшыся ад нечаканасці, напачатку вытарашчыўшы вочы, гакнуўшы, маўляў што, убачыўшы наперадзе на дарозе ваўка метрах у сямідзесяці, Сярога ўсхваляваўся. Воўк, пачуўшы ззаду сябе гук рухавіка, прыпыніўшыся, павярнуўся на сто восемдзесят градусаў. Заўважыўшы набліжаючуюся да яго машыну, паволі сышоў на правы бок дарогі, адыйшоў

у тайгу метраў на трыццаць, пабег далей наперад уздоўж дарогі па свайму кірунку.

– Стары ўжо, адзінотнік, – Яўсеевіч час ад часу паглядаў на ваўка, што ішоў па плотным снезе з правага боку між рэдка празрастаючымі таёжнымі раслінамі, – Сярога, прыадчыні фортку, дастань карабін і высунь рулю.

– А навошта, Яўсеевіч, страляць будзем, – Сярога, прыадчыніўшы шкло пярэдняй правай форткі, павярнуўшыся назад, дастаў карабін, трымаючы зброю перад сабой, паглядзеў на Яўсеевіча.

– Ды не, страляць не трэба, ён жа нам шкоды не нанёс ды й не нанясе. Высунь рулю, пабачыш, што будзе.

– Яўсеевіч а чаго гэта ваўчара падаўся наўцёкі далей ад дарогі ў тайгу на ўсіх парах, нібыта малады? – Сярога, дастаўшы назад рулю карабіна з прыадчыненай форткі, звярнуўся з пытаннем да ўсміхнуўшыгася Яўсеевіча.

– Так-та, братка, гэта воўк вопытны, якраз во і вецер з машыны на ягоны бок. Невыпадкова ён сыйшоў управа, калі нас заўважыў, – Яўсеевіч, прытармазіўшы, сцішыў ход праязджаючы па вялікай лужыне на дарозе, – пачуўшы пах пораха ад рулі карабіна, стары воўк, зразумеў адкуль небяспека і каб уратавацца даўся наўцёкі.

– Яўсеевіч, а ты даўно паляваннем займаешся?

– З маладосці, Сярога, з маладосці.

– А ваўкоў калі-небудзь страляў?

– Не, ваўкоў ніколі. Ні дзеля сябе, і калі звярталіся з просьбай здабыць, адмаўляўся.

Машыну, ідучую па лужыне, тарганула на яміне. Яўсеевіч, націснуўшы на тармазы, паволі, на першай перадачы выехаў на ўзвышша дарогі і прыпыніў аўто.

– Магчыма, падвеску пабіў, трэба глянуць.

Сярога-Рэйнджэр, выкарастаўшы зручны момант, вылез з кабіны, прыхапіў з сабой карабін. Уявіўшы сябе ў вобразе па-



ляўнічага, адыйшоў ад дарогі метраў на дваццаць, узняўшы карабін на ізгатоўку, выбіраючы цэлі, голасам умоўна дэманстраваў стрэлы.

– З падвескай парадак, – Яўсеевіч глянуў на нававыяўленага паляўнічага, заўсміхаўся, – што, цікава?

– Так, цікава, – Сярога, паставіўшы карабін прыкладам на снег, глянуў на Яўсеевіча засвяціўшыміся вачыма.

– Дай-ка мне гэту штуковіну, – Яўсеевіч падыйшоў, узяў карабін затворам і даслаў патрон у патроннік, – вунь сухое дрэва, метраў пяцьдзесят, якраз на выстаўлены прыцэл. У абойме пяць патронаў, тры твае, два мне пакінеш, – Яўсеевіч працягнуў карабін, – давай, пальні.

Сярога, выцэльваючы ў ствол дрэва, адчуў легкае хваляванне. Ціск на спускавы курок, стрэл, міма. Другі ціск, міма. Трэці – той жа вынік.

– Сярога, бачыш, галінка ад дрэва цягнецца метрах у двух ад долу. Глядзі, буду цэліць у месца, адкуль расце, глядзі.

Яўсеевіч прыцэліўся, стрэл, шчэпкі паляцелі. Яшчэ прыцэліўся, стрэл, шчэпкі.

10.

З кожным надыходзячым днём узыходзячы раней і заходзячы пазней, павялічваўся час светлавога дня, усё болей і болей промнямі абагравала сонца зямлю, растапліваючы снег, яно набліжала перыяд так званых белых ночаў. Паўночней, бліжэй да Палярнага круга, ды за ім сонца пасля зімовай Палярнай начы праз кароткі вясенні перыяд набліжала надыход Палярнага дня, пры якім на адпаведны перыяд цыкла на небакраі наогул не заходзіць, крыху прыніжаючыся увечары на захадзе, і свеціць суткамі запар.

Па сходзе крыгахода, а следам і шугі ды растайкі снега узровень ракі Чона знізіўся да звычайнай сваёй адметкі. Некалькі вялікіх крыгаў, вынесеных цячэннем на бераг на пяшчаную

глебу, засталіся дабываць свой кароткі тэрмін існавання, таючы пад цёплымі па-вяснавому промнямі сонца. Распрацаваная ад тайгі пляцоўка, зазелянела травой, невысокія бярозкі, лістоўніцы ды розныя хмызняковыя расліны, хутка апрануўшыся ў зялёнага колеру адзенне, упрыгожыўшы навакольныя краявіды, усталёўвалі надыход квітнеючай вясны.

– Так, хлопцы, – Мікалаевіч, падыйшоўшы да будоўлі, напружыўшыся выразам сайго твару, з-пад ілба агледзеў высцілаўшых падлогу на адкрытай мансандры перад уваходам у лазню, незадаволена фыркнуў, – тут ужо занадта шмат вас сабралася на адным месцы, трэба паразганяць. Андрэй, ты ў нас па спіску столяр-плотнік, вунь табе станок, – Мікалаевіч, стояў перад мансандрай павярнуўся крыху ўправа і правай рукой паказаў на станок, што стаяў непадалёку, накрыты на выпадак дажджу цэлафанавай плёнкай, – а вунь табе на франтоне даху венцыляцыйнае вакно, на тым баку – такое ж. Фёдар, а ты бяры Рэйнджэра і майструйце ганак на мансандру лазні. Прыступкі, пярыла, балясіны, памеры ведаеш, усё майстраваць па стандарце, аніякай самадзейнасці, – Мікалаевіч, паглядзеўшы на хлопцаў, запаліўшых цыгарэты, зноў незадаволена фыркнуў і распавёў далей, – і сягоння працаваць усім на гадзіну болей. Тэрміны падціскаюць, каб аніякіх перакураў, цыгарэты паліць у працэсе выканання працы.

Пад час абеду, прыняўшы ежу, Фёдар выйшаў са сталовай і прыладзіўся папаліць цыгарэту на лавачцы каля бытавога памяшкання метрах у трох ад дзвярэй увахода пад высокімі дрэвамі. Побач справа прысеў Андруха, з левага боку – Сярога-Рэйнджэр. Тытунь палілі моўчкі, убіраючы ў сябе з дымам цыгарэты пахі веснавога надвор'я. Сабака заўгаса Яўсеевіча Дзіна, белавата шэрай поўсці памерам з ладную, дварняжку, з мордай на выгляд ваўчыцы, увесь тэрмін працы тут новапрыбыўшых працаўнікоў, час ад часу на адлегласці трымаючыся каля іх, паглядаючы насцярожана, з-пад ілба, неўзабаве прай-

шла па сцежцы да траіх хлопцаў, што палілі тытунь, прысеўшых на лавачцы. Паволі перад Фёдарам, зрабіўшы некалькі крокаў наперад, паклаўшы галаву таму на калені, прытулілася, паглядаючы карымі сабачыма вачыма Фёдару ў вочы. Паводзіны сабакі здзівілі не толькі Фёдара ды двух паліўшых побач хлопцаў, але і тых, хто паліў тытунь каля балка сталовай. Фёдар пагладзіў Дзіну за вушамі, прыгаворваючы, што Дзіна добрая сабака, Дзіна добрая сабака. Атрымаўшы знак увагі, тая нетаропка пацягнулася да пабудовы гасцявога дома, варочаючы па баках галавой, удыхваючы вясновыя пахі.

– Так, сходні замераны, адрэзаны, зараз прыкінем, што да чаго тут датыкаецца, – Фёдар, узяў адрэзаную пад сходзень дошку-пяцідзесятку даўжынёй метр восемдзесят сантыметраў, адным канцом прыставіў да ўзроўня падлогі мансарды, другі апусціў на зямлю, – вось пад такім вуглом, Сярога, будуць майстравацца прыступкі. Трэба адбіць нерастаўшы лёд і на сантыметраў пятнаццаць заглыбіцца ў зямлю. Бяры шуфель, будзеш адграбаць.

Фёдар узяў жалезны лом, пачаў адбіваць, і тут пачуў:

– Ды навошта той лёд адбіваць ды заглыбляцца, пясочку зараз падсыпем, ды й годзе, – Сярога-Рэйнджэр ухваціў шуфель, хуценька набраў пяску, што знаходзіўся ў васьмі метрахі ляжаў кучкай і, амаль падскочыўшы, сыпануў пясок на тое месца, дзе Фёдар  старанна адбіваў лёд.

– Я табе што сказаў, трэба заглыбіцца, інакш падтае лёд і прыступкі перакосяцца, – Фёдар глянуў з-пад ілба на ірвануўшага  зноў за пяском Сярогу з шуфлём і бакавым зрокам заўважыў, што завіхасты Віцёк з двума таварышамі, што ладзілі падлогу на мансардзе, зацікаўлена назіраюць за далейшай дзеяй і толькі й падумаў, што зараз ён сам выдасць сваю развязку сюжэта. Калі Сярога-Рэйнджэр зноў прадстаў перад ім, трымаючы напоўнены пяском шуфель у дзвюх руках перад сабой, Фёдар рэзка, моцна, з узмаху ўсадзіў лом у зямлю так, што той



застаўся стаяць. З правай нагі, шмаргануўшы каблуком бота па шуфелю, Фёдар выбіў яго з рук Рэйнджэра.

– І хто гэта такія, твае Рэйнджэры, пра якіх сваю песеньку напяваеш? – Фёдар з-пад ілба паглядзеў на ў непаразуменні круціўшага па баках галавой Сярогу, што шукаў ладнае выйсце з такой недарэчнасьці.

– Рэйнджэры, ну, гэта, ну, гэта такія супермэны, што ўсё могуць. Ну, яны, Рэйнджэры, гаспадары жыцця, – Сярога, запінаючыся, затупаў на месцы, спуджана сціснуўся тулавам і стаяў, нібыта вінаваты, перад Фёдарам, разгубленымі вачыма паглядаючы на таго.

– Ды, ветрагоны яны, твае Рэйнджэры. Чуеш, фраер, газуйка ты адсюль, ідзі пашукай, да якога звяна табе прытыкнуцца. Дзе зладзіш, там і працуй, я тут без цябе спраўлюся, газуй, – Фёдар, як беркут, нахіліўшы галаву уперад, вытарашчыўшы на Рэйнджэра вочы, нахохліўся тулавам.

Сярога-Рэйнджэр, скрывіўшы фізіяномію, разгублена круціў па баках галавой, глянуў управа ад сябе на мансарду, на завіхастага Віцька з двума таварышамі, майстраваўшымі падлогу і назіраўшымі за развязкай сюжэта, потым павярнуўся на сто восемдзесят градусаў і падаўся прэч уздоўж мансарды, нязручна па баках махаючы рукамі, нібыта разгубіўшыся, што яму далей рабіць?

– Глядзі, вось як, глядзі, вось як, – пачулася Фёдару, як адзін з траіх, назіраўшых з вышыні мансарды, ціхенька казаў таварышам, – глядзі, вось як.

Фёдар, адбіўшы ў патрэбных месцах лёд, заглыбіў на пятнаццаць санціметраў у замёрзшую глебу і прыладзіў на месца дзве сходні, на якіх будуць майстравацца прыступкі. Потым вырашыў адпачыць і запаліў цыгарэту. У жаданні крыху паназіраць за ракой, Фёдар паволі пацягнуўся да берага міма працуючага за дрэваапрацоўчым станком Андрухі, што вырабляў вентыляцыйныя драўляныя рашоткі. Глянуў, як за мансардай

злева, працаваў з двума хлопцамі, забіваючы дошкамі лафет з трубаў Сярога-Рэйнджэр. Фёдар усміхнуўся, падумаў, што магчыма, у тым звяне, ты, братка, знойдзеш такі сабе прытулак, каб звычайна працаваць, не выстаўляючы перад таварышамі свайго незразумелага вобраза і сабе выпяндроса.

Стоячы на высокім беразе ракі, Фёдар паназіраў за плынню, потым павярнуўся і рушыў на месца сваёй працы і тут заўважыў, што падыйшоў да Андрухі завіхасты Віцёк, трымаючы ў левай руцэ зробленую тым вентыляцыйную рашотку, жэстыкулюючы правай, – напэўна, рабіў заўвагі майстру наконт якасці вырабу. Потым шпурлянуў ягоны выраб да кучы абрэзкаў каля станка, Віцёк замахнуўся правай рукой і шарганўў Андруху па грудзях. Той, доўга не разважаючы, выдаў у адказ правай рукой крыўдзіцелю ўдар па пысе. І гэта было ўжо цікава, таму Фёдар прыбавіў сваю хаду да працоўнага месца. Далей ён заўважыў, як Віцёк адхіліўшыся ад удару крыху назад, потым нахінуўся наперад і далонню правай рукі змахнуў выпушчаную Андрухіным кулаком з носа юшку, мацюкнуўся, дайшоў да мансарды і залез па часовых драбінах на сваё працоўнае месца.

11.

Па заканчэнні працоўнага дня, навёўшы па месцах працы належны парадак, і не застаўшыся працаваць на гадзіну болей як было замоўлена, хлопцы паволі пацягнуліся да бытавога памяшкання, дзе і пражывалі. З вакенца кухні разносіўся прыемны пах свежапрыгатаванай кухарам Мішкай ежы. Мікалаевіч з Яўсеевічам, выйшлі з будынка гасцявога дома на ганак, моўчкі пераглянуліся, праводзячы поглядам хлопцаў, што не засталіся, як было даведзена, працаваць на гадзіну болей.

– Віцёк, для цябе ёсць анекдот, сягоння вычытаў, – Мішаня-повар, раздаўшы хлопцам ежу, прымасціўся за раздзелачным сталом каля акна і паклаў кнігу на калені і, гартаючы яе, усміхаючыся, шукаў патрэбную старонку.

– А чаго для мяне? – Віцёк праглынуў набраную з міскі лыжкай кашу і абудзіўся ад увагі да сваёй персоны.

– Ну, як чаго, – Мішаня-повар знайшоў адпаведную старонку і эмацыянальна усклікнуў, – вось, знайшоў, ты жа ў нас, Віцёк, з пачатку працы тут усім нам розныя заўвагі робіш.

– Якія яшчэ заўвагі, – Віцёк праглынуў яшчэ лыжку кашы, прыкусіў хлебам і усміхнуўся.

– Ну, як якія, то хтосьці непаголены, то вопратка забрудзілася, то хтось пагаліўся, якраз для цябе і анекдот.

– Ну, давай чытай, – трасянуўшы правай рукой лыжку ўгору, Віцёк з выразным падкіндосам чарпануў з міскі грэцкую кашу, гатаваную з мясам аленя.

– Ну, значыць, чытаю. Прыходзіць мужчына ўзросту сярэдніх гадоў на прыём да доктара-сэксапатолага.

– І што вас прывяло да мяне, шаноўны спадар?

– Ды разумееце, доктар, ды ў мяне так ўсё ў парадку, жонка, двое дзяцей, добрая сям'я.

– Ну, дык у чым жа справа?

– Ну, у мяне як бы і не справа, але нешта я апошнім часам, пазглядаючы на мужчынаў, раблю ім заўвагі альбо кампліменты.

– Якія заўвагі ды кампламенты?

– Ну, такія заўвагі, што хтосьці непаголены, абыякава апрануты, дрэнна выглядае альбо наадварот. Ну, вы разумееце, доктар. Ну, хтосьці выглядае ўвесь з сябе, поголены, добра апрануты, ну, дакладна з іголачкі.

– Так, разумею. Вы артыст балета?

– Не, я не артыст балета.

– Вы дыпламат?

– Не, я не дыпламат.

– Вы член Дзяржаўнай Думы?

– Не, я не член Дзяржаўнай Думы.

– Баценька, дык вы звычайны педэраст.

– Га-а-а, задалбаў ужо гэты повар сваімі анекдотамі, што пад час вячэры чытае іх нам, – Віцёк ускочыў са свайго месца, завіхаста ўзняў лыжку ў правай руцэ ўгору, вышэй сваёй галавы, і шпурлянуў тую прама ў сваю міску з недаедзенай кашай, потым адскочыў ад стала са словамі, – ніколі не дасць нармальна павячэраць, – і панёсся да дзвярэй на выхад, не апрануўшы паверх майкі-цяльняшкі нават сваю вісячую на спінцы стула куртку, – задалба-а-а-ў, – і Віцёк выскачыў з памяшкання сталоўкі, моцным штуршком левай рукі з грымам зачыніў за сабой дзверы і падаўся да балка пражывання, нібыта метэор, мільгануўшы за вакном сваёй постаццю.

– Га-га-га, га-га-га, – з саркастычным зрывам зарагаталі хлопцы ўслед знікшаму са сталовай Віцьку, – га-га-га, га-га-га.

– Мішаня, – скрозь смех звярнуўся да повара Юрась-Фаза, – ды што ж ты натварыў, і хто ж цяпер нам будзе заўвагі рабіць ды парады даваць, а камплiменты? – хлопцы ўсе зноў зарагаталі.

– Ну, Мішаня, момант ты падабраў як сапраўдны стратэг, – Андруха ўстаў з-за стола, падыйшоў да пліты і наліў з каструлі палоўнікам у свой кубак кампоту, – Віцёк на нас з табой будзе думаць, што мы дамовіліся, – Андруха з кубкам кампоту прысеў на сваё месца за сталом, – сягоння на працы за тое, што мне ў грудзі шмаргануў, атрымаў ад мяне па пысе, ды так, што юшка з носу пайшла, а тут ты яму сваю мараль выдаў – ну, акурат, у самае яблычка.

– А што ж яшчэ з ім рабіць, калі паводзіць сябе з самага пачатку працы тут занадта вызываючы, па-фраерску, – повар пыдыйшоў да раздзелачнай тумбачкі, паклаў тоўстую кніжку анекдотаў на паліцу і заняўся навядзеннем парадку на сваім працоўным месцы.

12.

– Ну як, Андруха, у цябе поспехі, атрымаліся венцыляцыйныя рашоткі? – брыгадзір Мікалаевіч, падыйшоўшы да дрэва-

апрацоўчага станка, трымаючы рукі ў кішэнях, як бы незнарок кінуў погляд на мансарду, потым высунуў правую руку з кішэні і ўзяў пададзены Андрухай выраб, – ну, нічога, пойдзе. А другі калі зробіш?

– Яшчэ Мікалаевіч гадзіны дзве, акурат да самога абеду яна будзе гатовая, – кінуўшы пагляд на мансарду, Андруха заўважыў, што Віцёк прыпыніў працу, запаліў цыгарэту і прыслухаўся да іх размовы.

– Добра, пасля абеду лезь на гару і да вечара акурат прыладзіш іх там, – прайшоўшы ўздоўж мансарды да месца, дзе Фёдар ладзіў ганак, Мікалаевіч звярнуўся да таго з пытаннем:

– І што ты тут, Фёдар, адзін упіраешся?

Фёдар бачыў, што Мікалаевіч на падыходзе і чакаў гэтакае пытанне, таму не даў брыгадзіру дагаварыць сваю думку.

– Ды, Мікалаевіч, гэтакая праца акурат для аднаго: замеры, падгонкі, сягоння прыступкі наладжу, ну, а назаўтра балясіны ды пярылы будуць змайстраваны.

–Так, зразумела, – Мікалаевіч павярнуўся на сто восемдзесят градусаў і пайшоў уздоўж мансарды, трымаючы рукі ў кішэнях. Усе працуючыя хлопцы інтуітыўна пацягнуліся да пляцоўкі перад лазняй уздоўж мансарды.

– Так, хлопцы, справы ідуць у нас нядрэнна, – Мікалаявіч прыпыніўся, паволі тупаючы на месцы, і агледзеў падыйшоўшых хлопцаў, – ды тэрміны крыху нас падціскаюць, трэба, крышачку напружыцца, дні тры-чатыры папрацаваць на гадзіну болей – ну, і намаганні адпаведна будуць кампесанаваны заробкам, – перастаўшы тупаць на месцы, Мікалаевіч агледзеў хлопцаў, варочаючы па баках галавой.

– Ну, калі трэба, дзеля агульнай нашай справы, то запражомся, напружымся, зробім усё, як мае быць, то біш – як патрэбна, – і завіхасты Віцёк, звярнуўшыся да электрыка, спытаў таго, – Юрась, што там у нас з электрапілой «Макіта», адрыхтуецца, каб працаваць ёй?



– Ды будзе, там выключальнік знасіўся, я разабраў ды замяніў ужо, зараз ручку шурупамі завінчу і гатовы будзе. Толькі я не Юрась табе, а Юрый Мікалаевіч, – электрык, з-пад ілба патупіўшы вочы, напружыўся тварам.

– Ды, Юры Мікалаевіч, гэта я па-народнаму, – Віцёк разгублена, нібыта прыгадаў ўчарашнія свае прыгоды, прыкусіў вусны.

– Па-народнаму ўсяму ёсць і іншыя тлумачэнні. Калі добра папросіш, то іх табе прадэманструю, – Юрась адыйшоў ад гурта, прайшоў ускрайкам раслінаў і павярнуў управа да генератарнай, – зараз дарамантую, прынясу «Макіту».

– І яшчэ, хлопцы, – Мікалаевіч зноў звярнуўся да падначаленых, – назаўтра прыбудзе верталёт з нашым прарабам Аляксандравічам ды прадстаўнікамі кіраўніцтва заказчыка. Сягоння пасля абеду, Віцёк, ты тут як за старэйшага працаўніка, выдзялі каго чацвярых, каб заняліся добраўпарадкаваннем тэрыторыі. Дошкі, абрэзкі ўсялякія каб не валяліся абы дзе, пазносце да кучаў, складзіце. Смецця сабралося шмат, таксама прыбярыце, каб тэрыторыя мела добраўпарадкаваны выгляд...

13.

– Мужыкі, я толькі з верталётам прыбыў і праект лазні вам даставіў, тыдзень таму як завяршылі вычэрчваць і удакладняць , – малады мужчына, на выгляд гадоў крыху за трыццаць, інтэлегентна апрануты ў чорнае доўгае дэмісезоннае паліто, чорныя адпрасаваныя порткі, шчогальскія бацінкі з вострымі насамі, у белай сарочцы з чорным гальштукам пад кашуляй хвілін пяць таптаўся на дарожцы, вядучай ад верталётнай пляцоўкі да будынку гасцявога дома насупраць адбудаванай новай лазні, а потым наблізіўся да працуючых хлопцаў і распавёў гаворку, – ды, гляджу, што вы лазню новую ўжо і адбудавалі. А куды цяпер праект мой?

Хлопцы паглядзелі на яго, як на дзівака, і заняліся сваёй справай.

– Ты праект той свой нясі вунь у дом гасцявы, – Віцёк з завіхастай усмешкай на твары знаходзіўся бліжэй за астатніх да гэтага праектанта і таму звярнуўся да разгубленага няўдачніка, – там пакінь. Альбо Яўсеевічу, альбо Мікалаевічу, магчыма, спатрэбіцца.

– А-а, так, спатрэбіцца, ну, я пайду, там зараз паседжанне пачнецца. Дзякуй, я пайду, – паклаўшы праект, што трымаў перад сабой у правай руцэ ў скураную папку з паперамі, мужчына паспяшаўся да будынка гасцявога дома.

– Хлопцы, там жа з верталётам прыбыла печка для новай лазні. Хадзем паглядзім, што там за выраб такі ды й прыцягнем яе сюды. Аляксандравіч ішоў з тым кіраўніцтвам і мелькам сказаў мне, каб выгрузілі, – Віцёк накіраваўся да верталёта, паклікаўшы за сабой пяцёра рабочых.

Неслі ўшасцярох тую печку для лазні, падклаўшы пад яе абрэзкі дошак, трымаючы па парах. Потым вырашылі адпачыць, апусціўшы долу, запалілі па цыгарцы.

– Печка, відаць, эфектыўная, прамавугольная, камяні на ёй зверху добра прагравацца будуць, пара атрымаецца, што трэба. Бак для падагрэву вады змайстраваны збоку, як па спецзаказе для нашай парылкі змайстравалі, – па выразу твару Віцька было зразумела, што той мае намер штосьці спытаць, – магчыма, ёсць з нас хто, калі-небудзь займаўся печкамі, клаў з цэглы?

– Ды быў час, я займаўся, – Фёдар, глыбока зацягнуўшыся цыгарэтай, павольні выдыхаючы дым, з-пад ілба бокам управа паглядаў на завіхасты выраз твару Віцька, прыпомніўшы першую з тым сустрэчу ў інтэрнаце.

– Так Фёдар, калі займаўся, то і тут зробіш, – Віцёк ажно павесялеў, – а то Мікалаевіч даручыў мне знайсці каго-небудзь, а не тое, сказаў, не знойдзеш, то сам станеш і абкладкай цэглы зоймешся. Толькі я ў гэтакай справе, што называецца, ні бум-бум.

«Ні бум-бум, ні бум-бум...» – гучала ў мазгах Фёдара, калі ён нёс з хлопцамі тую печку да лазні ды выстаўляў яе на месца ў

памяшканні. І трэба ж мне было, дурню, балбатнуць непатрэбнае неўпапад. Давядзецца цяпер аддзіраць ад гліны, раствору ды сажы цэглу ад былой печы ды абкладваць нанова гэты выраб. Добра, калі дадуць каго ў памочнікі, інакш аднаму давядзецца нялёгка.

– Юрась, не лезь у гразь, – сыходзячы з ганку лазні апошнім і заўважыўшы Юрася-Фазу, што паслізнуўся, сыходзячы з апошняй прыступкі, апасля і сеўшага перад ганкам у невялікую лужыну. Юрась нетаропка пачаў ўзнімацца, абапёршыся на правую руку Фёдара. Тым часам Віцёк не упусціў моманту, каб падкінуць кпіну ў бок няўдачніка. Паволі ступіўшы на апошнюю прыступку і раптоўна атрымаўшы ад падняўшагася Юрася з правай па леваму вуху Віцёк, заваліўшыся на пярыла, крутануўся цераз левае плячо і ўпаў ніц на ганак.

– Ах ты, сука, – ускочыўшы на ногі, саскочыўшы з ганку, Віцёк хацеў было нанесці спрытны ўдар з правай нагі, але Юрась паспеў адскочыць убок, управа ад ганку і зарагатаў разам са знаходзячыміся побач хлопцамі ад того, што ад інэрцыйнай сілы ўзмаху, не утрымаўшы раўнавагу, Віцёк аказаўся седзячым на пятай кропцы ў той жа самай лужыне.

– Ну што, кіжлаты, я ж цябе папярэджваў, што ёсць народныя метады тлумачэння, і казаў жа, што калі добра папросіш, то я табе іх прадэманструю, – Юрась, запаліўшы цыгарэту, паглядзеў на седзячага ў лужыне Віцька, з ясным выразам на твары ці то абурэння ці то затоенай крыўды і тым часам рэзка вымавіў, – а ці ўсё ты зразумеў?

– Пайшлі, хопіць дуркаваць, повар-Мішаня нас да абеду чакае, пайшлі, – рушыўшы першым у накірунку да кухні, Андруха пацягнуў за сабой астатніх хлопцаў.

Тым часам ўзняўшыся са злачаснай лужыны, нахіляючыся, абтрасаючы бруд з рабочай вопраткі, Віцёк пашкандыбаў апошнім за хлопцамі і штосьці бурчэў сабе пад нос.

14.

Выдаўшы хлопцам прыгатаваныя порцыі абеда, кухар-Мішаня накладваў засоленых шчупакоў ды мянтузаў з ночваў у мех у правым вуглу ад дзвярэй уваходу, прыгаворваючы, маўляў, лавіся, рыбка, вялікая ды маленькая.

– Вось, колькі, болей паловы меха, – повар павярнуў галаву ўправа, заўважыў Фёдара, дапіваючага кампот, і звярнуўся да таго, – Фёдар, ты кампот дап'еш ды й затарабаніш рыбу да самага верталёта.

– Якую яшчэ рыбу ды да якога верталёта, – Фёдар устаў з-за стала, падыйшоў да пліты, наліў апалонікам з каструлі ў свой кубак кампота і вярнуўся на сваё месца.

– Ды рыбу во, на базу, прарабам.

– Ды ты што, Мішаня, то я жа яе не вудзіў. З якога гэта мне яе да верталёта тарабаніць, – Фёдар, седзячы за сталом, трымаючы перад сабой кубак абедзвюма рукамі, заўсміхаўся.

– Ну, як з якога, хлопцы во навудзілі, я во ўпарадкаваў, у мех склаў, а ты затарабаніш, – повар не адступаў, – гэта ж дзеля агульнай справы.

– Ды ты што, Мішаня, ды каб мяне сюды, у гэтую таёжную прастору закінулі дзеля вудзення рыбы прарабам з базы, то я толькі гэтым бы тут і займаўся, – Фёдар ды некалькі хлопцаў зарагаталі, гледзячы на здзіўлены выраз твару повара, стоячага ў вуглу, трымаючы перад сабой абедзвюма рукамі мех з рыбай, – а так, хто падпісаўся тую рыбу вудзіць, ды яшчэ ў вольны ад працы час, няхай той і тарабаніць.

– Ты тут, я гляджу, шмат спрабуеш гаварыць, – Віцёк павярнуў галаву ўправа, седзячы з левага боку абедзенага стала, і звярнуўся да Фёдара, што знаходзіўся з правага краю.

– Ды калі што і кажу, то ўсё болей па сутнасці.

Андруха, сядзеўшы у цэнтры стала, павярнуў галаву ўлева, у бок Віцька, перавёўшы погляд перад сабой на вугал, дзе

Мішка-повар так і стаяў, трымаючы перад сабой абедзвюма рукамі стаяўшы на падлозе мех з рыбай, і звярнуўся да таго.

– Мішаня, ты калі да вечара адшукаеш у кніжцы сваёй якісь анекдот пра тых, што ўсё глядзяць, то пасля вячэры, – Андруха павярнуў галаву улева і паглядзеў на Віцька, седзячага з адвісшай сківіцай, – Віцёк, магчыма, ужо і глядзець перастане.

– Мішаня, давай я затарабаню, – грымнуўшы конаўкай па стале, ускочыўшы з месца, Віцёк усхапіў мех з рыбай і накіраваўся да дзвярэй.

– Віцёк, ты, нясучы прыгаворывай: тарабанься, рыбка, вялікая ды маленькая, – Андруха падкінуў кпіну у бок Віцька і заўсміхаўся, устаўшы з-за стала.

– Я табе на-та-ра-ба-ню, – кінуўшы рэпліку на выпад Андрухі, трымаючы мех у правай руцэ, Віцёк знік за дзвярыма.

15.

– Фёдар, дзядзя Фёдар, ну, у цябе пачуццё гумару гэткае, што на ўсіх нас хопіць ды яшчэ і табе застанецца, – пасля абеду выйшлі ўсе разам папаліць тытунь каля балка сталовай-кухні, і да Фёдара звярнуўся Юрась-Фаза, – і як табе ўдаецца амаль усё ў гумар пераводзіць ды на ўсё знаходзіць свае тлумачэнні?

– Што тут шукаць, – Фёдар зацягнуўся цыгарэтай, паглядзеў у бок верталётнай пляцоўкі і заўважыў каля адбудаванай лазні Віцька з брыгадзірам Мікалаевічам, – мой гумар – гэта мой гумар, але, – Фёдар з-пад ілба агледзеў паглядаўшых на яго таварышаў, – але ўсяму ёсць свая мерка, усё калісьці заканчваецца, мой гумар таксама не бязмерны.

– А потым што? – Юрась-Фаза спытаў, нібыта неўпапад, і замоўк, круцячы галавой па баках і аглядаючы хлопцаў.

– Потым, братка, у залежнасці ад абставінаў.

– Народны метад? – Юрась, спытаўшы, зацягнуўся цыгарэтай.



– І народны, і свой, у залежнасці ад запатрабаванасці і па абставінах, – Фёдар прытаптаў выкінутую цыгарэту, адыйшоў ад гурта хлопцаў на некалькі крокаў і пагладзіў сабаку Дзіну, што тапталася непадалёку.

– Фёдар, вось чамусьці Дзіна толькі Яўсеевіча ды цябе прызнае, як я назіраў, то і пад час працы нярэдка яна каля цябе ашываецца, цікава, – брыгадзір Мікалаевіч падыйшоў з Віцьком да гурта хлопцаў і паспрабаваў пагладзіць Дзіну, але сабака адскочыла на недасягальную адлегласць, прыпусціла галаву і моўчкі і недаверліва паглядала на таго ў нерухомасці. – Так, хлопцы, усе тут, Фёдар, давай да гурта бліжэй.

Мікалаевіч у добрым настроі, крыху ўзхвалявана даводзіў брыгадзе далейшы расклад працы:

– Справы ў нас добра пайшлі, у тэрміны укладваемся. Фёдар, з парады Віцька, пасля абеду бярэш у памочнікі Андруху і займаешся печкай, як канкрэтна рабіць я падыйду, удакладнім. Цэгла, гліна, пясок, цэмент, усё ёсць. Астатнім займацца аддзелкай, накіравальныя напачатку трэба панадбіваць на сцены, потым на іх вагонку, якая ў наяўнасці ёсць больш, чым напалову. Назаўтра будзе верталёт з электрыкамі з мясцовага ўпраўлення, з тым верталётам і вагонка прыбудзе. Абяцаюць зваршчыка-сантэхніка прыслаць ды тры ці чатыры працаўніка, каб дапамагчы па добраўпарадкаванню тэрыторыі. Расклад зразумелы, пад час працы, калі што спатрэбіцца, Віцёк удакладніць. Адпачніце яшчэ крыху, і за працу, я пайду, трэба гасцей да верталёта правесці.

Угледзеўшы вавёрку, што скакала па галінках лістоўніцы за балком сталовай, Фёдар адыйшоў ад гурта хлопцаў, назіраючы за ў добрым вясновым настроі маленькай жывой істотай, на кароткі тэрмін адасобіўшыся ад нейкіх там пастаўленых працоўных задач ды непатрэбнасці высвятлення адносінаў паміж таварышамі па працы, і ачуў урэшце-рэшт, што і сапраўды прыйшла вясна. За нейкія амаль два тыдні пасля растайвання

снега, сыхода крыгахода ды шугі па рацэ, што усталявалася ў сваім звычайным рэчышчы, наваколле забруіла не тое што вясновым, а амаль ужо летнім краявідам.

16.

– Бачыш во, за працай надта і не было часу заўважаць нам, як расквітнела наваколле, – падыйшоўшы да Фёдара, цясляр Барыс распавёў гаворку.

–Так, прырода забруіла, лісточкі з'явіліся на бярозках, на лістоўніцах ужо вось і новыя іголачкі зазелянелі. Глядзі, так і травяныя расліны так хутка ўзняліся, а паветра якое цудоўнае, свежае. Дыхаецца з адчуваннем, і сапраўды, на поўныя грудзі, – Фёдар, глянуўшы на падыйшоўшага таварыша спытаў:

– Чаго ты, Барыс, мне здаецца, у кепскім настроі, – Фёдар запаліў цыгарэту і глянуў у бок хлопцаў перад дзвярыма сталовай.

– Ды сягоння жа табелі за месяц працы з прарабам Аляксандравічам адбудуць верталётам на базу, – Барыс запаліў цыгарэту, – я ж разлічываў на добры заробак, як заўсёды і было на вахтах у мяне, а тут за гэты месяц, – Барыс зацягнуўся цыгарэтай і зрабіў паўзу, – мне трэцюю катэгорыю вывелі, вось таму і кепскі настрой.

– Ды што ты кажаш, за вуглы, што бензапілой выводзіў, ды трэцяя? Ды з чаго гэта так атрымалася? – Фёдар глянуў на пахмурны выраз твару таварыша і вытарашчыў вочы.

– Трэцяя, а якая ж яшчэ. Бачыш вунь фраера, – Барыс, у пальцах правай рукі трымаючы цыгарэту, паказаў у накірунку, дзе Юрась-Фаза спрабаваў наблізіцца да сабакі Дзіны, ды тая, тупаючы з месца на месца, не жадала таго падпускаць, рычэннем выказваючы знак, каб той не набліжаўся.

– А гэты пры чым да трэцяй тваёй?

– Ну, як пры чым, ты ж бачыў, як зруб ставілі на лафет, Віцёк з аднаго боку бензапілой працаваў, запілы на вуглы па

шаблону рабіў, ну, а я – з другога, – ціхенька кажучы Фёдару, Барыс умоўна жэстыкуляваў рукамі, – Фазу брыгадзір паставіў бярвенні прымаць, што ты знізу на зруб падаваў.

– Так, адразу гэтак і было, гэтак і працавалі.

– Адразу, ды бярвенні на зруб прымаць трэба, ды паварачываць пад запілку, ды мох высцілаць, ды потым паверх запіленае бервяно выкладваць, ды потым шканціць. Ты ж бачыў, што потым гэтым Павел займаўся.

– А бензапілу Фаза дзе ўзяў, яе ж напачатку не было? – Фёдар задраў галаву ўгору і спрабаваў пабачыць знікшую з відавоку вавёрку.

– Ды вунь яна, глядзі правей, вунь на высокім дрэве, – пабачыўшы скачучую па галінках высокага дрэва вавёрку, Барыс заўсміхаўся, – а бензапіла тая ў генератарнай была, там на магніце правадок адляцеў быў. Ды ён жа, Фаза, адрамантаваў.

– Зразумела, успомніў, як зруб майстравалі, і Мікалаевіч, падыйшоўшы, казаў, што во электрык, а бензапілой валодае, як запраўскі цясляр, – пасля гэтай прамовы твар Фёдара займеў іранічны выраз.

– Ты зразумеў правільна, бачыў жа, як гэты запраўскі цясляр пачынаў бензапілой працаваць, то я заўсёды ўбок адыходзіў. Ён жа трымаў яе на выцягнутых руках, баючыся, на адлегласці ад сябе. Гэта небяспечна: піла, казырнуўшы, інэрцыйна можа пайсці ў любы бок.

– Слухай, Барыс, а ці не пра яго Андруха распавядаў, што ў мінулым годзе дзесьці на лесапавале хлопец-спец захварэў, а ён, гэты Фаза, узяўшыся за бензапілу хлопцу, што багром падпіраў лістоўніцу, каб валілася ў патрэбны бок, казырнуў шынай па нагах, – Фёдар, назіраючы за вавёркай, што скакала невысока, побач па галінках дрэваў, глянуў у бок яшчэ паліўшых тытунь хлопцаў.

– Так, пра яго казалі хлопцы на базе. Добра, што той у валёнкі быў абуты ды паверх у штаны ватныя, каб снег не засыпаўся. Штаны ды валёнкі ланцугом шыны ў ашмёткі парвала, урата-



валі, ногі крыху абадрала цэпам, ды зажыло, абыйшлося, – Барыс глянуў у бок гурта хлопцаў, – таму я і адыходзіў ад гэткага спяца на адлегласць, каб чаго не атрымалася. Віцёк вунь адзін хутчэй выганяў свае два вуглы, чым мы ўдваіх, замінаў ён мне. Яму – першая, а мне во трэцяя.

– А калі з прарабам Аляксандравічам пагаварыць, растлумачыць, што да чаго.

– Які Аляксандравіч? Яму галоўнае, каб патрэбныя аб'ёмы працы былі. Сам зразумей, які з намі шоў-кантынгент падабраўся. Гэта ўжо разумееш, бо з самага пачатку на гэтай бязмежнай таёжнай прасторы – межаваная абагульненасць Поўначы, высвятляць нічога я не буду.

17.

Прыбыўшыя верталётам для наладжвання камунікацый лазьні тры электрыкі першае, што спыталі ў хлопцаў, дык гэта




*Аўтар Валеры Скакун, сабака Дзіна.*
*На рацэ Чона. САХА-ЯКУЦІЯ*

пра снасці для вудзення рыбы і ці вудзіцца яна, тая рыба тут наогул, ды якая. Пачуўшы станоўчы адказ, задаволеныя прыйшлі да пабудовы гасцявога дома, каб часова, на некалькі дзен размясціцца там на пражыванне. Двух хлопцаў, што прыбылі верталётам для выканання работ па добраўпарадкаванню тэрыторыі, размясцілі для часовага пражывання таксама ў гасцявым доме. Прыбыўшаму зваршчыку-сантэхніку Сярога-Рэйнджэр, правёўшы таго ў балок для пражывання, паказаў свабоднае месца на другім паверсе драўляных нараў з закінутымі на іх матрацам, коўдрай ды падушкай.

– А абед хутка ў вас, пасля я ўжо на працу выйшаў бы, – аглядаючы памяшканне, зваршчык-сантэхнік не спяшаўся адразу з пералёта прыступаць да сваіх абавязкаў.

– Абед праз дзве гадзіны, пакуль рэчы свае распакуеш, то якраз і надыйдзе, размяшчайся, – Сярога-Рэйнджэр, выйшаўшы з памяшкання, накіраваўся да верталёта, каб дапамагчы хлопцам па выгрузцы прыбыўшай на борце вагонкі.

– Прараб Аляксандравіч з Мікалаевічам, нетаропка бадзяючыся па тэрыторыі, час ад часу прыпыняючыся, разглядаючы намаляваныя на паперы планы забудовы аб’екта, меркавалі, як зацікавіць хлопцаў, каб у бліжэйшы час здаць у эксплуатацыю лазню ды распачаць будаўніцтва драўлянага гаража немалых памераў для ўсюдыхода УАЗіка, снегахода ды ГАЗона пяцідзесяцітройкі.

– Так, хадзем, Аляксандравіч, да верталёта. Там якраз зараз усе працаўнікі на выгрузцы, бачыш, як рупліва справа ідзе, – Мікалаевіч прыпыніўся каля пабудовы лазні і паказаў правай рукой на верталётную пляцоўку, – хадзем, ты як кіраўнік вышэйшага рангу пагаворыш. Хлопцы запрагуцца, напружацца, наконт працы – мужыкі, што трэба.

Убачыўшы Мікалаевіча з Аляксандравічам, ідучых ад лазні да верталётнай пляцоўкі, прадчуваючы, што дзеля нейкай размовы, Віцёк аддаў загад адпачыць крыху і запаліў цыгарэту.

– Папалім па цыгарэтцы, нешта жадаюць кіраўнікі нам давесці. Хутчэй за ўсё напрэгчыся спатрэбіцца крыху.

– Ды нам не прывыкаць, – Андруха паліўшы цыгарэту, зрабіў павалі некалькі крокаў, праходзячы каля Віцька, і як бы ненаўмысна правым плячом злёгку піхануў таго ў правую лапатку спіны. Віцёк, скрывіўшы незадаволена твар, моўчкі падаўся крыху наперад і прамовіў:

– Табе што, месца не хапае, каб абыйсці мяне?

– Ды, Віцёк, мне прайсці трэба бач да Барыса, ён цыгарку папрасіў, а тут во ты стаіш ды дошкі во ляжаць, што з верталёта выгрузілі. Я жа ненаўмысна цябе піхануў, здаўся ты мне.

– Ты мне таксама, – звярнуўшыся да падыйшоўшага кіраўніцтва, Віцёк запытаўся:

– Аляксандравіч, напэўна зноў размова ёсць, зноў напрэчыся трэба.

– Так, хлопцы, ёсць размова, – Аляксандравіч, давёўшы расклад аб тым, што праз трое сутак лазня павінна быць здадзена у эксплуатацыю на сто працэнтаў, ды й самім з'явіцца магчымасць адладзіць свой быт, атрымаўшы ад хлопцаў згоду напрэгчыся, паднацісnуць, задаволены, рушыў з Мікалаевічам да сталовай паабедаць.

18.

Набліжэнне Паўночнага лета прыкметна доўжыла светавы дзень, скарачаючы час ночы, напрыканцы мая пераўтварыўшы ноч у прыцемак, і давала магчымасць амаль да паўночы працаваць, не ўключаўшы ліхтары асвятлення. Згадзіўшыся з прапановай прараба Аляксандравіча папрацаваць напружана аж да заканчэння аздобы лазні, хлопцам давялося выкарыстоўваць анцікамарыныя сродкі: намазваць твар, шыю, рукі, каб абараніцца ад прачнуўшыхся пасля зімовай спячкі насякомых. Асаблівыя клопаты дастаўлялі авады. Вялізныя, памерам са шмяля, крыху танчэй, але даўжэй тулавам. На машкару ды камароў,

што лётаюць без аніякага гуку, пах намазанага анцікамарыйнага сродку ды спецыяльная запаленая спіраль зялёнага колеру дзейнічала, адганяючы тых прэч. Нахабныя авады, не гледзячы на гэтакія сродкі абароны, дзейнічалі рашуча ды смела. У імгненне наляцеўшы на адкрытыя часткі цела, вырваўшы сваімі вострымі сківіцамі шматочак скуры і пакінуўшы пасля сваёй шкоды адмеціны ў выглядзе ружовага колеру кропкі, у імгненне знікалі. Толькі і заставалася, што пачосываць тыя месцы ды пры налёце наступнага агрэсара спрабаваць яго прыхлопнуць, што атрымлівалася надзвычай рэдка.

– Ну, што, стары, балбатнуў такі неўпапад пра печкі, цяпер во мясі гэту во гліну ды выкладвай цэглу, – зваршчык-сантэхнік ладзіў трубаправоды з парылкі ад баку гарачай вады у памяшканне для мыцця і паспрабаваў жартаваць над Фёдарам, абкладваючым разам з Андрухай цэглай жалезную печку.



*Аўтар Валеры Скакун на рацэ Чона.*
*САХА-ЯКУЦІЯ*

– Ды, па праўдзе кажучы, то мяне гэткі занятак і не заклапочывае, я ж крыху валодаю гэтакай справай, – Фёдар, усміхаючыся, паглядзеў на хітравата-лукавісты выраз твару суразмоўніка.

– Не балбатнуў бы, то бачыш во, як маладняк, набіваў бы вагоначку на сцены, ды ўсё.

– Ой, братка, акрамя сценаў ім жа яшчэ і столь падбіваць трэба, а гэта ж як выгібацца трэба будзе, бо нязручна малатком цвікі забіваць. Андруха, яшчэ чатыры цагліны данясі, выкладу, ды адпачнём крыху, потым гліны яшчэ замесім, – глянуўшы на гадзіннік, пабачыўшы, што ўжо дзве гадзіны ночы, Фёдар запаліў цыгарэту і звярнуўся да Андрухі, што прынёс чатыры цагліны, – прысядзем, Андруха, пятнаццаць хвілін адпачынку.

Зваршчык-сантэхнік, вывеўшы паўдзюймовую трубу да месца, дзе будзе ладзіцца кран, паглядзеў на дрэнажную рашотку пасярод пакоя для мыцця і спытаў:

– Хлопцы, а як тут дрэнаж змайстраваны? Бачу, там вунь пад рашоткай пад падлогай варонка з ацынкаванай бляхі. А што там, яма альбо труба выведзена на вуліцу?

– Якая труба, пад падлогай там, братка, вырыты прыямак памерам два на два метры ўшырку і глыбінёй два метры, – Андруха паліў цыгарэту, прысеўшы на чатыры прынесеныя цагліны, і бакавым правым поглядам глянуў на стоячага перад прыямкам зваршчыка-сантэхніка, імя і прозвішча якога пакуль ніхто не ведаў, магчыма, таму што прыбыўшы ва ўжо абцёрты калектыў паводзіў сябе па-фраерску і вызываючы, – у вечнай мярзлоце.

– У вечнай мярзлоце, кажаш. І як жа ўдалося гэтакую яміну выкапаць, – прышчурыўшы вочы, што падалося Андруху знакам, што гэты чалавек не вельмі парадачны, магчыма, і стукач там, на базе, зваршчык-сантэхнік затупаў на месцы з нагі на нагу, гледзячы праз дзіркі дрэнажнай рашоткі пад падлогу.

– Палілі дровы, што адтайвала ад цяпла, выбіралі, напачатку адбіваючы кіркой. Тры дні ўтраіх гэтай працэдурай займаліся.

«Нейкі ты занадта ахвочы ўсё ведаць?» – Падумалася Андруху, як той зноў спытаў:

– А вугалкі гэтыя пяцідзесятыя хто прыварыў да дымавой трубы, ды навошта, ды яшчэ цэглай ад вугалкоў абклалі ажно да столі?

– Ну, братка, ты прама ўсё ведаць хочаш, – Фёдар, дапаліўшы цыгарэту, устаў з падлогі, дзе прысеў быў адпачыць, абапёрся аб вугал парылкі спіной і надзеў працоўныя рукавіцы, – вугалкі я прыварываў, а цэглу мы з Андрухай выкладалі дзеля таго, каб і гэтая лазня не згарэла. У той лазні, што палыхнула, дымаход неабкладзены быў, а вагонка амаль да трубы металічнай даходзіла. Ад тэмпературы і полымя ўзнікла.

– Зразумела, а халодная вада адкуль падводзіцца будзе? – зваршчык-сантэхнік, аглядаючы памяшканне, круціў па баках галавой, спрабуючы прыкмеціць якую-небудзь ёмкасць.

– Ды ты, братка, не па баках глядзі, ёмкасць халоднай вады на гары лазьні знаходзіцца. Уцепленая, ды і венцель там ужо прыладжаны, запакаваны. Там зараз прыцемак, як развіднее, з вуліцы па драбінах дабярэшся туды. Андруха, тут мы ўсё магчымае зрабілі, каб хлопцы змаглі вагонку да столі ладзіць. Перабіраемся, будзем абкладваць цэглай зараз з калідора, дзе дзверы топкі ды паддувала.

19.

– Палова восьмага раніцы, пайшлі, пакуль рукі памыем ды пысы і час сняданку настане, – Юрась-Фаза, кінуўшы з грымам свой малаток ў правы далейшы вугал пакоя, адносна ўваходу з калідора для пераапранання, стомлена развярнуўся і рушыў да дзвярэй на выхад.

Мішаня-кухар, разумеючы сітуацыю, што хлопцы за суткі працы дужа стомленыя, моўчкі раздаў ужу і займаўся навядзеннем парадку каля электрапліты ды раздзелачнага стала.

– Дзякуй Мішаня, смачны сняданак, – Віцёк, седзячы за сталом ад дзвярэй уваходу з левага боку, на прыканцы, акурат перад электраплітой, павярнуў галаву управа, агледзеў хлопцаў, паставіў рукі перад сабой локцямі на стол, склаўшы далоні разам пад падбародак і, матлянуўшы галавой, перавёў погляд на седзячага насупраць Юрася-Фазу, – нам з паўгадзіны адпачыць і зноў напрагацца да абеду.

Выйшаўшы са сталовай, хлопцы ўсе разам прыселі на лавах, абсталяваных для адпачынку перад балком пражывання, і моўчкі запалілі цыгарэты. Сабака Яўсеевіча Дзіна, прысеўшы на заднія лапы перад дзвярыма ўваходу ў балок, сумна, са спачуваннем паглядала на прытаміўшыхся за суткі працаўнікоў. Пасля кароткага адпачынку хлопцы рушылі да месца працы гуртом. Так і Фёдар, дапальваючы цыгарэту, цягнуўся апошнім. Калі ён падымаўся на ганак, то на чацвёртай прыступцы Фёдар аступіўся, бо яго ад стомы павяло на правы бок. Спрабуючы ўтрымацца, каб не зляцець з прыступак ганка спіной, чапляючыся далонню правай рукі за парэнчы, ён змог-такі ўтрымацца на першай прыступцы, прытуліўшыся спіной да правага поручня. Яго вочы, калі ён недарэчна сыходзіў уніз запрыкмецілі, як улева ад лазьні двое прыбыўшых на дапамогу на добраўпарадкаванне хлопцаў, займаліся працай непадалёку. Фёдар заўважыў, што тыя, пабачыўшы ягоную няўдалую спробу ўзыйсці на ганак па прыступках, апусціўшы галовы долу і працавалі далей, аб чымсьці ціхенька размаўляючы.

На імгненне Фёдарам завалодала злосць, маўляў, вы вось выспаліся, а мы во суткі ўжо без сну і адпачынку. Ступіўшы дзве прыступкі наверх, Фёдар супакоіўся, пры чым тут яны да нашай працы, выконваюць, што ім даручана, у іх жа свая справа. «Нельга так, дзядзя Фёдар, нельга так, дзядзя Фёдар,» – су-

пакойваючы сябе, “пячнік” праз мансарду прайшоў у калідор лазні да свайго працоўнага месца.

– Сягоння будзе верталёт з прарабам і абсталяваннем для электрыкаў, а нам там цвікі розныя, інструмент для працы падвязуць, – Андруха, абдзіраючы з Фёдарам чарговую партыю цэглы ад сажы, раствору ды гліны з цэментам для абкладвання новай печкі, ціхенька распавёў гаворку, пабачыўшы што паблізу нікога няма, – паслязаўтра яшчэ будзе верталёт з некалькімі чынамі, рыбы павудзіць прыбудуць, адпачыць у тайзе некалькі дзён. Паслязаўтра тым верталётам я і адбуду на базу.

– Як адбудзеш? Тут жа яшчэ працы запланавана шмат, пасля лазні гараж будаваць будзем, ды пад кабелі электрычныя траншэі нам пракапываць давядзецца. Неглыбока, але тут жа мерзлата, у падтаяўшай глебе давядзецца папыхцець. Твая ж вахта тыдзень за маю пазней заканчваецца, – Фёдар, прысеўшы на кукішкі, ачышчаў гліну з цэглы каля сцяны лазні і знізу пазіраў на стоячага побач Андруху.

– Ды учора пад вечар Мікалаевіч падыйшоў, калі я гэтыя цэглы адзін абчышчаў, спытаў, што ў мяне за напружанне у адносінах з Віцьком.

– Ну, і што ты сказаў?

– Як ёсць, тое і сказаў.

– Ну, і як яно, тое самае ёсць, – Фёдар узняўся, абапёршыся аб ствол бярозкі, што раслі ўздоўж сцяны лазні, і запаліў цыгарэту.

– Ды пазаўчора, Фёдар, – Андруха таксама запаліў цыгарэту, – я тут цэглу адзін абчышчаў, а табе хлопцы дапамагалі трубу дымавую металічную ладзіць да печы. Віцёк вунь адтуль, – Андруха паказаў на далёкі вугал лазні з боку верталётнай пляцоўкі, – падыйшоў ды пачаў прыдзірацца да мяне, што я цэглу дрэнна ачышчаю. Ну, я яму сказаў, што не ягоная справа, што гэтак дастаткова. Прысеў побач на кукішкі, цагліну абчышчаў ад раствору сякерай.

– Ну, і што далей, – Фёдар, закруціўшы па баках галавой, каб пабачыць, ці няма паблізу чыіх-небудзь вушэй, што могуць дакладна падслухаць іх гаворку.

– А далей Віцёк мне раптам ботам, усёй ступнёй піхнуў нямоцна ў правае плячо.

– Цікава, ну, а ты што?

– А я што, сякеру адкінуў убок, у правую руку цагліну, падскочыў на нозі, ды з замаху той цаглінай плашмя добра прыклаўся Віцьку ў грудзі. Той, гокнуўшы, сагнуўся, пастаяўшы так крыху, выпрастаўся ды, аддыхваючыся, каб яшчэ не атрымаць чаго, пайшоў займацца сваёй справай. Ён вагонку ў лазні на сцены і зараз набівае.

– Ты вось так, Андруха, Мікалаевічу і распавёў, – Фёдар запаліў яшчэ цыгарэту.

– Ды не, Мікалаевіч гэта сам усё бачыў. Каля альтанкі ён быў, на раку глядзеў, і калі я рашоткі вентыляцыйныя рабіў, то хутчэй за ўсё яму і тое патрапіла на вока. Тады я Віцьку за яго выпяндрос юшку з носа пусьціў, – Андруха запаліў яшчэ адну цыгарэту.

– Ну, а Мікалаевічу ты што сказаў?

– Мікалаевічу на ягонае пытанне я адказаў, што тут за месяц сумеснай працы у такой нашай абмежаванай тайгой прасторы мне ягоная фізіяномія абрыдла болей, чым мая яму. Так я стрымліваю сябе ад нетактычных выпадаў у ягоны бок, а ў яго не атрымліваецца. Вось  канфлікт з ім у нашых адносінах і ўзнікае.

– І што, Мікалаевіч вырашыў цябе адправіць вось па гэтай во прычыне? Ды тут ужо ўсім нам адны і тыя ж фізіямордзіі пачынаюць надакучваць.

– Вырашыў так, бо праз два тыдні ў яго вахта заканчваецца, а заместа яго брыгадзірам тут Віцёк застанецца.

– Слухай, Андруха, – Фёдар, узяўшы цагліну з кучы ў левую руку, у правую – сякеру, пачаў абчышчаць, – а ўчора каля

верталёта ты навошта наўмысна зачапіў Віцька, адпомсціць захацеў?

– Ды якое адпомсціць, – Андруха, прысеўшы, пачаў абчышчаць цагліну, – я яму так у грудзі прыклаўся што ён мяне на ўсё жыццё запомніць. Гэтак хочацца яму пад канец добра па пысе надаваць. Ён мяне зараз старонiцца, абыходзіць. Зачапіў учора дзеля таго, каб ён штосьці распачаў, ды шкада, напэўна, не адважыцца.

20.

Пасля абеду каля сабраўшыхся гуртом папаліць тытунь на лавачках хлопцаў каля балка пражывання сабака Дзіна, падыйшоўшы, паволі пахадзіўшы вакол, уладкаваўшыся на тым жа месцы, што і раніцай, зноў сумна, са спачуваннем паглядаючы на людзей, паволі круціла па баках галавой, нібыта штосьці спрабуючы прыкмеціць. Праз хвілін пяць узнялася са свайго месца і нетаропка пабрыла міма пабудовы гасцявога дома, затым лазні да верталётнай пляцоўкі. Неўзабаве ў небе пачуліся гукі рухавіка верталёта з характэрным выдаваннем вінтамі звыклага акампанементу: «Сіў-сіў, сіў-сіў». Узняўшыся з месца без аніякай каманды, хлопцы ўсе разам рушылі да балка, каб прылегчы на свае нары адпачыць пакуль не з'явіцца прараб Аляксандравіч.

– Прывітанне, хлопцы, – Аляксандравіч у добрым настроі з крыху заклапочаным выразам твару ўвайшоў у балок, прысеў на стул за невялікім сталом на праходзе паміж двума двух'яруснымі драўлянымі нарамі уздоўж сцяны, справа ад дзвярэй уваходу і чатырма ўпоперак злева ад уваходу, – ну, малайцы, за суткі работу падцягнулі. Яшчэ крышачку і з лазняй фініш. Віцёк, колькі часу яшчэ патрэбна, каб завяршыць?

– Ну, калі зараз пачаць, Аляксандравіч, – Віцёк, узняўшыся, прысеў на нарах свайго першага яруса, звесіўшы ногі на падлогу, і павярнуў галаву улева ў бок Аляксандравіча, – то

дзесьці да раніцы наступнага дня акурат управімся. У нас жа запас ёсць, яшчэ заўтрашні дзень. Адпачыць бы нам крыху, гадзіны тры-чатыры паспаць, управімся жа.

– Управіціся, канечне, здолееце, хлопцы. Ды лепей, каб, ужо напругшыся, хутчэй дарабіць, назаўтра з раніцы адпачнеце. А з абеду там і лазню пратопіце, адпарыцеся. Апрабуеце яе, каб была яна ўжо ў нас на ўсё сто. Пайду, дзе там Мікалаевіч з Яўсеевічам чакаюць, патрэбна мне яшчэ з імі штосьці вырашыць, – выйшаўшы з памяшкання, Аляксандравіч паволі прычыніў дзверы і даючы зразумець, што трэба ўжо усім выбірацца на працу.

21.

У другой палове дня, у сувязі з дастаўкай абсталявання для мантажа электрыкам, у памяшканнях лазні праца закіпела, нібыта ў мурашніку. Да набіваючых на сцены ды столь вагонку ды абкладваючых цэглай печку хлопцаў далучыліся тры электрыкі, працаваўшыя дагэтуль у генератарнай. Апрача электраабсталявання, па новых правілах пажарнай бяспекі ў кожным пакоі лазні патрабавалася ўсталяваць балоны парашковага пажаратушэння. Прыладжаныя на кранштэйнах да сценаў, прадаўгаватыя, акруглай формы, чырвонага колеру балоны, як падавалася хлопцам, упісваючыся да інтэр'еру памяшканняў, мелі сваю адметную асаблівасць. Прыцягваючы ўвагу чырвоным колерам сваёй афарбоўкі, яны насцярожвалі яшчэ пакуль незразумелым прынцыпам выкарыстання.

У палову пятага дня выйшаў з будынка гасцявога дома Аляксандравіч з праводзіўшымі яго Мікалаевічам ды Яўсеевічам, ступіў некалькі крокаў ад ганку ў накірунку да верталётнай пляцоўкі, дзе стаяў верталёт, убачыў, як з дзвярэй лазні на мансарду выскачыў Сярога-Рэйнджэр, якога падштурхоўвалі Андруха, Фёдар ды адзін з электрыкаў, іхні брыгадзір. Услед за іхнымі спінамі заклубілася белае, нібыта з мукі, воблака. Паскорыўшы хаду, паспяшаліся да лазні.



– Усё ў парадку, усё ў парадку, – крыху вінавата ўсміхаючыся, супакойваў брыгадзір электрыкаў падыйшоўшых да ганку лазні кіраўнікоў ды выходзячых на мансарду праз дзверы з лазні абсыпаных з ног да галавы, нібыта мукой, парашком з балона для тушэння пажару хлопцаў, – усё нармальна, гэта здароўю не пашкодзіць, гэта я асечку даў, памыліўся.

Змантіраваўшы на калідоры, у памяшканні прыхожага пакоя, у памяшканні адпачынку ды мыйным аддзяленні балоны для пажаратушэння, двое электрыкаў пачалі раскідваць па праекце электраправодку. Трэці, іхні брыгадзір, выстаўляў балоны ў працоўны рэжым. Пачаўшы з памяшкання пярэдняга пакоя, дзе Фёдар з Андрухай абкладвалі печку цэглай, электрык, узвёўшы баёк, памыліўся, не паспеўшы уставіць кантрольны шплінт, так званую чаку. Баёк спрацаваў і праз некалькі секундаў балон выпусціў пад ціскам белы парашок тушэння. Электрык толькі і паспеў папярэдзіць Фёдара ды Андруху, што працавалі побач. Сярогу-Рэйнджэра, набіваўшага ў калідоры вагонку на сцяну, гэтая троіца ўцекачоў проста выпіхнула перад сабой праз дзверы лазні на мансарду.

– Ты, братка, не асечку даў, – страсаючы з сябе белы парашок, Барыс усміхаўся, нахіляючыся, тупаючы па падлозе мансарды, – ты, братка, у самае яблычка патрапіў, акурат у дзясятачку.

– Так, зразумела, але не зразумела, а дзе ж яшчэ двое? – Мікалаевіч, усміхаючыся са знешняга выгляду сваіх падначаленых, стоячы каля прыступак ганку, закруціў па баках галавой.

– Ды тут мы, ліха тое бяры, – з-за вугла лазні з боку ракі з'явіўся ўвесь убелены, нібыта прывід, Віцёк, а следам – мацюкаўючыся на поўнае веданне жанру, такі ж убелены Юрась-Фаза.

Пабачыўшы, нібыта ў пасыпаных мукой прывідаў-таварышаў, хлопцы ўсё разам зарагаталі.

– Хлопцы, а вы адкуль такія з'явіліся? – Мікалаевіч, спытаўшы, не змог стрымацца ад смеху.

– Адкуль, адкуль, – Юрась, матляючы галавой, наблізіўся да ганку, страсаючы абедзвюма рукамі з валасоў белы парашок, і пачаў смяяцца, – з Віцьком каля вакна адкрытага вагонку знутры набівалі. Штосьці дзесьці бахнула, ну, і вядома, яно ж ляціць, дзе прастора ёсць – праз пакой, ды ў расчыненае акно. Не ведаючы, што да чаго, ды ад чаго, мы разам з Віцьком і сіганулі, праз акно ўшчаміліся, амаль адначасова і выскачылі.

– Паколькі гэта наш пракол, Мікалаевіч, мы зараз хутка лазню ад парашка вычысцім, выправім становішча. Хадзем, хлопцы са мной, пыласос ды балон на замену прынясем, – брыгадзір электрыкаў, пазваўшы за сабой двух сваіх падначаленых, рушыў да генератарнай.

22.

– Сярога, то мы ж з табой з аднаго райцэнтра. Я добра ведаю тваю настаўніцу, класнага кіраўніка пад час твайго навучання ў школе, – Аляксандравіч звярнуўся да Сярогі-Рэйнджэра, – неяк яна казала, што і ў школе ты быў не надта пакладзістым вучням, ленаваўся.

– Аляксандравіч, – Сярога-Рэйнджэр напачатку вылупіў быў на таго вочы ды потым абмяк, – а пры чым тут тая мая класная кіраўнічка, ды і на самой справе, адкуль ёй ведаць, які я быў, ну, і да чаго гэткі ваш выпад у мой бок? Мне ўжо во дваццаць пяць гадоў, я і ў войску ўжо адслужыў. І-і-і, – Сярога вытрымаў паўзу, – штосьці я вас не разумею.

– Ну, вось тут за апошні месяц ты якую катэгорыю па заробку атрымаў, трэцюю. Ленавата працуеш, тут жа за тое, што прыбыў сюды, грошай не атрымаеш, іх жа трэба зарабляць, – Аляксандравіч паспрабаваў неяк аргументаваць сваё, як яму самому падалося, неўпапад выдадзенае тлумачэнне.

– А мяне, Аляксандравіч, мой заробак задавальняе. Я во тут, у тайзе, дыхаю свежым паветрам, любуюся таёжнымі краявідамі, харчуюся свежапрыгатаванай ежай, цішыня, спакой.

Рыбу сам вуджу ў вольны ад працы час на рацэ. Я сюды болей за ўражаннямі прыбыў, пакуль малады. Маючы жаданне свет паглядзець, я адчуваю сябе тут, і сапраўды, дзіцём прыроды.

– Ну, галоўнае што ты задаволены, – Аляксандравіч, павярнуўшы галаву ўлева, паглядзеў на стояўшага побач брыгадзіра Мікалаевіча.

– Ды на наступны месяц, што тут яму працаваць яшчэ дзесяць дзён, думаю, што пацягне Рэйнджэр наш на першую катэгорыю, – Мікалаевіч заўсміхаўся, – зараз во працуе, напружыўшыся на ўсе свае сто магчымых працэнтаў.

– Ну, калі патрэбна, то я, – Сярога крыху засмуціўся, – магу і напружыцца дзеля агульнай справы.

Верталёт, узняўшыся над тайгой, абляцеў традыцыйна кругам над базай, ўзяў патрэбны накірунак і хутка знік з відавоку.

23.

Глянуўшы на гадзіннік, крыху паразважаўшы ды выйшаўшы з парылкі, дзе разам з Юрасём-Фазай Віцёк майстраваў палок, ён прайшоў з пакоя для мыцця праз пакой адпачынку ў прыхожую, агледзеў рэшты аб'ёмаў працы па набіццю вагонкі і звярнуўся да Фёдара.

– Фёдар, шмат яшчэ ў вас працы.

– Ды не, мне трэба дакласці апошнія тры рады, а потым на гару перабяромся. Дымаход адтуль на дах нам засталося вывесці, і … фініш!

– Добра, – Віцёк, глянуўшы на Сярогу-Рэйнджэра, падбіваўшага вагонку да столі з высокага табурэта, звярнуўся да таго, – Рэйнджэр, ну, ты асцярожней з гэтым табурэтам, не рызыкуй. Там, на мансардзе, козлік нядрэнны стаіць, мо з яго зручней будзе.

– Ды не, Віцёк, я ж росту высокага, з козліка таго нязручна мне столь падбіваць, выгінацца спіной давядзецца, з табурэта мне як і трэба, зручна, – Сярога адарваўся ад занятку і з незада-

воленым выразам твару глянуў, стоячы на табурэце, з-пад столі на Віцька – маўляў, навошта ад працы адрываеш, час аднімаеш.

– Так, хлопцы, палова дзевятага вечару. Мішка-кухар падыходзіў, казаў, калі што, на вячэру раней прыходзьце. Хадзем падсілкуемся і да паловы адзінаццатага крыху адпачнем, калі да раніцы ўправімся, тады баста.

– Слухай, а што ты тут, я пільна гляджу, ежу толькі гатуеш, а самы дзелавы, ну, быццам ты тут самы галоўны, – зваршчык-сантэхнік, жуючы сваю грэцкую кашу з аленінай, як падалося хлопцам, недарэчна зробленым выпадам у бок повара, звярнуў на сябе такім чынам ўвагу.

– Табе што, братка, не здаровіцца, ці цябе там на базе дрэнна кармілі, ці ты, адбываючы адсюль паслязаўтра, закарцеў уміг у галоўнага тут пераўвасобіцца? – Мішаня-повар, трымаючы апалонік над каструляй, звярнуўся да хлопцаў, – калі хто жадае дабаўкі, падыходзьце, нагатавана дастаткова.

– Дабаўкі, – не ўнімаўся зваршчык-сантэхнік, – гэткія порцыі панакладваў, што і без дабаўкі не з'ясі, жывот трэсне. А як спісваць прадукты будзеш? Калі па поўнай, то ў хлопцаў столькі павылічваюць з заробкаў за харчаванне, што з голым шышом дадому вернуцца, колькі я во тут, то ты ўсё валіш ды валіш. У вас што, заўсёды гэтакія навароты?

– Апрача наваротаў, нярэдка ў нас ёсць і дэлікатэсы, – Віцёк з зацікаўленасцю пaглядаў на наваспечанага аратара, прыкідваючы ў мазгах, як лепей гэтага фраера асадзіць на яму адведзенае сантэхнічнае месца, – ты, братка, сярод нас не першы дзень, а ніхто пакуль ні імя тваё, ані прозвішча не ведае. Так сказаць, інкогніта прыбыў, інкогніта і адбыў.

– А вам яно трэба, імя маё ды прозвішча, – зваршчык-сантэхнік, трымаючы лыжку над міскай, напружыўся, праглынуўшы ежу.

– Ды яно і не трэба, каму цікава будзе, у табелі пабачаць, што ты за птушка такая залётная, – Андруха, седзячы за сталом насупраць залётнага незнаёмца, закруціў па баках галавой.

– Еўдакімам мяне клічуць, – расслабіўшыся, звар-шчык-сантэхнік прыпусціў галаву над міскай, нібыта разважаючы, як гэта ўсё з'есці, – не, не Еўдакім я, Анатоль, Анатоль Гапееў.

– Анатоль, а чаго гэта ты сярод нас нейкі не-аа-дээк-ваатны, – Юрась-Фаза ўстаў з-за стала, падыйшоў да пліты і спытаў у повара, – Мішаня, а рыбка ў нас на дэлікатэс маецца па твайму рэцэпту?

– Абавязкова, як заўсёды, – повар зняў крышку з вялікай каструлі на пліце і паказаў далонню правай рукі, – калі-ласка, частуйцеся, на ўсіх хопіць.

– Я неадэкватны? Ды я самы адэкватны з усіх знаходзячыхся тут, – Анатоль узняўся з-за стала, падыйшоў да пліты, – а мне можна пачаставацца вашым дэлікатэсам?

– Ды бяры, калі-ласка, частуйся, – повар адыйшоў на крок убок, каб Анатоль змог дацягнуцца да каструлі з рыбай.

– Я тут самы адэкватны, таму што я ўжо сваю, пастаўленую мне баявую задачу выканаў: ваду падвёў і халодную,і гарачую. Пасля вячэры пайду адпачываць, а вам яшчэ да раніцы змагацца.

Віцёк, устаўшы з-за стала, падыйшоў да пліты, дацягваючыся правай рукой да каструлі за рыбай, як бы незнарок піхануў злёгку левым плячом разварнуўшагася адыходзіць Анатоля ў левае плячо. Прысеўшы на сваё месца, Віцёк завёў гаворку пра добраўпарадкаванне тэрыторыі і звярнуўся да ўплятаючага за абедзве шчакі марынаваную свежапрыгатаваную рыбу Анатоля.

– А ты, братка, назаўтра чым займацца будзеш? Верталёт за табой ды дэмбелямі прыбудзе паслязаўтра.

– Назаўтра – адпачываць, а што жа яшчэ мне рабіць?

– Ну-у, – Віцёк, пакруціўшы галавой, агледзеў хлопцаў і як бы абыякава прамовіў, – твая справа, ды тады назаўрта ў табелі ў цябе выхадны дзень стаяць будзе. Калі цябе гэта задавальняе…

Анатоль, праглынуўшы ежу, прызадумаўся, гледзячы на Віцька.

– Ну, калі які занятак мне знойдзецца, то я не супраць яшчэ дзень папрацаваць тут.

– Калі згодны, назаўтра далучышся да двух тых хлопцаў, што займаюцца добраўпарадкаваннем тэрыторыі. Разам з імі потым верталётам і адбудзеш.

– Згодны, што мне час марнаваць дарэмна, грошы трэба зарабляць, – наліўшы ў свой кубак кіпеню, заварыўшы каву з цукарам, выдзеленую па просьбе Мішаняй-поварам, сказаўшы, што пойдзе адпачываць да раніцы, Анатоль нетаропка, нясучы свежапрыгатаваную каву перад сабой у правай руцэ, выйшаў праз прыадчыненыя дзверы балка кухні-сталовай.

– А казачок гэты засланы, не іначай, – Андруха, усміхаючыся, выдаў сваё ўражанне, паглядаючы на рэакцыю Віцька.

– А як жа, не ў казку мы сюды патрапілі, не ў казку, – Віцёк паставіў рукі лакцямі на стол, склаў разам далоні, паволі стомлена пакруціў галавой і агледзеў хлопцаў, – адна справа, што брыгадзір Мікалаевіч кожны вечар з базай на сувязі па рацыі, альбо калі-нікалі Яўсеевіч. Ці прараб наш Аляксандравіч там пра нашы справы распавядзе. А калі вось такі во дзятлік, – Віцёк пастучэў пальцамі правай рукі, сціснутымі ў кулак па сталу, – гэта ўжо іншы ўзровень, іншая прыступка ведання там, што да чаго, ды як у нас тут.

24.

Зацягнуўшы інструмент, ночвы, патрэбную колькасць цаглінаў па драбінах на гару лазні, зрабіўшы ў ночвах адпаведны раствор з гліны, пяску ды крыху цэменту, Фёдар з Андрухай прыселі каля дзверцаў гары, каб адпачыць, углядаючыся ў прыцемак ночы.

– Глядзі во, у начы тут не так цёмна, як ў нас. Лета надыйдзе, то будзе магчымасць і газету чытаць, – Фёдар запаліў цы-

гарэту, – а на Палярным крузе ды за ім, дзе ў свой час давялося пабываць, сонца летам наогул не заходзіць, круціцца навідавоку цэлыя суткі табе над галавой па небе.

– Цікава, – Андруха запаліў цыгарэту, – магчыма, і мне пашанцуе туды калі патрапіць, пабачыць. Фёдар, а колькі нам тут яшчэ выкладваць?

– Зараз, – Фёдар, падсвяціўшы запалкай, глянуў на гадзіннік, – зараз палова чацвертай гадзіны ночы, – Фёдар быў у задуменні, гледзеў на неабкладзеную металічную дымавую трубу, што выходзіла за дах, – дзесьці, Андруха, гадзін да сямі раніцы змайструем і абкладзем.

– Фёдар, ты яшчэ ўцямліваеш?

– Уцямліваю.

– А я ўжо не.

– Андруха, давай яшчэ цагліну, – выклаўшы пададзеную, запатрабаваўшы наступную ды не атрымаўшы патрэбнае, Фёдар паглядзеў у бок, дзе ляжалі падрыхтаваныя цагліны. Андруха, прысеўшы каля ўцепленага шклаватай бака халоднай вады, абапёршыся на таго спіной, спаў, пераможаны вялікай стомай, павярнуўшы галаву крыху на левы плячук, трымаючы рукі ўздоўж тулава. Зразумела, малады хлопец, прытаміўся.

Выклаўшы астатнія тры цагліны, прасунуўшы тыя праз дзіркі каля трубы вышэй за ўзровень металачарапіцы даху, Фёдар глянуў на гадзіннік. Сем гадзін трыццаць хвілін раніцы, як і разлічваў, вопыт ёсць вопыт. Яго, як кажуць, ды яго вялікасць майстэрства не прап'еш, ды тут і выпіць няма чаго. Вакол тайга ды дзікія звяры, і ніводнай крамы паблізу. Фёдар заўсміхаўся. Прысеў каля Андрухі, абапёршыся спіной аб бак халоднай вады, запаліў цыгарэту.

Праз рамку адчыненай дзверцы гарышча лазні Фёдар убачыў, як па сінім моры ў ясны сонечны дзень аднекуль ды некуды з надзьмутымі ветразямі паволі ідуць караблі розных памераў ды прызначэнняў. Вунь – баявы, вялікі, з гарматамі навідавоку з

левага па хадзе таго боку, а вунь – крыху меншых памераў гандлёвы, з настаўленымі на палубе ў два рады, адна на адну, бочкамі. Пасля ўбачанага наступнага з надзьмутымі ветразямі ды людзьмі на палубе, махаючымі камусьці рукамі, Фёдар, напрогшы мазгі, матлянуў па баках галавой. Якія караблі, адкуль ветразі? Гэта ж аблокі ў ранішнім сонечным небе. Во блін, двое сутак без сну і амаль адпачынку, акрамя часу прыёма ежы, гэта ж міражы.

Ён падпоўз да дзверцаў гары, глянуўшы ўніз, нейкі тэрмін паразважаў, ці хопіць сілаў злезці долу. Паволі выбраўся на драбіны, прыступка за прыступкай зніжаўся, пры кожным саступе перамагаў жаданне вось так, стоячы на нахіленых драбінах, трымаючыся абедзвюма рукамі, прыпаўшы да вось гэтай во нахіленай апоры, заснуць. «Зваліцся, трэба злазіць, зваліцся, трэба злазіць,» – казаў сабе ў думках, разважаючы, што можа лепей было б там наверсе адпачыць, прылегчы паспаць, цёпла ж ужо. Саступіўшы з апошняй прыступкі на зямлю, Фёдар супакоіўся, абыйшлося. Не заўважыўшы нікога на тэрыторыі, вырашыў перш, чым пайсці адпачываць, завітаць у пабудову лазні. Фёдар паволі ўзняўся па прыступках ганку на мансарду і прайшоў у калідор праз незачыненыя дзверы.

У пярэднім пакоі Сярога-Рэйнджэр спаў, прылегшы на лаву, з левага ад ўваходу боку, каля акна. Юрась-Фаза, прымасціўшыся ў правы ад увахода далейшы вугал, кімарыў, абапёршыся спіной аб правую сцяну, правую нагу паклаўшы на лаву ўздоўж тарцовай часткі пакоя, а левую звесіўшы долу, склаўшы рукі перад сабой, схіліў галаву на правае плячо, абапёршыся аб вугал. У адпачывальным пакоі на лавах вакол стола мірна сапелі астанія хлопцы, не хапала толькі Віцька. Ледзь вяртаючыся да выхаду, Фёдар усё ж вырашыў заглянуць у парылку. Прайшоў у мыечны пакой праз адчыненыя дзверы і заўважыў Віцька, адпачываўшага на палку, якога сам і майстраваў. Фёдар накіраваўся да выхаду. Усе тут, усё ў парадку, як і патрабавалася, лазня адбудавана ў намечаныя тэрміны.

Пры падыходзе да балка пражывання ўбачыў Анатоля, шыбаваўшага да кухні-сталовай. Фёдар толькі і падумаў што на сняданак не пойдзе, бо там за сталом і засне. Зняўшы абутак, паразважаўшы, што яшчэ хопіць сілаў залезці адпачываць на сваё месца на другім ярусе драўляных нараў, здзейсніўшы апошнія патрэбныя намаганні, Фёдар пачаў засынаць. І раптам ўявіліся яму караблі з надзьмутымі ветразямі ў ясны сонечны дзень, што па сіняму мору ішлі павольна аднекуль у невядомае.

25.

Прачнуўшыся ад таго, што таргануліся драўляныя нары на другім паверсе, на якіх адпачываў, Фёдар заўважыў, што Віцёк з Юрасём-Фазай зноў тузаюцца, высвятляючы адносіны, адзін аднога трасуць за грудзі, паваліліся разам на праходзе паміж уздоўж дзвюх стаячых з правай ад уваходу сцяны і чатырох упоперак злева дзвюх’ярусных нараў, развярнуўшы набок столік ды табурэт.

– Зараз я табе растлумачу па-народнаму, – Віцёк, устаўшы з падлогі, аддыхваўся, – шукаеш усё, дзе лягчэй, ды намалявацца перад бугром, каб другога падставіць.

– Чаго я шукаю, – Юрась, аддыхваючыся, лежма на падлозе, узняўся на ногі, – дзе лягчэй я знаходзіў, каго я падстаўляў? – Юрась, жэстыкулюючы рукамі, стаяў насупраць Віцька, абураўся.

– Дзе, што, каго? Ты з кім зараз працаваў, з кім палок парылкі рабіў, а потым куды перамятнуўся? – Віцёк, нахіліўшыся, паправіў падушку на сваім месцы ніжняга яруса нараў у вуглу уздоўж правай сцяны ад уваходу.

– Палок, – Юрась адыйшоў да свайго лежбішча, ад уваходных дзвярэй прайшоў налева, прысеў, развёў рукамі, паклаў іх на калені, – слухай, там работы заставалася для аднаго цябе няшмат, а Рэйнджэр закапаўся вісець пад столлю, таму да яго кінуўся дапамагаць. Адначасова жа і ты дарабіў, і мы з Рэйнджэрам.

– Слухай, ты тут не тыкай і не мыкай, цябе даўно ўжо раскусілі, – Віцёк, прысеўшы на ложак, прылёг, заклаўшы рукі на падушцы за галаву, – ты-мы, мы-ты. Тытымыты ты, табе абы штосьці замуціць, а потым шмыг і…

– Шмыг і, што і? – Юрась, прылёг на месца, дзе адпачываў, паглядаючы са свайго вугла ў працілеглы па дыяганалі вугал на Віцька.

– Што і, і як мышка пад венік, і нібы з гуся вада з цябе, а хлопцам потым катэгорыю рэжуць ад тваёй дапамогі. З Рэйнджэрам не пройдзе. Яму першая будзе, а табе, – Віцёк на імгненне замоўк, – табе як Мікалаевіч вырашыць. Ён цябе раскусіў.

– Што вы тут зноў за базар развялі амаль, як бабы, – Сярога-Рэйнджэр, прылёгшы на сваё месца над Віцьком, звярнуўся да Фёдара:

– Фёдар, а ты абедаў?

– Ды не яшчэ, а колькі зараз часу?

– Дзве гадзіны дня, Мішаня-повар вас чакае.

– Каго гэта вас? – Фёдар злез са свайго ложку.

– Каго вас, цябе ды Андруху. А дзе ён падзеўся? – Рэйнджэр, лежачы, закруціў галавой па баках.

– Калі няма, то ён тады на гары лазні, яшчэ адпачывае. Пайду будзіць, паесці ж трэба.

26.

Распаліўшы ў печцы лазьні трэскі, закінуўшы невялікі ахапак дроў Фёдар глянуў на гадзіннік. Шаснадцаць гадзін, акурат да дзевятнаццаці лазня пратопіцца, трэба яшчэ дроў паднесці. Сыходзячы з ганку, глянуў управа, дзе трое хлопцаў, займаючыся добраўпарадкаваннем тэрыторыі, складвалі дровы. Фёдар прыкмеціў, што амаль усе астатнія, хто адпачываў пасля дзвюх сутак бесперапыннай працы, тусуюцца побач, паляць цыгарэты, паглядаюць на першы дым з дымавой трубы, дзе палалі дровы печкі лазні і, аб нечым жартуючы, усміхаюцца. Сыйшоўша-

му з апошняй прыступкі ганка Фёдару амаль пад ногі з левага боку, ад ракі, кінулася радасна-усхваляваная сабака Дзіна.

– Дзіна, ты чаго, Дзіна, ты чаго? – Фёдар глядзеў на сабаку, што кідалалася яму пад ногі, узбуджана-радасна адскокваючую, усхвалявана рычэўшую, – Дзіна ты чаго?

Урэшце-рэшт зразумеўшы, што тая кліча яго пайсці за сабой, Фёдар падаўся на яе заманьванне. Мінаючы мансарду лазні, Дзіна звярнула ўлева уздоўж сцяны, і Фёдар заўважыў каля вугла пабудовы прыхаванага ў бярозках сабачку-шчанюка з шэрай  кудлатай доўгай поўсцю. Дзіна заскавытала, падалася да цяперашняга свайго выхаванца, крутануўшыся каля таго, спуджана паглядаўшага на паволі падыходзячага незнаёмца, і падскочыла да Фёдара. Той пагладзіў Дзіну, прысеў на кукішкі і пачаў ціхенька хлопаць у далоні. Сабака-шчанюк візжаў, тупаючы на месцы, прыгнуўшы калені, на чатырох лапах рабіў некалькі крокаў наперад, круцячы па баках галавой, з падвізгваннем даваў задняю хаду і зноў вяртаўся на сваё у бярозках месца. Дзіна мітусілася, падскоквала то да шчанюка, прыпусціўшы долу да того морду, то да ў дзвюх метрах ціхенька хлопаючага ў далоні Фёдара. Урэшце-рэшт, як здольны навучэнец, кудлаты шчанюк, падскочыўшы да прысеўшага на кукішкі Фёдара, радасна, усхвалявана падбрэхваючы, круцячы па баках галавой ды хвастом, дазволіў таму сябе пагладзіць, развярнуўся на сто восемдзесят градусаў, падскочыў і схаваўся на сваё ў бярозках месца. Дзіна, супакоіўшыся, прысела каля Фёдара.

– Дык вось, у чым справа – Фёдар, пагладжваючы сабаку, абапёрся спіной аб сцяну лазні, – гэта і ёсць той шчанюк, пра якога ўчора хлопцы казалі, што паляўнічы-прамыславік-эвенк, дамовіўшыся з Яўсеевічам, даставіў табе, Дзіна, на выхаванне. Ну, малайчына, Дзіна, ну, малайчына, ты выхаваеш яго належным чынам для выжывання ў гэтай такой бязмежнай таёжнай прасторы.

Узняўшыся на ногі, крыху нахіліўшыся, пагладзіўшы Дзіну, Фёдар накіраваўся надалей займацца сваёй справай. З боку мансарды заўважыў з дымавой трубы моцны дым, узышоў на ганак, пракрочыў праз мансарду ў калідор і здзівіўся двум паленцам, ляжачым перад топкай печкі. Прабіваючыяся праз дзверцу язычкі полымя насцярожвалі. Апрануўшы рукавіцы, пакладзеныя побач з вядром з вадой для пажарнай бяспекі, адчыніўшы дзверцу топкі, Фёдар выцягнуў некалькі ўпаліўшыхся паленняў, прытушыўшы іх у вядры з вадой. Цікава, памочнік знайшоўся, зараз разбяромся, хто ж гэта такі. Нетаропка ідучы праз мансарду да прыступак ганку, глянуў управа, дзе каля траіх хлопцаў, складваючых дровы, бадзяліся некалькі адпачываючых, і заўважыў, што Юрась-Фаза паліць цыгарэту каля калоды для рубкі дроў з усаджаным у яе тапаром і глядзіць з-пад ілба убок лазні. Фёдар зразумеў што гэта ён, дапамагаты.

– Цябе, братка, хто прасіў, звяртаўся за дапамогай? – Фёдар, падыйшоўшы да гурта стаў адносна Юрася-Фазы на адлегласці так, што калі спатрэбіцца, каб зарадзіць таму ў левае вуха.

– Ды я каб лазьня хутчэй пратапілася падкінуў крыху, бо ты адыйшоў кудысьці за лазню, – Юрась зрабіў два крокі назад і адыйшоў прэч ад усаджанай ў калоду сякеры, вызваліўшы Фёдару доступ да дзяжурнага інвентара.

– Лазня топіцца не хутчэй, а неабходны тэрмін, каб вада ды камяні праграваліся адпаведна рэжыму, – Фёдар, выдзярнуўшы правай рукой сякеру, нахіліўся, левай узяў чурбак і паставіў той на калоду. Трымаючы сякеру правай рукой апушчаным уніз, агледзеў зявак ды траіх хлопцаў, што складвалі дровы ў радок, але прыпынілі працу і запалілі цыгарэты, паглядаючы ў ягоны бок. Потым дадаў:

– Назаўтра ў нас тры дэмбелі, адпаведна і кола зносінаў тут звужаецца, адпаведна зніжаецца і запас майго гумару. І ўрэшце-рэшт некалі ён закончыцца.

– Хто закончыцца? – Віцёк, лыпаючы вачыма, затупаў на месцы, нязграбна варочаючы тулавам па баках.

– Ён, братка, мой гумар, і тады, – Фёдар закруціў галавой па баках, – паплывеце вы ў мяне па Чоне, а я, па прычыне, што тут мы без пашпартоў, у Кітай падамся, тут недалёка.

– А як мы, на чым мы паплывём, – Юрась-Фаза, скорчыўшы міну непаразумення, з-пад ілба паглядзеў на Фёдара і замёр у нерухомасці, трымаючы пальцамі правай далоні перад падбародкам цыгарэту.

Фёдар, узняўшы правай рукой сякеру угору, махануў ім па чурбаку так, што той раскалоўся на дзве паловы і зваліўся з калоды долу.

– А я вас усіх папросту пасяку, як гэты чурбак, і ўся справа!

З кароткага ўзмаху ўсадзіўшы сякеру ў калоду, набраўшы ўнушальны ахапак дроў, Фёдар моўчкі павольна накіраваўся да ганку лазні.

– Фёдар, ну як лазня, як печка працуе? – Яўсеевіч з Мікалаевічам падыйшлі да ганку і спыталі ў Фёдара, паліўшага цыгарэту на мансардзе, прысеўшы на столак. У адказ яны пачулі, што ўсё працуе выдатна і, у добрым настроі ўзняўшыся на ганак, прайшлі ў расчынененыя дзверы калідора лазні агледзець, пацікавіцца.

– Так, сапраўды добра, галоўнае што ў тэрмін паспелі, – выходзячы на ганак лазні разам з Яўсеевічам, Мікалаевіч звярнуўся да Фёдара, – слухай, назаўтра і паслязаўтра вы яшчэ адпачываеце, ды тут, Фёдар, наш Яўсеевіч назаўтра прыхопіць цябе з сабой пасля сняданку. Вы ўверх па цячэнню пойдзеце, там за пятнаццаць кіламетраў, на возеры трэба праверыць сеткі, што ўчора ён на карася паставіў. Ну што ты, згодны?

– Мікалаевіч, я з задавальненнем, па рацэ і на маторцы, да таго ж таёжныя краявіды агледзець атрымаецца з верхавым возерам, што вышэй узроўню ракі. Пабачыць такое цікава будзе

– Ну, тады добра. Яўсеевіч, назаўтра пасля сняданку і забірай яго, няхай злётае з табой, – сыйшоўшы з ганку, Яўсеевіч з Мікалаевічам накіраваліся да ракі.

27.

Прачнуўшыся, як звычайна рана, на гэты раз не пабудзіўшы хлопцаў да сняданку, каб не спазніцца на працу з васьмі гадзін, бо быў выходны дзень, Фёдар выйшаў з памяшкання, прысеў на лаву ў абсталяваным месцы і запаліў цыгарэту. Ранішняе сонейка, ласкава прабіваючыся праз кароны высокіх дрэваў, узнімала настрой. За балком сталовай, адкуль даносіўся прыемны пах свежапрыгатаванай Мішаняй-кухарам ежы, па галінках дрэваў спрытна скакала нічога не баючыся знаёмая вавёрачка. Прыгожа, як бы знарок балансіруючы пры скачках сваім пухнатым хвастом, упэўнена адчуваючы сябе ў сваёй стыхіі.

– Слухай, Фёдар, – пасля сняданку Анатоль, выходзячы са сталовай, звярнуўся з пытаннем, – хутка верталёт прыбудзе, мне адбываць. Аляксандравіча сягоння не будзе, а ён наказаў мне, каб рыбу я прыхапіў з сабой, што тут навудзілі прарабам з базы. А да каго мне звяртацца наконт той рыбы?

– Гэта, братка, не да мяне. Мяне сюды не рыбу вудзіць закінулі верталётам.

– А да каго?

– Звярніся да Мішані-повара альбо да Віцька, ён тут па вудзенню рыбы галоўны.

– А чаму ён галоўны?

– Таму што пагадзіўся, падпісаўся на гэта.

Пабачыўшы Яўсеевіча, выйшаўшага з дома на ганак, трымаючага на правым плячы карабін, а ў левай руцэ рукзак, матлянуўшы яму галавой, маўляў выпраўляемся, Фёдар ціхенька ўвайшоў у балок пражывання, апрануў цёплую вопратку, і гэтак незаўважна выйшаў, каб не пабудзіць адпачываючых хлопцаў, і хутка пашыбаваў да ракі.

– Яўсеевіч, а чаго гэта, як за паваротам улева пайсці па рацэ, то тут дзе-нідзе такія вялікія магутныя дрэвы выраслі, а некаторыя з іх абгарэўшыя. Тут што, калісьці пажар адбыўся?

Яўсеевіч, заглушыўшы японскі рухавік дзюралевай лодкі-казанкі, прыўстаў з сядзення, нахіліўся за борт, зачэрпнуў вайсковым кацялком вады, папіў сам і працягнуў кацялок Фёдару. Спатоліўшы смагу трыма глыткамі, Фёдар падзякаваў.

– Так, тут у семідзесятыя гады дваццатага стагодзя вялікі пажар адбыўся. Лета дужа спякотнае тады выдалася, шмат гектараў тайгі тады павыгарала, а там, дзе зараз наша база пабудавана, усё павыгарэла ўшчэнт, пад самыя карані. Таму і тайга зараз там невысокая ды густая, адрадзілася за гады, прырода.

Пасля чарговага павароту па рацэ направа на правым беразе па руху маторкі, Фёдар заўважыў пабудаваны на высокім беразе гожы і дыхтоўны драўляны дом, гаспадарчыя пабудовы, лазню, агароджаныя драўляным шчыкетнікам, і з зацікаўленасцю звярнуўся да Яўсеевіча.

– Яўсеевіч, а што гэта за сядзіба такая збудаваная зараз убачылі, у самой ў тайзе, пражывае хто там?

Яўсеевіч, кіруючы лодкай-казанкай прыстасаваным аўтамабільным рулём, узяў бліжэй да правага берага, скінуў газ і сцішыў ход.

– Тут пражывае паляўнічы-прамыславік з жонкай ды сынам. Мінулы раз, калі я сеткі ставіў, да яго зарульваў, сябруем мы з ім, – параўняўшыся з сядзібай, Яўсеевіч яшчэ больш сцішыў рух лодкі, – сягоння, бачыш, ніхто не выйшаў да берага, – значыць, дзесьці яны ў тайзе. Пачатак лета, заняткаў зараз шмат, – Яўсеевіч, даўшы газу, накіраваў лодку да сярэдзіны ракі, – нам яшчэ пяць кіламетраў, і на месцы будзем прызначэння.

Прычаліўшы лодку да правага берага, спрытна выскачыўшы, Яўсеевіч прывязаў яе вяроўкай да дрэва і матлянуў знакам рукі Фёдару.



– Цікава, Яўсеевіч, рака вунь дзе, унізе метра тры-чатыры, а зверху во возера. А дрэвы такія магутныя, у два абхваты, не меней.

Яўсеевіч, хутка накачаўшы нажным насосам двухмесную гумавую рыбацкую лодку, што была прыхавана каля вялікага дрэва, загадаў Фёдару ўзяць карабін ды рукзак, заскочыў ў спушчаны на ваду плывучы транспарт і прыладзіў вёслы.

– Адпіхні крыху ад берага ды запрыгвай, толькі падай мне карабін ды рукзак.

Пакуль Яўсеевіч веславаў ў вядомым яму накірунку, тым часам, седзячы на драўлянай лавачцы, Фёдар з зацікавасцю хлапечай аглядаў навакольныя краявіды.

– Што, не даводзілася такога пабачыць, – Яўсеевіч, усміхаючыся, звярнуўся да Фёдара, – бачыш якое возера вялікае, некалькі пратокаў сыходзяцца да цэнтра, куды мы зараз і накіроўваемся, пасля сядзеш на вёслы, а я сеткі здымаць буду.

Берагі, паросшыя ў асноўным нізкарослымі таёжнымі дрэвамі, лістоўніцамі, бярозкамі ды хмызняковымі раслінамі, што павырсталі і па пратоках з вады, некранутасцю даўніны стагоддзяў, насычалі Фёдара ўраджаннямі бачання вось такога пышнага захавання прыродай свайго першанароджання, можа ад сатварэння свету.

–Так, давай, Фёдар, на вёслы а я сеткі буду здымаць.

Пераходзячы на вёслы, саступаючы сваё месца Яўсеевічу, пры выхадзе пратокі на азёрную прастору, Фёдар прыкмеціў з правага боку па ходу лодкі ў пятнаццаці метрах прывязаны за вытыркаючую з вады састарэлую стваліну бярозкі канец рыбацкай сеткі. Зразумеўшы, куды патрэбна веславаць, уладкаваўшыся на месца ды пачаўшы вось гэтае самае дзеянне, Фёдар зразумеў, што не мае аніякага навыка кіраваць гэтакім надзіманым рыбацкім прыстасаваннем і тое не ўсё так проста. Лодка, матляючыся то ўлева, то ўправа, ніяк не жадала ісці ў патрэбным накірунку.

– Падвяслоўвай да сеткі, падвяслоўвай да сеткі, – Яўсеевіч даваў парады, стоячы на каленях, і нейк дацягнууся правай рукой да патрэбнага ствала бярозкі, – стоп машына, ну, што ты вяслуеш не так, як патрэбна, – трымаючыся правай рукой за ствол бярозкі, Яўсеевіч загадаў, – так, так, а зараз у накірунку, адкуль сетка з вады выходзіць, вяслуй няспешна, а я яе здымаць буду. Бяры крыху лявей па накірунку, каб сетка з правага борта ішла, зразумела.

Седзячы на вёслах, спіной па накірунку вызначанага шляху і пачаўшы веславаць, Фёдар, упершыню патрапіўшы на гэтакі плавучы сродак, спрабаваў уцяміць, што гэта азначае, браць крыху лявей па накірунку руху, каб сетка ішла з правага борта. Ці то ад ягонага веславання, ці то ад таго, што Яўсеевіч выбіраў сетку з нацягам, лодка ішла па накірунку руху то ўлева, то ўправа. Вырашыўшы выправіць накірунак лодкі, пры чарговым веславанні пайшоўшую ўправа, Фёдар, рэзка веслануўшы левай рукой адпаведна з правага борта па ходу, надаў плавучаму сродку энергіі закруціцца ўлева супраць гадзіннікавай стрэлкі так, што Яўсеевіч, знаходзячыся спераду лодкі, стоячы на каленках, аказаўся на патрэбным накірунку руху сеткі.

– Што ты творыш, вяслуй, вяслуй управа, – Яўсеевіч, павысіўшы голас, ажно закрычэў, – управа вяслуй, выпраўляй.

Не ўцяміўшы, што да чаго, ды ў якое ўправа, ды чым веславаць, усхвалявана разгубіўшыся, Фёдар, веслануўшы левым вяслом у той жа бок, а правым – у процілеглы, раскруціў сваімі намаганнямі лодку так, што яна, хутка закруціўшыся на месцы супраць гадзіннікавай стрэлкі, прыпынілася толькі, калі зрабіла два з паловай абароты. Фёдар, не ведаючы, як яе спыніць, толькі і нахіляў наперад спіну згінаючы, як мага ніжэй долу галаву, каб пры абаротах лодкі не заблытацца самому ў сетку, адзін канец якой з нацягам трымаў Яўсеевіч, а другі знаходзіўся на дне возера з прывязаным важкім грузілам.

Пасля спынення плавучага сродка Фёдар, узняўшы галаву, пабачыў цікавае відовішча і пачаў, стрымліваючыся, заходзіцца са смеху. Стоячы на каленях спераду лодкі, за яго спіной Яўсеевіч, абматаны з грудзей да галавы на два абароты сеткай, трымаючыся за борт далонямі, выпучынымі вачыма скрозь сетку глядзеў на яго. Каля левай шчакі ды злева падбародка, памахваючы хвастом, уладкаваўся карась даўжынёй мо сантыметраў дваццаць пяць. Яшчэ некалькі карасёў, патрапіўшы ў сетку, абляпіўшыя з усіх бакоў тулава Яўсеевіча, уцямліваючы, дзе гэта яны зараз апынуліся, паволі памахваючы хвастамі, зыркаючы наўкола вачыма, раскрывалі ды закрывалі, як падавалася Фёдару, ад здзіўлення свае раты. А карась тут і сапраўды нічога так, ладны – такі, што дома зрэдку калі вывудзіш. Ледзь стрымліваючыся са смеху, каб не ўзарвацца ў рогат, ацаніўшы тутэйшых карасёў, Фёдар уцямліваў, у які бок патрэбна веславаць, каб хутчэй вызваліць Яўсеевіча з гэтага такога прыкольнага палону.

– Што ты тут накруціў мне, што яшчэ за гым-гым? – Яўсеевіч заварочаў па баках галавой ад таго, што здаравенны карась, вісеўшы ў сетцы на твары галавой каля левага вуха ад шавялення Яўсеевічавай сківіцы, спрытна матляючы хвастом, лупцаваў таго па падбародку так, што гукі плясь, плясь, плясь, плясь разносіліся далёка ад месца размяшчэння лодкі з патрапіўшымі ў недарэчнасць рыбакамі, – давай, выварочвай назад, – плясь, плясь, плясь, плясь: карась, затурбаваўшыся зноў, выдаў па падбародку Яўсеевіча хлёсткія ўдары хвастом.

– Зараз, Яўсеевіч, выпраўлю, толькі разабрацца трэба, куды мне веславаць, – ледзь стрымліваючы смех, уцяміўшы, што патрэбна веславаць па гадзіннікавай стрэлцы, апусціўшы вёслы ў ваду, Фёдар паволі пачаў выпраўляць становішча.

Пасля трэцяй знятай сеткі, вяслуючы да чацвертай, у тую завадзь, што паказаў Яўсеевіч, Фёдар хацеў было сказаць, што ў яго атымліваецца амаль, як і патрэбна, трымаць лодку на вадзе па патрэбным накірунку, ды Яўсеевіч яго апярэдзіў.



– Бачыш во, у цябе ўжо і атрымліваецца амаль належным чынам. Наступны раз, я думаю, абыйдзецца без недарэчнасцяў. А кажуць, што два разы ў адну раку не ўваходзяць.

– Яўсеевіч, вы аб чым? – падвяслоўваючы лодку да апошняй пастаўленай сеткі, Фёдар запытаўся, не зусім уцяміўшы ў сэнс гэтых словаў.

– Ды ўсё аб тым, – Яўсеевіч усміхнуўся, – у мінулым годзе, калі дом адбудоўвалі, то я таксама браў сюды беларуса, – Яўсеевіч, гэкнуўшы, заматляў па баках галавой, – ты ведаеш, ён, як і ты сягоння, мяне тады абкруціў вось так той сеткай з карасямі. Рагатаў ён тады так, што рэха разносілася па ўсёй гэтай во акрузе. Потым нічога, асвоіўся, і без прыгодаў ды недарэчнасцяў яшчэ два разы мы з ім карасёў тут спраўна вудзілі сеткамі.

Паклаўшы спушчаную гумавую лодку ды сеткі на месца схова, даручыўшы Фёдару рукзак з карасямі, ускінуўшы на правае плячо карабін ды паказаўшы Фёдару знак рукой рухацца да лодкі, Яўсеевіч ішоў ззаду, азіраючыся па баках.

– Яўсеевіч, а што ты па баках галавой круціш, хіба пярнатых, калі з'явяцца, з карабіна зручна браць?

– Я не пярнатых выглядаю, а раптоўна каб нас з табой гаспадар тайгі не сустрэў тут. Таму і карабін з сабой, каб калі што, абараніцца. Мы тут гасьцюем, братка, гасьцюем.

Мінаючы сядзібу паляўнічага-прамыславіка пры вяртанні на базу ўніз па цячэнню цяпер з левага борта, павярнуўшы лодку па ручве ўлева амаль на дзевяноста градусаў, Яўсеевіч прыўстаўшы з месца, глянуў праз акуляры над ветравым шклом, рэзка даўшы газу, і паскорыў ход лодкі.

Праз нейкіх сто метраў заглушыўшы матор, схапіўшы карабін, перазарадзіў яго і зрабіў два прыцэльныя стрэлы ў пралятаючую невысока наперадзе невялікую зграйку дзікіх качак. З другога стрэлу адна качка, уздзёрнуўшыся ўверх наперад, абмякшы крыламі, і зляцела ўніз да вады, астатнія, злажыўшы

крылы, дзюбамі ўніз сіганулі да вады і, даўшы нырца, зніклі з відавоку, бліснуўшы сваім рознакаляровым апярэннем.

Яўсеевіч завёў матор, падруліў да ўпаляванай качкі, сцішыўшы ходу, і спрытна левай рукой закінуў здабычу ў лодку. Даўшыя нырца качкі вынырнулі з-пад вады, хутка ўзняліся ў паветра, збіўшыся ў зграйку, і даліся наўцёкі над ракой уніз па цячэнню. Рэзка газануўшы ўслед, наблізіўшыся да ўцекачоў, выключыўшы рухавік і спрытна ўхваціўшы карабін, зрабіўшы два стрэлы, Яўсеевіч парульваў, сцішаючы ходу лодкі да з другога стрэлу абмякшай і зляцеўшай у ваду качкі. Астатнія, як і ў папярэдні раз, склаўшы крылы, дзюбамі ўніз далі нырца і зніклі пад вадой. каб уратавацца ад небяспекі. Яўсеевіч, паклаўшы карабін на карму, спрытна левай рукой ухапіў з вады яшчэ адну напаляваную качку і закінуў яе ў лодку.

– Дзве хопіць, больш чым дастаткова. Нельга, прыроду берагчы трэба.

Прыбавіўшы газу, Яўсеевіч прайшоў над зграйкай качак, узняўшыхся ў чарговы раз з вады і далі зноў нырца для ўратавання ўжо за кармой адплываючай ад іх маторнай лодкі. Перад апошнім паваротам па рэчышчы ракі, направа перад базай, Яўсеевіч, пільна ўзіраўся наперад, запытаў у Фёдара, сядзеўшага побач, разглядаючы навакольныя краявіды.

– Глядзі што там, глядзі, вунь наперадзе?

– Ды нічога не бачна, Яўсеевіч.

– Глядзі, вунь мядзведзь наперадзе, на правым павароце, на беразе, на пяшчаным плёсе, – Яўсеевіч даў руля лявей, бліжэй да берага, каб прайсці правы паварот каля касалапага.

У нахіленага да вады, каб спатоліць смагу, у мядзведзя, ад гуку рухавіка і хутка з невядомасці з'явіўшайся лодкі, ўзняўшага погляд наперад перад сабой, Фёдар напачатку заўважыў пашыраныя вочы і такі моцна здзіўлены выраз ягонай морды.

– Гэй, гэй, гэй, гэй, – закрычаўшы з лодкі, пайшоўшай на правы паварот, Фёдар запляцкаў ў далоні, – гэй, гэй.

У імгненне здзіўлены выраз пысы касалапага змяніўся на рашучы. Прышчурыўшы вочы, у скачку павярнуўшыся на сто восемдзесят градусаў, моцна адпіхваючыся лапамі, гаспадар тайгі ў некалькі скачкоў угору ўзняўся на высокі бераг і знік з відавоку за паросшымі вышэй раслінамі хмызняку. За правым паваротам на даляглядзе з'явіліся пабудовы базы ды на верталётнай пляцоўцы прыбыўшы грузапасажырскі верталёт МІ-8.

28.

У другой палове трэцяга дня адпачынку, пасля адбыцця прыбыўшага за чатырма адпачываючымі гасцямі ды «дэмбелямі» верталёта, Яўсеевіч паклікаў Віцька, паставіўшы яму задачу на заўтрашні працоўны дзень, сам адбыў на суткі на ўсюдыходзе УАЗіку ў тайгу на паляванне. Ён прыхапіўшы з сабой карабін, паляўнічую стрэльбу, адпаведных боепрыпасаў ды харчу. Тым часам перадаў Віцьку ключы ад адной лодкі з рухавіком, ён дазволіў крыху пагойсаць, калі будзе жаданне, па рацэ. Пры гэтым трэба было абавязкова адвезці ўніз па цячэнню за другі паварот ракі вывуджаных гасцямі ды не ўпарадкаваных з дзесятак шчупакоў, што засталіся каля прыстані ў вадзе ў драцяной сетцы, каб закапаць іх пасля дзе-небудзь на процілеглым беразе. Сеўшы было ўжо ў аўто, запусціўшы рухавік і адчыніўшы дзверцу, Яўсеевіч зноў паклікаў Віцька.

– І яшчэ, Віцёк, значыць назаўтра механік Іван, што прыбыў да нас апошнім верталётам, будзе наладжваць судна на паветранай падушцы. Калі спатрэбіцца якая дапамога, то ён з Жэнькай, генератаршчыкам маім, да вас звернуцца, па патрэбе ды магчымасці дапаможыце.

– Лад, Яўсеевіч. Усё, што неабходна, зробім, дапаможам, – Віцёк махнуў услед адбываючаму Яўсеевічу рукой.

– Слухай, Фаза, а што гэта Мікалаевіча не бачылі мы ні ўчора і сягоння няма, а сам Яўсеевіч адбыў нейкі злы, як мне падалося.



– Слухай, Віцёк, а што табе Мікалаевіч, – Юрась-Фаза затупаў на месцы, стоячы каля генератарнай, чакаючы падыходзячага Віцька, – пайшлі да ракі шчупакоў тых закапаем, бо ляжаць з учарашняга дня – патрашыць позна, ды пагойсаем на маторцы па рацэ, клёва будзе.

29.

З раніцы наступнага дня, як звычайна ўзняўшыся раней за астатніх хлопцаў, у дваццаць хвілін восьмага, пачаўшы будзіць таварышаў да сняданку, Фёдар атрымаў у свой бок знак абурэння ад Юрася-Фазы. Маўляў, прачнецца той раней за астатніх ды шоргаючы сваімі, сорак шостага памеру ступнямі па падлозе, не дае ўсім астатнім адпачываць амаль яшчэ гадзіну, пакуль на працу выбірацца.

– Так, хлопцы, гараж будзе будавацца з лістоўніцы на гэтым лафеце, што змайстравалі ў мінулым годзе, – Віцек агледзеў хлопцаў, сабраўшыхся вакол месца пабудовы, – зараз разгрупуемся, хто чым будзе займацца. Фёдар з Барысом, вычышчайце тэрыторыю вакол лафета ды знутры будучай пабудовы. Шуфлі, граблі, лапаты – у генератарнай. Юрась, ты падводзь электрычны кабель ад генератарнай. Праводзь па дрэвах, на вышыні, хлопцы табе дапамогуць, – Віцёк глянуў у бок генератарнай, што знаходзілася непадалёку, направа ад пляцоўкі будучага гаража, калі стаяць перад ім тварам на раку.

Прыбыўшы ўчора механік Іван, стоячы на драўляным тратуары, змайстраваным ад гасцявога дома да генератарнай, аб чымсьці размаўляў з Жэнькай-генератаршчыкам каля самага ўваходу.

– Гэтых бярвенняў для сцен нам мала будзе, астатнія, значыць, са мной. Зараз завяду ГАЗон, з-за верталётнай пляцоўкі пператралюем яшчэ дваццаць бярвенняў, на сягоння гэта задача максімум. Яўсеевіч з палявання вернецца ўвечары, дазволіў лазню пратапіць. – Фёдар, – Віцёк запаліў цыгарэту запалкай, склаўшы далоні, каб ветрык на патушыў полымя, – па рас-

топцы лазні ты галоўны, прыбярэцеся тут, і зоймешся, і ніякіх дапамагатых каб болей не знаходзілася. Барыс, ты потым нам траляваць дапаможаш.

– Бачыў як Юрась на Віцька паглядаў, калі разыходзіліся па працоўных месцах, – Барыс, падчышчаючы пляцоўку будаўніцтва гаража, завёў з Фёдарам гаворку.

– Бачыў, яны нешта высвятляюць між сабой, нібыта ў нечым супернічаюць, – Фёдар усміхаючыся глянуў у бок дома, – а куды Мікалаевіч наш падзеўся?

– Напэўна, адпачывае. Магчыма, тэлебачанне глядзіць. Што яму, працу наладзіў, лазню здаў у тэрмін. Гараж хутка змайструем, тут жа сцены, дах ды вароты, і ні аддзелкі, ні вагонкі.

З боку верталётнай пляцоўкі данеслася:

– Ты, кіжлаты, давай паганяй, сягоння ж лазня. Працу раней закончым.

Барыс заўсміхаўся:

– Чуеш, як Віцёк таго, Юрасём-Фазай кліча, а той яму мянушку «кіжлаты» даў, ды адзін з адным усё тузаюцца. То хто рыбы болей навудзіў, то пысы адзін адному рыхтуюць, ды нешта працуюць заўсёды разам.

– Працаваць жа не гарэлку разам піць, працаваць можна з рознымі людзьмі, – Фёдар, прыпыніўшы працу, запаліў цыгарэту і паглядзеў убок верталётнай пляцоўкі, адкуль па дарозе між невялікіх таёжных раслін Віцёк, кіруючы ГАЗонам, цягнуў два тоўстых бервяна лістоўніцы. Юрась-Фаза ішоў наперадзе, час ад часу абарочваючыся назад, і махаў правай рукой, паказваючы, куды падварочваць.

– Так, пачатак шаснаццатай гадзіны, пляцоўка прыбрана, я пайшоў, лазню пратаплю, – Фёдар хацеў было аднесці да генератарнай шуфель ды граблі, але Барыс стрымаў яго.

– Пакінь, магчыма яшчэ спатрэбяцца. Я тут застаюся бярвенні прымаць, потым сам аднясу, ты ідзі.

30.

Апранаючыся, крыху затрымаўшыся і сыходзячы з прыступак лазні апошнім, заўважыўшы ўсіх хлопцаў, Жэньку-генератаршчыка ды Івана-механіка, стаячых гуртом каля адрывістага берага непадалёку ад альтанкі, прыхоўваючыся за дрэвамі, Фёдар вырашыў падыйсці.

– А што тут такое цікавае, што ўсе сабраліся разам?

– Цыс, цыс, – Віцёк, павярнуўшы погляд у бок падыходзячага да гурта Фёдара, прыклаў указальны палец да вуснаў, – цыс, цыс, мядзведзь прыйшоў, па тым беразе ходзіць.

Фёдар, далучыўшыся да гурта, глянуў праз прасвет лістоты дрэва і заўважыў на другім беразе ракі вялікага мядзведзя. Той паволі ішоў каля ўскрайку вады, час ад часу сцішваючы хаду, паварочваючы галаву ў бок базы. Віцёк, спусціўся па прамытай павадкавай вадой расколіне да ракі, дастаў з кабіны судна на паветранай падушцы праз бакавое адкрытае шкло бінокаль і неасцярожна грымнуў. Мядзведзь, павярнуўшы галаву ў бок драўлянай прыстані малагабарытнага рачнога флота, складзенага з дзюралявай лодкі-казанкі, дзвюх гумавых японскіх лодак ды невялікага судна на паветранай падушцы, прыпыніўся. Праз адлегласць шырыні ракі былі бачны яго насцярожаны выраз мысы ды пільна сачыўшыя за сітуацыяй вочы. Павярнуўшы паволі галаву наперад руху ды потым зноў на другі бераг у накірунку прыстані, не выказываючы знешне аніякага хваляванhя, раптоўна, пасля прыжка ўлева на дзевяноста градусаў зрабіўшы чатыры моцныя скачкі да хмызняку, што вырас на паволі ўзнятым левым беразе, знік з відавоку за раслінамі. Хлопцы, стаячы гуртом, назіралі са схованкі за касалапым, не рухаліся з месца, ўцямліваючы тое, што адбылося ў іх навідавоку.

– Вось гэта да, вось гэта спрытнасць, – Юрась-Фаза запаліў цыгарэту, – каб сам не пабачыў то і не ведаў бы, што вось такі во агромісты касалапы здольны на гэткую хуткасць, а які



хітрушчы. Пакруціў галавой, нібыта звычайна так, чатыры скачкі, і шукай-свішчы.

Пачуўшы гук рухавіка аўто, хлопцы адвёўшы погляды ад ракі на процілеглы бок, заўважылі пад'язджаючага на ўсюдыходзе Яўсеевіча, вярнуўшагася з палявання.

– Яўсеевіч, мядзведзь прыходзіў, мядзведзь, тым берагам, – Віцёк, узбуджана паказваючы на раку правай рукой, звярнуўся да Яўсеевіча, адчыніўшага дзверцу машыны збоку вадзіцеля.

– Мядзведзь, кажаш, – Яўсеевіч выйшаў з кабіны і падыйшоў да гурта мужыкоў, – а дзе вы рыбу, шчупакоў тых закапалі ўчора?

– Вунь там, – Віцёк паказаў у накірунку за пабудову дома, – метраў трыста адсюль, дзе паварот ракі ўлева, гэтым берагам.

– Зразумела, я жа вам загадаў закапаць за другім паваротам тым берагам, – Яўсеевіч, павысіўшы голас, наўшырку раскрыў вочы, – рыба тая ўжо з душком, для касалапага гэта – дэлікатэс. Ён на пах прыйшоў, учуяў. Аглядае падыходы, урэшце-рэшт пераплыве ў зручны момант раку ды паласуецца. Ну, вы і выкінулі прыкід, слухаць трэба, што загадана ўважліва і выконваць абавязкова. Пакуль не паласуецца, паводзьце сябе асцярожней, – і ён, сеўшы ў кабіну за руль, захлопнуў дзверцу, завёў рухавік і накіраваўся да ганка гасцявога дома.

31.

З раніцы наступнага дня, пачаўшы выкладваць бярвеннямі зруб гаража, хлопцы заўважылі, як да іх з боку дома нетаропка, аб чымсьці размаўляючы, ідуць брыгадзір Мікалаевіч, механік Іван і Жэнька-генератаршчык.

– Прывітанне хлопцы, – падыйшоўшы, Мікалаевіч нетаропка абыйшоў вокол будучай пабудовы гаражу і звярнуўся да Віцька, – Віцёк, да абеда Фёдар няхай дапаможа Івану. Патрэбна на судне на паветранай падушцы цягі газу ды шчаплення пераварыць, даўжэй іх зрабіць, каб педалі адрыхтаваць. Вян-

цы на зрубе абавязкова шканціць, два на сцяну і вуглы. З абеда, Фёдар, пачнеш падмосткі знутры майстраваць, вышэй, каб потым зруб падымаць зручна было, – Мікалаевіч, агледзеўшы хлопцаў, нібыта палічыўшы па галовах, запытаў, – а дзе ж наш Фаза, штосьці нябачна яго?

– Ды пайшоў да прыстані, малаток там узяць, – Віцёк глянуў у бок ракі, – оба на, вось гэта шчупак.

Павярнуўшы галовы, хлопцы убачылі Юрася-Фазу з задаволеным выразам твару, які нёс ў левай руцэ малаток, пад правым пахам нахіліўшыся ад вагі ўлева ўнушальных памераў вывуджанага шчупака.

– Юрась, ты што, малатком яго глушыў, як ты такога здабыў? – Мікалаевіч, вытарашчыўшы вочы, перамінаючы з нагі на нагу, трымаючы рукі ў кішэнях курткі, здзіўлена матляў па баках галавой.

– Ды якое, малатком, Мікалаевіч, – Юрась крыху прыгнуў ногі ў каленях і апусціў шчупака долу, – да прыстані спусціўся малаток узяць, а там спінінгі ў сцелажы стаяць. Ну, я узяў адзін ды разок закінуў. Зматваю ўжо, блясна паказалася ў вадзе каля берага, ну, думаю, спінінг пастаўлю на месца ды й пайду. Блясна ўжо на беразе была, на пяску, і тут вось гэты тарпеданосец ўздагонку за блясной мне пад ногі і шуганоў. Ну, прама цуд, так яшчэ шчупакоў я не вудзіў.

Павазіўшыся гадзіну каля генератарнай з цягамі газу ды шчаплення, зрабіўшы іх даўжэй, Фёдар запытаў у Івана:

– А што далей, зварваць яшчэ што-небудзь трэба?

– Не, зварваць не. Пойдзем зараз да прыстані, Жэнька пазней падыйдзе. Да абеда якраз паспеем на месца паставіць, звінціць, потым я настройкай займуся. Хадзем, я да Яўсеевіча яшчэ зайду, скажу, якія патрэбны запцацкі яшчэ, каб даслалі з наступным верталётам. Ён па рацыі з базай звяжацца.

Не пайшоўшы за Іванам у гасцявы дом, прыладкаваўшыся на табурэце каля ганку, Фёдар запаліў цыгарэту. Прыслухоўва-

ючыся да чарговай перабранкі, узнікшай на будаўнічай пляцоўцы гаражу паміж Віцьком і Юрасём-Фазай, спрабуючы праз прасветы паміж дрэвалі штосьці ўгледзець, Фёдар ажно уздрыгануўся ад раптоўна ўзнікшымі перад ім дзвюма аўчаркамі, кабялём і сучкай. Яны прыпыніліся дзесьці ў пяці метрах ад яго, уважліва разглядаючы незнаёмца. У гэты момант у Фёдара мільганула думка, маўляў, маці забяры мяне адсюль. Але першым кабель, а затым сучка гулліва паімчалі далей на прыемны пах прыгатаванай ежы да балка кухні-сталовай.

З-за правага вугла гасцявога дома з боку балка харчавання на адкрытую пляцоўку раптоўна выйшла сабака Дзіна са сваім кудлатым выхаванцам. Выхаванец, заўважыўшы, што аўчаркі, гуляючы між сабой, вяртаюцца да пабудовы дома, падагнуўшы хвост, крутануўшыся, знік у хмызняку за вуглом пабудовы. Дзіна, выцягваючы перад сабой морду, нібыта ўлаўліваючы пах падбягаўшых суродзічаў, засталася нерухома стаяць на месцы. Аўчарка-сучка, заўважыўшы наперадзе Дзіну, падбягаючы за кабялём, рэзка паскорылася, абганяючы таго з правага боку, і злёгку падпіхнула кабяля ўлева на адкрытай пляцоўцы, потым, гулліва забегшы наперад, падалася да ўскрайку хмызняку, зазываючы таго за сабой. Кабель, маючы іншы намер, узяўшы ўправа, падбег да Дзіны і пачаў завіхацца вакол, абнюхваючы прывабную асобу ў жаданні пазнаёміцца бліжэй.

Дзіна, асцярожна варочаючы галавой, выказваючы знак даверу незнаёмцу, зыркала ўбок адбегшай наперад да ўскрайку хмызняку метраў на трыццаць аўчаркі-сучкі. Тая, азірнуўшыся, заўважыла кабяля каля Дзіны, на момант прыпынілася, уздрыганулася і з рычэннем у скачку паімчала да суперніцы ўратоўваць сваю рэпутацыю. Падскочыўшы пад час знаёмства двух сабачых асобаў, ашчэрыўшы зубы сваёй пасткі, яна зарычэла на свайго сябра, адпіхваючы таго вышчэранай пашчай у левы бок прэч, на адкрытую пляцоўку ад вугла дома.



Аўчар, крыху адскочыўшы, паспрабаваў было падацца ўлева, каб, мінуючы сяброўку, праскочыць да стаячай на месцы прывабнай незнаёмкі, але не тое тут было. Рэзка падаўшыся ўлева, аўчарка спрытна хватанула пашчай аўчара за шыю злева і матлянула галавой у правы бок. Кінуўшыся ўправа, паспрабаваўшы прарвацца, падаўшыся на разварот той атрымаў ад сяброўкі пакус у правае пярэдняе сцягно і адхінуўся ўбок улева, не адводзячы погляда ад прывабнай незнаёмкі.

Аўчарка, падскочыўшы да стаячай нерухома на месцы Дзіны, прыпусціўшы галаву, гучна, пагрозліва з рычэннем забрахала перад яе мысай. Тым часам сабака затупаў на месцы, з трох метраў назіраючы за далейшым развіццём сюжэта. Дзіна, стоячы нерухома, прыпусціўшы галаву, моўчкі паглядала на раз'юшаную, пакрыўджаную самку, выказваючы той свой погляд, маўляў, чаго ты, ён жа сам каля мяне завіхацца пачаў, адчапіся. Раптоўна замоўкшы, рэзка павярнуўшыся да стаячага непадалёку свайго сябрука, злёгку зарычэўшы, піхаючы таго ў правую бачыну, перад сабой папёрла ўхажора, што аглядваўся на прывабную незнаёмку, праз адкрытую пляцоўку да ўскрайку тайгі.

«Во дзіва, во цуд,» – Фёдар, седзячы на табурэце каля ганку злева ад уваходу, дапальваючы цыгарэту, не бачыўшы раней анічога падобнага, і ўявіць сабе не мог, што такое магчыма. Ну, прама, як у людзей: рэўнасць, крыўда, пахатлівасць да сэксапільнай незнаёмкі, высвятленне адносінаў. Ну, а Дзіна, ну, прама, адна з гераінь з кінастужкі «Брыльянтавая рука», маўляў, «не вінаватая я, ён сам да мяне прыйшоў».

Мільгануўшы ўскрайкам хмызняку да ганку лазні, салодкая парачка падалася перад мансардай праз адкрытую пляцоўку да берага ракі. Павярнуўшы галаву ўправа, Фёдар заўважыў ідучага да пабудовы дома ад ракі чалавека, абутага ў высокія рыбацкія бродні цёмна-зялёнага колеру, апранутага ў зяленага колеру піджак і фланэльную, у вялікую клетку, светлую кашулю

пад ім. Нес ён на правым плячы карабін, трымаючы за рамень правай рукой, у левай трымаў прыспушчаны на шлейках, напалову чымсьці напоўнены рукзак. Прыпыніўшыся перад падбегшымі да яго аўчаркамі, штосьці сказаў тым, матлянуўшы на раку галавой, а сам потым рушыў да дома. Сабакі, зразумеўшы загад, нетаропка накіраваліся да ракі.

Праходзячы міма Фёдара, матлянуўшы галавой у знак прывітання, мужчына меў выгляд гадоў сорака пяці, сярэдняга росту, збіты, паджары з сядзінамі ў цёмных густых валасах. Ён узняўся па прыступках на ганак, паставіў карабін справа ад дзвярэй уваходу, трымаючы прыспушчаным рукзак у левай руцэ за шлейкі, увайшоў праз дзверы ў дом. Неўзабаве выйшаўшы з дому Іван, сыходзячы з ганку, паклікаў за сабой Фёдара, накіраваўшыся да лазні, павярнуўшы за вуглом пабудовы ўправа да ракі, ды прыпыніўся.

– Гэта завітаў да Яўсеевіча паляўнічы-прамыславік, у якога сядзіба ўверх па цячэнню на тым беразе, ты памятаеш за карасямі з Яўсеевічам міма праплываў, – Іван паправіў на правым плячы рамень сумкі з інструментам ды цягамі шчаплення ды газу, спускаючыся па драўлянай лесвіцы з высокага берага да прыстані, працягваў распавед. – На тым возеры, дзе карасёў вы з Яўсеевічам вудзілі, падстрэліў паляўнічы лася, у вадзе, недалёка ад берага, дзе неглыбока, але карчы розныя там, аднаму не выцягнуць, звярнуўся да нашага Яўсеевіча за дапамогай. Хацеў Яўсеевіч цябе з сабой узяць, ды яшчэ каго, ды я сказаў, што ты мне сягоння яшчэ дапамагаць будзеш, каб наладзіць судна во. Зараз Жэнька падыдзе, і з ім мы ўдвох управімся, а так навошта табе, Фёдар, лася таго траляваць па тым возеры, іншага каго возьме. Мікалаевіч жадае возера верхавое паглядзець, хай ім і дапаможа.

Пры сыходзе з лесвіцы на пясок берага Фёдар заўважыў, што аўчар прыладкаваўся ў драўлянай лодцы гаспадара з узнятым матарам, носам выцягнутай на бераг і прывязанай вяроўкай

за загнаны ў пясок драўляны кол. Аўчарка, прылегшы на пяску на беразе перад лодкай, пільна сачыла за сваім бой-фрэндам. «Ну, прама, хатні арышт,» – падумалася Фёдару.

– Так, Фёдар, зараз яны там збяруцца і прыдуць на прыстань. Давай створым заклапочаны від, быццам мы цалкам заняты працай. Як адчаляць, то мы паціху, да іхняга прыбыцця тут павозімся, адпачнем крыху. Цягі паставіць на месца зойме ў нас не болей, чым паўгадзіны.

32.

Драўляная маторная лодка з паляўнічым-прамыславікам ды дзвума ягонымі аўчарамі, адчаліўшы ад прыстані, пайшла ўверх па цячэнню. Яўсеевіч, завёўшы японскі рухавік лодкі-казанкі, з трыма пасажырамі на борце: Мікалаевічам, Барысам ды Паўлам, – даўшы наўкола кругам перад прыстанню, накіраваў сваё судна следам. Параўняўшыся на хуткаснай лодцы-казанцы, абсталяванай японскім рухавіком з драўлянай лодкай паляўнічага з рухавіком «Віхор», махануўшы таму ды двум сабакам-аўчаркам, пільна сачыўшым за наваколлем, даўшы газу, Яўсеевіч паімчаў на ўсіх парах па воднай гладзі ракі пракаціць з ветрыкам дзівіўшыхся навакольнымі таёжнымі краявідамі пасажыраў. Прычаліўшы да свайго звычайнага месца, Яўсеевіч прывязаў лодку вяроўкай за дрэва, ускінуў на правае пляча рамень карабіна і рушыў па сцежцы наверх, астатнія ўтрох пацягнуліся следам, азіраючыся па баках.

– Яўсеевіч, а дзе той лось завалены, што ты во лодку сваю надзьмуў? – Мікалаевіч закруціў па баках галавой, спрабуючы прыкмеціць сярод тырчэшчых з вады каранёў ды розных карчоў здабычу.

Яусеевіч паглядзеў на край пратокі ўлева.

– Казаў Еўдакім, што там. Ды вунь за карчом ляжыць напалову ў вадзе, – Яўсеевіч паказаў далонню правай рукі на тырчэўшую напалову з вады ўпаляваную тушу.



Пачуўшы гук рухавіка маторкі, Яўсеевіч загадаў двум хлопцам спусціцца ўніз дапамагчы Еўдакіму паднесці ад берага другую гумавую лодку ды вяроўкі. Пасля спуску дзвюх падрыхтаваных лодак на ваду, размеркаваліся. Яўсеевіч з Еўдакімам у адной, у другой Барыс з Паўлам веславалі да патрэбнага месца ў другой, пакінуўшы Мікалаевічу, застаўшамуся на беразе, на ўсялякі выпадак, карабін.

– Мікалаевіч, чаго ты залез у ваду ды па гэтым во карчам поўзаеш, будзь на беразе, – тралюючы дзвюма лодкамі лася, завязаўшы за яго ногі вяроўкі, Яўсеевіч зрабіў заўвагу Мікалаевічу, што цёгаўся абутым у рыбацкія высокія бродні па вадзе на глыбіні вышэй каленяў. Той з сур'зным вяглядам трымаў карабін абедзвюма рукамі перад сабой, як бы быў напагатове, імкнучыся трымацца як мага бліжэй да лодак.

– Чаго-чаго, ага, пакінулі мяне во аднаго з гэтым во карабінам, ага, на табе, сцеражыся ад касалапага, – Мікалаевіч абураўся, варочачы галавой то ў бок берага, то на лодкі, – а калі з'явіцца той касалапы, што я з ім рабіць буду?

– З кім рабіць? – Яўсеевіч здзіўлена запытаў, гледзячы на цёгаючагася на вадзе з карабінам у руках Мікалаевіча.

– З кім, ды з тым самым касалапым, калі з'явіцца, як ты кажаш.

– Што рабіць, стралянеш ў яго з карабіна, ды й уся справа, медзвяжацінай паласуемся, а ты, Мікалаевіч, дадому скуру запрэш. Фарсіць перад сваімі будзеш, што мядзведзя ўзяў, – у Яўсеевіча ды астатніх на тварах з'явіліся ўсмешкі.

– Ага, стралянеш, ды я за пяцьдзесят гадоў жыцця аніводнай птушкі не падстрэліў, а тут з карабіна гаспадара тайгі, – Мікалаевіч азірнуўся на бераг, трымаючы карабін перад сабой і падаўся бліжэй да лодак, – калі хто з'явіцца, Яўсеевіч, я ў лодку да вас, а карабін табе ў рукі. Вось ты і будзеш страляць ці ў касалапага таго, ці макітру якую таёжную, я не спецыяліст па гэткай справе.

Агульнымі намаганнямі, выцягнуўшы лося з вады на бераг, прысеўшы адпачыць на выкручаную з каранямі лістоўніцу, тралёўшчыкі палілі цыгарэты і моўчкі паглядалі наўкола. Еўдакім чагосьці адыйшоў убок, паблукаўшы непадалёку па тайзе, вярнуўся, матлянуўшы правай рукой, адыйшоў на метраў пяць і пасярод рэдкіх нізкарослых хмызняковых раслінаў прыпыніўся. Усе гуртом ды Мікалаевіч з карабінам на правым плячы пацягнуліся следам.

– Во, бачыце, сляды, раніцой я лося заваліў тут. Пакуль да вас зганяў, па дарозе яшчэ тых качак настраляў чатырох, што табе, Яўсеевіч, падагнаў, прыходзіў касалапы. Тусаваўся бач тут, во сляды ягоныя. Напэўна, як вы на казанцы падрулявалі, то сыйшоў ён. Магчыма, дзесьці непадалёку трымаецца, хто яго ведае, ён жа гаспадар тут.

Мікалаевіч, трымаючы карабін, пакруціў па баках галавой, паволі правай рукой зняўшы зброю з пляча, трымаючы за рэмень, і працягнуў стаяўшаму побач Яўсеевічу.

– На, Яўсеевіч, гэта па тваёй частцы, сцеражы нас, ну, так сказаць, на ўсялякі выпадак. Ты ў нас спецыяліст па гэткай справе, а мы зараз умомант лася асвяжуем ды на лодкі мяса знясём, трымай.

33.

Увайшоўшы на вячэру ў балок кухні-сталовай, адчуўшы своеасаблівы, церпкі насычаны пах зваранага мяса, хлопцы закруцілі насамі.

– Мішаня, а што гэта такое ў цябе гатуецца, што ўсе, водзячы насамі, спрабуем уцяміць, – Віцёк, прысеў на сваё месца насупраць Юрася-Фазы, паглядаючы ўлева на электрапліту, на якой з вялікай каструлі валіўшая з пад крышкі пара распаўсюджвала своеасаблівы, на ўвесь памер кухні-сталовай, пах.

– Так хлопцы, я зараз вось, кашу рысавую ды рыбу накладвайце самі. Нагатавана шмат, на ўсіх хопіць. Пакуль накладваць будзеце, я зараз дзічыну прыгатую.

Мішаня-кухар, клапатліва мітусіўся каля пліты, павярнуўся тварам да стала, за якім хлопцы пачыналі вячэраць, і, трымаючы ў правай руцэ палонік, з задаволеным выразам твару прамовіў:

– Дзічына, хлопцы! Дзічына, ай смачна будзе!

Прымаючы ежу, з зацікаўленасцю пазіраючы ўбок пліты, хлопцы ўбачылі, як Мішаня, уцапіўшы на палонік штосьці важкае, узняў над каструляй шэравата-чорную са знешняга выгляду, абскубленую ад пер'я дзікую качку, тулавам ляжаўшую на палоніку, апусціўшы шыю ды галаву ўніз. Перастаўшы есці, са здзіўленнем у пашыраных вачах, хлопцы паглядалі на тое, што прыгатаваў ім Мішаня-повар, разважаючы, як ім давядзецца вось гэта ўжываць у ежу.

– Мішаня, а што гэта? – Віцёк, прыўстаўшы з месца, трымаючы далоні на стале, павярнуўшы пагляд налева да пліты, выцягнуўшы шыю, спрабаваў лепей разгледзець тую дзічыну, – Мішаня, а дзе ты яе надыбаў?

– Ну, як дзе надыбаў, – кухар, трымаючы палонік з вуткай правай рукой, перавёў свой погляд на Віцька, – сягоння ж паляўнічы Еўдакім Яўсеевічу з раніцы падагнаў чатырох вутак. Дзвюх Яўсеявіч сабе пакінуў, ну і дзве нам падагнаў.

Повар, вывярнуўшы на раздзелачную дошку дзіч, падчапіўшы палонікам у каструлі другую, пачаў паволі даставаць. Узняўшыся ў паднятым поварам палоніку, такая жа шэравата-чорная дзічына, знаходзячыся навідавоку ў назіральнікаў пры адвядзенні палоніка рукой повара ўбок ад каструлі да распрацоўчай дошкі, заматляўшы па баках галавой ад торгання рукі, трымаўшай палонік, нібыта спрабавала разгледзець месца свайго знаходжання.

Ці то інтуітыўна, ці пад гіпнозам дзеяння хлопцы, чамусьці закруціўшы па баках галовамі ўслед за апушчанай ў палоніку качкай, прыпусціўшы галовы долу, не зводзілі вачэй ад заінтрыгаваўшага іх дзеяння. У вывярнутай пова-

рам на распрацоўчую дошку дзічыны галава на доўгай шыі, звесіўшыся долу, матлянуўшыся ў правы бок, застыла вертыкальна ўнізе ў нерухомасці. Віцёк так іназіраў, прыўстаўшы з лавы, трымаючы далоні рук на стале. Юрась-Фаза ці то знарок, ці то пад уплывам дзеяння, паўтараючы рухі дзічы, павярнуў галаву, прыклаўшы на сваё правае плячо, і заплюшчыў вочы.

– Дзіч, хлопцы, дзіч, зараз дзіч, – повар, замітусіўшыся, ухваціў вялікі нож і пачаў адразаць ад дзічы ножку, прыкладаючы намаганні, – во зараза, не надта паддаецца, – урэшце-рэшт надрэзаўшы мяса, кінуўшы нож на стол, абедзвюма рукамі ўхваціў качку, і яму ўдалося-такі аддзяліць тую ножку ад тулава зваранай дзічы.

– Дзіч, хлопцы. Во, – зразумеўшы, што атрымалася недарэчнасць, павярнуўшыся да хлопцаў, што паціху праглытвалі сваю ежу, каб выйсці з псіхалагічнага дыскамфорта, узняўшы правай далонню ножку, повар паспрабаваў куснуць, – штосьці не кусаецца, – повар, трымаючы абедзвюма рукамі непаддаўшуюся дзіч, напрогся, кусаючы, моцна сціснуўшы сківіцы.

– Ды, Мішаня, ды не клапаціся, будзем лічыць, што сягоння ў нас рыбны вечар, – Барыс падыйшоў да пліты і наклаў сабе ў міску некалькі смачна прыгатаваных кавалкаў шчупакоў, – чуў я, што дзіч неяк патрэбна замачваць у нечым, а потым гатаваць, крыху падтушваючы.

– Ну, назаўтра, хлопцы, я які-небудзь дэлікатэс прыгатую, абавязкова, – Мішаня-повар, расчулены ад атрымаўшайся недарэчнасці, затупаў на месцы круцячы прыпушчанай галавой па баках.

– Не, Мішаня, не трэба нам аніякіх дэлікатэсаў, ты нам што гатаваў звычайна, тое і гатуй, – Віцёк устаў з-за стала, падыйшоў да пліты і наліў апалонікам у свой кубак кампот з сушанай гародніны.

34.

Перастаўшы распавядаць байкі пра свае жыццёвыя прыгоды, ад пачатку працоўнага дня, Віцёк узяўся кіраваць працоўным працэсам, не маючы, як хлопцам падавалася, другі месяц запар працаваўшы разам у гэтай во абмежаванай таёжнай прасторы, аніякай нахіленасці да гэтакай справы. Выдатна валодаўшы майстэрствам цяслярскага рамяства, але не маючы пачуцця індывідуальнага падыхода да кожнага працаўніка, бо ўсё ж людзі розныя самі па сабе. Ён імкнуўся ўладарыць нахрапам, нярэдка нарываўся на адмоўную рэакцыю калег. І што здзіўляла хлопцаў, дык гэта тое, што, высвятляючы перыядычна адносіны, ці то па пытаннях працы, ці наконт вудзення рыбы, тым прарабам з базы альбо адпачынку, калі-нікалі па-народнаму з Юрасём-Фазай растлумачвалі адзін аднаму свае погляды па спрэчных пытаннях, рыхтуючы адзін аднаму пысы, але заўсёды апасля трымаліся разам. Так на працы ці ў вольны час імкнуліся па магчымасьці існаваць сваёй суполкай.

– Ну, што ты так ужо мацуеш гэтыя во падмосткі? Дошку давай так да сцяны, падпору мацуй гэтак, ды высцілай насціл і ўсё, – Віцёк падыйшоўшы да Фёдара, рабіўшага падмосткі, патузаў, упершыся дзвюма рукамі, прыладжаную да сцяны апору.

– Калі мне даручылі гэту справу, то я зраблю яе,так, як лічу патрэбным, а навошта, потым пабачыш, – Фёдар, высцілаючы дошкі на падмосткі, каб прайсці да наступнай апоры, адпіхнуў правым плячом Віцька, маўляў, прэч.

З левага боку ад увахода ў гараж, дзе гатавалі бярвенні, запрацаваўшая бензапіла насцярожыла Віцька. Той штосьці хацеў было сказаць Фёдару ды, выскачыўшы праз праём дзвярэй за сцяну ўправа, узарваўся, абураючыся.

– Чаго лезеш не ў сваю справу, што ты тут зарэзаў? Гэта ж бервяно на тую доўгую сцяну загатавана ўжо было. Што ты яго

на два разлупіў, ёлупень? Наперад, дзе дзверы вунь прыгатаваныя, з тых памер робіцца, карацейшыя.

– Чаго не папярэдзіў загадзя, што куды? Я замер зрабіў, на два якраз хапае перад весніцамі.

– Табе вунь задача назаўтра траншэю ад генератарнай пракапаць, электрыкі прыбудуць кабель пракладываць. Вось ідзі і капай, і аддай, – Віцёк падыйшоўшы да Юрася выхапіў у таго з рук бензапілу.

– Што тут у вас зноў за разборкі? – Мікалаевіч, падыйшоўшы па сцежцы з боку лазні акурат да зноў зачапіўшыхся Віцька з Юрасём-Фазай, гледзячы з-пад ілба, з бурчэннем зірнуў на выкладзенную частку сцяны зруба гаража, – шкантоў колькі робіце на бярвяно?

– Два, Мікалаевіч, ды па вуглах, як і было загадана, – Віцёк, апусціўшы долу бензапілу, косячыся ўлева ад сябе, глянуў у бок Юрася-Фазы

– Так, ну, хадзем, глянем, – прайшоўшы праз праём будучых дзвярэй у будуемы гараж, агледзеўшы майстраваныя Фёдарам падмосткі, Мікалаевіч звярнуўся да таго.

– Ну, ты рабі, каб надзейна было, бо ведаеш жа, які ён, гэты ліствяк цяжкі, што жалеза. Нетаропка, як кажуць, але хутка, так і працягвай, – выйшаўшы з будуемага зруба гаража, глянуўшы за сцяну з боку генератарнай і заўважыўшы, што пачатая ўчора траншэя пад электрычны кабель засталася на ўчарашнім узроўні, Мікалаевіч, нахмурыўшы бровы, звярнуўся да Юрася-Фазы, што шкандыбаў крокам з Віцьком.

– Слухай Юрась, а чаго гэта ты месца сваё працоўнае пакінуў і без майго дазволу? Да заўтрашняй раніцы траншэя павінна быць выкапана.

– Мікалаевіч, ну, як жа я адзін спраўлюся, яно як бы неглыбока, на штык лапаты, ды зверху адтаяўшы пласт, а там, крыху глыбей, мярзлота вечная.

– Так, зразумела, – Мікалаевіч, вярнуўшыся да ўвахода ў гараж, паклікаў Фёдара, – хадзем сюды, тут уводная мяняецца. Дапаможаш Юрасю пракапаць траншэю пад кабель. Юрась ад гаражу, а ты ад генератарнай, насустрач, да вечара паспееце. Падмосткі назаўтра даробіш, зруб яшчэ невысокі, з долу яшчэ падымаць зручна.

Прыняўшыся за копку траншэі ад генератарнай, час ад часу паглядаючы наперад, на надта імкненага насустрач Юрася-Фазу, Фёдар прыкмеціў недалёка ад правага далейшага вугла гаража схаванага невялікімі раслінамі шчанюка Кудлатага, як празвалі яго тут хлопцы, даўшы таму мянушку за знешні выгляд ды наравісты, напорысты характар. Той, чамусьці прыхоўваючыся за раслінамі, час ад часу выбягаў да пракопанай ўчора часткі траншэі і, зноў замітусіўшыся, сігаў хавацца за раслінамі. Час ад часу, назіраючы з цікавасцю за яго басяцкімі дзеяннямі, Фёдар заўважыў крыху далей Дзіну, паволі швэндаўшую між раслінаў, трымаючы навідавоку свайго навучэнца.

– Глядзі, глядзі пацягнуў, – Фёдар прыпыніўшы працу звярнуўся да насустрач капаючага Юрася, – глядзі, Юрась.

Той, прыпыніўшы працу, павярнуўшы галаву назад на выкапаную траншэю, паспеў заўважыць, як шчанюк Кудлаты, цягнучы за шыю адну з дзвюх звараных поварам вутак, знік за вуглом гаража паміж раслінамі.

– Цікава, – Юрась засмяяўся, – гэта ж ён учора ў пракапанай мной траншэі схованку зрабіў. Глядзі, Фёдар, Дзіна вунь не сыходзіць, магчыма, і другая дзіч дзесьці тут закапана.

Неўзабаве, ўзнікшы шчанюк Кудлаты, ужо без аніякага хвалявання пратупаў уздоўж траншэі, ад пачатку на метр, грэбнуўшы пярэднімі лапамі па брустверы, ухапіўшы зубамі пасткі за шыю другую ўчора звараную качку-дзічыну і хутка, з падскокамі, затраляваў яе за вугал гаража. Ён гэтак жа раптоўна знік з відавоку з дзіччу ў пастцы паміж раслінамі, як і з’явіўся. Дзіна, пакруціўшы галавой па баках, паволі пацягнулася следам.

– Во глядзі, навучанне ідзе па плану, па праграме выжывання ў таёжных умовах. Бачыш, як прыхаваў, а Дзіна кантралюе. Адчулі небяспеку ды вырашылі змяніць месца схованкі, проста выдатна, – Юрась, запаліўшы цыгарэту, прысеў адпачыць на непадалёку лежачае бервяно.

Паволі ішоўшы з боку гасцявога дома па драўляным тратуары Мікалаевіч, трымаючы рукі ў кішэнях курткі, падаўся Фёдару, са знешняга выгляду, у кепскім настроі. Магчыма, зноў не паспяваем з графікам выканання працы, зноў тэрміны падціскаюць. Не прыбаўляючы тэмпу, як звычайна, капаючы, Фёдар працягваў працаваць, і яму прыйшла ў галаву думка, што, магчыма, зноў давядзецца напружвацца.

– Назаўтра будзе верталёт, прыбудзе Аляксандравіч з электрыкамі, каб адлажваць далей сваю гаспадарку, – Мікалаевіч, прыпыніўшыся на тратуары побач з капаючым траншэю Фёдарам, завёў гаворку, – тым верталётам назаўтра я і адбуду.

– Што, Мікалаевіч, тэрмін вахты заканчваецца? – Фёдар, прыпыніўшы працу, запаліў цыгарэту.

– Ды якое заканчэнне, размова была, што да здачы гаражу я затрымаюся яшчэ на месяц, з базы кіраўніцтва прапаноўвала. Я згадзіўся, ды Яўсеевіч мяне здаў.

– Як здаў? – Фёдар з пытаннем зацікаўлена звярнуўся да Мікалаеевіча.

– Так вось, заклаў, як госці прыбывалі адпачыць. Я сюды па вахтах бугром дваццаць гадоў лётаю, мяне добра ведае кіраўніцтва розных установаў, з якімі мы на падрадзе працуем. Запрасілі мужыкі ўвечары за стол па чарачцы разам выпіць. Гэта, як бы і нельга нам так, а мне адмовіцца як, паважаныя людзі, і мяне добра ведаюць. Па-мужыцкі гарэлкі папілі крыху, потым, як яны адбылі верталётам, я яшчэ два дні прыкладаўся пакрыху. Яны мне бутэльку «Пшанічнай» пакінулі, ды яшчэ шэф-повар з рэстарана, што з імі прыбывала, ежу ім гатавала, таксама падагнала мне бутэльку. Ну, я хоць крыху ды адарваўся тут.

– А што, Яўсеевіч наўмысна заклаў?

– Як бы і ненаўмысна, але, – Мікалаевіч, казаўшы сціша-на, круціў па баках галавой, быццам выглядаючы, каб не было кагосьці побач падслухаць, – яно як бы і нельга нам у гэткіх выпадках з гасцямі за стол садзіцца, ды я набраўся быў так, што не ў такім стане з базай увечары мне на сувязь па рацыі выходзіць,– зразумеюць, што п'яны. Давялося Яўсеевічу маю справу рабіць.

– А Яўсеевіч не мог па рацыі сказаць, што Мікалаевіч на рыбалку выбраўся альбо на паляванне?

– Ды якая рыбалка, якое паляванне, там жа на базе ведаюць, што з мяне такі рыбак, як і паляўнічы той. Гэта не маё хоббі, Віцьку во рабіць болей не было, чаго як пагадзіцца рыбу нашым прарабам з базы навудзіць тут. Ну-у, падпісаўся, ягоная справа, – Мікалаевіч, прыпусціўшы галаву пакруціў ёй па баках, – там жа вядома, калі і якія госці сюды прыбываюць, ды я і не крыўдую на Яўсеевіча, гэта ягоная справа. Страхуецца, каб там наверсе розных размоў, яму непатрэбных не было, вось і ўся размова.

Фёдар, запаліўшы цыгарэту, прысеў на драўляны тратуар.

– Яму, Яўсеевічу, ужо во семдзесят пяць гадоў, а бачыш, як выглядае, – Мікалаевіч, усміхаючыся, замятляў галавой.

– Ды ты што, Мікалаевіч, ён жа са сваім карабінам яшчэ і мядзведзя возьме.

– Ён жа ўсё выбіраецца на паляванні, ты думаеш, чаго? Па восені, як тлушчу набяруць ды поўсць лашчонай будзе, акурат і возьме касалапага якога. Наглядае пакуль, дзе зручней ды бяспечней узяць будзе магчыма, ён вопытны, распавядаў, што не аднаго ўжо браў. Былы партыйны работнік, ды жонка ў яго руская. Глядзіць за ім, як сініца вока беражэ, а так яны, мясцовыя якуты, пастолькі не жывуць. Брыгадзірам за мяне Віцёк застаецца, управіцеся, – Мікалаевіч нетаропка накіраваўся па тратуары да будынка гасцявога дома, – пайду, з альтанкі на раку палюбуюся. Падабаецца мне тут, цішыня, лагода, спакой.

Уцяміўшы урэшце-рэшт, чаму Віцёк з раніцы ўзяўся актыўна кіраваць працоўным працэсам, Фёдар набліжаўся праз выкапванне траншэі пад электрычны кабель да прабіваючагася праз мярзлоту насустрач яму Юрасю-Фазе.

35.

З неба, зацягнутага кучавымі аблокамі, распачаўся невялікі дождажык, што сапсаваў настрой Яўсеевічу і ўзбадзёрыў хлопцаў свежым паветрам, насычаным азонам. Мікалаевіч, падыйшоўшы да будоўлі гаража, агледзеў пачаўшых працаваць хлопцаў і заўсміхаўся.

– Ну, ветрык падзьмуў, магчыма, хмары разгоніць. Калі дождажык не сціхне, то не мокніце. Палова ў генератарнай зоймецца падлогу перасцілаць, а другой палове ў гасцявым доме занятак знойдзецца.

– Мікалаевіч, а што гэта Яўсеевіч з раніцы не ў добрым настроі, што гэта яго так заклапаціла? – Віцёк акрэсліваючы алоўкам шаблон на бервяне для зарэзкі бензапілой пад вугал, прысеўшы на кукішкі, завіхаста звярнуўся з пытаннем.

– Ды, Віцёк, у Яўсеевіча цяпер абавязак высадзіць з тайгі парэчкай, чырвонай ды чорнай, уздоўж распрацаванай пляцоўкі па беразе – ад бяседкі да верталётнай пляцоўкі. Сягоння Аляксандравіч прыбудзе, а праца яшчэ і не пачыналася, – Мікалаевіч звярнуўся да Фёдара:

– Зараз, Фёдар, калі ветрык хмары паразганяе, з’ездзіш з ім на маторцы за той парэчкай.

За другім паваротам ракі ўверх па цячэнню, прайшоўшы па рэчышчу з кіламетр, Яўсеевіч падвярнуў лодку ўлева і падчаліў да берага. Прывязаўшы лодку да блізка росшага дрэва, накінуў на правае плячо рамень карабіна, загадаў Фёдару ўзяць рыдлёўку і пацягнуўся на высокі палогі пад’ём. Калі той ўвайшоў следам за Яўсеевічам у густыя зараснікі таёжнага хмызняку, то ў такі ясны сонечны дзень было не ўгледзець праз лістоту со-

нечных промняў і Фёдару зрабілася вусцішна. Зняўшы з пляча карабін, паставіўшы прыкладам на зямлю, абапёршы рулю на папрарастаўшы вакол невялікі хмызняк, Яўсеевіч спытаў:

– З карабіна страляць умееш?

– Умею, а навошта?

– Вось гэтую смародзіну зараз будзем выкапваць, не адыходзь далёка ад карабіна і паглядай па баках, тут у любым месцы касалапы можа з'явіцца. Калі што, то хто першы да зброі, той і страляе, іначай нам кепска будзе.

Да лодкі Фёдар ішоў першым, прыхапіўшы з сабой як мага болей выкапанага хмызняка чорнай парэчкі. Яўсеевіч, ускінуўшы карабін на правае плячо, пад левую руку ўзяўшы рэшты хмызняка парэчкі, ішоў следам і паглядаў па баках, час ад часу азіраючыся назад.

– Так, гэта чорная, зараз зарулім з кіламетр наперад, і на тым беразе на адкрытай пляцоўцы выкапаем чырвонай.

– Там без карабіна выкапваць будзем? – забраўшыся ў лодку, Фёдар паспрабаваў пажартаваць.

– Можна і без карабіна, братка, але з карабінам нам спакайней будзе. Гэта тайга, тут свае парадкі.

Выйшаўшы з правага паварота на прамое русла ракі ў накірунку да базы і заўважыўшы прыбыўшы на верталётную пляцоўку верталёт, Яўсеевіч глянуў на седзячага справа Фёдара.

– Ну, будзем лічыць што мы ўправіліся своечасова. Прыбудзем, пакажу, дзе парэчку высаджваць ды падыйду да Аляксандравіча, трэба з ім яшчэ пытанні вырашыць.

36.

Падабраўшы пад сябе паветра, узнімаючыся да неба, верталёт МІ-8 традыцыйна абляцеў наваколле базы і ўзяў патрэбны накірунак, знік з відавоку за небакраем. Ён выклікаў у Фёдара, што высаджваў ўздоўж берага хмызняк чорнай ды чырвонай

парэчкі пачуццё шчымлівай тугі. Па тэрміне ягоная вахта мінула за палову, з аднаго боку ўзмацняецца прыцягненне роднага да сябе дома, а з другога шмат цікавага спасцігнута тут, у гэтай таёжнай цішы: ад уражанняў успрымання дзікай, запаведнай прыроды да ўсталявання зносінаў паміж людзьмі ва ўмовах абмежаванасьці таёжнай прасторы.

Фёдар прачнуўся ў начы, не спалося. Выйшаў з балка папаліць цыгарэту, прысеў на лаўцы і раптам пачуў шавяленне на галінках дрэва. Узняўшы галаву, мужчына заўважыў вавёрку, што мітусілася за балком кухні-сталовай. Тая, скачучы з галінкі на галінку, час ад часу прыпыняючыся, як падалося Фёдару, з зацікаўленасцю паглядала на яго, і дзіўна было назіраць за ёй. Раптоўна на тым беразе ракі, дзесьці недалёка ў тайзе зароў на ўсю сваю моц мядзведзь. Крыху ніжэй па цячэнню ракі, за левым паваротам, нібыта яму ў адказ, завыў воўк: «Ву-у-у, ву-у-у!» – разносілася рэхам па наваколлю, выклікаючы адчуванне жаху і зацікаўленасці. Таёжнае наваколле рычэла мядзведзем, выла паводчы, фухкала глушцамі, цяўкала, шчабятала ўсім тым, для каго таёжная прастора – гэта звычайны асяродак пражывання.

– Колькі яшчэ часу патрэбна, каб высадзіць вось гэту во дэкарацыю? – прыкапваючы чарговы высаджаны хмызняк парэчкі, ад нечаканасці пытання Фёдар уздрыгануўся, узняў галаву і ўбачыў справа ад сябе двух, не разлі вадою, сябрукоў: Віцька ды Юрася-Фазу.

– У цябе што, мову адняло? – Віцёк, хмыкнуўшы, завіхаста па-свойму ўсміхнуўся.

– Ты выразы падбірай, за базарам сачы, – Юрась-Фаза гмыкнуў, – а то раптам у яго гумар скончыўся, рубане зараз во лапатай абодвух, а сам праз раку ды ў Кітай падасца.

– Далёка не адыдзе, на тым беразе ў гэта лета гаспадарыць той мядзведзь, што бачылі ўжо не раз.

Фёдар, паклаўшы рыдлёўку каля хмызняку на зямлю, дастаў з кішэні парткоў цыгарэты і запытаў у Віцька запалкі.

– Ды мне яшчэ гадзіны паўтары-дзве, – сказаў ён. – Што потым далей рабіць?

– Далей нічога, верталёт адбыў, у тэрміны ўкладываемся, прараб Аляксандравіч задаволены, – Віцёк пакруціў галавой па баках, – праз тры дні ў Мішані-повара дэмбель. Як ён і абяцаў, калі з дзіччу пракалоўся, сягоння шашлык з ласяціны. Возьмем вуды, вячэра будзе раней, вунь там, – Віцёк правай рукой паказаў на месца, дзе рака робіць левы паварот перад базай на дзевяноста градусаў, – там з верхавога невялічкага азярца ручаёк у раку ўпадае, і рыба там добра вудзіцца. Шкада, што крамы паблізу няма, а то бы ганца заслалі.

Высаджваючы рэшткі хмызняку чорнай і чырвонай парэчкі, Фёдару добра было бачна, як каля прыстані з прышвартаванымі лодкамі ды судна на паветранай падушцы Віцёк з Юрасём-Фазай ладзілі з сухіх бярвенняў невялікі плыт, памерам прыкладна тры с паловай на два з паловай метры, па загаду Яўсеевіча. Назаўтра з раніцы патрэбна па плыт нагрузіць піламатэрыялаў, абрэзкаў дошак, бруса, некалькі лістоў металачарапіцы, якія ўжо не спатрэбяцца. Павінен з'явіцца паляўнічы-эвенк – той, што пакінуў Дзіне на выхаванне шчанюка Кудлатага. Яўсеевіч, вярнуўшыся дзесьці да абеда, затралюе маторнай лодкай плыт з будматэрыяламі ды лодку з паляўнічым-эвенкам за дванаццаць кіламетраў уніз па цячэнню да сядзібы свайго сябра.

37.

Мішаня-повар, смажучы на вогнішчы нанізаныя на шампуры замарынаваныя загадзя кавалкі мяса сцягна лася, напяваў сабе ціхенька нейкую вясёленькую песеньку, не далучаючыся да гамонкі побач вудзіўшых рыбу таварышаў. Пасля атрымаўшайся недарэчнасці з прыгатаваннем дзічы, якую малады шчанюк усё яшчэ перахоўвае са схованкі ў схованку пра запас, як навучыла яго настаўніца Дзіна, акурат перад дэмбелем, ад

з'явіўшайся магчымасці рэабелетаваць сябе перад таварышамі, Мішаня адчуваў сябе на вышыні.

– Глядзі, глядзі што робіць, а ну, пайшла, брысь, – Віцёк, вывудзіўшы на тэлескапічную вуду чарговую рыбіну, зняўшы з кручка, павярнууся на сто восемдзесят градусаў, каб кінуць яе далей ад берага да навуджанай рыбы, абураўся, заўважыў як адкульсьці з'явіўшаяся выдра ўхапіла сківіцамі самую вялікую з кучы рыбіну і спрабавала прабіцца праз яго месца да ручайка, што ўпадаў з верхавога азярца ў раку, – а ну, кінь, кінь.

Ага, так вось узяла ды паслухала, ды кінула. Выдра з рыбінай у сківіцах, матлянуўшыся ўлева, управа, заблытаўшы Віцька, сіганула да ўпадаючага ў раку ручая паміж расстаўленых ўшырку Віцьковых ног.Назіраючыя за відовішчам хлопцы зарагаталі. Выдра са здабытай рыбінай, даўшы драпу цераз ручай, выскачыла на другі бераг і знікла ў хмызняку лявей за вырасшым побач  вялікім дрэвам. Неўзабаве з'явіўшыся з-за дрэва, пакінуўшы рыбіну ў сваім бяспечным месцы, з мілавідным выразам сімпатычнай мысы наўшыр раскрытымі вочкамі, выдра зацікаўлена стала разглядаць незнаёмых двуногіх істотаў, што маюць у наяўнасці столькі шмат рыбы

– Ах ты, зладзейка, – Віцёк канцом высунутай на ўсю магчымую даўжыню тэлескапічнай вуды, прыцэліўшыся, датыкнуўся выдры па галаве, акурат паміж вушэй. Выдра, адхінуўшыся назад, крутануўшыся, схавалася за дрэва, але праз імгненне высунулася сваёй сімпатычнай мордачкай з выразам пакрыўджанасці, маўляў, табе што шкада той рыбы, вунь колькі яе ў вас. Віцёк, прыцэліўшыся выцягнутай вудай, зноў канцом злёгку цюкнуў выдру паміж вушэй. Тая, матлянуўшыся, знікшы на імгненне, зноў паказала сваю мордачку з такім мілавідным выразам ды пакрыўджанымі вочкамі, маўляў, ты чаго, шкада, што Мішаня-кухар, пазіраючы на гэтыя падзеі, бо сам крыху недалека гатаваў шашлык, не стрымаўся.

– Слухай, Віцёк, ды няхай яшчэ рыбы той возьме, тут ужо меха паўтары вы навудзілі. Давайце, хлопцы на вячэру, шашлык, як і абяцаў, атрымаўся, што трэба.

За вясёлай гамонкай, ужываючы смачна прыгатаваны Мішаняй-поварам шашлык, сабраўшыся гуртом каля вогнішча побач з навуджанай рыбай, хлопцы не імкнуліся больш адагнаць выдру, толькі крыху патупвалі, дзеля забавы, назіраючы як яна, не баючыся, гойсала паміж імі і цягала адну за адной рыбіны праз ручай у сваю схованку, – напэўна, сваім дзеткам.

– Так, ціха, ціха, – Віцёк, глянуўшы праз лістоту хмызняка, на процілеглы бераг, узняў правую руку і затрос далонню, – ціха, ціха.

– Віцёк, а што здарылася? – Мішаня-повар, стоячы непадалёку, спытаў смакуючы з асалодай кавалак шашлыка.

– Што здарылася, мядзведзь вунь на тым беразе, падыйшоў вады сербануць, так што ціха.

– А чаго ціха? Віцёк, а давай шуганём яго, паназіраем як драпака даваць будзе, – ад таго, што хлопцам смачны шашлык быў даспадобы, Мішаня-повар не ўнімаўся.

– Шуганём, – Віцёк агледзеў сабраўшыхся каля яго гуртом, – пачнем шугаць, то ён жа, магчыма, зацікавіцца, хто тут такі адважны ды нахабны. Ды калі паплыве цераз раку пазнаёміцца, то будзем мы даваць драпака адсюль, прыхапіўшы ногі ў рукі, хутчэй да базы, пакінуўшы і вуды, і шашлык, і гэту сваю навуджаную рыбу. За два гады, што я калісьці па маладосьці працаваў на Далёкім Усходзе, усялякага цікавага нагледзеўся ды расповедаў розных пачуў. Будзе час, што-небудзь распавяду, пра мядзведзяў там, пра ізюбраў, тыграў. Лепей моўчкі паназіраць, зараз вады нап’ецца ды пойдзе сабе, куды яму патрэбна, – Віцёк заціх, мядзведзь, напіўшыся вады, узняў галаву перад сабой і ўважліва паглядзеў наперад на хмызняк, на процілеглы бераг ракі, за якім прыхавалася, сабраўшыся гуртом, каманда шашлычнікаў. Глытнуўшы яшчэ крыху вады з ракі, гля-



нуўшы ўбок хмызняка на процілеглым беразе, з-за якога ўзвіваўся лёгкі дымок ад дагараючага вогнішча, павярнуўшыся ўлева, мядзведзь паволі пакасалапіў уздоўж берага, час ад часу варочаючы галавой у бок другога берага, дзе былі пабудовы базы, а потым знік за раслінамі на павароце ракі ўлева.

З'явіўшаяся з-за ручая выдра, пакруціўшыся паміж хлопцаў, працягваўшых сваю трапезу за ўжываннем шашлыка, ухваціўшы пасткай ізноў самую вялікую рыбіну, як падалося назіракльнікам, фанабэрыста, паводзячы сябе як гаспадыня ў дадзеным выпадку, сіганула праз ручай за дрэва да сваёй схованкі.

– Во, глядзіце, заяц, – Віцёк, паказаў на другі бераг, адкуль толькі што сыйшоў касалапы, заўважыў падыйшоўшага да таго ж месца вялікага шэрага зайца, адклаўшы свой шашлык, хутка сыйшоў берагам да ўскрайку вады, узяўшы плоскі каменьчык, шпурлянуў па воднай гладзі з падскокамі аб ваду, амаль да таго берага. Заяц ад усплёску вады перад сабой перастаўшы піць, прысеў на заднія лапы. Ад крыкаў ды свісту, утворанымі Віцьком ды яшчэ двума хлопцамі, падскочыўшымі да вады, заяц, навастрыўшы свае вушы тырчком угару, завадзіў імі па баках, нібыта лакатарамі, спрабуючы ўцяміць тыя незнаёмыя яму гукі ды здалёку разгледзець невядомых яму двуногіх істотаў. Упэўніўшыся ў бяспечнасці свайго становішча, нахіліўшыся да вады, ён спатоліў смагу ды, не звяртаючы ўвагі на булькаючыя амаль каля яго, кінутыя з процілеглага берага каменьчыкі, касы паволі патупаў уздоўж берага, акурат па слядах касалапага.

– Вось гэта прыкол, – Барыс, узяўшы вуду, нанізаўшы на кручок прыманку, закінуў яе ў ваду, – дзіўна, ураджанне, нібыта заяц мядзведзя пасе.

– Падобна што так, ходзіць сабе следам на адлегласці, вунь які здаравяка адкормлены. Упэўнены, што так яго ніхто не схавае, разумняка, – Мішаня-повар глянуў на гадзіннік, – ну што, хлапцы, збіраемся, мне яшчэ два дні вам ежу гатаваць, і я

дэмбель. Па праўдзе кажучы, ужо і дадому цягне, крыху я ўжо стаміўся, хочацца адпачыць.

38.

Сонца, падыходзячы да паўдзення, паліла спякотай. Зладзіўшы кроквы даху, распачаўшы накрываць металачарапіцай, бліжэй да гадзіны абеду, брыгада вырашыла крыху адпачыць і захавалася ў гаражы ў зацяненні. Па спякоце было яшчэ цярпяліва, не было паратунку ад нахабных авадоў, што, выкусваючы з лёту шматкі скуры, уносілі ў настрой адпаведны дыскамфорт. Хлопцы, падпаліўшы ў будынку спецыяльную зялёнага колера спіраль, антыкамарык, як яны яе называлі, прысеўшы на бярвенні, палілі тытунь.

– Так, з абеду, значыць, – Віцёк, завёўшы гаворку, закруціў па баках галавой, – значыць, Барыс зоймецца капчэннем навуджанай учора рыбы. Аляксандравіч прасіў прарабам з базы. Ну, а табе, Фёдар, – Віцёк, зацягнуўшыся цыгарэтай, выпускаючы дым тытуню, седзячы на бервяне ў двух метрах насупраць Фёдара, глядзеў на таго з-пад ілба і закрывіўся сваёй завіхастай усмешкай, – табе, як заўсёды, халява. У генератарнай вароты жалезныя для гаража, дапаможам вынесці, выкладзем. Патрэбна іх даварыць, ты ў нас адзін зваркай валодаеш, зоймешся.

– Абавязкова, толькі ты, братка, за базарам не сочыш. Якая гэта мне заўсёды халява? Раблю я, што загадываюць мне, за тое і грошы атрымліваю свае.

– Ну, пра халяву гэта я так, як бы дзеля размовы, – Віцёк, шукаючы выйсце, закруціў па баках галавой, – а гумар твой што, ужо заканчваецца?

– Заканчваецца ці не, гэта для мяне не праблема, выйсце нейкае заўсёды ёсць, – Фёдар, узяўшы ляжаўшую перад ім сваю сякеру у правую руку, павярнуўшы вастрыём уверх, памацаў яго пальцамі левай далоні, – вострае, што лязо, і да Кітая адсюль недалёка, калі што, то я дабяруся, – Фёдар, паклаўшы прыладу

перад сабой, з-пад ілба ўпарта глянуў на седзячага насупраць са скрыўленым выразам твару Віцька і дадаў, – пешшу... Віцёк, а колькі табе гадоў? – Фёдар, запаліўшы яшчэ адну цыгарэту, наўмысна прышчурыў вочы.

– Мне гадоў, – Віцёк прызадумаўся, – сорак два мне гады.

– Раз во ў два-тры гады, – Фёдар гмыкнуў, усміхнуўшыся, – раблю я парадны свой фотаздымак, у касцюмчыку, белай кашулі ды гальштуку, пры парадзе. А ты, Віцёк, даўно такі свой фотаздымак рабіў?

– А навошта такі? – здзівіўшыся, Віцёк наўшырку раскрыў вочы.

– На помнік, – Барыс, стоячы позаду Фёдара, уважліва слухаючы, уключыўся ў ґаворку.

– І як гэта Віцёк табе ўдалося да сарака двух дацягнуць? Такія фраеры, звычайна, па столькі не пражываюць, выключны выпадак, – Фёдар глянуў на гадзіннік.

– А я ўжо думаю, дзе гэта вы падзеліся, – у дзвярным гаражным праёме з’явіўся бадзёры твар Мішані-повара, – там эвенк-паляўнічы прыбыў за плытом. На сваёй гумавай лодцы веславаў супраць цячэння дванаццаць кіламетраў, чакае Яўсевіча, ды штосьці яго во няма. Затрымаўся, а магчыма, што здарылася. Можа, хадзем пакуль абедаць?

Накрываючы пасля абеду дах гаража металачарапіцай, хлопцы заўважылі, як Віцёк з Юрасём-Фазай, дапамагалі эвенку-паляўнічаму адчаліць ад пристані на гумавай лодцы з прывязаным да яе вяроўкамі плытом з будматэрыяламі, узняўшыся на высокі бераг, паглядалі ўніз. Віцёк, пакінуўшы Юрася на беразе, накіраваўся да будоўлі.

– Хадзем усе, паглядзім, хадзем, – толькі і сказаўшы, Віцёк накіраваўся да берага.

Паляўнічы-эвенк, дробны стары чалавек са зморшчанай скурай на твары, на ўсе свае магчымасці змагаючыся з цячэннем ракі, вяслуючы ў сваёй гумавай лодцы з прывязаным ззаду вя-

роўкамі плытом з будматэрыяламі, уразіў на беразе сабраўшыхся хлопцаў сваёй упартасцю. Вада па русле, уваходзячы ў левы паварот перад базай, ды праз некалькі сотняў метраў уваходзячы ў левы паварот зноў, зносіла прывязаны плыт да правага берага па цячэнню на мель. Плыт стапарыўся, вяслоўца, ўпарта заграбаючы, сцягваў намаганнямі з лодкі плыт на цячэнне, але, заварочваючыся з левага паварота зноў у левы паварот паток вады раз-пораз асаджваў плыт на мель. Хлопцы з высокага берага маглі толькі назіраць за мужнасцю ды ўпартасцю гэтага старога чалавека, паляўнічага-прамыславіка, амаль усё жыццё пражыўшага ў гэтых самых, што ні на ёсць некамфортных таёжных умовах, нібыта аддаючы сябе цалкам яднанню з прыродай.

– Віцёк, ты лодку маторку завёў бы ды і затраляваў бы старога да ягонай сядзібы, – Барыс, звярнуўшыся да Віцька, парушыў маўчанне.

– Да маторкі ключоў няма, каб завезці. Ключы ў гасцявым доме, у сейфе. Ад сейфа Яўсеевіч ключы не пакідае, з сабой яны ў яго.

На гук рухавіка аўто хлопцы, стоячы гуртом, павярнулі галовы. Акурат да іх пад’ехаў на ўсюдыходзе Яўсеевіч, адчыніў дзверку, спрытна выскачыў з машыны. Павітаўшыся, спытаў, у чым справа, пабачыў старога эвенка, змагаючагася з цячэннем ракі, сказаў, што зараз дапаможа сябру. Адным рухам аддаў ключы ад аўто Віцьку і загадаў перагнаць да месца стаянкі. Адчыніўшы заднюю дзверцу з боку вадзіцеля, дастаў карабін, паляўнічую стрэльбу ды больш чым напалову запоўнены рукзак з напаляванай дзіччу, павалок сваю ношу, крыху сагнуўшыся, паўскідаўшы на плечы, да пабудовы гасцявога дома. Неўзабаве шпарка крочачы назад, Яўсеевіч, штосьці жуючы на хаду, моўчкі мінаючы хлопцаў, спусціўся з крутога берага па лесвіцы да прыстані, завёў рухавік японскай шматмеснай гумавай лодкі і адчаліў. Далей ўсе ўбачылі, як ён паруляваў да змагаўшагася з воднай стыхіяй свайго сябра-эвенка.

39.

Прачнуўшыся раніцой наступнага дня, як звычайна, раней за астатніх, Фёдар нетаропка памыў твар халоднай вадой, якая дадала бадзерасці арганізму, старанна выцер яго рушніком. Каб не пабудзіць хлопцаў, ціхенька выйшаў з балка пражывання і, запаліўшы цыгарэту, глянуў на гадзіннік. Без дваццаці хвілін восем, час сняданку. Ціхенька прыадчыніўшы дзверы, каб не пабудзіць повара, што адпачываў на дзяжурным ложку, накрыўшыся коўдрай з галавой, узяўшы сваю порцыю, прысеў за стол снедаць. На гук зарыпеўшых прыадчыняемых дзвярэй Фёдар, адарваўшыся ад сняданку, павярнуў галаву улева і ўбачыў у дзвярным праёме твар Яўсеевіча.

– А дзе хлопцы? – Яўсеевіч спытаў ціхенька шэптам, каб не пабудзіць кухара.

– Спяць, – напаўголаса адказаў таму Фёдар.

– Дзе хлопцы? – зноў сцішана з вуліцы праз прыадчыненыя дзверы запытаўся Яўсеевіч.

– Спяць,– Фёдар глытнуў з кубка чаю.

– Дзе-е? – зноў запытаў Яўсеевіч, з наўшырку раскрытымі вачыма, ўцямліваючы ў сэнс адказаў Фёдара.

– Спя-а-ць, – выцягнуўшы наперад галаву, каб да Яўсеевіча ўрэшце-рэшт дайшоў сэнс ягонага адказу, Фёдар яшчэ раз удакладніў, – спя-а-ць.

– Як спяць? – ажно падпрыгнуўшы ды потым прычыніўшы дзверы, Яўсеевіч мільгануў за акном у накірунку да балка пражывання.

Крык абурэння Яўсеевіча, данёсся да балка кухні-сталовай, пабудзіў повара.

– Што гэта там за гвалт такі, з чаго гэта Яўсеевіч, нібыта з ланцуга сарваўся, якая гэта сабака яго пакусала? – Мішаня-повар, скінуўшы коўдру, прысеў на ложку, – а што ты адзін?

– Так патрэбна.

– Зразумела, фраеры нарваліся, сягоння Аляксандравіч верталётам прыбудзе, Яўсеевіч разборку палётаў правядзе. Ты, Фёдар, – повар пазяхнуў, пацягнуўшыся рукамі, – акурат у яблычка сягоння, што не пабудзіў. Яны, гэтыя фраеры, барзатухі так насёрбаліся, што самы раз іх на месца паставіць, адпаведна іхняму наяўнаму раскладу, а не згодна самаўяўленню, у якое яны хацелі б пераўвасобіцца.

Выйшаўшаму са сталовай Фёдару першым з гурта хлопцаў, ідучых на сняданак, сустрэўся Юрась-Фаза.

– Ты чаго нас не пабудзіў? – Юрась, прыпыніўшыся, замінуў уваход у дзверы астатнім хлопцам.

Фёдар, дастаўшы цыгарэты, запаліўшы запалкамі, па-фраерску зацягнуўшыся, у правай руцэ трымаючы цыгарэту, выдыхнуў працяжна з легкіх дым тытуню Юрасю, замінуўшаму яму прайсці, у твар.

– Сягоння не пабудзіў, і надалей я вас нікога будзіць не буду.

– І гэта правільна, так і трэба, – Барыс, ішоўшы ззаду Юрася, падпіхнуў таго правай рукой управа ад дзвярэй увахода, каб прайсці, – а то ўсё, чаго будзіш рана, даспаць не даеш, задалбаў, – справядлівае вырашэнне. Цяпер самі прачынацца будуць, своечасова.

40.

Заўважыўшы, што да прыбыўшага акурат да абедзеннага часу верталёта ад гасцявога дома накіраваўся Яўсеевіч, Віцёк, вымавіў мужыкам, што пайдзе перахопліваць ініцыятыву, каб не дазволіць Яўсеевічу пагнаць паражняк, пашыбаваў следам, трымаючыся на адлегласці. Памыўшы рукі, пысы, убачыўшы што да іх набліжаецца ў саправаджэнні Яўсеевіча ды Віцька прыбыўшы верталётам прараб Аляксандравіч, хлопцы прыпыніліся перад уваходам у сталовую.

– Сягоння во ўсе спалі як трутні, у восем гадзін пабудзіў, што гэта за адносіны да працы, – Яўсеевіч, выкараставўшы зручны момант, падыходзячы да стоячых гуртом хлопцаў, вырашыў-такі казырнуць.

– Яўсеевіч, ды ў нас казыроў тут болей, чым дастаткова, – Віцёк, сарваўшыся, абураўся, – як па двое сутак працаваць без перадыху, альбо колькі дзён запар звыш тэрміну напружвацца, то ты гэта як бы і не прыкмячаеш. А тут адзін дзень адпачылі болей, пазней падняліся, бо людзі ўсё ж стаміліся занадта, ствараеш, ну, прама невырашальную праблему. Яшчэ невядома, што мы за свае намаганні, абяцанкі абяцанкамі, што мы атрымаем, які заробак па заканчэнню вахты. Ты, Яўсеевіч, не бузі.

– Ды хопіць вам тут плюралізм разводзіць, па тэрмінах з апяраджэннем ідзём. Бачу па аб'ёмах, што зроблена ўсё тут, як мае быць, хутка ўжо і сам дах на гаражы накрыты будзе, – Аляксандравіч, падыйшоўшы да гурта, павітаўся з усімі хлопцамі за руку, – з заробкам, хлопцы, парадак. Табелі ў бугалтэрыі, незадаволеных не будзе, з гэтым вырашана, – Аляксандравіч пакруціў па баках галавой, шукаючы Віцька, – Віцёк, ёсць вельмі важная задача – навязаць для лазні бярозавых венікаў. Каму даручыш гэту справу?

– Ну, напэўна, Фёдару, ён жа ў нас па лазні галоўны.

Пад час абеду, запакаваўшы вэнджаную рыбу, напоўніўшы мех амаль на поўную, дэмбель Мішаня-кухар, збіраючы свае рэчы ў дарожную сумку, круціў наўкола галавой, нібыта жадаючы штосьці выказаць. Віцёк, застаўшыся за бугра, выпіваючы кампот са свайго вялікага кубка, павалі пераводзіў погляд то на стоячую ў левым перад сабой вуглу ў меху рыбу, то ўправа – на седзячых за сталом хлопцаў і аб чымсьці задумліва, нібыта, разважаў.

– Вось, – Мішаня-повар парушыў агульнае маўчанне, якое звычайна ўсталёўвалася, калі для кагосьці надыходзіў тэрмін заканчэння вахты і заглыбляў у мройнасць хуткага вяртання да-

дому, а камусьці тут яшчэ цягнуць лямку да свайго непазбежнага часу дэмбеля, – рыбу ўпарадкаваў, рэчы свае што тут таксама, засталося ў балку сабраць і-і-і, – повар, узняўшы погляд ад складзенай сумкі на абыякава глядзеўшага перад сабой Фёдара, звярнуўся да таго, – Фёдар, ну, ты мне дапаможаш рэчы мае да верталёта данесці?

Той, ленавата нахіліўшы галаву крыху налева ўбок, запытаў:

– А з чаго гэта я панясу твае рэчы?

– Ну, як з чаго, я ж сёння дэмбель, і я ўвесь тэрмін твайго знаходжання тут карміў цябе. Я тую рыбу, што на базу прарабам пацягну, ну, а ты бяры сумку маю.

– Ён мяне карміў, ты, братка, парожняе не гані, за базарам сачы, – Фёдар, уздрыгануўшыся, павысіў тон свайго голаса, – за базар адказваць трэба. Ты тут не мяне карміў, ты тут гатаваў ежу для ўсіх, за што і грошы атрымаеш свае. І рэчы свае, і рыбу тую, на што падпісаўся тым прарабам з базы, ухопіш і пагазуеш адсюль. Твой час тут завершаны.

– Ну, дапаможаш, у мяне ж шмат, – Мішаня-повар не дагаварыў свой расповед, бо Фёдар, устаўшы з-за стала, падыйшоў да пліты, наліваючы палонікам сабе ў кубак кампот, і перабіў яго думку.

– Ды колькі бы шмат, Мішаня, не было, трэба разлічваць настолькі свае магчымасьці, напружвацца, насколькі ты сам здольны пацягнуць, – Фёдар, адыйшоўшы ад пліты на два крокі, павярнуўся тварам да прысеўшага на табурэце повара, што пазіраў на яго знізу, разгублена моргаючы вачыма, і змяніў напорысты тон на звычайны, – мне во пастаўлена вельмі важная задача, з абеда я шурую ў тайгу для лазні венікі бярозавыя вязаць, Аляксандравіч загадаў. Дапамагатых тут табе, падпісаўшыхся на нарыхтоўку той рыбы, без мяне дастаткова, затралюеце, – сказаўшы, што пара выбірацца, Фёдар прыхапіўшы з сабой невялікую навостраную сякерку, зручны востры нож ды вярова-

чак, намазаўшыся антыкамарыным сродкам, рушыў за пабудову гаража, міма генератарнай у тайгу.

41.

Аддаляючыся ад базы, арыентуючыся на гук працаваўшага рухавіка генератара, што пры адыходзе далей чуўся меней і меней, Фёдар дзівіўся знаходжаннем вось у гэтай такой некранутасці дзікай прыроды, ступаючы, магчыма, там, дзе не праходзіў яшчэ чалавек.

Дайшоў да месца, наўшырку пакрытага мохам не толькі па долу, але і па вялікім паваленым з каранямі дрэвам, нібыта засланаму зялёнай коўдрай, багатага на нізкарослыя маладыя бярозкі з пышнай каронай лістоты. Фёдар, прыняўшыся за сваю справу, хутка панаразаў галінак, прысеўшы на ствол ляжачага, пакрытага мохам дрэва, час ад часу паглядаючы наўкола, дзівіўшыся незнаёмым дагэтуль краявідам, адзін за адным пачаў вязаць венікі. На гук запрацаваўшага рухавіка верталёта Фёдар прыслухаўся. Ён павольна ўзняўся, праводзячы задуменным поглядам, знікаючую з відавоку вінтакрылую машыну з усё цішэй і цішэй даносячымся гукам рухавіка, злавіў сябе на думцы, што праз тыдні паўтара, як даводзіў прараб Аляксандравіч, будзе і яго верталёт.

Прысеўшы зручней на дрэва, працягваючы свой занятак, прыслухаўшыся да ледзь, на адлегласці, чутага ім гуку рухавіка працуючага генератара, Фёдар ажно ўздрыгануўся: «Э-э братка, а ці не далёка, ажно сюды зайшоў-такі ты? Хлопцы казалі тыдзень таму, што бачылі гэтым берагам ракі, уніз па цячэнню, у кіламетрах двух ад базавай пляцоўкі, мядзведзіцу з мядзведзянём. Гэтым берагам яна гаспадарыць, Яўсеевіч параіў не выбірацца далёка. Лепей будзе рэціравацца адсюль, ды хутчэй, пакуль не знайшоў тут сабе прыгоды якія. А не то паляпае па плячы хтосьці, азірнешся, а касалапы так і спытае, маўляў, мужык ты што венікі тут вяжаш, прыйдзецца адказаць, што так,



вяжу. Ён, той касалапы, як у рэкламе па тэлебачанню пра піва, працягне пакет які ды й загадае, маўляў, зганяй, брат, за «Клінскім». А дзе яно, тое «Клінскае» тут у тайзе надыбаеш, недарэчнасць атрымаецца».

Сабраўшы пад правую руку зрэзаныя з бярозак галінкі, пад левую пяць навязаных венікаў, прыхапіўшы працоўны інструмент ды вяровачкі, нетаропка, азіраючыся наўкола, прыкмячаючы таямнічы краявід дзікай тайгі, Фёдар пацягнуўся бліжэй да пляцоўкі базы на ўсё мацнеўшы гук рухавіка працаўніка-генератара.

42.

Надакучлівыя авадзені, што імкнуліся праз дымавую завесу тлеючых на будоўлі гаражу антыкамарыных спіраляў, не гледзячы на панамазаныя сродкамі ад насякомых працаўнікоў, з лёту прычынялі тым шкоду, знікаючы з відавоку, псавалі агульны настрой. Віцёк, прызначаны брыгадзірам пасля адбыцця Мікалаевіча, карэкціруючы бы лейкамі тэрміны выканання работ па заканчэнню будаўніцтва гаража, прапанаваў выходзіць на працу ў начную змену, адчуўшы сябе на вышыні пад час у дзень адпачынку, і пацягнуў за сабой дваіх хлопцаў на раку навудзіць рыбы да прыбыцця чарговага верталёта прарабам з базы, каб паспець яшчэ і навэнджыць яе.

– Што, не спіцца? А я во за рулеткай зайшоў, дзесьці яна ў мяне ў ляжыць сумцы, якую паклаў пад ложак, – Фёдар, увайшоўшы ў дзве гадзіны ночы ў балок пражывання, звярнуўся да Барыса, якому дручылі пасля адбыцця Мішані-повара кашаварыць, а ў вольны час займацца вэнджаннем навуджанай рыбы.

– Не-на-а- від-жу, я ва-ас усі-іх, не-на-від-жу. Вы-ы мне-е усе-е абры-ы-длі-і ўжо. Я-а не-е жада-а-ю бо-о-ле-ей ба-ачыыць ва-ашы тва-а-ры, бы-ыць за-а-ўсё-ды-ы з ва-а-мі-і по-о-бааач. Не-на-а-від-жу, абры-ы-длі-і усе-е, усі-і-х ва-а-с не-на-віджу, – Барыс, седзячы на ложку, датыкнуўшыся спіной да сцяны, падцягнуў ногі пад сябе, трымаючы рукі ўздоўж тулава і па-

клаўшы на ложак, як прыкмеціў Фёдар ад святла пражэктара за вакном, з наўшырку раскрытымі вачыма паглядаў на яго і казаў, матляючы крыху ўніз-уверх галавой.

– Так, у мяне такія ж адчуванні ад усяго гэтага. Казалі, што на дзесяць дзён, а ўжо во амаль два з паловай месяцы мы тут. Ну, нічога, як-небудзь выцягнем мы гэтую лямку, яшчэ крыху засталося, – Фёдар, шукаючы ў сумцы правай рукой, намацаў рулетку, – ёсць, пайду, хлопцы чакаюць мяне.

– Як працуецца? – Барыс, сцішана запытаўшы, дадаў:

– Штосьці не засынаецца сягоння.

– Ды сягоння дапрацуем, потым зноў у дзень працаваць будзем. Напачатку нічога, ды ўчора з пяці гадзін раніцы так даймалі камары ды машкара, што рады не маглі даць. Антыкамарыныя нашы прылады не дапамагаюць. Уяўляеш, на пачатку шостай гадзіны Яўсеевіч з'явіўся, усміхаецца, шчурыцца хітравата ды пытае, як справы? Пасля, дастае загадкавым рухам з кішэні балончык невялічкі, апырсквае нас усіх, і ўся тая надакучлівая мішура рэзка прэч ад нас знікае. Потым, усміхаючыся, распавёў, што балончык той – фінскі сродак, эфектыўны, на некалькі гадзін хапае. Віцёк папрасіў яго, каб на сягонняшнюю ноч даў папырскацца нам, ды Яўсеевіч не пагадзіўся. Сказаў, што мала засталося і што ў пяць гадзін раніцы зноў падыйдзе, як і ўчора, дапаможа нам, падсобіць. Ён жа тутэйшы, і пра гэта добра ведае, выбіраючыся падоўгу ў тайгу на паляванні.

– Там, Фёдар, гэта, там сняданак я прыгатаваў. Ён на пліце падагрэтым стаіць, дзе што браць, ведаеце. Я прылягу, паспаць трэба.

За ціхенька зачыненымі Фёдарам дзвярыма ў балку пражывання ўсталявалася цішыня.

43.

Як верталёт пачало моцна падтрэсаць, Фёдар, крыху закімарыўшы, прачнуўся.

– Вось, бачыш, як бы верталёт наш не разваліўся зусім, – прараб Аляксандравіч, седзячы на лаве ў жэраве вінтакрылай машыны побач з Фёдарам, заўважыўшы, што той прачнуўся і паспрабаваў, усміхаючыся, пажартаваць.

Нічога не адказаўшы, Фёдар, задаволена ўсміхнуўшыся, агледзеў насупраць седзячых на лаве таварышаў па працы, павярнуў галаву ўлева да ілюмінатара і ўбачыў аэрапорт, які чакаў іх прызямлення. Толькі і падумаў ён праз сябе, што байкі ты мне будзеш распавядаць, Аляксандравіч. Не першы ж раз даводзіцца лётаць на МІ-8, і добра вядома, што пры ўзлёце ды пасадцы корпус верталета заўсёды трасе. Перавёўшы погляд на таварышаў насупраць, Фёдар прыпомніў застаўшыхся на Чоне двух, якіх не разліць вадой, сябрукоў, Віцька ды Юрася-Фазу. За тры тыдні да заканчэння вахты ім засталося ліквідаваць недаробкі па давядзенню здадзенага ва эксплуатацыю аб’екта да поўнай гатоўнасці. Традыцыйна аблятаючаму наўкола базы верталёта махаючы на развітанне, яны стаялі побач, праводзячы паглядамі знікаючую ў даляглядзе вінтакрылую машыну з экіпажам, прарабам Аляксандравічам ды таварышамі па працы на борце.

Да часова размясціўшыхся ў пакоі інтэрната галоўнай базы на другім паверсе ўвайшоўшы дзённы дзяжурны, паведаміў Фёдару, што яго зараз выклікаюць зайсці ў вагончык прарабскай для ўдакладнення месца працы на два тыдні астатнія да заканчэння тэрміну вахты, а двум яшчэ трэба пачакаць рашэння адміністрацыі. Выйшаўшы, ён пагрукаў у дзверы суседняга пакоя, дзе часова размясціліся астатнія прыбыўшыя верталётам.

– Ну што, куды ўжо цябе, дзядзя Фёдар? – Барыс, лежачы на ложку, запытаўся, стомлена паглядаючы на вярнуўшагася Фёдара, заклаўшы рукі за галаву на падушцы.

– Зараз мяне ў другі інтэрнат машына падвязе. Накіравалі на два тыдні застаўшыхся працаваць у начную змену, штосьці там са зваршчыкам будзем майстраваць, адтуль аб’ект недалёка, паблізу, – Фёдар, выцягнуўшы з-пад ложка сваю сумку з рэчамі,



*САХА-ЯКУЦІЯ,*
*г. Мірны*



*Валеры Скакун.*
*САХА-ЯКУЦІЯ, г. Мірны*

паставіўшы яе каля дзвярэй на выхадзе з пакоя, глянуў на дваіх сваіх таварышаў па працы, прылегшых на суседніх ложках, заклаўшы рукі за галовы на падушках, стомлена, але ўважліва паглядаючых на яго, і спытаў:

– Хлопцы, а з чаго гэта вы, амаль усе, так прагна імкнуліся на мяне  наехаць, ледзь не да апошняга выпрабоўвалі ўзровень ступені майго гумару?

– Ды разумееш, дзядзя Фёдар. Ты вось неяк вылучаўся сярод нас сваёй інтэлігентнасцю, напорыстасцю, мэтанакіраванасцю. Вось і брыгадзір Мікалаевіч да цябе па імені болей, чым да нас астатніх звяртаўся, – Барыс прысеўшы на ложку, падцягнуў калені пад сябе і закінуў наперад рукі, сашчапіўшы разам далоні.

– Зразумела, – Фёдар вытрымаў невялікую паўзу, – гумар мой калі б закончыўся, то і паплылі б вы ў мяне па Чоне, уніз па цячэнню.

– Так, мы зразумелі, што да Кітая ты б дайшоў.

Да павярнуўшагася, узяўшага сумку каля дзвярэй у правую руку Фёдара звярнуўся прылёгшы на ложку Павел:

– Я болей сюды ніколі не палячу. Тры тыдні дапрацую як-небудзь тут, і з мяне хопіць, да-ста-тко-ва.

– Ну-у, твая справа, – Фёдар, трымаючы сумку з рэчамі ў правай руцэ зрабіў два крокі на месцы, – ды толькі пасля першай сваёй вахты, можа, адразу і не рабі нейкую катэгарычную выснову. Тут галоўнае – быць самім сабой, не паддавацца разважанням наконт таго, што пра цябе думаюць іншыя. Быць самім сабой, ну-у і-і, трэба сачыць за базарам, – развітаўшыся, Фёдар сыйшоў па лесвіцы на першы паверх, выйшаў з будынка праз гаспадарчы двор і накіраваўся да стаяўшай каля варот на выезд дзяжурнай машыны, што чакала яго.

Прачнуўшыся раніцой, адчуўшы палёгку ад таго, што сягоння не трэба збірацца на працу, выконваць нейкія загады, рабіць замеры, напружвацца, каб у дакладны тэрмін належным

чынам завяршыць планы выканання работ па здачы аб’екта, Фёдар хацеў пабыць болей у сваіх асабістых думках.

Пасля сняданку вырашыў, каб не марнаваць час на інтэрнатаўскім ложку, пашвэндацца па горадзе. Фёдар выбраўся адзін. Цёплы, сонечны летні дзень абуджаў успаміны, выклікаючы хваляванне ад назаўтра хуткай сустрэчы з родным домам. Беларус нетаропка блукаў па вуліцах, заходзячы ў крамы, набываючы адметныя сувеніры Паўночнага края, а ў галаве ў песенным матыве круцілася толькі адно слова: дадому, дадому, дадому, дадому.

Ідучы з абеда да асноўнай базы, каб атрымаць разлік за адпрацаваны тэрмін, павярнуўшы ўправа па тратуары, сыходзячы з узвышша ўздоўж галоўнай вуліцы, Фёдар напаткаў працаваўшых на добраўпарадкаванні праспекта, выстаўляючых з іншымі працаўнікамі бардзюры, умацоўваючы іх бетонам, Барыса ды Паўла.

– Прывітанне, хлопцы.

– Ну, дзядзя Фёдар, ты ўжо ўсё, дэмбель, – Барыс, прыпыніўшы працу, падаў руку на прывітанне.

– Шчаслівы, ну, а мы, як нам ужо паведамілі, дадому праз тыдзень, – Павел, падаўшы руку на прывітанне, заўсміхаўся.

– Табе вось, Фёдар, тут якраз месяц закончыўся, за апошнія два тыдні што па заробку закрылі, якая катэгорыя? – Барыс, як падалося Фёдару, неяк сцішана, незадаволена запытаўся, піўшы з бутэлькі мінеральную ваду.

– Ды першую выставілі, учора роспіс паставіў свой, першая.

– Бачыш як, а нам вось з Паўлам, – Барыс сцішыў голас, каб не пачулі працаваўшыя непадалёку таварышы, – а нам во абодвум чацвёртую ўлупілі, вось так нам. Учора, як спісы на подпісы падалі, то мы з Паўлам і давай абурацца, а брыгадзір, што тут на аб’екце, будзе казаць, маўляў, не ведаю нічога, прарабы выстаўлялі, да іх і звяртайцеся.

– Ну, і як, звярнуліся? – Фёдар працягнуў руку да бутэлькі з вадой, каб спатоліць смагу.

– Звярнуліся.

– І што?

– Ды нічога, у іх свае аргументы. Зайшлі мы ўчора з Паўлам у прарабскую, а яны ўтраіх там тую рыбу з Чоны, што мы вудзілі ды вэнджыў я ў вольны свой час, лупяць са спіны, ды з асалодай уплятаюць, і так павольна кажуць нам, – Барыс зрабіў здзіўлены выраз твару, – кажуць, маўляў, тут вось мужыкі ўсю вахту працуюць, ну, ім во першыя ці другія катэгорыі. Вы ж на Чоне працавалі, там грошы зараблялі, тут добра працуеце, прэтэнзій да вас не маецца ды вы тут часовыя, хутка ўжо дадому, таму і чацвёртая. Ты во, дзядзя Фёдар, на правільным накірунку быў, не, не рыбу вудзіць нас туды накіроўвалі для гэтых рабаедаў-прарабаў.

– Так, добра, пайду я, ужо вось і хлопцы за разлікам падцягваюцца да базы.

Услед адыходзячаму Фёдару Барыс, аклікнуўшы таго, звярнуўся з просьбай, маўляў, вазьмі нам з разліку мінеральнай звычайнай ды фанты салодкай па паўтарары літры.

Павярнуўшыся, у знак згоды і матлянуўшы галавой, Фёдар пашыбаваў уніз па схону да ўжо блізкай базы, пра сябе напяваючы ў песенным матыве адно слова: дадому, дадому, дадому, дадому...

# Не сцірае час сляды

*Аповесць-расповеды*

1.

– Нічога Валера, нічога, Вольга хутка стоміцца, і ты яе абгоніш, – заўсёды казаў мне наш настаўнік, трэнер-выкладчык Мэлс Харысавіч Ісхакаў, праводзячы заняткі ў спартыўнай секцыі па лыжнаму спорту пад час навучання ў Сенніцкай сярэдняй школе Мінскага раёна, калі трэніроўкі праводзіліся на стадыёне вёскі Сенніца. На хуткасных трэніроўках, калі бегалі адрэзкі па сто метраў, адпрацоўвалася хуткасная падрыхтоўка працы мышцаў і функцыянальная падрыхтоўка спартсменаў. На такіх трэніроўках практыкаванні выконваліся па парах. Праз імкненне абагнаць суперніка бег на стомятроўцы адпрацоўваўся з максімальным напружаннем. Мэлс Харысавіч заўсёды ставіў мяне бегаць адрэзкі стомятроўкі разам з Вольгай Зайкінай, дзяўчынай, на год за мяне маладзейшай. Стоячы за сто метраў наперадзе, Мэлс Харысавіч уздымаў дзве рукі ўгару, трымаючы два секундамеры. Узмах рукамі ўніз адзначаў старт і уключэнне секундамераў. Са старту на першай трэці дыстанцыі я, заўсёды вырываючыся наперад, разлічваў першым да фініша і заставацца. На пачатку другой трэці стомятроўкі Вольга Зайкіна чамусьці заўсёды мяне даганяла і, другую трэць бягучы побач, яшчэ і паглядала ўправа на мяне. Я, выдаючы хуткасць на ўсе свае магчымасці, заўсёды разлічваў на заключным адрэзку трэцяй часткі стомятроўкі выйсці наперад, ды Вольга, высока ўздымаючы бедры, нібыта выпырхвала ад мяне на недасягальную для мяне адлегласць і заўсёды фінішавала першай.

Ад уражанняў шаноўных чытачоў пры прачытанні ў кнізе прозы «Паўночны варыянт» біяграфічнай аповесці «Першы снег» ды выказанай шаноўнымі чытачамі думкі аб тым, што лыжным спортам займацца цікава, абудзілася натхненне да стварэння аповесці-расповедаў «Не сцірае час сляды». Удзельнічаючы ў лыжным прабегу «Мінская лыжня-1996» Баравая-Раўбічы на пятнаццаць кіламетраў, пасля фініша ідучы няспешна па РСК

«Раўбічы», на верхняй пляцоўцы, каля трамплінаў да гасцінічнага комплекса сустрэўся я, расповеды ў аповесці будуць як ад аўтара так і ад трэнераў, сяброў, знаёмых, таварышаў, дзяўчат і хлопцаў, з былой вучаніцай Сенніцкай сярэдняй школы Мінскага раёна Марынай Закрэўскай, якая таксама займалася пад час навучання ў школе лыжным спортам. Заняткі секцыі па лыжнаму спорту ад Мінскай РДЮСШ праводзіў Мэлс Харысавіч Ісхакаў. Майстар спорту СССР па лыжным спорце, Мэлс Харысавіч працаваў у той час дырэктарам Рэспубліканскай спецыялізаванай ДЮШ алімпійскага рэзерва Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.



*На дыстанцыі Майстар Спорту СССР Мэлс Харысавіч Ісхакаў. Першынства БДІФК, г. Мінск, 1969 г.*

Пры сустрэчы Марына Закрэўская выказала думку, што пад час навучання ў школе нам вельмі пашанцавала, мы мелі магчымасць займацца лыжнымі гонкамі, у нас быў настаўнік. Павышаючы сваё спартыўнае майстэрства, захапляючыяся лыжным спортам, вучні Сенніцкай сярэдняй школы ўдзельнічалі ў спаборніцтвах узроўню першынства школы, раённых, абласных, рэспубліканскіх і, у той час, Усесаюзных спартакіядах. Гэта было цікава, не пагадзіцца з гэтым нельга. Праз заняткі спортам наш юнацкі максімалізм набываў мэтанакіраванасць. У той час Марына Закрэўская працавала па заканчэнні Інстытута фізічнай культуры выкладчыкам фізкультуры ў сельскагаспадарчым тэхнікуме, што знаходзіўся ў вёсцы Сенніца Мінскага раёна. Казала, што зараз яна імкнецца здольных,

захапляючыхся спортам навучэнцаў і сваіх дзяцей па магчымасці, як зараз на «Мінскую лыжню-1996», далучыць да ўдзелу ў масавых спартыўных мерапрыемствах, прыстасоўваючы да здаровага ладу жыцця.



*Марына Закрэўская. Першынства СССР сярод ВНУ. Абарончыя спаборніцтвы на сусветную Універсіяду, г. Оцэпе, Эстонія, 1979 г.*

На добры ўспамін усім удзельнікам таго лыжнага прабегу арганізатары пакінулі нумары, на якіх, акрамя нумара і лагатыпа «Мінская лыжня-1996», змяшчалася схема той пятнаццацікіламетровай дыстанцыі. Сын мой Уладзімір, якому у дзве тысячы пятнаццатым годзе споўнілася шэсць гадоў, ужо лічы тры восені запар, чакаючы выпадзення першага снега, апрануўшы на сябе той нумар і стаўшы на свае лыжы з лыжнымі палкамі, гойсае па кватэры. У зіму ў выхадны дзень выйсці асобна ад яго і пахадзіць на лыжах ужо трэці сезон запар не маю я магчымасці.



*Уладзімір Скакун, зіма 2015 г. Трэці зімовы спартыўны сезон*



*Уладзімір Скакун,*
*лета 2015 г.*

Напачатку пагойсаем разам з ім па лыжні каля дома, потым у лес мяне адпускае выбрацца. У гэтую зіму дзве тысячы пятнаццатага года са слязьмі, праз сваю ўпартасць дамогся-такі, каб я браў яго з сабой пахадзіць на лыжах па лесе.

З дачкой Ганнай, якая ўжо дарослая, пад час яе навучання ў адной з Мінскіх школаў выбіраліся ў зіму пахадзіць на лыжах па лыжні, пракладзенай па лесапаркавай зоне паблізу ад мікрараёна, дзе яна пражывае. Пры навучанні ў дзевятым класе сярэдняй школы на спаборніцтвах на першынстве сваёй школы па лыжных гонках, абыйшоўшы па выніках праходжання дыстанцыі вучняў і адзінаццатых класаў, дзяўчат ды хлопцаў, дачка мая Ганна вельмі здзівіла настаўніка фізкультуры валоданнем тэхнікі лыжнага ходу. На пытанне настаўніка, адкуль такія здольнасці і валоданне, Ганна і адказала, што з бацькам з малодшых класаў у зіму рэгулярна выбіраецца на лыжныя



*Ганна Скакун на лыжах*

прагулкі, калі-нікалі, па магчымасці наведвае штогадовае спартыўнае свята «Мінская лыжня».

Захапленне фізічнай культурай і спортам з свайго маленства дачка Ганна развівае і ў дарослым жыцці, у зімовы перыяд робіць рэгулярныя вылазкі на лыжах, у лета – веласіпед, кросавыя прабежкі і агульныя фізічныя практыкаванні.

На традыцыйнае зімовае спартыўнае свята «Мінская лыжня – 2003», што ў той год праводзілася ў РСК «Раўбічы», выбраўся я, прыхапіўшы з сабой лыжы, каб пабыць у атмасферы спартыўных спаборніцтваў разам з сябрам Аляксандрам Ляўковічам, у маладосці захапляўшымся футболам. Зараджаючыся накалам спартыўнай барацьбы і вырашыўшы прыняць удзел у лыжнай гонцы для жадаючых на дыстанцыі пяць кіламетраў, заявіўшыся, атрымаў нумар удзельніка, прыняў старт у агульным гурце і заняў па выніках праходжання дыстанцыі трэцяе прызавое месца. Як прызёр спаборніцтваў «Мінская



*"Мінская лыжня – 2003". Узнагарода пераможцаў і прызёраў спаборніцтваў сярод жадаючых. Крайні справа – Валеры Скакун (III-е прызавое месца). РСК "Раўбічы", 2003 г.*

лыжня – 2003», атрымаў я ва ўзнагароду дыплом трэцяй ступені і электрычны, з парам, прас.

Вечарам таго ж дня, будучы дома, прымасціўся на канапе за прачытаннем кніжкі і задрамаў. Прачнуўшыся ад спрацаваўшага званка ў кватэру, глянуў на гадзіннік – дваццаць дзве гадзіны. Адчыніў дзверы і запрасіў увайсці пабудзіўшага мяне Мікалая Варашыліна. Раней разам працавалі, зразумела, завітаў па нейкай справе. Прайшоўшы на кухню, заварыў чаю і, завёўшы гаворку пра «Мінскую лыжню», паказаў Мікалаю здабытыя ў лыжнай гонцы на пяць кіламетраў дыплом за трэцяе прызавое месца ды прас з парам. Не гаворачы нічога пра мэту завітання, Мікалай уважліва, з зацікаўленасцю выслухаў мае ўражанні пра свята спорта ў РСК «Раўбічы», дзе мы з Аляксандрам Ляўковічам, актыўна адпачываючы, выдатна правялі вольны час выхаднога дня.

Зайшла гаворка пра значнасць фізічнай культуры і спорта ў жыцці грамадства і дзеля ўсталявання станоўчай атмасферы,



*Аляксандр Ляўковіч. "Мінская лыжня – 2003". РСК "Раўбічы", 2003 г.*

псіхалагічнага мікраклімату ў працоўных калектывах. З часоў навучання ў школе і па сягонняшнія дні Мікалай Варашылін актыўна ўдзельнічае ў фізкультурна-масавых мерапрыемствах па лёгкай атлецыі, валейболе, настольным тэнісе.

Пражываючы зараз у п. Дружны Пухавіцкага раёна і працуючы на Мінскай ЦЭЦ-5, з поспехам выступае на спартыўных спаборніцтвах па розных відах спорта як на першынствах сярод працаўнікоў Мінскай ЦЭЦ-5, так і на спартакіядах сярод прадпрыемстваў энергетычнай галіны. За цікавай гаворкай пад чай з кубкаў, Мікалай так і не паведаміў пра мэту заходу да мяне, потым пры сустрэчы сказаў, што ўсё вырашылася станоўча.



*Мікалай Варашылін. Першынства Мінскай ЦЭЦ-5 па настольным тэнісе. 2015 г.*



*Мікалай Варашылін. Пераможца першынства Мінскай ЦЭЦ-5 па настольным тэнісе ва ўзроставай групе за пяцьдзесят гадоў*

2.

У падлеткавым узросце мы, вясковыя хлапчукі, яшчэ не займаючыся лыжным спортам, у зімовы перыяд пасля заняткаў у школе бавілі вольны час светлавога дня, гойсаючы па заснежаных узгорках на лыжах

вакол вёскі Скарынічы Мінскага раёна альбо на сажалках, што маюцца каля вёскі, расчысціўшы снег на лёдзе пад хакейную пляцоўку, і да цемры ганялі шайбу. Памятаю, як з братам Юрай, на тры гады за мяне малодшым, угаварылі мы маці набыць нам лыжы, і маці аўтобусам прывезла з Мінска дзве новенькія пары. А першыя лыжы, што былі ў мяне, з удзячнасцю ўспамінаю гэта і зараз, падарыў мне Анатоль Паўлоўскі, старэйшы за мяне на некалькі гадоў хлопец з нашай вёскі Скарынічы.

Добра запомнілася, як аднойчы, выбраўшыся на лыжах утраіх, сябра мой аднакласнік Саша Янушонак, брат мой Юра ды я, ішлі ўздоўж чыгуначнага насыпу, што непадалёку ад вёскі. Тады і вырашылі мы пагойсаць з вышыні таго, акурат каля маста чыгункі, над асфальтавай дарогай. Узабраліся на насып утраіх, першым сігануў са стромы Саня і з’ехаў удала. Другім з’язджаў я, як звычайна ў тую пару, не ўтрымаўшы раўнавагу пры выкаце са схону, адхінуўшыся назад, затармазіў па снезе пятай кропкай. З’язджаючый за мной Юра напрыканцы спуска пры выкаце на роўнядзь па лыжні нахіліўся тулавам наперад так, што ў мяне ды Аляксандра стварылася ўражанне, што братуха зараз, зарыўшыся ў снег галавой, перакуліцца ў сальце, ды не тое было. Раптоўна выпрастаўшыся, падкаціўшы па лыжні да стаячых наперадзе мяне ды Аляксандра, прытармазіўшы лыжамі, нахінуўшыся крыху наперад, прыклаўшы далоні рук, на якіх на раменьчыках завіслі лыжныя палкі, да грудной клеткі з чагосьці загаманіў: «Вой баліць, вой баліць, вой баліць». Глянуўшы на лыжню, што ідзе з вяршыні чыгуначнага насыпу, мы з Аляксандрам зразумелі прычыну атрымаўшайся недарэчнасці. Ужо на роўнядзі, акурат пасярэдзіне лыжні, ляжала вывернутая, што называецца, з каранямі, змерзлая купіна кратовай норкі, якую з двух бакоў абыходзіла пракладзеная лыжня. З’язджаючы з насыпу, ды на выкаце на роўнядзь нахіліўшыся тулавам наперад, Юра і шарганўў па ёй груднай клеткай. Супакоіўшыся, што абыйшлося, заўсміхаўшыся, глянуўшы на лежачую пасярод лыжні дагары

нагамі выкручаную змерзлую купіну, утраіх далей пакацілі мы па лыжні ўздоўж шашы ў накірунку да пасёлка Юбілейны.

Пад час навучання ў школе ў старэйшых класах, прыцягнуў я на заняткі ў секцыю лыжнага спорта свайго малодшага брата Юру Скакуна, акурат калі наш настаўнік Мэлс Харысавіч рабіў трэці набор навучэнцаў. Да слова, за перыяд выкладання заняткаў па лыжным спорце на базе Сенніцкай сярэдняй школы Мінскага раёна Мэлс Харысавіч Ісхакаў праводзіў тры наборы навучэнцаў.

У першым наборы займаўся мой стрыечны брат Грыша Скакун з вёскі Сенніца, старэйшы за мяне на чатыры гады, у другім, патрапіўшы, займаўся я, у трэцім наборы – мой родны брат Юры Скакун.

Была восень, і ў той дзень, калі Юра прыйшоў на першы свой занятак, была прахалода. Да месца асноўнай трэніроўкі,



*19 Выхаванцы першага набора Мэлса Харысавіча Ісхакава, вучні Сенніцкай СШ. Злева направа: Пяткевіч Таццяна, Баркоўскі Анатоль, Ракета Ала, Скакун Рыгор, Мэлс Харысавіч Ісхакаў, Урбан Міхась, Запольская Валянціна, Карпіловіч Сяргей. Г. Барысаў. Матчавая сустрэча ДЮСШ Мінскай вобласці. Сакавік 1974 г.*



*Выхаванцы першага набора Мэлса Харысавіча Ісхакава, вучні Сенніцкай СШ. Злева направа: Юры Скакун, Уладзімір Казятнікаў, Мэлс Харысавіч Ісхакаў, Аляксандр Кручонак, Вадзім Саўкін, Сяргей Заяц, Марына Закрэўская. Спартыўна-аздараўленчы лагер "Юны Алімпіец", п. Ждановічы, чэрвень 1979 г.*

што праводзілася ў лесе каля вёскі Скарынічы, – чатыры кіламетры дабіраліся пехатой з бегам. Затым для ўжо падрыхтаваных навучэнцаў праводзілася хуткасная трэніроўка па кругу чатырыста метраў з інтэрваламі адпачынку да ўзроўню адпаведнага пульса. Пачаткоўцы, бегаючы па той жа дыстанцыі, у невялікім тэмпе наматвалі кругі. Напрыканцы трэніроўкі Мэлс Харысавіч сказаў мне, што брат у цябе, Валера, крышачку грузнаваты, у сэнсе тым, што паўнаваты па камплекцыі. Быўшы па камплекцыі звычайным падлеткам, у той восеньскі, з прахалодай, дзень збіраючыся на трэніроўку, ды не ўяўляючы, што гэта за заняткі, Юра, апрануўшы на сябе двое порткаў ад спартыўных касцюмаў з начосам менавіта грузнаватым і выглядаў. Казаў мне потым, што, бегаючы так апранута, ажно ўпрэў, яно і зразумела, што ўпрэеш.

Рэгулярна займаючыся лыжным спортам пад кіраўніцтвам вопытнага настаўніка Мэлса Харысавіча Ісхакава, развіваючы і ўдасканальваючы сваё спартыўнае майстэрства, паступова набіраючы спартыўную форму пад час навучання ў Сенніцкай сярэдняй школе, Юры Скакун паспяхова выступаў на спартыўных спаборніцтвах па лыжных гонках на першынствах Мінскага раёна, Мінскай вобласці, спартакіядзе школьнікаў БССР, у

прыватнасці пад час навучання ў дзесятым класе ў г. Навагрудку. На летнім першынстве Мінскай вобласці па лыжэролерам і кросу, у перыяд навучання ў дзесятым класе, што праводзілася ў РСК «Раўбічы», Юры Скакун першынстваваў у гонцы на пятнаццаць кіламетраў на лыжэролерах. У той жа зімовы сезон спаборніцтваў Юры Скакун паспяхова выступаў на першынстве рэспублікі сярод ВНУ




*Першынства БССР сярод ВНУ, г. Магілёў, 1981 г. Юры Скакун*

(Рэспубліканскай Універсіядзе) у складзе каманды Беларускага медыцынскага інстытута па заліку юнакоў.

Пад час вучобы ў дзесятым класе сярэдняй школы Юры Скакун быў пераможцам на Першынстве рэспублікі па лыжных гонках па ДСТ «Ураджай», што ў той год праводзілася ў г. Лагойску. Па заканчэнні Сенніцкай сярэдняй школы, пры навучанні ў адным з Мінскіх ПТВ займаючыся лыжным спортам, Юры Скакун паспяхова высту-




*Юры Скакун. Спартакіяда БССР. Першынства ДСТ "Чырвоны Сцяг", г. Магілёў, 1982 г.*

паў на спартыўных спаборніцтвах па лыжных гонках рознага ўзроўню і меў дачыненне да ДСТ «Чырвоны Сцяг».

У юніёрскім узросце, пэўны тэрмін займаючыся біятлонам у трэнера-выкладчыка ДСТ «Працоўныя Рэзервы» Сідарэнкі Уладзіміра Пятровіча, у мінулым выдатнага біятланіста, выступаючага за ДСТ «Чырвоны Сцяг» з СК «Камвольшчык», Юры Скакун стаў пераможцам у біятлоннай гонцы на пятнаццаць кіламетраў з чатырма агнявымі рубяжамі на першынстве кубка БССР па юніёрах па ДСТ, выступаючы за каманду ДСТ «Працоўныя Резервы». У эстафетнай гонцы чатыры па сем з паловай кіламетраў каманда біятланістаў ДСТ «Працоўныя Резервы», у склад якой уваходзіў і Юры Скакун, заняла ганаровае другое месца і, па выніках тых спаборніцтваў Кубка БССР па біятлоне, што ў той год праводзілася ў РСК «Раўбічы», каманда біятланістаў ДСТ «Працоўныя Резервы» пад кіраўніцтвам трэнера-выкладчыка Сідарэнкі Уладзіміра Пятровіча упершыню па агульным заліку спаборніцтваў заняла ганаровае другое месца.



*Юры Скакун. Спартакіяда БССР. Першынства ДСТ "Чырвоны Сцяг", г. Магілёў, 1983 г.*

Пад час службы ў войску Юры Скакун паспяхова выступаў на вайсковых спаборніцтвах па лыжных гонках і біятлоне. Першынствуючы і ўваходзячы ў тройку прызёраў на першынствах ваенна-паветраных сілаў Чырвонасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, Юры Скакун на другім годзе тэрміновай службы на першынстве ЧБВА па біятлоне ў класічнай гонцы на



*Біятланісты ДСТ "Працоўныя Рэзервы". Злева направа: Юры Скакун, Аляксандр Барадуля, Рыгор Бабічаў. РСК "Раўбічы", летні збор, пачатак 1980-х гг.*

дванццаць кіламетраў з чатырма агнявымі рубяжамі ўвайшоў ў тройку прызераў, заняўшы ганаровае другое месца.

Пры паступленн і на службу ў МНС Юры Скакун актыўна ўдзельнічаў у спартыўных спаборніцтвах па лыжных гонках, гіравому і пажарна-прыкладному відах спорта. У тысяча дзевяцьсот восемдзесят пятым годзе Юры Скакун першынстваваў у спаборніцтвах па лыжных гонках па Упраўленню пажарнай аховы і Упраўленню унутраных спраў г. Мінска, ў эстафетнай гонцы чатыры па пяць кіламетраў Юры Скакун, выступаючы на першым этапе, па выніках спаборніцтваў разам з таварышамі па камандзе заняў ганаровае прызавое месца. З дзве тысячы пятага года, пры ўключэнні ў рэспубліканскую спартакіяду МНС спаборніцтваў па лыжных гонках, Юры Скакун, выступаючы па сваёй узроставай групе, пастаянна ўваходзіў у тройку прызёраў. У цяперашні час, пры выхадзе на пенсію па выслузе гадоў, старшы прапаршчык Юры Скакун, вядучы актыўны лад жыцця, падтрымлівае высокую фізічную форму.

Напрыканцы навучання ў дзесятым класе, у маі месяцы, выбраўся я на трэніроўку да таго ж леса каля вёскі Скарынічы. Мэлс Харысавіч, адправіўшы гурт навучэнцаў да месца прызначэння, паклікаў мяне з сабой зайсці да інструктара па спорту калгаса імя Гастэла Васільева Уладзіміра Віктаравіча, у раённы Дом культуры ў Сенніцы, дзе па тым часе мелася выдатная спартыўная зала. Ідучы напрасткі цераз поле за Мэлсам Харысавічам, пры падыходзе да асфальтавай дарогі, за якой злева была кантора калгаса, а па накірунку прама – Дом культуры са спартыўнай залай, заўважыў у траве латарэйны білет ды вырашыў

яго падняць, і не паверыў сваім вачам. На грашовай купюры з партрэтам Леніна было напісана «сто рублёў», па тым часе грошы немалыя. Мэлс Харысавіч, азірнуўшыся, запытаў у мяне: «Што, Валера, дзесятка?» А я так гляджу, вачам не веручы сваім ды адказываю: «Не, сторублёўка». Мэлс Харысавіч сказаў, што пакуль я буду бегаць, то згублю, склаў купюру і прыхаваў яе ў сваёй кішэні. Пад час трэніроўкі ў лесе на крузе чатырыста метраў хлопцы і дзяўчаты ўсё цікавіліся ў мяне, ці сапраўды я знайшоў сто рублёў? На станоўчы мой адказ не верылі, кажучы, што мы з трэнерам прыдумалі гэткі розыгрыш. Паверылі толькі тады, калі напрыканцы трэніроўкі Мэлс Харысавіч дастаў з той кішэні сторублёвую купюру і працягнуў яе мне. Прыйшоўшы з трэніроўкі дадому, сказаў маці, што знайшоў грошы ды хацеў было ёй іх аддаць, але яна адмовіла, вымавіўшы, што калі ты іх знайшоў, то і набудзь сабе штосьці патрэбнае. У хуткім часе, будучы ў Мінску, прымяраў на сабе ў магазіне «Старт» на знойдзеныя мною сто савецкіх рублёў спартыўны касцюм сіняга колеру шарсцяны, красоўкі і лёгкую спартыўную форму для заняткаў бегам у летні пярыяд падрыхтоўкі, якія і прыкупіў.

3.

Пра свой удзел у першых сваіх спаборніцтвах у Мінску каля абсерваторыі я ўжо пісаў у аповесці «Першы снег» у кнізе прозы «Паўночны варыянт». Пасля гэтых спаборніцтваў прыйшло разуменне, што аднаго жадання штосьці здзейсніць, штосьці стварыць сваё, чамусьці навучыцца недастаткова. Для дасягнення мэты патрэбна шмат працаваць, працаваць штодзённа, рупліва, мэтанакіравана. На пачатку маіх заняткаў лыжным спортам Мэлс Харысавіч правёў сярод нас, сваіх выхаванцаў, спаборніцтвы на першынства Мінскай раённай ДЮСШ, ад якой і праводзіліся заняткі на базе Сенніцкай сярэдняй школы. Хто першынстваваў сярод дзяўчат, нажаль, я ўжо запамятаваў. Сярод юнакоў стаў першым Саша Янушонак, я быў другім, трэцім



Віктар Бурын, г. Вольск, 1980 г.

Віця Бурын. Усе ўтраіх мы былі з адной вёскі Скарынічы, сябравалі і вучыліся ў адным класе. Атрыманыя намі граматы за першынства і прызавыя месцы былі стымулам для далейшага ўдасканальвання майстэрства ў хадзьбе на лыжах. Калі-нікалі выпраўляючыся на спаборніцтвы альбо на спартыўныя зборы, Мэлс Харысавіч казаў, што калі Віця Бурын будзе з намі, значыць будзе весела. Той заўсёды прыдумляў альбо нейкія вясёлыя розыгрышы, то жарцікі падкідваў, а анекдоты расказваў падоўгу ды шмат, з талентам цікавага распавядальніка. Мы тады дзіву даваліся, адкуль ён ведаў іх столькі, часам складвалася ўражанне, што некаторыя анекдоты ён сам прыдумляў.

Па заканчэнні навучання ў сёмым класе, на чале з настаўнікам Мэлсам Харысавічам, перспектыўныя выхаванцы спартыўнай секцыі лыжнага спорта ўдасканальвалі сваё майстэрства, знаходзячыся ў спартыўным лагеры каля Даманава Маладзечанскага раёна. Пражыванне ў палатачным лагеры, трэніроўкі ў маляўнічай мясцовасці, адпачынак, рака Вілія ўносілі ў фарміраванне юнакоў і дзяўчат свой адметны, станоўчы каларыт. З хлопцаў, выхаванцаў, былі мы ўдваіх, я і Саша Янушонак, у адной палатцы спартыўнага палатачнага лагера мы разам і пражывалі. Дзяўчат было значна болей, дакладна ўжо і не памятаю.

Пры навучанні ў восьмым класе, пры выпадзенні першага снега трэніўкі напачатку праводзіліся на лыжні, пракладзенай на стадыёне вёскі Сенніца, што непадалёку ад школы. Памятаю, як на трэніроўкі, дзе мы, пачаткоўцы з нейкім стажам і ўзроўнем падрыхтоўкі, адпрацоўвалі тэхніку лыжнага хода, з зацікавасцю

назіралі, імкнучыся паўтарыць хадзьбу на лыжах, у прыватнасці пракат-штуршок Анатоля Баркоўскага, хлопца, на год старэйшага за мяне і нядаўна прыбыўшага са спартыўных збораў з першага снега. Высокі, жылісты Анатоль Баркоўскі, апрануты ў лыжны гоначны касцюм з гетрамі на галёнках, выдаваючы нам, пачаткоўцам, прыклад валодання тэхнікай лыжнага хода, абуджаў у пачынаючых спартсменаў спадзеў, што ўрэшце-рэшт калі працаваць, то атрымаецца. Мяне, за маё амаль бесперапыннае, ад жадання хадзіць на лыжах прыгожа, доўгае соўганне на іх па лыжні хлопцы ды дзяўчаты ў той час далі мянушу конь Пржывальскага.



*Узнагарода пераможцаў і прызёраў вайсковых спаборніцтваў па лыжных гонках. На першым месцы – Рыгор Скакун*

Калі-нікалі падыходзілі на трэніроўкі да настаўніка, Мэлса Харысавіча, каб пагойсаць на лыжах былыя выхаванцы, скончыўшы навучанне ў школе, Грыша Скакун і Міша Урбан. Дасканала валодаючы тэх-



*Парад адкрыцця вайсковых спаборніцтваў па лыжных гонках. Першы злева – Рыгор Скакун*

нікай хода па лыжні і з'яўляючыся для нас прыкладам, былыя выхаванцы выклікалі ў займаўшыхся ў той час вучняў школы давер да настаўніка. У перыяд службы ў войску Грыгорый Скакун актыўна ўдзельнічаў у вайсковых спаборніцтвах як па лыжных гонках, так і па іншых спецыяльных вайсковых прыкладных відах спорту.

Перыядычна становячыся пераможцам і займаючы прызавыя месцы на першынствах сваёй вайсковай часткі, Загорскага гарнізона (зараз Загорск – Сергіеў Пасад, уваходзячы у Залатое кальцо Расіі), на іншых буйных вайсковых спаборніцтвах у асабістых і камандных, эстафетных лыжных гонках, павышаючы і ўдасканальваючы сваё баявое і фізічнае майстэрства, Грыгорый Скакун пасля службы ў войску пад час навучання ў Беларускім дзяржаўным інстытуце фізічнай культуры і пэўны тэрмін па заканчэнні навучальнай установы, паспяхова працаваў трэнерам-выкладчыкам Мінскай раённай ДЮСШ на базе той жа



*Вайсковыя спаборніцтвы. Эстафетная гонка. Рыгор Скакун перадае эстафету на першым месцы Майстру Спорту СССР Уладзіміру Барнашову. Трэці – чацвёрты этап*

Сенніцкай сярэдняй школы, дзе пад час навучання займаўся лыжным спортам.



*Вайсковыя спаборніцтвы. Эстафетная гонка. Рыгор Скакун прымае эстафету ад таварыша па камандзе*

4.

Пры навучанні ў восьмым класе школы, на зімовых канікулах, акурат пасля Новага года, Мэлс Харысавіч накіраваў нас, сваіх выхаванцаў, на спартыўныя зборы з трэнерам-выкладчыкам Мінскай раённай ДЮСШ Уладзімірам Пятровічам Пачапінскім, які выкладаў заняткі па лыжным спорце на базе Міхалоўскай школы Мінскага раёна. Спартыўныя зборы праходзілі ў п. Ждановічы Мінскага раёна, з пражываннем і харчаваннем юных спартсменаў і трэнераў у памяшканні Ждановічскага інтэрната, выхаванцы якога пад час канікулаў раз'ехаліся дадому. Акрамя лыжнікаў падрыхтоўку праходзілі і юныя гімнасты пад кіраўніцтвам сваіх выкладчыкаў. Выхаванцаў Мэлса Харысавіча колькі было дакладна, ужо і не памятаю. Пражывалі мы і трэніраваліся разам з выхаванцамі Уладзіміра Пятровіча Пачапінскага пад непасрэдным яго кіраўніцтвам. Цікавыя знаёмствы з вучнямі іншай школы, з іншай мясцовасьці, агульнае захапленне лыжным спортам аб'ядноўвалі юнакоў і дзяўчат.

Напрыканцы спартыўных збораў, акурат пад заканчэнне зімовых вакацый, захацелася нам, выхаванцам Мэлса Харысавіча, адзін дзень вакацый пабыць дома. Сказаўшы Уладзіміру Пятровічу, што мы паедзем дадому на дзень раней і атрымаўшы станоўчы адказ, пасля абеду, мы сабралі свае рэчы, спартыўны

інвентар, пацягнуліся ад інтэрната, што знаходзіўся на водшыбе ад паселішча, на ўзгорак у кірунку да станцыі Ждановічы. Пры з'яўленні з узгорку навідавоку будынка чыгуначнай станцыі, усе мы, прыпыніўшыся, з чагосьці азірнуліся на стаяўшы ў нізіне на водшыбе наш інтэрнат. Крыху пастаяўшы, моўчкі, кожны разважаючы пра сябе, рушылі назад да інтэрната пасля выказвання кімсьці ўслых, запамятаваў кім, агульнага намеру, маўляў, а давайце вернемся, Уладзімір Пятровіч нас зразумее. Вярталіся моўчкі, кожны разважаў пра сябе, што патрэбна яшчэ адзін дзень пабыць менавіта тут, дадому прыбудзем назаўтра, як і паведамлялі бацькам. Яшчэ адна трэніроўка сягоння ды назаўтра з раніцы, яшчэ суткі цікавых адносінаў з хлопцамі ды дзяўчатамі з іншай школы, да таго нас з'ядналі агульныя інтарэсы праз заняткі лыжным спортам, гэта цікава. Праводзячы заняткі па лыжным спорце, нашы настаўнікі Мэлс Харысавіч Ісхакаў і Уладзімір Пятровіч Пачапінскі з менавіта тых нас, у той перыяд, як раней так і пазней, юнакоў і дзяўчат, стваралі каманду лыжнікаў Мінскага раёна, у будучым Уладзімір Пятровіч і біятлапістаў, займеўшую немалыя поспехі на абласных, рэспубліканскіх і ўсесаюзных спаборніцтвах.

Ветліва сустрэўшы і пачуўшы ад нас, што вырашылі мы вярнуцца каб дазаўтра пабыць яшчэ тут, Уладзімір Пятровіч сказаў, што, давайце, рыхтуйцеся да трэніроўкі, хутка выбіраемся.



*Майстар Спорту СССР Мэлс Харысавіч Ісхакаў. Першынства СССР сярод сельскіх лыжнікаў, г. Сыктыўкар, 28 сакавіка – 1 красавіка 1970 г.*

У тую ж зіму наш настаўнік, Мэлс Харысавіч, вазіў нас, сваіх выхаванцаў з мэтай

удасканальвання спартыўнага майстэрства ў горад Навагрудак на матчавую сустрэчу з юнымі лыжнікамі Навагрудскай раённай ДЮСШ. Акрамя ўдзелу ў спаборніцтвах па лыжных гонках, наш настаўнік, Мэлс Харысавіч, правёў з намі, сваімі выхаванцамі, экскурсію па старажытным горадзе з наведваннем музея сусветна вядомага паэта Адама Міцкевіча, гары Міндоўга, дзе побач насыпаны узгорак ў гонар Адама Міцкевіча, а таксама пешшу ўсёй камандай разам з настаўнікам мы пахадзілі па вулачках старажытнага горада.

У той жа зімовы спартыўны сезон, тэрмінам крыху раней, спаборнічалі мы на лыжні ў матчавай сустрэчы з выхаванцамі Маладзечанскай раённай ДЮСШ у Радашковічах. Потым, праз гады, пад час майго навучання ў Мінскім энергетычным тэхнікуме пры правядзенні спаборніцтваў па лыжных гонках на першынства г. Мінска сярод ССНУ, у адзін з тых гадоў у Радашковічах патрапіў я ў недарэчнасць разам з таварышам па камандзе Аляксадрам Скальскім, біятланістам з г. Лагойска, таксама навучэнцам энергатэхнікума. Дабіраючыся камандай да месца старта электрацягнікам на Маладзечанскім накірунку, нашы кіраўнікі памыліліся, не набылі на двух членаў каманды білеты. Завітаўшыя ў вагон кантралёры, нягледзячы на тое, што, атрымалася памылка ў спешцы, а на спаборніцтвы трэба дабрацца ўчас усім членам каманды, адхілілі прапанову кіраўнікоў каманды выплаціць штраф за двух безбілетнікаў, ахвяравалі мною ды Скальскім, таму нам прыйшлося выйсці на прыпынку «Мінскае мора» з таго электрацягніка. Праявіўшы ініцыятыву, як знаток лыжных трасаў у Радашковічах, я прапанаваў таварышу дабрацца да мёсца прызначэння папутнай машынай, маўляў, хутчэй атрымаецца, а лыжы ды спортформу каманда даставіць, і пацягнуў таго за сабой на побач праходзячую шашу. Толькі прагаласавалі, прыпыніўся вадзіцель МАЗа, згадзіўшыся падкінуць. Па прыбыццю ад шашы павёў я Скальскага за Радашковічамі праз поле па снезе на ўзгорак, за якім траса лыжні і стартавы

гарадок, з паселішча не бачна. Узабраліся на вяршыню узгорка, і перад нашымі вачыма прадстала заснежаная да ўскрайку леса даліна, і ні лыжні, ні стартавага гарадка, і ніводнай там жывой душы наўкола, акрамя нас абодвух, разгублена паглядаючых адзін на аднога. Пакруціўшы па баках галовамі, пераглянуўшыся, рушылі мы ўдваіх назад, з узгорка па глыбокім снезе да шашы. Пры сыходзе з таго ўзгорка Саня Скальскі абураўся на мяне, маўляў, трасу ведаю, папуткай дабяромся. Першую сваю перамогу атрымаў ты тут яшчэ пры навучанні ў школе ў восьмым класе, ага, і зараз мы пераможам. Саня ўсё абураўся, якая перамога, калі і ўдзелу ў спаборніцтвах не прыняць нам. Потым у тэхнікуме наш трэнер, Анатоль Іосіфавіч Драздоўскі, зразумела, вычытываў мне, бо мая была ініцыатыва папуткай па шашы дабрацца, і давёў што спаборніцтвы праводзіліся не ў саміх Радашковічах, а каля чыгуначнай станцыі Радашковічы, што ў дванаццаці кіламетрах ад паселішча. Вось такая атрымалася, амаль анекдатычная, недарэчнасць.

5.

Пры маім навучанні ў восьмым класе частка выхаванцаў нашага настаўніка Мэлса Харысавіча была ўключана ў рэзерв зборнай каманды Мінскай вобласці і ў зімовы перыяд праходзіла падрыхтоўку на спартыўных зборах да першынства Беларусі сярод школьнікаў у п. Ратамка Мінскага раёна, дзе ў той год і праводзілася спартакіяда БССР сярод школьнікаў. З вучняў Сенніцкай школы, памятаю, былі Саша Янушонак, Віця Бурын, быў я і хтосьці яшчэ з хлопцаў ды дзяўчат, нажаль запамятаваў. Вучні восьмых класаў прымалі ўдзел у спаборніцтвах па асабістым заліку. За каманды абласцей і г. Мінска у залік ішло выступленне хлопцаў і дзяўчат дзевятых класаў па малодшай групе, дзесятых класаў па старэйшай. У асабістых лыжных гонках, па заліку малодшых дзяўчат, выхаванка Уладзіміра Пятровіча Пачапінскага, вучаніца Міхалоўскай школы Мінскага раёна Ва-

лянціна Міrandчык, па выніках праходжання дыстанцый, заняла прызавыя другое і трэцяе месцы.



*Валянціна Мірончык. Срэбраны і бронзавы прызёр спартакіяды школьнікаў БССР 1976 г., п. Ратамка, Мінскі раён*

У асабістай гонцы па малодшых юнаках Саша Акулевіч з г. Барысава, выступаючы за каманду Мінскай вобласці, ходам па дыстанцыі выйграючы і ў юнакоў старэйшай узроставай групы, незадоўга да фініша, так атрымалася, зламаў лыжу, адпаведна – страта часу і непападанне ў тройку прызёраў. Памятаю, як пасля фінішу, прысеўшы на кукішкі, ён усё круціў у руцэ носік ад зламанай сваёй лыжы фірмы «ЯАРВІНЕН».

Увечары, будучы на адпачынку і рыхтуючыся да на наступны дзень эстафетнай гонкі чатыры па пяць кіламетраў, хлопцы з каманды Мінскай вобласці, выступаючы па заліку малодшых юнакоў, настроіліся назаўтра выступіць рашуча, адпаведна свайму ўзроўню падрыхтоўкі, вырашылі не апранацца ў гоначную форму, а выйсці на старт у звычайных спартыўных касцюмах. Напрыканцы трэцяга этапа Саша Лобус з Барысаўскай лыжнай спортшколы, за васемсот метраў да фініша павысіў голас на нежадаючага ўступіць лыжню хлопца з каманды старэйшай ўзроставай групы, што ішла першай, і прымусіў таго сыйсці з лыжні, даўшы магчымасць мацнейшай камандзе перадаць эстафету чацвёртаму этапу першымі. На сваім чацвёртым этапе Саша Акулевіч, у той час мацнейшы і сярод юнакоў старэйшай групы, не ўступіў першынства ў той эстафетнай гонцы спартакіяды школьнікаў БССР.

Удзел вучняў восьмых класаў, уключаных у рэзерв зборнай каманды Мінскай вобласці, у спартакіядзе БССР па лыжных гонках па асабістым заліку, і праходжанне падрыхтоўкі на спартыўных зборах, станоўча ўплывалі на павышэнне нашага спартыўнага майстэрства. На наступны год пры правядзенні першынства Мінскай вобласці па лыжных гонках у г. Барысаве па ўзроставай групе малодшых юнакоў перамог Юры Горыд з п. Краснае Маладзечанскага раёна, Саша Янушонак з нашай каманды Мінскага раёна быў другім, услед за ім, заняўшы трэцяе месца, быў я. На другі дзень у гонцы на пяць кіламетраў зноў перамог Юры Горыд, Саша Янушонак ды я, паказаўшы аднолькавы вынік праходжання дыстанцыі, падзялілі між сабой другое і трэцяе месца.

Патрапіўшы ў асноўную зборную каманду Мінскай вобласці, падрыхтоўку да спартакіяды школьнікаў БССР, што ў той год праводзілася ў г. Магілёве, Саша Янушонак ды я праходзілі з камандай лыжнікаў Беларускага тэхналагічнага інстытута лясной прамысловасці, куды нас накіраваў наш настаўнік Мэлс Харысавіч Ісхакаў, пад кіраўніцтвам трэнера каманды студэнтаў навучальнай установы Аркадзя Васільевіча Лябёдкі з пражываннем на спартыўнай базе «Ганалес», што на Мінскім Моры. На праходзячым у тым 1977 годзе першынстве рэспублікі сярод ВНУ, рэспубліканскай універсіядзе, у г. Гарадок Віцебскай вобласці з Аляксандрам



*Члены каманды Беларускага тэхналагічнага інстытута лясной прамысловасці на першынстве БССР сярод ВНУ. Злева направа: Валеры Скакун, Анатоль, Таццяна Балашова, навуковы супрацоўнік інстытута, Валянціна Гарнак, Мікалай Карнавухаў, Аляксандр Якушонак, г. Гарадок, Віцебская вобласць, 1977 г.*

Янушонкам мы прынімалі ўдзел за каманду БТІ, выступаючы па заліку юнакоў. Настрой і імкненне Аркадзя Васільевіча па выніках зімовай спартакіяды абыйсці галоўнага суперніка, каманду Беларускага дзяржаўнага інстытута фізічнай культуры, з уплывам на выхаванцаў, студэнтаў БТІ, меў становучыя вынікі.

Агульны настрой каманды на перамогу настолькі паўплываў на двух вадзіцеляў заказнога аўтобуса, арэндаванага падвозіць каманду пад час спаборніцтваў, што яны ўвечары перад эстафетнымі гонкамі, якія былі назаўтра сярод мужчын і жанчын, на белай матэрыі немалога памеру напісалі дзесьці здабытай сіняй фарбай плакат со словамі «Сухан-Перамога».

На першым этапе выступалі юнакі і Мікалай Карнавухаў, студэнт першага курса БТІ, доўга вядучы за сабой караван першага этапа па дзесяцікіламятровай дыстанцыі, па лыжні, пракладзенай па ноччу свежавыпадзеным снезе. Потым пры разборы эстафетнай гонкі ён атрымаў прачуханца за няправільныя тактычныя рашэнні ад трэнера Аркадзя Васільевіча. На другім этапе эстафеты адставанне ад лідыруючай каманды крыху паменьшылася, выступаўшы на трэцім этапе Майстар Спорту СССР Генадзь Унуковіч, значна скараціўшы адрыў ад лідыруючай каманды ІФК, передаў эстафету члену зборнай БССР па лыжных гонках Аляксандру Сухану. Ліквідаваўшы адрыў і за метраў шэсцьдзесят да фініша, абыходзячы фінішора ІФК, ідучы першым, патрапіўшы ва ўпадзіну на лыжні, спатыкнуўшыся, Аляксандар Сухан, паваліўшыся, фінішаваў другім. Мне і цяпер добра памятаецца фініш той эстафеты. З Аляксандрам Янушонкам за каманду БТІ выступіўшы ў дзвюх асабістых гонках, за эстафетнай мы назіралі, знаходзячыся на трасе на лыжах. Спаборніцтвы ў г. Гарадок праводзіліся ў прыгожам маляўнічым месцы каля азёраў. Перад фінішам траса праходзіла па ўзгорку, затым ішла налева на дзевяноста градусаў, і крыху уніз, затым зноў паварочвала налева амаль на дзевяноста градусаў, і пасля ішоў доўгі спуск да фініша, амаль паралельна трасы, што на ўзгорку,

дзе мы з Аляксандрам і былі акурат перад фінішам эстафеты, і з вышыні назіралі за чакаўшай усіх перамогай. Саша Сухан ужо абыходзіў суперніка з левага боку, ды ва ўпадзіне казырнулі лыжы, і ён, высокі, жылісты, паваліўся наперад, пры падзенні абапёрся на рукі, хутка узняўшыся, фінішаваў другім. Па выніках эстафетных гонак, нажаль, запамятаваў, як выступіла жаночая каманда БТІ, і па спаборніцтвах ва індывідуальных лыжных дысцыплінах, каманда БТІ у той год пад кіраўніцтвам свайго трэнера Аркадзя Васільевіча Лябедкі абыйшла каманду БДІФК, заняўшы першае месца ў рэспубліканскай спартакіядзе, універсіядзе, сярод ВНУ рэспублікі па лыжных гонках.



*Члены каманды БТІ лясной прамысловасці на першынстве БССР сярод ВНУ. Злева направа: Валеры Скакун, Анатоль, Таццяна Балашова, навуковы супрацоўнік інстытута, Валянціна Гарнак, сёмы – Мікалай Карнавухаў. Першы рад: другая – Таццяна Балашова, Святлана, Майстар Спорту СССР Генадзь Унуковіч, Аляксандр Якушонак, г. Гарадок, Віцебская вобласць, 1977 г.*

6.

Пры маім навучанні ў дзесятым класе Мэлс Харысавіч увосень зноў накіраваў мяне на спартыўныя зборы на першы снег

у г. Краснакамск Пермскай вобласці разам з камандай БТІ, дзе ў тую восень праходзілі падрыхтоўку на першым снезе і іншыя выхаванцы Мэлса Харысавіча і Уладзіміра Пятровіча Пачапінскага, юныя спартсмены Мінскай раённай ДЮСШ, пад непасрэдным кіраўніцтвам Уладзіміра Пятровіча. З тых спартыўных збораў на першым снезе ў г. Краснакамску чамусьці запомнілася прагулка ў дзень адпачынку ўздоўж берага ракі Кама, на якой і адбудаваны горад. Памятаю, быў пахмурны дзень з тэмпературай паветра вышэй нуля, снег растайваў. Уздоўж берага ўніз па цячэнню доўга гуртом мы ішлі разам з Уладзімірам Пятровічам, потым вярталіся назад. Рака Кама ўражвала сваёй магутнасцю і шырынёй. Ад пахмурнага надвор'я ў паветры стаяла вільготная імжа, і другога берага незамерзшай ракі бачна не было.

Як пісалася вышэй, Аркадзь Васільевіч Лябёдка, у мінулым выдатны лыжнік-гоншчык, у штогадовай зімовай спартакіядзе сярод ВНУ рэспублікі заўсёды імкнуўся абыйсці галоўнага суперніка, каманду БДІФК. З расповедаў ведаючых, у адзін з такіх зімовых спартыўных сезонаў, напярэдадні спартакіяды па лыжным дваябор'і адзін з выхаванцаў Аркадзя Васільевіча, лыжнік-гоншчык Ігроў Уладзімір выказаў думку, маўляў, калі вы, Аркадзь Васільевіч, скокніце з трампліна, то і я скокну, дзеля поспеху каманды. Аркадзь Васільевіч на трэніроўцы ў РСК «Раўбічы», скокнуўшы з малога трампліна, устаяў. Уладзімір Ігроў, стрымаўшы слова, прыняў удзел у спаборніцтвах па лыжным дваябор'і на першынстве рэспублікі сярод ВНУ. З трох скачкоў з трампліна ў залік ішлі два лепшых і потым лыжная гонку на пятнаццаць кіламетраў. Прымаючы непасрэдна ўдзел у спартакіядзе, Аркадзь Васільевіч скокнуў з малога трампліна ў першай спробе на дванаццаць, у другой – на чатырнаццаць метраў. Пры судзейскай жараб'ёўцы на лыжную гонку на пятнаццаць кіламетраў, зразумеўшы, што лыжня будзе пракладзена па свежавыпаўшым снезе і будзе мяккай, Аркадзь Васільевіч не здаў сваю картачку ўдзельніка ў агульны стос. Па заканчэнні

жараб'ёўкі сказаў, што чамусьці яго, як удзельніка не назвалі, дзесьці згубілася картачка. Сітуацыя зразумелая, бывае, што губляюцца картачкі, хітрык ягоны прайшоў. Суддзі прапанавалі яму бегчы апошнім, а значыць, лыжня ўжо будзе накатаная. Урэшце-рэшт, па суме дзвюх дысыплінаў, Аркадзь Васільевіч заняў другое прызавое месца. Выступілі на добрым узроўні і астатнія члены каманды БТІ, па выніках двух дзён спаборніцтваў, па набраных балах у той год занялі першае месца ў зімовай спартакіядзе па лыжным дваябор'і сярод ВНУ рэспублікі.

7.

По заканчэнні дзевятага класа, у чэрвені, знаходзячыся ў працоўным лагеры на базе Сенніцкай сярэдняй школы, працавалі мы, вучні школы, на палях калгаса імя Гастэла Мінскага раёна, у асноўным, праполвалі буракі. У другой палове дня – адпачынак, альбо прымалі ўдзел у розных мерапрыемствах, маючых спартыўна-патрыятычны накірунак. Пры звычайным раскладзе трэніровак, Мэлс Харысавіч чатыры разы на тыдзень праводзіў заняткі ў секцыі па лыжнаму спорту. У ліпені Мэлс Харысавіч накіраваў мяне для падрыхтоўкі да наступнага зімовага сезона ў спартыўны лагер з камандай БТІ. Выпраўляючыся на спартыўныя зборы, я не ведаў, дзе, у якой мясцовасці буду знаходзіцца, і маці наказала мне, каб даслаў паштоўку. Разам са спартсменамі навучальнай установы выправіўся я ў маляўнічы, прыгожы куток Беларусі, што непадалёку ад пасёлка Энергетык, у Негарэльскі лясгас, дзе была адбудавана база інстытута лясной прамысловасці для праходжання студэнтамі практыкі і дзе для спартсменаў на летні перыяд падрыхтоўкі быў створаны спартыўны лагер. Трэніроўкі праводзіліся па звычайным раскладзе летняй падрыхтоўкі да зімовага спартыўнага сезона спаборніцтваў па тыднёвым цыкле з адным днём адпачынку, звычайна ў нядзелю. У дні адпачынку калі-нікалі выбіраліся пашвэндацца па лесе, што рос наўкола, альбо бавілі час на маляўнічым беразе ракі Уса.

Мікалай Карнавухаў, скончыўшый першы курс навучальнай установы, прыхапіў з сабой на зборы, акрамя спартыўнага інвентара ды формы, гітары і экіпіроўку для падводнага палявання, маску, трубку і пнеўматычную стрэльбу з гарпунам. Аркадзь Васільевіч, пабачыўшы гэтую ягоную экіпіроўку, пажартаваў, маўляў, бацька табе грошы на вучобу выдзяляе, а ты іх, тыя грошы на непатрэбнае транжырыш. Пабачу як бацьку, то і распавяду яму, куды ты сродкі расходуеш. Гэта былі, канечне, проста жарты. Аркадзь Васільевіч, як трэнер і кіраўнік сваёй каманды, з веданнем свайго педагагічнага прызначэння наладжваў і падтрымліваў добрыя зносіны і меў павагу сярод сваіх выхаванцаў.

Аднойчы быў дзень адпачынку, і мы выбраліся з хлопцамі ды дзяўчатамі на раку, а Мікалай Карнавухаў прыхапіў з сабой прылады для падводнага палявання. Адпачывалі на месцы, абсталяваным мясцовымі жыхарамі пад пляж. Там, дзе рэчышча ракі шырэй, цячэнне невялікае, з берагу – адразу глыбіня, і на дрэве, што расло паблізу, ад вады прыладжана дошка пад вышку для ныранне. З дазволу Мікалая надзеўшы маску ды трубку, вырашыў я паплаваць. Сапраўды цікава, вочы пад маскай у вадзе, дыхаю цераз трубку, рыбкі розныя праплываюць, падводныя расліны, а хлопцы ды дзяўчаты назіралі з берага як я, заглыбляючыся, нібы воўк з мультфільма «Ну, пачакай!», плаваю, дыхаючы цераз трубку, што віднелася ледзь-ледзь з вады. Як потым казалі, адыйшоўшы ад рогату, маўляў, чакаем, што вось-вось схаваецца трубка, вось-вось, і тут я, заглыбіўшыся, удыхнуў так, што вада ў схаваную пад ўзровень трубку для дыхання шуганула, нібыта ў варонку. Заглытнуўшы вады я, нібыта той воўк з мульціка, грэбаючы рукамі, выпіхнуўшы галаву і частку тулава ў паветра з вады, выхапіўшы правай рукой з зубоў трубку і выдыхаючы ваду з крыкам «ва-аа-ўў» схаваўся з галавой у воднай пучыне. Потым другі ды трэці раз. Смеху было, казалі хлопцы ды дзяўчаты, што атрымалася, ну, прама, як у

мультфільме тым, толькі птушачкі не хапала, якая прысела бы з лёту на трубку адпачыць.

Мікалай Карнавухаў вырашыўшы выкарыстаць сваю экіпіроўку па прызначэнні, апрануўшы сваю амуніцыю, маску ды трубку для дыхання, прыхапіўшы пнеўматычную стрэльбу для падводнага палявання, даваў нырца на глыбіні ракі ў спадзеву на ўдачу. Мы, адпачываючыя, з берага з зацікаўленасцю назіралі, жадаючы урэшце-рэшт пабачыць падстрэленую Мікалаем рыбіну. Вынырнуўшы з глыбіні каля берага, аддыхваючыся, зняўшы трубку, трымаючы ў правай руцэ стрэльбу, прамовіў «зараз». Надзеўшы трубку, са стрэльбай на пагатоўцы Мікалай, даўшы нырца, знік з відавоку на глыбіні. Праз невялікі тэрмін паказаўшыся з вады, у правай руцэ трымаючы нявыкарыстаную стрэльбу, у левай банку рыбных кансерваў шпротаў у масле, працягнуў яе на бераг Генадзю Унуковічу. Аддыхваючыся, сказаўшы зноў «зараз», надзеў трубку для дыхання і даў зноў нырца, трымаючы на пагатоўцы сваю падводную стрэльбу. Вынырнуўшы, трымаў ў правай руцэ стрэльбу нявыкарыстанай, у левай яшчэ адну банку рыбных кансерваў шпротаў у масле, працягнуў кансервы на бераг зноў Генадзю Унуковічу. Аддыхваючыся, надзеўшы трубку для дыхання са стрэльбай на пагатоўцы, зноў даўшы нырца на глыбіню, Мікалай знік з відавоку. Неўзабаве вынырнуў каля берага, правай рукой трымаючы сваю стрэльбу, а левай – здабытую з-пад вады бутэльку гарэлкі з этыкеткай «Пшанічная» і працягнуў тую зноў Генадзю Унуковічу. Зняўшы трубку, маску, аддыхваючыся, сказаў, што ўсё, на глыбіні болей нічога няма Мікалай, трымаючы ў правай руцэ стрэльбу, вылез з ракі на бераг. Паклаў прылады для падводнага палявання каля здабытых прадуктаў харчавання, адыйшоўшы ўбок, пачаў далонямі страсаць з сябе, нібыта якую недарэчнасць, кроплі вады.

Паглядаючы на здабытыя Мікалаем пачастункі, з чагосьці нас усіх ахапіў смех. Зваліўся з ног ад смеху, страсаючы з сябе далонямі кроплі вады і Мікалай. Урэшце-рэшт, ужыўшы ў

ежу здабытыя прадукты харчавання, усе разам выправіліся мы да часу абеда ад ракі да сталовай. Увечары, пад час адпачынку калі-нікалі збіраючыся разам, спартсмены і студэнты ВНУ, праходзячыя практыку, спявалі песні пад гітару. Ведаючы некалькі акордаў, прыслухоўваючыся да спеваў ды прыкмячаючы акорды, якія хлопцы ды дзяўчаты бралі пры спевах, калі-нікалі знаходзячыся ў пакоі адзін, браў я Мікалаеву гітару і ціхенька напяваў матывы песен, што змог прыпомніць. Урэшце-рэшт я быў злоўлены за гэткім сваім заняткам. Хлопцы падслухалі, і потым, у вольны час, усаджвалі мяне на стул, давалі мне ў рукі гітару, паказвалі акорды і прымушалі мяне спяваць сваім голасам, гаворачы мне тады, што ў мяне нядрэнна атрымліваецца. Першымі маімі настаўнікамі па ігры на гітары былі студэнты БТІ і асабліва лыжнік-гоншчык Мікалай Карнавухаў, з якім мы на тых зборах пражывалі ў адным пакоі. Потым, з цягам часу вучыўся я ігры на гітары, як кажуць, дзесьці ў кагосьці, ды на пачатку дзевяностых гадоў дваццатага стагоддзя па ігры на гітары быў у мяне прафесійны настаўнік, выкладчык музыкі з кансерваторскай адукацыяй Мікалай Пармон, член Мінскага клуба гітарыстаў, якім і зараз кіруе выдатны гітарыст і кампазітар Алег Капянкоў.

Па заканчэнні месяца трэніровачных збораў Аркадзь Васільевіч паведаміў мне: «Калі будзе магчымасць, пабудзь крыху дома, а пры жаданні, прыязджай на жнівень, пакуль ад школы канікулы, для праходжання падрыхтоўкі на наступны зімовы сезон, месца табе знойдзецца». Прыхапіўшы свае лыжэролеры, сумку з рэчамі, развітаўшыся, рушыў я дадому. Ад прыпынку «Энергетык» электрацягнікам дабраўшыся да станцыі «Памыслішча», пехатою, у добрым настроі пацягнуўся я да сваёй вёскі Скарынічы, што у двух з паловай кіламетрах. Перайшоўшы шашу, што праходзіць з Мінска на Прылукі, ідучы па сцежцы цераз поле, што вядзе да агародаў вёскі крыху на ўзгорак, заўважыў, што бацькі мае, тры старэйшыя сястры ды малодшы брат Юра зграбаюць прасушанае сена, і мяне, што



*Бацька Уладзімір Рыгоравіч Скакун. Камяні каля вёскі Асавы Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці*

называецца, узяло. Маці ж казала, каб даслаў паштоўку дадому, каб ведалі, дзе буду знаходзіцца, ды я ўсё хацеў ды й не паведаміў. Бацька, Уладзімір Рыгоравіч, зграбае сена бліжэй да мяне, злевага боку ад мяне, маці справа, бліжэй да агарода. Уцямліваю, што трэба да бацькі адразу наблізіцца, падыйсці павітацца, крыху згладзіць мне справядліва адведзены наганяй.

Падыйшоў, павіталіся, бацька і кажа мне ціхенька, маўляў, ну, што, блудны сын, зараз табе будзе. Маці, Ніна Трафімаўна, хуценька накіраваўшыся ў мой бок, зрэдку падкідваючы граблямі сена, у метрах пятнаццаці прыпыніўшыся перада мной, трасучы перад сабой граблямі, трымаючы іх абедзвюма рукамі, запытала, маўляў, ты дзе месяц быў, чаму паштоўкі не даслаў. З'явіўся сюды адкульсьці, бадзяешся па свеце, невядома дзе. Я, выслухаўшы ўзбучку, вытрымаўшы паўзу, ды і кажу, што быў во недалёка, павярнуўшыся ўбок леса, паказваю далонню правай рукі ўбок Негарэлага. Кажу, мама ды ўсё добра, а маці мне свае аргументы выдае, маўляў, дзе Негарэлае ведае, недалёка. Ды не ведалі, што я менавіта там і быў месяц, болей, рэзка выдала маці, нікуды не паедзеш. Я прыціх так ды крыху ўлева на бацьку паглядаю, а бацька ўсміхаецца, злёгку круцячы па баках галавой, нібыта паказвае, маўляў, маўчы, вытрымай паўзу, і ўсё будзе добра. Маці, трасучы перад сабой абедзвюма рукамі граблі, далей мне выдае, маўляў, тут нам сена трэба сушыць, да зімы рыхтавацца. Бацька, адклаўшы граблі

ды накладваючы сена ў пасцілку, каб зносіць у пуню, хітравата ўсміхаючыся, нібыта падказвае, маўчы пакуль, вытрымлівай паўзу і бярыся за граблі, і паедзеш куды табе трэба.

Падграбаючы граблямі сена ды потым услед за бацькам зносячы ў пасцілцы да пуні, ўсё разважаў я над тым, што Аркадзь Васільевіч прапанаваў, што калі будзе магчымасць, то прыехаць на зборы на жнівень, месца будзе, для падрыхтоўкі да наступнага зімовага сезона, а дома свеціць свая падрыхтоўка да зімы. На трэці дзень знаходжання дома, гадзін у шаснаццаць, паразважаўшы над выйсцем з такога становішча, што не ў маю карысць склалася, звярнуўся я да маці з прапановай, каб на апошні месяц канікулаў выправіцца мне на тыя зборы, з якіх і вярнуўся. Ды прапанаваў, што па суботах там адна трэніроўка, то буду да дома пад'язджаць на дзень адпачынку ад трэніровак ды па гаспадарцы дапамагаць да вечара нядзелі. Маці, крыху паразважаўшы, уважліва паглядзела на мяне, пагадзілася, сказаўшы, што калі так трэба табе, то едзь. Хутка шмыгануўшы ў свой пакой, пачаў я збіраць у сумку рэчы, а маці ўслед за мной, ды пытаецца ў мяне, куды я ўжо. Кажу, што сягоння так і выберуся, каб назаўтра з раніцы патрапіць на першую трэніроўку. Маці, прайшоўшы на кухню прапанавала, маўляў, ну, вазьмі тады малака свайго і выставіла на стол дзве трохлітровыя шклянкі малака: адну салодкага, другую кіслага, з адстаяўшайся ў гарловіне з паўлітра смятанай. У мяне, глянуўшага на тыя шклянкі ажно пашырыліся вочы, гэта ж у дадатак да сумкі з рэчамі, лыжэролерам, лыжным чаравікам ды лыжным палкам яшчэ сем кілаграмаў вагі. Каб не псаваць маці настрой, адмаўляцца не стаў, яна ж турбуецца, каб я харчаваўся добра.



*Маці Ніна Трафімаўна Скакун, п. Скарынічы, Мінскі раён*

Да прыпынку электрацягніка «Памыслішча» дацягнуў-такі я сваю ношу.

З прыпынку «Энергетык» ужо ўвечары, пехатою сорак хвілін. Мне пашанцавала: дапамаглі папутчыкі, студэнты БТІ, праходзячыя практыку і вятаючыся з дому з выхаднога дня на заўтрашнія заняткі.

У палове дванаццатага начы, калі ўвайшоў ў пакой на другім паверсе корпуса, дзе пражываў у мінулым месяцы, мяне ветліва сустрэлі хлопцы ды дзяўчаты, члены каманды лыжнікаў, якія сабраліся разам пагаманіць. Пабачыўшы выстаўленыя на стол дзве трохлітровыя шклянкі з малаком, усе, дружна ўскочыўшы з месцаў, ухапілі хто шклянкі, хто кубкі, прыняліся ўжываць смачны вясковы пачастунак, напачатку салодкае малако. Мікалай Карнавухаў з каварнай, хітраватай усмешкай на твары, вытрымаўшы паўзу, з веданнем сэнсу ўзяўшы эмаліраваную літровую кружку, напоўніў яе амаль даверху вяршком са смятанай са шклянкі з кіслым малаком і прысеўшы на свой ложак, усміхаючыся, круцячы па баках галавой, з асалодай паціху смакаваў здабыты ім малочны прадукт. Пачаставаўшыся салодкім, хлопцы ды дзяўчаты накінуліся на шклянку з кіслым малаком і ўраз яе апаражнілі.

У наступную суботу, калі я выпраўляўся дадому да бацькоў, хлопцы спыталі пра малако, ці будзе, на што я станоўча адказаў, што абавязкова. У нядзелю ўвечары, у палову дванаццатага, калі я ўвайшоў у свой пакой, дзе мяне чакалі, згуртваўшыся разам члены каманды, а на стале на падстаўцы стаяла каструля са свежазваранай маладой, дзесьці здабытай студэнтамі, бульбай. Апаражніўшы як нейкую прысмаку з бульбай трохлітровую шклянку салодкага малака, студэнты прыняліся ўжываць у ежу з другой шклянкі кіслае, зразумела ў прысмаку з бульбай. Мікалай Карнавухаў хітравата ўсміхаючыся, прысмакоўваючы бульбачку, налягаў з літровай эмаліраванага кубка на вясковую смятану, злітую з вяршка шклянкі кіслага малака. І так было яшчэ два тыдні запар па вечарах, калі я вяртаўся на спартыўны збор пасля дня адпачынку ад бацькоў.

8.

Потым, як пісалася вышэй, нас чакалі зборы на першым снезе у г. Краснакамску Пермскай вобласці, дзе быў і Уладзімір Пятровіч Пачапінскі са сваімі выхаванцамі і выхаванцамі Мэлса Харысавіча Ісхакава, складаўшымі каманду лыжнікаў Мінскага раёна. Пад заканчэнне другой чвэрці навучання ў дзесятым класе ішлі заняткі ў школе і трэніроўкі пад кіраўніцтвам нашага трэнера Мэлса Харысавіча. Памятаю, неяк прыйшоў са школы, і пачаўся вялікі снегапад, і маці адгаворвала мяне, каб не ішоў зноў у школу за тры кіламетры ў Сенніцу на трэніроўку, але я ўсё ж выбраўся. Тады я быў адзін на занятку, Мэлс Харысавіч праклаўшы кругам лыжню па садзе, што рос цераз шашу каля школы, праводзіў з адным выхаванцам трэніроўку па ўдасканальванню тэхнікі лыжнага хода, падказваючы мне і на асабістым прыкладзе правільнасць выканання штуршка і праката на выплюхнутай лыжы.

Пры наступленні 1978 года, пад час майго навучання ў дзесятым класе сярэдняй школы, па выніках спаборніцтваў па лыжных гонках на першынстве Мінскай вобласці, што ў той спартыўны сезон праводзілася ў г. Лагойску, я быў уключаны ў зборную каманду Мінскай вобласці для падрыхтоўкі ва ўдзеле ў спартакіядзе БССР сярод школьнікаў у г. Навагрудку, і Мэлс Харысавіч накіраваў мяне на спартыўныя зборы з камандай БТІ з пражываннем на турбазе Чырвонасцяжнай Беларускай вайсковай акругі, што знаходзілася ў п. Ждановічы Мінскага раёна. Разам з камандай БТІ на тых спартыўных зборах знаходзіўся і Уладзімір Пятровіч Пачапінскі са сваімі выхаванцамі.



*Валеры Скакун. Фотаздымак з альбому "Лепшыя спартсмены Мінскай раённай ДЮСШ". 1978 г.*



Майстар Спорту СССР па лыжных гонках Валянціна Міро́нчык

Дакладна памятаю, што была выдатная лыжніца Валянціна Міро́нчык, Юра Гардзеюк, падрастаючы хлапчук, меўшы добрыя здольнасці да заняткаў лыжным спортам. У тую зіму на адных са спаборніцтваў па лыжных гонках, праводзіўшыхся ў г. Лагойску па лыжні, пракладзенай па свежавыпаўшым снезе, Юры Гардзеюк, вучань у той час восьмага класа сярэдняй школы, высокі, хударлявы, меўшы малую вагу, праскочыўшы, не правальваючыся, паверх лыжні і паказаўшы лепшы вынік праходжання дыстанцыі, заняў першае месца. Надвор'е ў той дзень было марознае, і па заканчэнні спаборніцтваў у аўтобусе дзяўчаты з каманды БТІ адагравалі Юрыя, далонямі рук расціраючы яму падмёрзшыя часткі тулава і канечнасці. Па вяртанні аўтобусам да турбазы ў п. Ждановічы, Генадзь Унуковіч, было яму гадоў дваццаць пяць, Майстар Спорту СССР па лыжных гонках, усё даймаў Аркадзя Васільевіча, маўляў, Аркадзь Васільевіч, Гардзеюк у мяне выйграў, ну няўжо ён мацнейшы за мяне. Аркадзь Васільевіч, зрабіўшы сур'ёзны выраз твару, адказваў яму, маўляў, ну, Гена, ну, што ты ўсё пытаеш у мяне, усё ж зразумела, калі Гардзеюк выйграў, значыць ён мацнейшы.

У той год, мне прыйшлося удзельнічаць ў спартакіядзе сярод ВНУ рэспублікі, што праводзілася ў г. Магілёве, і выступаў па заліку юнакоў за каманду БТІ у першай гонцы на пяць кіламетраў. Незадоўга да фініша ўваходзячы па дыстанцыі з поля на спуск па лесе, я папрасіў у наперадзе ідучага ўдзельніка на драўляных лыжах саступіць мне лыжню. Той, агрызнуўшыся, не дазволіўшы мне прайсці, пайшоў на спуск. Разумеючы што мае пласцікавыя фінскія лыжы з гары ідуць значна хутчэй, давялося мне прыпыніцца. Вытрымаўшы паўзу ды пайшоўшы па

дыстанцыі на спуск, напрыканцы накатваючы на ўдзельніка на драўляных лыжах, давялося мне прытармазіць. Лыжня была пракладзена адна, і ад казырнуўшых па баках лыжаў, заваліўся я напрыканцы спуска на хмызняк. Для гонкі на пяць кіламетраў атрымалася немалая страта часу. Заняўшы пятае месца ды праіграўшы трэцяму прызавому дваццаць секундаў, вельмі быў я расчараваны ад такой недарэчнасці. Увечары ў пакой інтэрната, дзе я пражываў пад час спаборніцтваў з Мікалаем Карнавухавым, Генадзям Унуковічам і Аляксандрам Суханам, увайшоўшы Аркадзь Васільевіч супакоіў мяне, сказаўшы, што па жараб'ёўцы на заўтрашнюю гонку, стартую я ўслед за Вячаславам Нячаем, таксама вучнем дзесятага класа адной са школаў г. Мінска, выступаючым па юнаках за каманду БДІФК, маўляў, дагоніш Вячаслава і станеш пераможцам.

Уначы я прачнуўся ад таго, што Генадзь Унуковіч звярнуўся да мяне з пытаннем: «Валера ты чаго, Валера ты чаго?» Ляжу я на сваім ложку на спіне, а уздоўж мяне ад сцяны састаўленыя адна да адной мае лыжы, якія трымаю я далонню левай рукі каля левага пляча, а далонню правай рукі ваджу па паверхні пластыка, што слізгае. Генадзь і прачнуўся ад гука шоргату маёй далоні па лыжах. У адказ на пытанне, сказаў: «Нічога, Гена, усё нармальна». Прыўзняўшыся на сваім ложку, паставіў я свае лыжы на месца за спінкай, дзе стаялі лыжы і яшчэ траіх хлопцаў. Атрымалася ў цемры гэта так нязручна, што і мае лыжы, і лыжы хлопцаў з грымам бразнуліся на падлогу на сярэдзіну пакоя. Прачнуўшыся раніцой, Мікалай Карнавухаў запытаўся пра раскіданыя па пакою лыжы, на што Генадзь Унуковіч выдаў сваю думку, што гэта Валера ноччу мазь расціраў, рыхтуючыся да сягонняшняй гонкі на дзесяць кіламетраў. Ніякую мазь я не расціраў, гэта мне ўначы прысніўся сон, што быццам і сапраўды стартую я за Вячаславам Нячаем, дзесяць кіламетраў ганюся за ім, і ужо перад самым фінішам абганяю, і метраў за дзесяць наперадзе Вячаслава фінішую, заняўшы першае месца.

Надвор'е пацяплела на адлігу і я, пасля фініша зняўшы лыжы, задаволены вынікам праходжання дыстанцыі, абчышчаў з лыжаў снег. На самай справе, па жэраб'ёўцы не я стартаваў за Вячаславам Нячаем, а ён за мной, і не я быў даганятым, а ў ролі ўцекача. Час ад часу азіраючыся, прыкмячаў, як Вячаслаў Нячай у сваім чырвонага колеру лыжным гоначным камбінезоне паступова падбіраецца да мяне. Удзельніцтваў у спаборніцтвах па лыжных гонках было шмат, але тая дзесятка засталася ў шэрагу запамінаючых назаўсёды. У той час Вячаслаў Нячай займаўся лыжнымі гонкамі ў Школе вышэйшага спартыўнага майстэрства і меў сур'ёзны ўзровень падрыхтоўкі. Як мне і прыснілася, толькі не я, а ён, мяне абыйшоўшы перад фінішам, закончыў праходжанне дыстанцыі метрах у дзесяці наперадзе. Здаецца, Вячаслаў у той гонцы стаў пераможцам, ну, а мне за мае намаганні ўдалося патрапіць на трэцюю ступень п'едэстала, і як напамін, у маёй калекцыі ўзнагарод і прызоў маецца бронзавы медаль рэспубліканскай універсіяды ДСТ «Буравеснік». Па надвор'і у той дзень, і сапраўды, як прыснілася, была адліга.

Выхаванка Уладзіміра Пятровіча Пачапінскага Валянціна Міронччык, у той год выступаючы на рэспубліканскай універсіядзе за каманду БТІ, была мацнейшай сярод дзяўчат. Неўзабаве з Цэнтральнага Савета ДСТ «Буравеснік» прыйшоў выклік на дзяўчыну прыбыць у г. Оцепе, што ў Эстоніі, для ўдзелу ў адборачных спаборніцтвах у зборную каманду СССР, што фарміравался для выступу на сусветнай ўніверсіядзе, і ёй трэба было атрымаць спартыўную форму і інвентар. Выкладчык БДІФК Паўлаў Ілья Рыгоравіч, замест Валянціны Міронччык, што па ўзроўню падрыхтоўкі мела шанцы адабрацца на сусветную ўніверсіяду, выправіў для ўдзелу ў адборы юнака, студэнта БДІФК Сідорку Уладзіміра. Арганізатары, пабачыўшы што прыслалі юнака, заявілі таго адбірацца на гонку на пятнаццаць кіламетраў. Так атрымалася, што гонка не пайшла, і той сышоў з дыстанцыі. Для Валянціны Міронччык магчымасць адабрацца

ў зборную каманду СССР для ўдзелу ў сусветнай універсіядзе засталася нявыкарыстанай.

Па заканчэнні сярэдняй школы і паступіўшы на навучанне ў Інстытут народнай гаспадаркі, зараз Эканамічны універсітэт, працягваючы зай-




*МС СССР Валянціна Мірончык. Першынства БССР сярод ВНУ. Эстафета, г. Магілёў, 1989 г.*

мацца лыжным спортам, Майстар Спорту СССР Валянціна Мірончык выдатна выступала на спаборніцтвах па лыжных гонках рэспубліканскага і ўсесаюзнага ўзроўняў.




*МС СССР Валянціна Мірончык. Першынства БССР сярод ВНУ, г. Магілёў, 1981 г.*

У тыя часы напрыканцы зімовых сезонаў спаборніцтваў праводзіліся прафсаюзна-камсамольскія лыжныя кросы. У тым 1978 годзе першынстваваў я ў Мінскім абласным сярод юнакоў, ды чагосьці ўдзел мой у рэспубліканскіх спаборніцтвах пры наборы зборнай каманды быў пад пытаннем. Урэшце-рэшт падключыўшыся для высвятлення, мой настаўнік Мэлс Харысавіч Ісхакаў пытанне майго ўдзелу вырашыў



*Зборная каманда Інстытута народнай гаспадаркі (зараз Эканамічны універсітэт). Другі рад, другая злева – МС СССР Валянціна Міронччык. Першы рад, чацвёртая злева – трэнер Ніна Раманько, МС СССР, чэмпіёнка СССР па лыжных гонках*

становча. Зборную каманду Мінскай вобласці перад адпраўкай у г. Магілёў, дзе і праводзіліся рэспубліканскія спаборніцтвы, размясцілі на адну ноч у гасцініцы РСК «Раўбічы», даручыўшы Уладзіміру Пятровічу Пачапінскаму даставіць яе да месца і вырашаць там арганізацыйныя пытанні. У нумары, дзе размясціўся Уладзімір Пятровіч, было спякотна і, выпадкова, адпачываючы, працягнуўшы руку да акна за штору, намацаўшы бутэльку ды падумаўшы, што там мінеральная вада, глыткамі з бутэлькі спатоліўшы смагу, наглытаўся Уладзімір Пятровіч з той бутэлькі шкіпінару, якім у тыя часы з пластыкавых лыжаў здымалі лыжныя мазі. З раніцы было дрэнна і Уладзімір Пятровіч папрасіў вадзіцеля аўтобуса, што вёз каманду, прыпыніцца каля бара і запіў той шкіпінар трыма бакаламі піва – стала лягчэй. Потым хтосьці супакоіў, сказаўшы, што скіпідар шкоды здароўю не наносіць, раней ім, выпіваючы, лячылі хваробы жывата.

Надвор'е пры правядзенні спаборніцтваў у г. Магілёве напрыканцы сакавіка было каля нуля градусаў, акурат той выпадак,

калі ўскладняецца задача па падборы змазкі для лыжаў. Шмат хто з лыжнікаў, студэнтаў БТІ, быў уключаны ў зборную каманду, і ім, як і мне на мае лыжы, як і шэрагу іншых удзельнікаў тых спаборніцтваў, на першай гонцы падабраць смазку не ўдалося. Пры агульным старце на дваццаць кіламетраў, удала вырваўшыся ў галаўной групе, на роўняддзі лыжы мае выкатвалі проста выдатна. Пры заходзе на пад'ём з поля ў лес па лыжні ў рашчэліне на маіх лыжах аддача была такая, што, прыгаючы амаль на месцы, ўзбіраўся я ўверх па лыжні, выпіхіваючы сябе лыжнымі палкамі. Некалькі ўдзельнікаў, што ішлі наперадзе мяне, хутка пераадолеўшы той пад'ём, у імгненне зніклі з відавоку, паімчалі ў адрыў ад стрымліваемых мной у расчэліне астатніх удзельнікаў гонкі. Сысці набок, каб прапусціць прайсці мацнейшых за мяне гоншчыкаў наперад, не было ў мяне магчымасці, і я крыху засцярогся, каб хто з затрыманых мной на дыстанцыі па прычыне няўдалай змазкі маіх лыжаў не пачаставаў мяне па спіне лыжнай палкай, альбо яшчэ як. Засцярогся я дарма, лыжнікі – народ добра выхаваны сваімі настаўнікамі, і праблемы са змазкай узніклі ў той гонцы шмат у каго з удзельнікаў. Як толькі дабраўся я да зручнага месца, то і саступіў з лыжні набок, даўшы мацнейшым прайсці, а потым пакаціў услед, прыстасоўваючыся мацней працаваць плечавым поясам.

Дваццатку тую праходзілі ў два кругі па дзесяць кіламетраў. Камусьці з удзельнікаў па ходзе па дыстанцыі трэнеры і прадстаўнікі камандаў перамазвалі лыжы. Напрыканцы першай дзесяткі Аркадзь Васільевіч Лябёдка з Мікалаем Карнавухавым памянялі мне мае лыжы на перамазаныя лыжы Мікалая, той, паскакаўшы крыху, вырашыў сыйсці з дыстанцыі, каб зберагчы сілы да наступнай гонкі назаўтра. Новыя, перамазаныя па надвор'і фінскія лыжы і кацілі выдатна, і пры штуршку трымалі належным чынам. Калі пачаў падбіраць па ходзе па дыстанцыі больш моцных і вопытных спартсменаў з няўдалай змазкай лыжаў, мяне цалкам ахапіў азарт другой паловы той дваццаткі.

Гэта яшчэ адна з шэрагу тых гонак, што добра памятаецца і да гэтай пары. Лыжы тыя ў той год і набылі Мікалаю Карнавухаву за сродкі інстытута. Аркадзь Васільевіч хацеў было сам паставіць на тыя лыжы крапленне пад лыжныя чаравікі, ды Мікалай доўгімі ўгаворамі дамогся дазволу паставіць на лыжы крапленне самому. Не маючы часу перад нейкімі спаборніцтвамі тыя лыжы прыкатаць і надзяваючы іх акурат перад стартам, сталася, што, відаць моцна хваляваўся, Мікалай паставіў мацаванне пад чаравікі пяткамі наперад.

Атрымалася такая вось смешная недарэчнасць, гонку тую прайшоў Мікалай на лыжах, што і былі да набыцця новых. Мацаванне пераставіў, як патрэбна, потым.

9.

Пасля заканчэнні навучання ў Сенніцкай сярэдняй школе Мінскага раёна пры навучанні ў Мінскім энергетычным тэхнікуме, займаючыся далей лыжным спортам, меў я дачыненне да Добраахвотнага спартыўнага таварыства «Чырвоны Сцяг». Заняткі лыжным спортам, як для навучэнцаў тэхнікума, так і для іншых жадаючых, праводзіў Анатоль Іосіфавіч Драздоўскі, працаваўшы трэнерам выкладчыкам ДЮСШ ДСТ. Займацца лыжным спортам пад час навучання ў тэхнікуме, што знаходзіцца ў мікрараёне Дражня г. Мінска, было зручна. Побач – лесапаркавая зона, лыжныя трасы, на якіх у зімовы перыяд праводзяцца спаборніцтвы featuring рознага ўзроўню.

Па восені, на пачатку лістапада патрапіўшы на спартыўныя зборы на першы снег у г. Апаціты, што на Кольскім паўвостраве, разам са спартсменамі ДСТ «Чырвоны Сцяг», сустрэўся я там з Юрыям Горыдам, які таксама меў дачыненне, працягваючы займацца лыжным спортам да таго ж ДСТ. Сяброўства наша з часоў навучання ў школе працягвалася і там. Пры вяртанні са спартыўных збораў для працягу навучанне ў тэхнікуме, неяк прыйшоў пасля заняткаў на трэніроўку. Лыжная база

знаходзілася ў будынку навучальнай установы, на пачатку другой трэці снежня рыхтуючыся выйсці на лыжню, апрануў я на сябе два спартыўных зяленага колеру з начосам цёплых касцюма, каб не падмерзнуць. Трэнер Анатоль Іосіфавіч Драздоўскі, прыкмеціўшы мой гэтакі прыкід, заскочыў у памяшканне склада спартыўнага інвентара ды хутка выйшаўшы адтуль са словамі: «Скакун на яшчэ адзін апрані, яшчэ адзін апрані, каб не змерзнуць на лыжні,» – іпрацягнуў мне новенькі, ва ўпакоўцы, яшчэ адзін зялёнага колеру спартыўны касцюм. На адказ мой, што хопіць два Анатоль Іосіфавіч, са словамі, маўляў, ну-ну, два хопіць, усміхаючыся пакачаў згодна па баках галавой. На трэніроўцы на трасе пры мінус трох градусах мароза не паказваў я выгляду, што, быў апрануты ў тыя два касцюмы, увесь тады ўпрэў, вырашыўшы дацягнуць да завяршэння трэніроўкі, ды болей так цёпла на лыжню ніколі не апранаўся.

Лыжным спортам у трэнера Анатоля Іосіфавіча Драздоўскага займаліся як навучэнцы энергатэхнікума, так і іншых навучальных установаў, а таксама школьнікі. Гадоў мне ўжо было каля трыццаці, калі аднойчы сустрэў я неяк аднаго з хлопцаў, былых школьнікаў. Пры размове ён выказваў падзяку Анатолю Іюсіфавічу за пачатак заняткаў спортам менавіта лыжным. Прайшоўшы першапачатковую фізічную падрыхтоўку лыжніка, пацягнула яго займацца грэбляй і ў адзін з гадоў навучання ў ВНУ, у складзе зборнай каманды Савецкага Саюза, у васьмёрцы з рулявым, на чэмпіянаце свету стаў ён чэмпіёнам.

Пад час вучобы ў тэхнікуме пасябраваў я з двума хлопцамі з Калінкавіцкага раёна – Мухай Уладзімірам і Новікам Васілём. Васіль Новік, зацікавіўшыся лыжным спортам, рэгулярна наведваў заняткі. Дужага целаскладу юнак Уладзімір Муха быў выдатным фізкультурнікам. З Васілём Новікам мы і зараз сябруем, калі знайшліся праз дваццаць два гады. Пры сустрэчах калі-нікалі жартуем, маўляў, Уладзімір Муха спортам займацца мог і не займацца. Моцны, дужы Уладзімір пасля пэўнага тэрміну

навучання ў энергатэхнікуме пасля прызыву ў войска праходзіў службу ў паветрана-дэсантным падраздзяленні, што па яго здольнасцях наканавана было яму лёсам.

У тыя часы навучэнцаў тэхнікумаў і ВНУ на пачатку навучальнага года, у верасні, пасылалі на сельскагаспадарчыя працы для дапамогі збору ўраджаю калгасам. Група наша, 12-78 ПГУ, патрапіўшы ў адну з вёсак Ушацкага раёна Віцебскай вобласці, паспяхова спраўлялася з пастаўленымі задачамі па ўборцы бульбы і лёну. Ну і, зразумела, калі-нікалі для моладзі ладзіліся танцы увечары ў мясцовым клубе, дзе напачатку, як і звычайна, чужынцаў успрымаюць, з боку гледжання тутэйшага бамонда. Пачалі былі мясцовыя хлопцы на танцульках дуркаваць перад прышлымі навучэнцамі, маючы намер паказаць свой нораў, ды Уладзімір Муха адным махам пяткай правай нагі па сківіцы завадатару мясцовых вузлавую сітуацыю разруліў станоўча. Зваліўшыйся з ног, мясцовы завадатар, прыўзняўшыся, прысеў на поплаў пры святле ліхтара, гэта быў хлапец з доўгімі светлымі валасамі. Ён абапёрся левай рукой на глебу, далонню правай рукі сціраючы з твару аб крыўды слёзы, пачаў прычытаць, маўляў, навошта адразу пяткай ды па сківіцы, маўляў, у нас так не прынята, бойкі ў нас толькі на кулаках. Уладзімір спакойна, ураўнаваджана растлумачыў таму хлопцу ды астатнім мясцовым збіўшымся да кучы, нібыта разважаючы, у які бок падацца наўцёкі, калі зараз гэтыя самыя прышлыя навучэнцы пачнуць разварочвацца для адпрацоўкі сваіх разнастайных прыёмаў барацьбы, што ў нас прынята інтэлегентна сябе паводзіць і знаёміцца з людзьмі на інтэлектуальнай падставе, а не праз бойкі на кулаках. Болей недарэчнасцяў паміж нашымі навучэнцамі і мясцовымі хлопцамі ды дзяўчатамі не ўзнікала. Сябравалі і на танцах, і ў часе адпачынку на спартыўнай пляцоўцы, нярэдка гулялі разам у футбол і валейбол.

Па праходжанні тэрміновай службы ў войску, Уладзімір Муха паспяхова скончыў навучанне ў Мінскім энергетычным



*Уладзімір Муха*

тэхнікуме і ў цяперашні час працуе начальнікам змены паліўнага цэха Гомельскай ЦЭЦ-2 філіяла РУП «Гомельэнерга».

Васіль Новік, спасцігаючы тэхніку лыжнага ходу, здзіўляў нас, вопытных спартсменаў, што рэгулярна займаліся спортам колькі ўжо гадоў запар, здольнасцямі ў бегавых дысцыплінах як на кароткія, так і на доўгія дыстанцыі. Для бегавых спартыўных дысцыплінаў, у школьныя гады займаючыся на ўзроўні ўрокаў фізкультуры, Васіль Новік быў самародкам ад прыроды.

У адзін з тых гадоў навучання, напрыканцы снежня мы ўдзельнічалі ў штогадовай, традыцыйнай у той час эстафетнай гонцы чатыры па пяць кіламетраў на прызы газеты «Вячэрні Мінск». Каманду Мінскага энергатэхнікума складалі Валеры Скакуна, Уладзімір Кавалеўскі, Аляксандр Леўс і Валянцін Кугуч, і гэтая каманда паспяхова выступіла, заняла трэцяе прызавое месца па заліку юнакоў. Акрамя ўзнагарод ад арганізатараў спаборніцтваў, члены каманды, навучэнцы энергатэхнікума, за паспяховае выступленне ад прафсаюзнага камітэта навучальнай установы атрымалі грашовыя прэміі ў памеры пятнаццаці рублёў. У зімовы сезон спаборніцтваў пад час першага года навучання ў тэхнікуме, выдатна выступіўшы на першынстве Мінскага абласнога савета Дабраахвотнага спартыўнага таварыства «Чырвоны Сцяг» і патрапіўшы ў зборную каманду Мінскага абласнога савета, тры навучэнцы энергатэхнікума: Валянцін Кугач, Уладзімір Кавалеўскі ды я, звестка ад аўтара, – праходзілі

падрыхтоўку да першынства цэнтральнага савета ДСТ «Чырвоны Сцяг» па юнаках і дзяўчатах у г. Лагойску Мінскай вобласці пад кіраўніцтвам трэнераў Драздоўскага Анатоля Іосіфавіча і Голуба (імя і прозвішча, нажаль, запамятаваў).

На праходзячым у г. Наваполацку першынстве ЦС ДСТ «Чырвоны Сцяг» каманда наша выступіла на добрым узроўні. У дзвюх лыжных гонках мне ўдалося два разы запар заняць прызавыя другія месцы. Запомніліся тыя спаборніцтвы яшчэ і тым, што наш трэнер Анатоль Іосіфавіч Драздоўскі дамовіўся ў Наваполацку, каб спартсмены змаглі набыць новыя вуглепластыкавыя лыжныя палкі, што пачалі вырабляць на прадпрыемстве «Хімвалакно». Па тым часе гэта быў дэфіцыт. Прайшоўшы другую гонку з новымі, вуглепластыкавымі лыжнымі палкамі і адчуўшы ўдасканальванне свайго ходу па лыжні, з выкарыстаннем сучаснага спартыўнага інвентара, з цітанавымі палкамі болей на старт лыжных гонак ніколі я ўжо і не выходзіў.

Напрыканцы лыжнага сезона, як звычайна ў тыя гады, на праходзячым у той год у РСК «Раўбічы» рэспубліканскім прафсаюзна-камсамольскім лыжным кросе Анатоль Іосіфавіч Драздоўскі адгаворваў мяне праходзіць лыжную гонку з новымі, вуглепластыкавымі лыжнымі палкамі, сказаўшы, каб бег з цітанавымі, бо з агульнага старта, у натоўпе, магчыма, паламаю. Не пагадзіўшыся з прапановай трэнера, я прыняў старт у агульным гурце і са стартавай паляны павярнуў ў пелетоне за біятлонным стрэльбішчам улева, і тут на правую маю лыжную палку хтосьці з удзельнікаў наступіў і ламануў яе. Прыпыніўшыся, падхапіўшы адламаны канчур, рушыў я далей па трасе. Анатоль Іосіфавіч, знаходзячыся акурат на пераходным мастку над лыжнай трасай, заўважыўшы мяне ў гурце гоншчыкаў, са зламанай лыжнай палкай працягваючым ісці па трасе, прысеў на кукішкі, выцягнуўшы правую руку за агароджу, левай трымаючы свае лыжы і цітанавыя палкі, і амаль закрычаў на мяне з вышыні:

– Ну, што, Скакун, я ж казаў табе, што паламаюць, казаў, вазьмі цітанавыя, я ж казаў, што паламаюць, – рэзка ўзняўшыся, Анатоль Іосіфавіч, пакінуўшы лыжы на мастку, хуценька збегшы па прыступках да лыжні, працягнуў мне свае цітанавыя палкі, – я ж казаў, што паламаюць, казаў жа, беражы, гэта ж лыжны крос, – узяўшы адну цітанавую палку, паімчаў я далей па дыстанцыі, тэхнічна выдаваючы левай вуглепластыкавай на рубель, правай цітанавай – на дваццаць капеек, правая была менш ростам, бо Анатоль Іосіфавіч росту невысокага, але моцныі жылісты. Запомнілася тая кросавая лыжная дваццатка яшчэ і тым, што наперадзе таго гурта лыжнікаў, у якім я праходзіў па дыстанцыі, нібыта выкладаючы тэхніку лыжнага хода, маячыла, аддаляючыся ад нас на адлегласць далей і далей, выдатная лыжніца з ДСТ «Чырвоны Сцяг», Майстар Спорту СССР Вера Багамолава.

За тыдзень да рэспубліканскага лыжнага кроса на спартыўнай базе «Ганалес», што на Мінскім моры, праводзіўся Мінскі абласны прафсаюзна-камсамольскі лыжны крос. У першы дзень з раздзяляльнага старту на першых кроках дыстанцыі зламаў я лыжу, так атрымалася. На другі дзень спаборніцтваў з агульнага старту па гуртах, выступаючы на лыжах, выдзеленых мне трэнерам Голубам, са старта адарваўшыся ад гурта ўдзельнікаў свайго забегу, дзесьці на палове дыстанцыі пры выкаце са спуска, крыху страціўшы раўнавагу, пры хлапку па лыжні адваліўся носік левай лыжы. Спатыкаючыся, працягваў ісці па дыстанцыі, пры зарыванні левай лыжы без носіка ў снег пачалі абганяць мяне ўдзельнікі майго стартавага забега. Узяўшы ў пікетчыка на дыстанцыі лыжу, выйшаў зноў наперад свайго гурта ўдзельнікаў і пачаў я лідзіраваць, аддаляючыся на адлегласць у адрыў. Праз кіламетры два праходжання па дыстанцыі той гонкі, ламаецца у мяне правая лыжа, на роўнядзі адваліваецца носік. Зноў мяне абганяюць удзельнікі спаборніцтваў з майго гурта. За два кіламетры да фініша мужчына, што стаяў уздоўж лыжні,

даў мне сваю правую лыжу. Пачаў набліжацца да ўдзельнікаў свайго забега ды абыходзіць па дыстанцыі за кіламетр да фініша, са спуска тарганулася правая лыжа. Утрымаўшы раўнавагу, на лыжню не паваліўшыся, з'ехаўшы на роўнядзь і азірнуўшыся на правую лыжу, заўважыў, што ад пяткі задніка лыжы нябыло, адваліўся. Пасля фініша трэнер Анатоль Іосіфавіч Драздоўскі, падыйшоўшы да мяне, прамовіў, маўляў, запішы Валера ў свой дзённік трэніровак гэтыя спаборніцтвы, як чорныя дні.

На тыя спаборніцтвы па лыжнаму кросу на спартыўнай базе «Ганалес» трэнер зборнай Беларусі Барыс Сяргеевіч Дубаў заявіў для ўдзелу, прыняць старт, члена зборнай рэспублікі Іонінкава Сяргея. Лепшая падрыхтоўка да спаборніцтваў – гэта ўдзел у спаборніцтвах, менавіта так і набіраецца спартыўная форма да галоўных стартаў сезона. Акрамя Барыс Сяргеевіч прыглядаўся да юнакоў і дзяўчат для адбору перспектыўных гоншчыкаў. Анатоль Іосіфавіч Драздоўскі выказываў Дубаву думку наконт таго, што ёсць у яго зараз выхаванец, які на працягу сезона з кожным стартам набірае майстэрства. Пасля атрыманых гэткіх недарэчнасцей, наламаных мной за два дні спаборніцтваў на дзвюх дыстанцыях дроў, чатыры лыжы, Барыс Сяргеевіч выказаў Анатоль Іосіфавічу сваю думку, маўляў, што мне твайго Скакуна браць, калі ён гэтак лыжы ламае. Працуючы са зборнай камандай Беларусі па лыжных гонках, Барыс Сяргеевіч Дубаў праводзіў вялікую працу па развіццю лыжнага спорта ў рэспубліцы і па ўдасканальванню рэльефнасці лыжных трасаў у РСК «Раўбічы», дзе ёсць і так называемы Дубаўскі пад'ём. Да працы са зборнай Беларусі Барыс Сяргеевіч працаваў у Беларускім тэхналагічным інстытуце лясной прамысловасці, дзе паспяхова падрыхтоўваў спартсменаў высокага ўзроўню.

Як пісалася вышэй, аповесць-расповед пішацца як ад аўтара, так і ад імя сяброў, хлопцаў ды дзяўчат, знаёмых, трэнераў-выкладчыкаў. Пад час працы з камандай БТІ у Барыса Сяргеевіча быў выхаванец Андрэеў Віктар, чэмпіён Савецка-

га Саюза сярод моладзі. У адзін з перыядаў летняй падрыхтоўкі, пражываючы на спартыўных зборах на турбазе ЧБВА, што знаходзіцца ў п. Ждановічы, Віктар Андрэеў на працяжнай трэніроўцы вакол Мінскага мора, адбегшы ад турбазы і набыўшы білет на прагулачны катэр, перабраўся на тым катэры на процілеглы бераг і прадоўжыў бег. Праз трыццаць хвілінаў з пачатку трэніроўкі Барыс Сяргеевіч, завёўшы свой матацыкл з каляскай, рушыў на ім услед спартсмену, што рабіў прабег, каб праверыць самаадчуванне таго. У патрэбным месцы праверыўшы пульс у Андрэева, Барыс Сяргеевіч быў вельмі здзіўлены самаадчуваннем спартсмена, пераадолеўшага нямалую адлегласць і бягучага па дыстанцыі лёгка і непасрэдна.

У адзін з зімовых сезонаў спаборніцтваў на першынстве рэспублікі сярод ВНУ па біятлоне ў РСК «Раўбічы», Барыс Сяргеевіч выставіў на біятлон сваіх лыжнікаў-гоншчыкаў. Адзін з яго выхаванцаў, прыбегшы па дыстанцыі на стрэльбішча, звярнуўся з пытаннем да галоўнага суддзі спаборніцтваў Корбіра Міхаіла Іванавіча, маўляў, таварыш галоўны суддзя, тут установак шмат, а па якой мне страляць. Галоўны суддзя, здзіўлена глянуўшы на ўдзельніка, не ведаючага, куды страляць, запытаў у таго, маўляў, а хто твой трэнер, і пачуўшы ў адказ, што Барыс Сяргеевіч Дубаў, Корбір Міхаіл Іванавіч, глянуўшы ўбок трэнераў і прадстаўнікоў камандаў, стоячых і назіраючых за спаборніцтвамі з-за лініі стрэльбішча і заўважыўшы сярод іх Барыса Сяргеевіча, паказаў далонню правай рукі ўбок таго і прамовіў, маўляў, вось у Барыса Сяргеевіча Дубава і страляй.

Працуючы са спартсменамі каманды БТІ на спаборніцтвах па веласіпеднаму спорту на першынства рэспублікі сярод ВНУ, Барыс Сяргеевіч Дубаў выстаўляў лыжнікаў-гоншчыкаў. У адзін з такіх сезонаў адзін з выхаванцаў Барыса Сяргеевіча, звярнуўшыся да таго з просьбай абкатаць новыя колы да гоначнага веласіпеда, атрымаў дазвол. Увечары, круціўшы педалі веласіпеда з тымі новымі коламі па Мінскай кальцавой дарозе ў

патоку за грузавой машынай каля філіяла БДУ, па прычыне, што вадзіцель аўто прытармазіў на ямінах, урэзаўшыся таму ў задняе кола, зляцеў выпрабаванец у кювет. Пэўны тэрмін ад удара аб глебу лежачы непрытомным, ачуняўшы, павалок на плячах веласіпед з упрацаванымі, пагнутымі новымі коламі, у палову дванаццатага вечара з'явіўшыся на спартыўнай базе сваёй навучальнай установы.

10.

У сямідзесятыя гады дваццатага стагоддзя ў в. Сенніца Мінскага раёна пры раённым Палацы культуры калгаса імя Гастэла дзейнічала некалькі гадоў запар спартыўная секцыя па веласіпедным спорце ад ДСТ «Ураджай», дзе заняткі па веласпорце праводзіў трэнер-выкладчык Іваноў Алег Уладзіміравіч, дзе аднакласнікі з вёскі Скарынічы Саша Янушонак, Віця Бурын ды я, звестка ад аўтара, і пачалі рэгулярна займацца спортам, пайшоўшы з восені ў шосты клас. Праз год секцыю па веласіпедным спорце па пэўнай прычыне перавялі ў іншае месца, і трэнер-выкладчык Іваноў Алег Уладзіміравіч перайшоў на працу ў ДСТ «Чырвоны Сцяг». Мы ўтраіх, аднакласнікі, перайшлі займацца спортам у лыжную секцыю пры Сенніцкай сярэдняй школе да нашага настаўніка Мэлса Харысавіча Ісхакава, патрапіўшы акурат у другі набор, атрымаўшы папярэднюю падрыхтоўку ў секцыі па веласпорце, адкуль з часу дзеяння выйшлі выдатныя майстры. У прыватнасці, Васіль Бурын, на два гады за нас па ўзросту старэйшы, пад час навучання ў Сенніцкай сярэдняй школе стаўшы чэмпіёнам Беларусі сярод юнакоў.

Памятаю ў спартыўнай газеце «Фізкультурнік Беларусі» быў артыкул пад назвай «Чэмпіён з Сенніцы». Разам з трэнерам-выкладчыкам Івановым Алегам Уладзіміравічам перайшоў надалей займацца веласіпедным спортам у ДСТ «Чырвоны Сцяг». Па заканчэнні сярэдняй школы паступіўшы на навучанне і БДІФК, Васіль Бурын пад кіраўніцтвам свайго трэнера раз-

віваў і ўдасканальваў сваё спартыўнае майстэрства. Майстар Спорту СССР па веласіпедным спорце, чэмпіён БССР, шматразовы чэмпіён ЦС ДСТ «Чырвоны Сцяг», абсалютны чэмпіён другіх Усесаюзных гульняў моладзі па велатрэкавым дысцыплінам тысяча дзевяцьсот семдзесят сёмага года, што праводзіліся ў г. Ленінградзе, пераможца і прызёр шматлікіх тураў прафсаюзаў як на шасейных велагонках, так і на трэку.




*Другія ўсесаюзныя спартыўныя гульні моладзі. Першы рад, справа – Васіль Бурын, Майстар Спорту СССР па веласпорце. Ленінград, 1977 г.*

Васіль Бурын, пад час навучання ў БДІФК пазнаёміўшыся са сваёй паловай, пабраўся ў шлюбе з Нінай, дзявочае прозвішча Палякова, зараз Ніна Бурын. Майстар Спорту СССР па веласіпеднаму спорту Ніна Бурын (Палякова) пад час навучання ў БДІФК была трохразовай чэмпіёнкай першынства Цэнтральнага савета дабраахвотнага спартыўнага таварыства «Буравеснік» (Усесаюзнай універсіяды). Пераможца першага кубка БССР па веласіпедным спорце ў трэкавай праграме на тры кіламетры, праходзячага ў г. Брэсце. Шматразовая пераможца і прызёр ту-

раў прафсаюзаў па веласіпедным спорце ў шасэйных гонках і па трэкавых дысцыплінах, Майстар Спорту СССР Ніна Бурын, дзявочае прозвішча Палякова, па заканчэнні навучання ў БДІФК пэўны тэрмін працавала малодшым навуковым супрацоўнікам у праблемнай лабараторыі, зараз НІІ, Беларускага дзяржаўнага ІФК.

Трэнер-выкладчык па веласіпедным спорце Іваноў Алег Уладзіміравіч, выхоўваючы і падрыхтоўваючы майстроў высокага класа і ўдасканальваючы сваё прафесійнае майстэрства, пэўны тэрмін працаваў галоўным трэнерам зборнай каманды Беларусі па веласіпедным спорце.



*Майстар Спорту СССР па веласпорце Ніна Палякова (зараз Бурын). Ленінград, велатрэк. Сярэдзіна 1970-х гг.*

Гера Калінкоўскі, хлопец на год за мяне маладзейшы, да гэтай пары не змяняе спартыўнаму веласіпеду. Калі-нікалі дабіраючыся дадому з Мінска электрацягнікам у летні перыяд, прыкмячаю Геру на станцыі прыпынку «Калядзічы» на спартыўным веласіпедзе. Магчыма, працуе дзесьці там на прамзоне і на працу ды з працы выкатвае з тае даўняй ужо пары на спартыўным веласіпедзе. І сапраўды, зайздросная, у добрым сэнсе, засталася ў Геры Калінкоўскага прыхільнасць. Заняткі веласіпедным спортам, як і лыжным, уключаюць у сябе розныя віды агульнай і спецыяльнай падрыхтоўкі. У веласіпедным спорце абавязкова адпрацоўка руху ў пелетоне. Звычайна, на трэніроўках у пелетоне наперадзе рухаліся болей вопытныя, старэйшыя па ўзросце і са стажам трэніровак спартсмены. Маладзейшыя набіраліся

навыка рухацца кола ў кола ў самім хвасце. На адной з такіх трэніровак на шашы на Атоліна, праходзячай паралельна вёскі Скарынічы, з чагосьці старэйшыя прыпыніліся напрыканцы доўгага спуска. Пад'язджаючыя да іх, адстаючыя, прытармажваючы, далучаліся да гурта. Па левай паласе насустрач пачынаючы ўздымацца ўгору аўтобус у накірунку на Мінск прымусіў пад'язджаючых, прытармажваючы, спыняцца на абочыне ўправа. Імчаўшы напрыканцы пелетона перада мной Саша Янушонак, узяўшы руля правей і пераскочыўшы цераз адну з насыпаных самасваламі кучаў пяску на абочыне, утрымаўшы раўнавагу, прыпыніўся каля гурта веласіпедыстаў. Набліжаючыйся ўгору па стрэчнай паласе, аўтобус насцярожыў мяне і, ўзяўшы руля правей, забурыўся я ў кювет, мінаючы тую кучу, што Саша пераскочыў, па левую сваю руку. Як куляўся ўжо і не ведаю, бо вочы заплюшчыў, ды атрымалася, што, саскочыўшы з веласіпеда, застаўся я стаяць на нагах, абняўшы магутны ствол аднаго з тапалёў, што і зараз падрастае яшчэ ўвысь уздоўж той шашы. Атрымалася ўсё паволі ды мякка, сінякоў ды падзёртасцяў я не набыў. Старэйшыя хлопцы спачатку запыталіся як ды што, ці не зашыбся я. Пабачыўшы, што абыйшлося ўсё добра, усе разам зарагаталі, а я, ледзь стрымліваючы слёзы, каб не заплакаць ад атрымаўшайся недарэчнасці, падняўшы свой веласіпед, выпраўляў звернуты набок пры падзенні руль і знаходзячыяся на ім абодва рычагі ручных тармазоў. Пачакаўшы мяне, пакуль я выпраўлю свой веласіпед, пелетон і я разам з ім прадоўжылі рух па шашы ў накірунку на Атоліна. Хлопцы калі-нікалі пасля гэткай са мной недарэчнасці падкідвалі, па-сяброўску, кпінкі ў мой бок, маўляў, Валерык тапалі ўздоўж дарогі абдымаў, ды я тады, усміхаючыся, ніколі не крыўдаваў.

Пляменнік мой (звестка ад аўтара), Валеры Кавалёў, года нараджэння тысяча дзевяцьсот семдзесят шостага, з сёмага класа навучання ў адной з сярэдніх школаў г. Мінска пачаўшы рэгулярна займацца веласіпедным спортам у спартыўнай секцыі

ДЮСШ ад ДСТ «Працоўныя Резервы», на працягу шасці гадоў запар развіваючы і ўдасканальваючы тэхніку педаліравання пад кіраўніцтвам вопытнага трэнера-выкладчыка Сяргея Іванавіча, шматразова першынстваваў на чэмпіянатах рэспублікі у шасэйных велагонках па Дабраахвотным спартыўным таварыстве «Працоўныя Рэзервы» сярод юнакоў сваёй узроставай групы.

У летні перыяд падрыхтоўкі і спаборніцтваў, развіваючы і удасканальваючы сваё спартыўнае майстэрства, знаходзячыся на спартыўных зборах у спартыўным лагеры «Бабёр», што месціўся непадалёку ад г. Крупкі Мінскай вобласці на рацэ Бобр, Валеры Кавалёў паспяхова прынімаў удзел у спаборніцтвах па шасэйных велагонках розных узроўняў у розных кутках Беларусі, у прыватнасьці ў гарадах Орша, Барысаў, Асіповічы, Мінск. У цяперашні час, пражываючы ў вёсцы Скарынічы Мінскага раёна і захапляючыся веласіпедным спортам, як фізкультурнік, Валеры Кавалёў, працуючы вадзіцелям ААТ «Гастэлаўскі» за адказныя адносіны да сваёй справы перыядычна адзначаецца кіраўніцтвам фотаздымкам на Дошцы Гонару названай гаспадаркі.

Па заканчэнні дзевятага класа ў тысяча дзевяцьсот семдзесят сёмым годзе Мэлс Харысавіч Ісхакаў для трэніровак выдзяліў мне лыжаролеры і спартыўны гоначны веласіпед (звестка ад аўтара). Калі-нікалі выбіраўся я на тым веласіпедзе з вёскі Скарынічы да кальцавой дарогі і, аб’язджаючы вакол Мінска, вяртаўся дадому альбо круціў педалі да Ждановічаў і, абгінаючы на веласіпедзе вакол Мінскага мора, увабіраючы ў сябе прыгажосць навакольных краявідаў, уздымаў узровень сваёй фізічнай падрыхтоўкі.

11.

У сямідзесятых гадах мінулага стагоддзя вучні Смілавіцкай сярэдняй школы нумар адзін, захапляючыся заняткамі фізкультуры і спорта, удасканальвалі ўзровень свайго спартыўнага

майстэрства пад кіраўніцтвам настаўніка фізічнай культуры. У вясенні і восеньскі перыяды навучання настаўнік фізкультуры, падбіраючы здольных вучняў школы, падрыхтоўваў каманды для ўдзелу ў спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы, комплексу нормаў ГПА на першынствы Чэрвеньскага раёна. Выступаючы на высокім узроўні, вучні Смілавіцкай школы, быўшы уключанымі ў зборныя каманды Чэрвеньскага раёна, паспяхова выступалі на спаборніцтвах і на першынствах Мінскай вобласці. У зімовы перыяд хлопцы і дзяўчаты, меўшыя здольнасці да заняткаў лыжным спортам, пад кіраўніцтвам настаўніка фізкультуры праходзілі падрыхтоўку да спаборніцтваў па лыжным спорце на першынства Чэрвеньскага раёна і па узроўню падрыхтоўкі траплялі, у прыватнасці Алег Латышаў, у зборныя каманды раёна і паспяхова выступалі ў спаборніцтвах па лыжных гонках на першынствах Мінскай вобласці.

Пад час навучання ў Смілавіцкім ПТВ-203 па спецыяльнасці «бульдазерыст», Алег Латышаў, на летні перыяд канікулаў браў ў настаўніка фізкультуры навучальнай установы лыжаролеры, самастойна трэніраваўся на іх на шашы, рыхтуючыся да зімовых спаборніцтваў па лыжным спорце.



*Вучні Смілавіцкай СШ нумар адзін на трэніроўцы. Злева направа: Тарасевіч Анатоль, Цялюк Яўген, Іваноў Уладзімір, Латышаў Алег*

Працуючы ў васьмідзесятыя гады мінулага стагоддзя бульдазерыстам на будаўніцтве Мінскай ЦЭЦ-5, Алег Латышаў актыўна ўддзельнічаў у фізкультурна-масавых мерапрыемствах і спартыўных спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы, вольнай барац-



*Спаборніцтвы па вольнай барацьбе. Справа – Алег Латышаў. П. Дружны, пачатак 1980-х гг.*

бе, лыжных гонках. У спаборніцтвах па трыятлоне на першынствах сярод прадпрыемстваў энергетычнай галіны, уключаючых у сябе плаванне, стральбу з дробнакалібернай вінтоўкі і бег. З тых маладых гадоў і ў цяперашні час Алег Латышаў – заўзяты прыхільнік актыўнага ладу жыцця.

Аматар-фізкультурнік Елісейкін Канстанцін Іванавіч у цяперашні час, у дзве тысячы пятнаццатым годзе, ва ўзросце маладога пенсіянера ў шэсцьдзесят шэсць гадоў рэгулярна праводзіць прагулкі на веласіпедзе і раніцой прабежкі да Мацярынскага возера, што знаходзіцца непадалёку ад п. Дружны Пухавіцкага раёна, дзе шаноўны спадар і пражывае, а пры спрыяльным надвор'і, купаннем і заняткамі агульнымі фізічнымі практыкаваннямі. У зімовы перыяд, калі-нікалі выбіраючыся пахадзіць на лыжах, з часу адкрыцця Цэнтра гарналыжнага спорту «Сілічы», Канстанцін Іванавіч рэгулярна наведваецца




*Удзельнікі спаборніцтваў па трыятлоне. Першы злева – Алег Латышаў. Г. Мінск, пачатак 1980-х гг.*

на горналыжныя трасы маляўнічай мясцовасці Лагойшчыны. Захапленне горнымі лыжамі ў падлеткавым узросце, нарадзіўшагася і пражываючага ў Горкаўскай вобласці, прывілася Канстанціну Іванавічу ад старэйшых, захапляючыхся горнымі



*Спаборніцтвы па трыятлоне. Плаванне. Справа на дарожцы – Алег Латышаў. Г. Мінск, пачатак 1980-х гг.*

лыжамі навуковых супрацоўнікаў, якія і падаравалі Колe Елісейкіну першыя сапраўдныя, у той час драўляныя, горныя лыжы. З пяцідзесяціпяцігадовага ўзросту наведваючыся на горналыжныя трасы «Сілічаў», Канстанцін Іванавіч завёў цікавыя знаёмствы з аматарамі горных лыжаў з Беларусі, Расіі, іншых краінаў, у хуткім часе з людзьмі, аб'яднанымі агульным захапленнем, пачаў наведваццa ў цэнтры горналыжнага спорту Карпатаў і Расіі.



*Канстанцін Іванавіч Елісейкін. Г. Чарна Клёва. Карпаты. 2012 г.*

У зіму дзве тысячы пятнаццатага года, станоўча адклінкуўшыся на прапанову аднаго маладога пенсіянера з г. Мінска, сябра Уладзіміра Даніленкі, з якім пазнаёміліся на трасах «Сілічаў» сем год таму і які па ўзросце старэй-



*Уладзімір Даніленка, 77 гадоў. Г. Сочы, "Чырвоная Паляна". Гарналыжны цэнтр "Роза Хутар". 2015 г.*

шы за Канстанціна Іванавіча на дзесяць гадоў, у складзе гурта з некалькіх маладых пенсіянераў, на чале з сямідзесяцісямігадовым Уладзімірам, Канстанцін Іванавіч выправіўся пакатацца на горных лыжах на алімпійскіх трасах г. Сочы з пражываннем у санаторыі «Беларусь».

Выдатныя ўмовы, маляўнічая мясцовасць, добра прыгатаваныя горналыжныя трасы «Роза Хутара», дзе праводзіліся спартыўныя спаборніцтвы Сочынскай алімпіяды, station ноўчы ўплыў кола зносінаў знаёмых таварышаў і новых сяброў



*Канстанцін Іванавіч Елісейкін. Г. Сочы, "Чырвоная Паляна". Гарналыжны цэнтр "Роза Хутар". 2015 г.*

на агульны настрой аматараў актыўнага адпачынку, пазітыўны водгук кіраўніка гурта сямідзесяцісямігадовага Уладзіміра Даніленкі наконт таго, што Канстанцін Іванавіч праз сем гадоў, як Уладзімір і выказываў думку пры першым знаёмстве, катаецца на горных лыжах належным чынам, выклікалі жаданне ва ўдзельнікаў зкамплектаванага гурта маладых пенсіянераў падтрымліваць і надалей сувязі на



*Уладзімір Даніленка. Карпаты, 2009 г.*

падставе агульнага захаплення.

12.

Усё далей і далей адводзячы нас ад вытокаў, час вяртае ва ўспаміны, у тыя гады бесклапотнасці, юнацкага максімалізма і пошуку сябе. Калі-нікалі пры рэдкіх сустрэчах з былымі аднакласнікамі, паглядаючы адзін аднему адкрыта ў вочы, з разуменнем адзначаеш, што ішлі мы сваімі цікавымі па жыцці шляхамі, стварыўшы кожны свой падмурак для ўдасканальвання сябе і выбару з шэрагу магчымасцей развіцця свайго, адпаведнага табе, накірунку. Са зменай месца жыхарства і вандроўным вобразам жыцця, звязаным, у першую чаргу, з узнікшай з чагосьці калісьці ў юнацтве марай пабачыць свет, у тых мясцінах, дзе падрастаў і фарміраваўся, у сваім тым асяроддзі бываць даводзіцца, нажаль, рэдка. З аднакласнікам Мікалаем Багуцкім не бачыліся з апошняга разу сустрэчы гадоў дзесьці васемнаццаць-дваццаць, з сярэдзіны дзевяностых мінулага стагоддзя, ды пры сустрэчы на адным з аб'ектаў адчуванне было, нібыта апошняя сустрэча была напярэданні. З Віктарам Безменам, сустрэўшыся вясной дзве тысячы пятнаццатага года, не бачыліся з часу заканчэння навучання ў школе. Здаецца, колькі гадоў мінула, а пры сустрэчы мы, усё тыя ж аднакласнікі, шмат чаго цікавага распавядалі адзін аднаму. Неяк гадоў дванаццаць таму, завітаўшы з вандроўкі па свету ў вёску Скарынічы і ідучы да бацькоўчкай сядзібы, сустрэліся з Аляксандрам Якушонкам, сябрам-аднакласнікам з якім разам займаліся


*Сябры Аляксандр Якушонак і Валеры Скакун. Экскурсійная паездка класам у г. Брэст. 1974 г.*

лыжным спортам. Аляксандар пры сустрэчы выказаў і маю думку, каб як бы калі-небудзь сабрацца, зразумела, за чарачкай, ёсць нам, што ўзгадаць і аб чым пагаманіць.

Па прызыву ў войска на тэрміновую службу Аляксандар Якушонак актыўна ўдзельнічаў у вайсковых спаборніцтвах па лыжных гонках, біятлоне, кросавых вайсковых спартыўных дысцыплінах, прыкладных вайсковых відах спорту.


*Аляксандр Якушонак, пераможца вайсковых спаборніцтваў у кросе на 1500 метраў*

Становячыся пераможцам у спаборніцтвах па лыжных гонках на першынства войскаў супрацьпаветранай абароны, Аляксандар Якушонак уваходзіў у дзесятку мацнейшых на першынствах сярод радоў войск па лыжных гонках Чырвонасцяжнай Беларускай Ваеннай акругі. У цяперашні час афіцэр запаса, старшы лейтэнант Аляксандар Якушонак, актыўна займаючыся фізкультурай, падтрымлівае выдатную спартыўную форму, як і яго сябра-аднакласнік, афіцэр запа-


Валеры Скакун. Вайсковыя спаборніцтвы па лыжных гонках

са, старшы лейтэнант Валеры Скакун, аўтар аповесці-расповедаў. Пад час тэрміновай службы ў войску, перамагаючы на першынствах рода войскаў па лыжных гонках, Валеры Скакун на першынстве Чырвонасцяжнай Беларускай Ваеннай акругі ў лыжнай гонцы на пятнаццаць кіламетраў, патрапіўшы ў тройку прызёраў, заняў ганаровае трэцяе месца.

Мікалай Багуцкі з трэцяга класа пяць гадоў займаўся ў Сенніцкай музычнай школе па класе баяна, якую паспяхова скончыў, прайшоўшы поўны пяцігадовы курс навучання. Паралельна заняткам у музычнай школе, з шостага класа Мікалай сур'ёзна займаўся спортам у секцыі бокса. Выкладчык музыкі, прыкмеціўшы, што яго здольны вучань прыходзіць на заняткі то з ранкамі, то з сінякамі, неяк пацікавіўся, маўляў, дзе ды, як ты, Мікалай, займаючыся сур'ёзна і паспяхова мастацтвам, нарываешся на такія прыгоды і пачуўшы ў адказ, што гэта не прыгоды, а сур'ёзны занатак боксам, вельмі быў здзіўлены. Для выкладчыка музыкі заняткі мастацтвам і спортам, у прыватнасці боксам, падаліся несумяшчальнымі, на што Мікалай выказаў сваю думку наконт таго, што гарманічна развітая асоба мае здольнасці праяўляць сябе ў розных накірунках дзейнасці. Па заканчэнні навучання, у восьмым класе сярэдняй школы зрабіўшы свой выбар, Мікалай Багуцкі паступіў на навучанне ў Мінскі энергетычны тэхнікум, дзе актыўна ўдзельнічаў у грамадскіх, фізкультурна-спартыўных мерапрыемствах сярод моладзі. Удзельнічаючы ў складзе збор-

най каманды энергатэхнікума ў рэспубліканскай ваенна-спартыўнай гульні «Зарніца», што ў адзін з тых гадоў праводзілася ў г. Брэсце, падрыхтаванай выкладчыкам ПВП маёрам ваенна-паветраных сілаў Бабковым, ва ўпартай барацьбе Мікалай Багуцкі разам з таварышамі па камандзе занялі ганаровае трэцяе месца сярод сярэдніх спецыяльных навучальных установаў Беларусі. Па заканчэнні энергатэхнікума, працуючы электраманцёрам буйнога прадпрыемства энергетычнай галіны «Белэнергарэмналадка», Мікалай Багуцкі, захапіўшыся зімовымі відамі спорту, паспяхова прымаў удзелы ў спаборніцтвах па зімовым шматбор'і, куды ўваходзяць падцягванне на перакладзіне, стральба з дробнакаліберная вінтоўкі і лыжная гонка, на першынствах сярод прадпрыемстваў энергетычнай галіны і ў іншых спаборніцтвах. Праз тры гады працы кандыдатуру Мікалая Багуцкага, былога ў той час намесніка сакратара камсамольскай арганізацыі, з прапановы Першамайскага райкома камсамола г. Мінска зацвердзілі на пасаду вызваленага сакратара камсамольскай арганізацыі прадпрыемства «Белэнергарэмналадка», на якой Мікалай добрасумленна працаваў пэўны тэрмін. Сумяшчаючы працу, актыўны лад жыцця і вучобу на вячэрнім аддзяленні ВНУ, у тысяча дзевяцьсот восемдзесят шостым годзе Мікалай Багуцкі паспяхова скончыў навучанне на энергетычным факультэце Беларускага палітэхнічнага інстытута.

Удзельнічаючы ў спартыўных спаборніцтвах на першынства сярод прадпрыемстваў энергетычнай галіны і працоўных спартакіядах па летнім шматбор'і ГПА, пашыраючы сферу сваёй дзейнасці, Мікалай Багуцкі далучыўся да масавых лёгкаатлетычных прабегаў на дзесяць і дваццаць кіламетраў, праводзячыхся у той час Мінскім клубам аматараў бегу пад старшынствам Кізіла. У прыватнасці, удзельнічаючы ў адным з такіх прабегаў на дзесяць кіламетраў, што ў тысяча дзевяцьсот восемдзесят восьмым годзе праводзіўся на трасе лесапаркавай зоны са стартам і фінішам каля спартыўнага комплекса «Пра-

цоўныя рэзервы», які знаходзіцца ў мікраараёне «Зялёны Луг» г. Мінска, Мікалай Багуцкі па сваёй узроставай групе стаў прызёрам, заняўшы ганаровае трэцяе месца. У васьмідзесятыя гады мінулага стагоддзя пашанцавала і мне, (звестка ад аўтара), разам з сябрамі-лыжнікамі два разы ўдзельнічаць у такіх масавых прабегах. Адзін – па праспекце Машэрава, зараз Пераможцаў, на дваццаць кіламетраў са стартам і фінішам каля Палаца Спорта, другі – на Дзень Перамогі 9 Мая са стартам з Плошчы Перамогі і фінішам каля Кургана Славы.

Актыўныя ўдзельнікі масавых забегаў і члены Мінскага клуба пастаянна і паспяхова, па запрашэннях, прымалі ўдзел у масавых прабегах па кальцу гарадоў-герояў Савецкага Саюза, аддаючы даніну памяці героям-абаронцам Айчыны.

А пачатку васьмідзесятых гадоў дваццатага стагоддзя, захапіўшыся пешым горным турызмам, Мікалай Багуцкі, перш чым пайсці ў першы свой пешы горны паход працяжнасцю ў сто дваццаць шэсць кіламетраў, з прысваеннем па праходжанні першай катэгорыі складанасці, некалькі разоў выпраўляўся ў пробныя паходы на два-чатыры дні па тэрыторыі Беларусі. Праходзілі яны ў складзе гуртоў па шэсць чалавек з інструктарам па турызму Мінскага абласнога савета па турызму і экскурсіях, у якіх для высвятлення сумяшчальнасьці членаў гурта па чалавечым фактары інструктарам наўмысна ствараліся цяжкасці і складанасці ў праходжанні намечанага маршрута. Паступова скамплектаваныя гурты, атрымаўшы дазвол ад Мінскага абласнога савета па турызму і экскурсіях, па замове выпраўляліся ў пошуку ўражанняў і прыгод на Цэнтральны і Усходні Каўказ.

Увайшоўшы ў склад сфарміраванага гурта колькасьцю ў шэсць чалавек, у які па выніках пробных паходаў па Беларусі з пяццю мужчынамі была ўключана аматар жанчына Надзея Дзяругіна, Мікалай Багуцкі разам з таварышамі, атрымаўшы па замове карту групавога маршрута пешага горнага турызма, прыбыў на Усходні Каўказ да месца старту ад горнага сяла Каз-

бегі. Разбіўшы базавы палатачны лагер, члены гурта, ведаючы з расповедаў бывалых, прыняліся за падрыхтоўку рыштункаў. Падгонка рамянёў рукзакоў, спартыўнай вопраткі, спецыяльнага горнага абутку – галоўная складальная поспеху пераадолення цяжкасцей пешага паходу па гарыстай мясцовасці. Пры падрыхтоўцы да пахода члены гурта прыслухоўваліся да парадаў вопытнай, бываўшай у гарах Надзеі Дзяругінай, менавіта Надзея састаўляла рацыён харчавання і прызначала, што каму з прыпасаў прыхапіць з сабой, каб у паходзе ежа, меўшы меншую вагу, адпавядала каларыйнасьці харчавання ў залежнасці ад звышнагрузак на арганізм у гарыстай мясцовасці.

Пад час паходу, калі спускаліся восем гадзін запар, сыходзячы па галечных камянях, па маршруце да кантрольнай адметкі ў горным паселішчы, у аднаго з членаў гурта ад непадабраных пад сябе старых горных бацінкаў да крыві сцёрліся пяткі ступеняў ног і ад непадагнаных належным чынам рамянёў рукзака да крывавых мазалёў нацерліся плечы. Па ўмовах пераадолення



*Згортванне базавага лагера. Цэнтральны і Усходні Каўказ. Пачатак 1980-х гг.*

вызначанага маршруту ў шасці кантрольных пунктах павінны быць зроблены фотаздымкі склада ўсіх членаў гурта, па ўмовах прысваення катэгорыі складанасці, да фініша гурт павінен дайсці ў поўным складзе з паведамленнем на кантрольных адметках аб прыбыцці і адбыцці на маршрут у адпаведныя мясцовыя органы.

Зрабіўшы фотаздымак усіх членаў гурта, выправіўшы непадрыхтаванага таварыша лячыцца дадому, аказаўшы першую патрэбную медыцынскую дапамогу ў горным паселішчы, разбіўшы палатачны легер для адпачынку, астатнія пяць удзельнікаў паходу ўвечары засумавалі. Далей пераадольваць цяжкасці і складанасці паходу з прысваеннем па заканчэнні катэгорыі складанасці не мела сэнсу – не залічыцца. Станоўчае вырашэнне пытання працягу ісці далей па заяўленым маршруце выявілася на наступны дзень, калі ў горным паселішчы на кантрольнай адметцы з'явіўся гурт горнага велатурызма з г. Адэсы, у якога ў аднаго з членаў каманды ад знаходжання ў гарыстай мясцовасці (недахоп кіслароду ў сувязі з высокагор'ем), цела пабілася ў чырвоныя крапіны і яму патрэбна было тэрмінова вяртацца дадому. Графік праходжання гурта пешага горнага турызма ў дадзенай мясцовасці супадаў з графікам гурта горнага велатурызма па кантрольных адметках і часе. У склаўшымся становішчы, зразумела, на дапамогу прыйшла ўзаемавыручка і супрацоўніцтва. Да заканчэння сто дваццаці шасці кіламетровага пешага горнага маршрута, на кантрольных адметках абменьваючыся членамі, рабілі адпаведныя фотаздымкі на наяўнасць поўных складаў. Маршрут гурта адэсітаў горнага велатурызма значна працяжней, чым пешага, ды адэсіты, разбіўшы лагер для адпачынку на апошняй адзнацы пешага турызма, не сумавалі, спадзяючыся, што нейкае выйсце на застаўшыхся кантрольных адметках знойдзецца.

Праз пэўны тэрмін члены адэскага гурта горнага велатурызма, даслаўшы ліст, павіншавалі беларускіх сяброў з па-



*Мікалай Багуцкі. Цэнтральны і Усходні Каўказ. Пачатак 1980-х гг.*

спяховым пераадоленнем маршрута пешага горнага турызма і прысваеннем першай катэгорыі складанасці, падзякаваўшы за ўзаемавыручку і супрацоўніцтва, і паведамілі, што паспяхова завяршылі праходжанне свайго маршрута горнага велатурызма з прысваеннем адпаведнай катэгорыі складанасці. Працягваючы захапленне пешым горным турызмам, гуртом пасля некалькіх пробных паходаў па тэрыторыі Беларусі, патрапіўшы ў сфарміраваны гурт пешага горнага турызма і атрымаўшы па замове карту маршрута на наступны



*Мікалай Багуцкі. Цэнтральны і Усходні Каўказ. Пачатак 1980-х гг.*



*Мікалай Багуцкі. 2015 г.*

тысяча дзевяцьсот восемдзесят трэці год, Мікалай Багуцкі разам з таварышамі нанова сфарміраванага гурта зноў выправіўся на Цэнтральны і Усходні Каўказ для пераадолення сто трыццаць шэсць кіламетраў пешага горнага маршрута другой катэгорыі складанасці. Паспяхова ў дакладны тэрмін, пераадолеўшы выпрабаванні, з болей складанымі пераваламі гуртом у шэсць удзельнікаў, Мікалай Багуцкі разам з таварышамі атрымаў пасведчанне аб прысваенні праходжання гуртом маршрута пешага горнага турызма другой катэгорыі складанасці.

Напрыканцы семідзесятых і ў васьмідзесятыя гады мінулага стагоддзя, працаваўшы выкладчыкам фізкультуры Сенніцкага сельскагаспадарчага тэхнікума, а затым старшынёй Сенніцкага сельскага савета Рамейка, захапляючыся спортам, па дамове дастаўляў з РСК «Раўбічы» снегаход «Буран», якім пракладвалася лыжная траса даўжынёй у пяць кіламетраў на дзве нарэзаныя лыжні, што ахоплівала маляўнічыя мясцовасці каля п. Юбілейны, в. Сенніца, в. Капеявічы і ўздоўж чыгуначнага насыпу ад філіяла БДУ, даходзячы да вёскі Скарынічы з замыканнем лыжні на пачатку межавання п. Юбілейны і в. Сенніца. На той якасна прыгатаванай лыжнай трасе, апрача масавай хадзьбы на лыжах мясцовых захапляльнікаў фізкультуры і спорту, праводзіліся рознага ўзроўню спаборніцтвы па лыжных гоках, у адных з якіх пашанцавала ўдзельнічаць і мне (звестка ад аўтара).

Калі-нікалі пры навучанні ў Мінскім энергетычным тэхнікуме падыходзіў я на заняткі па лыжным спорце да настаўніка Мэлса Харысавіча Ісхакава на трасу, пракладзеную па лесапаласе каля возера в. Сенніца да в. Капеявічы. У вясну тысяча дзевяцьсот семдзесят восьмага года, па заканчэнні зімовага сезона спаборніцтваў, я тады вучыўся ў дзесятым класе школы, на трэніроўцы разам з настаўнікам Мэлсам Харысавічам каталіся мы, выхаванцы, з гары, з'язджаючы з узвышша ў накірунку замёрзшага Сенніцкага возера. У Вольгі Зайкінай, пры падкатванні да мяжы возера, на хуткасці аб штосьці тармазнуліся лыжы, і інэрцыйнай сілай, паволі грацыёзна, яе напачатку падкінула ўгору, а потым, нібыта даўшы нырца, уніз галавой праламаўшы лёд, узровень вады за зіму пад лёдам значна падсеў, зазірнула Вольга ў падлёдавую пустэчу. Мэлс Харысавіч, хуценька падскочыўшы, дапамог вызваліць Вользе галаву з падлёдавага палону. Абыйшлося ўсё добра, Вольга, усміхаючыся ветлівай усмешкай, варочаючы злёгку па баках галавой, паправіўшы на далонях раменьчыкі лыжных палак, усміхаючыся, пачала ўздымацца ўгару, каб у чарговы раз сігануць уніз са стромы.

У тыя гады, у снежныя, марозныя зімы па Скарынічскаму лесу, як называюць яго жыхары пасёлка Юбілейны і вёскі Сенніца, а жыхары дзвюх вёсак Скарынічы называюць яго Прылуцкім, бо далей за лесам знаходзіцца п. Прылукі, па шматлікіх дарожках ды сцежках заўсёды была накатаная лыжня. Туды наведваліся захапляючыяся лыжным спортам жыхары з паселішчаў, што знаходзіліся паблізу, і каталіся па лыжні, праходзячай па маляўнічых краявідах, жыхары мікрараёнаў Курасоўшчына і вуліцы Ландара г. Мінска. На фотаздымку, зробленым на пачатку васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя, – выбраўшыся ў лыжны паход у Скарыніцка – Прылуцкі лес былыя вучні Сенніцкай сярэдняй школы.

Трое з іх – мае былыя аднакласнікі: Віктар Вайцяховіч, Мікола Багуцкі, Віктар Дзяргай. Ала Мірутка, родная сястра

Юры Міруткі, аднакласніка, таксама займалася пад час навучання ў школе ў секцыі лыжнага спорту. Як і Віктар Дзяргай, абодва паспяхова выступалі ў свой час на спаборніцтвах па лыжных гонках. Разам з імі – мой сябра і аднакласнік па пачат-



*У лыжным паходзе былыя вучні Сенніцкай СШ Мінскага раёна: Віктар Вайцеховіч, Сяргей Кавалёў, Мікалай Багуцкі, Ала Мірутка, Ірына Бусло, Віктар Дзяргай, Алена Корзун*

ковай Скарыніцкай школе Сяргей Кавалёў з вёскі Скарынічы, закончыўшы навучанне ў сярэдняй школе ў п. Прылукі Мінскага раёна. Алена Корзун і Ірына Бусло, як і Ала Мірутка, выпускніцы школы пачатку восьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя. Маці Ірыны Бусло Таіса Уладзіміраўна Бусло ў свой час выкладала ў Сенніцкай сярэдняй школе Мінскага раёну ўрокі беларускай мовы і беларускай літаратуры і прывівала вучням любоў да беларускага слова, беларускай мовы, да свайго роднага. Сяргей Кавалёў і Юра Мірутка ў тысяча дзевяцьсот восемдзесят шостым годзе прымалі ўдзел у праводзячымся ад паселішча Баравая да РСК «Раўбічы» лыжным прабегу на пятнаццаць кіламетраў. Станоўчыя ўражанні ад пераадолення ў лыжным караване той пятнадцацікіламетровай дыстанцыі засталіся добрым успамінам на ўсе жыццё. Пераадоленне – гэта заўсёды прыступка наверх, да развіцця.

Разбегліся ўсе па свеце ў пошуках сваёй ісціны, сутнасці жыцця, таму сустрэчы з аднакласнікамі, якіх болей бачыш на здымках фотаальбому «Мае школьныя гады», падаюцца знакавымі. Быццам менавіта ў гэты час лёсам і нагадана вось гэта такая выпадковая сустрэча. З чагосьці ў васьмідзесятыя гады так



*Шура Лобан*

і адчувалася пры сустрэчы з дзвюма сяброўкамі-аднакласніцамі Ірынай Круглік і Шурай Лобан, заўсёды знаходзілася, аб чым цікавым пагаманіць. Памятаю, неяк пры навучанні ў восьмым класе школы на перапынку паміж урокамі Мікалай Багуцкі, ўзняўшыся з месца з-за сваёй парты справа, павярнуўшыся крыху ўлева і кінуўшы погляд на Шуру Лобан, устаўшую з-за сваёй парты позаду злева, крыху ўзняўшы правую руку угору, гучна прамовіў, маўляў, Шура. Шура Лобан, трымаючы перад сабой кніжку абедзвюма рукамі, уважліва перавёўшы погляд на Мікалая, запытала, маўляў, што? Мікалай, зрабіўшы сур'ёзны выраз твару, паглядаючы на Шуру, узняўшы і левую руку ды потым абедзве рукі вышэй угору, артыстычна, стрымана-працяжна прамовіў фразу Астапа Бэндзера з кінастужкі, маўляў, калі мы будзем дзяліць нашы грошы? Смеху ў класе гэткі жарт Мікалая не выклікаў, але наступны ўрок пачаўся на прыўзнятым агульным настроі.

Несумненна, што на такія станоўчыя ўспаміны праз гады паўплывала самаадданая праца класных кіраўнікоў нашага 10 «Б» Веры Пятроўны Думновай, выкладаўшай урокі рускай мовы і літаратуры, а таксама выкладчыцы матэматыкі і класнага кіраўніка паралельнага 10 «А» класа, і канешне, добрасумленная праца ўсяго настаўніцкага калектыва школы.

У сярэдзіне дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя зноў жа выпадкова-знакава на чыгуначным вакзале сталіцы сустрэўся я з Ірынай Круглік. Не вяртаючыся ва ўспаміны, гаманілі болей пра сучаснае. Дэфіцытная мітусня, разбяганне па вуглах навідавоку зменьвала лад жыцця, выклікаючы шкадаванне наконт таго, што на штосьці мы пачынаем забывацца. Чарговая выпад-

кова-знакавая сустрэча з Ірынай адбылася ў лета дзве тысячы трынаццатага года ў памяшканні чыгуначнага вакзала Мінска ў файе тунэля-перахода да чыгуначных платформаў. Пачуўшы знаёмы голас, азірнуўшыся, заўважыў што Ірына Круглік тлумачыць двум хлапчукам, па ўзросце гадоў мо па дзесяць, з рукзачкамі за плячыма, як кудысьці ім патрэбна прайсьці. Дзеці тыя, уважліва паглядаючы, па майму ўраджанню ці то на матулю, ці на бабулю, уцяміўшы, куды ім патрэбна рушыць, з падзякай матлянуўшы Ірыне галовамі, спешна патрусіўшы ў патрэбным накірунку, зніклі з відавоку паміж бадзяючыхся па файе тунэля пасажыраў.

Са словамі: «Прывітанне, дзяўчынка!» – паўстаў я перад Ірынай, усміхаючыся, павітаўшайся са мной, і звярнуўся з пытаннем, маўляў, гэта хто, дзеці, унукі? «Ды якія дзеці, гэта во малыя заблукалі ды з чагосьці ў мяне запыталіся, як ім прайсці, куды патрэбна, растлумачыла, ды й панесліся такія, шустрыя». Пакруціўшы крыху па баках галавой, ветліва ўсміхаючыся, задала мне Ірына пытанне: «А што, я гэтак яшчэ выглядаю, што ты адразу і пазнаў мяне?» Я адказаў, што напачатку пачуў знаёмы голас паблізу і, кінуўшы погляд, адразу і пазнаў. Нажаль, доўга паразмаўляць не давялося, бо хутка па часе адыходзіў мой электрацягнік. У псіхолагаў ёсць тэст наконт таго, ці часта незнаёмыя вам людзі аб чымсьці ў вас пытаюцца і станоўчы бал выстаўляецца пры адказе «нярэдка».


*Ірына Круглік*

Па заканчэнні ў 1978 годзе Сенніцкай сярэдняй школы, паступіўшы ў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі на інжынерна-педагагічны факультэт, Ірына Круглік у 1983 годзе паспяхова скончыла навучанне ў ВНУ, атрымаўшы кваліфікацыю «інжынер-выкладчык сельскагаспадарчых дысцыплінаў».

Працуючы выкладчыкам спецыяльных дысцыплінаў у Капыльскім ПТВ-67 з 1983 па 1985 гады, даючы веды навучэнцам навучальнай установы і павышаючы ўзровень свайго прафесійнага майстэрства, з 1985 года Ірына Круглік працавала інспектарам у Дзяржаўным камітэце БССР па прафесійна-тэхнічнай адукацыі. У цяперашні час, у 2015годзе, выкарыстоўваючы свае веды і вопыт, займаючыся пытаннямі прафесійна-тэхнічнай адукацыі, Ірына Круглік працуе кансультантам кіравання прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Пасля сустрэчы ў вясну 2015 года з Віктарам Безменам і Мікалаем Багуцкім у пасёлку Юбілейны, увечары паруляваў я дадому, клопаты назаўтра не дазволілі мне застацца на большы тэрмін. Мікалай Багуцкі потым паведаміў мне, што Віктар Безмен выказаў яму сваю думку наконт таго, што трэба было мяне яшчэ прытрымаць, назаўтра ж выхадны дзень. З трэцяга класа навучання ў Сенніцкай сярэдняй школе Мінскага раёна і сур'ёзна займаючыся футболам там жа, у вёсцы Сенніца, дзе першым трэнерам быў Каўфман Барыс Навумавіч, гуляў Віктар Безмен за каманду Мінскага раёну. Набіраючагася вопыту, спартыўнага майстэрства і валодання футбольным мячом, перспектыўнага выхаванца трэнера Каўфмана Барыса Навумавіча, падлетка Віктара Безмена запрасілі займацца футболам у спецыялізаваную дзіцяча-юнацкую школу алімпійскага рэзерва «Дынама Мінск», дзе, прыбаўляючы з кожным наступным спартыўным сезонам, Віктар Безмен развіваў і ўдасканальваў сваё спартыўнае майстэрства. Па заканчэнні Сярэдняй школы, пэўны тэрмін працуючы на ПА «Інтэграл» і гуляючы ў футбол за каманду СК «Арбіта», у 1979 і 1980 гадах у зімовы перыяд Віктар Безмен паспяхова выходзіў на лёд хакейных пляцовак, гуляючы ў асноўным складзе каманды СК «Арбіта» па хакею. Пагадзіўшыся з прапановай гуляць у футбол у чэмпіянаце СССР другой лігі за футбольную каманду «Дзвіна», перабраўшыся на жыхарства ў г. Віцебск, павышаючы і удасканальваючы ўзровень свайго спартыўнага



*Віктар Безмен. Г. Віцебск, стадыён "Дынама". Гульня чэмпіянату Беларусі. 1997 г.*

майстэрства, у 1996 годзе Віктар Безмен быў уключаны ў асноўны склад зборнай каманды Беларусі па футболу.

З матэрыялаў, прадастаўленых Віктарам Безменам, на фотаздымках – поўныя склады камандаў, удзельнікаў адборачных гульняў да чэмпіянату свету, зборнай каманды Беларусі і зборнай каманды Шатландыі, у гульні, што праводзілася ў г. Мінску ў чэрвені тысяча дзевяцьсот дзевяноста сёмага года.



*Зборная каманда Беларусі па футболу. Трэці рад, шосты злева направа – Віктар Безмен. Г. Мінск, чэрвень 1997 г. Склад зборнай Беларусі: Андрэй Сацункевіч, Валерый Шанталосаў, Сяргей Гурэнка, Сяргей Штанюк, Эрык Яхімовіч, Андрэй Лаўрык, Валянцін Бялькевіч, Вячаслаў Герашчанка, Аляксандр Кульчый, Радзіслаў Арлоўскі, Сяргей Герасімец, Ігар Тарлоўскі, Андрэй Астроўскі, Андрэй Доўнар, Уладзімір Макоўскі, Міраслаў Рамашчанка, Віктар Безмен, Андрэй Хлебасолаў, Дзмітрый Балашоў*



*Зборная каманда Шатландыі,*
*г. Мінск, 1997 г.*

Да гэтай гульні быў выпушчаны буклет, у якім ад імя Беларускай федэрацыі футбола і футбалістаў зборнай каманды Беларусі, напісана запрашэнне балельшчыкам прыйсці на Мінскі стадыён «Дынама» на, несумненна, прадстаячы цікавы футбольны матч, ёсць там і прывітанне да кіраўніцтва і футбалістаў зборнай каманды Шатландыі, якая лічыцца адной з мацнейшых каманд Еўропы, а на пачатку буклета да усіх звяртаўся прэзідэнт Беларускай федэрацыі футбола Яўген Шунтаў.



*Прэзідэнт БФФ*
*Яўген Шунтаў*

У буклеце, выпушчаным да футбольнага матча зборнай камандаў Беларусі і Шатландыі, у шэрагу цікавай інфармацыі прадстаўлены звесткі пра трэнераў, у прыватнасці Беларусі: Міхаіл Вергеенка (з восені 1992 года па лета 1994 года), Сяргей Бароўскі (з лета 1994 года), Міхаіл Вергеенка (з 1997 года). Таксама прадстаўлены ўсе капітаны зборнай каманды Беларусі і па колькі матчаў: Андрэй Зыгмантовіч – 9 матчаў, Валеры Шанталосаў – 6, Андрэй Сацункевіч – 5, Сяргей

Алейнікаў, Віктар Безмен і Уладзімір Журавель – па 2, Генадзь Лясун – 1.



Віктар Безмен. Г. Віцебск, стадыён "Дынама". Гульня чэмпіяната Беларусі. 1997 г.

За перыяд уваходу у асноўны склад зборнай каманды Беларусі Віктар Безмен разам з таварышамі па камандзе паспяхова гуляў у футбол у адборачных матчах да чэмпіянату свету, чэмпіянату Еўропы і ў таварыскіх сустрэчах са зборнымі камандамі розных футбольных краін.



Справа ў атацы – Віктар Безмен. Таварыская гульня: зборная Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў – зборная Беларусі. Германія, Мюнхен, 1996 г.

З лістападу 1997 года, паступіўшы на службу ў Віцебскае абласное кіраванне Міністэрства надзвычайных становішчаў па пасаду галоўнага спецыяліста аддзела службы баегатоўнасці падраздзяленняў, Віктар Безмен сумленна, самаадданна працуючы, актыўна, асабістым прыкладам з патрабаваннем да сябе і падначаленых падтрымліваў і ўдасканальваў баегатоўнасць асабістага склада. Рэгулярна выступаючы ў чэмпіянаце МНС па міні-футболу, у 2005 годзе Віктар Безмен далучыўся да ўдзелу ў спаборніцтвах па лыжных гонках, уключаных у штогадовую спартакіяду МНС.



*Чэмпіянат МНС РБ па лыжных гонках, г. Віцебск, 2009 г. Віктар Безмен – срэбраны прызёр*

Зімовы чэмпіянат МНС па лыжных гонках штогод праводзіцца на поўначы Беларусі ў г. Віцебску, у сувязі са спрыяльнымі кліматычнымі ўмовамі на наяўнасць снега. На праводзячыхся чэмпіянатах МНС рэспублікі па лыжных гонках па ўзроставым групам Віктар Безмен неаднаразова трапляў на п’едэстал, уваходзячы па выніках праходжання дыстанцый у тройку прызёраў.



*Віктар Безмен. Чэмпіянат МНС РБ па лыжных гонках, г. Віцебск, 2009 г.*

Па выхадзе на пенсію па выслузе гадоў у 2011 годзе, галоўны спецыяліст аддзела службы баегатоўнасці падраздзяленняў Віцебскага абласнога кіравання МНС, падпалкоўнік Віктар Безмен у цяперашні час працуе дырэктарам спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерва па футболу фізкультурнага клуба «Віцебск».



*Чэмпіянат МНС РБ па лыжных гонках, г. Віцебск, 2009 г. Віктар Безмен – срэбраны прызёр*

Падтрымліваючы фізічную форму і вядучы актыўны лад жыцця, Віктар Безмен рэгулярна прымае ўдзелы ў спаборніцтвах па футболу, міні-футболу, у зімовы перыяд у спаборніцтвах па лыжных гонках і з'яўляецца членам любіцельскай каманды па хакею.

13.

Мінскім абласным саветам ДСТ «Чырвоны Сцяг» для займаючыхся лыжным спортам юнакоў і дзяўчат у чэрвені 1979 года быў арганізаваны спартыўны лагер у п. Паплавы, што ў дзесяці кіламетрах ад г. Беразіно. Разам з іншымі трэнерамі і выхаванцамі спартыўнай школы са сваімі выхаванцамі праводзіў падрыхтоўку да наступнага зімовага спартыўнага сезона і трэнер Анатоль Іосіфавіч Драздоўскі. Як старэйшыя па ўзросце навучэнцы энергатэхнікума, мы пражывалі ў палатцы, усталяванай на тэрыторыі, прылягаючай да вучэбна-вытворчага камбіната, астатнія спартсмены і трэнеры пражывалі ў дзвюхпавярховым будынку навучальнай установы. Чэрвень у той год выдаўся спякотны, трэніроўкі на пачатку перыяда падрыхтоўкі да наступнага сезона мэтанакіравана праводзіліся па наборы аб'ёмаў кіламетраў. У асноўным кросавая падрыхтоўка, лыжаролеры і бег з імітацыяй на пад'ёмы тэхніцы лыжнага хода з лыжнымі палкамі.

Старэйшыя па ўзросце, пражываючыя ў палатцы спартсмены Уладзімір Кавалеўскі, Васіль Новік, я і яшчэ адзін навучэнец энергатэхнікума Валеры, прозвішча нажаль запамятаваў, трэніраваліся па асобнаму плану трэніровак. На кросавых трэніроўках разам з Уладзімірам Кавалеўскім, займаючыся рэгулярна спортам колькі ўжо гадоў запар, спрабавалі забегчы наперад Васіля Новіка, які да заняткаў з намі спортам займаўся на ўзроўні урокаў фізкультуры і, як мацнейшы сярод вучняў сваёй школы, выступаў на раённых спаборніцтвах у кросавых дысцыплінах ды у зімовы перыяд па лыжных гонках. Спробы нашы пачыналіся з таго, што з Уладзімірам, па чарзе мяняючыся, уз-

мацнялі мы тэмп бегу. Васіль, трымаючыся то побач з намі, то крыху ззаду, на невялікай адлегласці, пачынаў на нас злавацца, затым, з намі параўняўшыся і пэўны тэрмін бягучы разам, напэўна, адкрываў другое дыханне і імчаў наперад, калі-нікалі азіраючыся, прыкмячаў, як мы ўдваіх і чацверты з нас, Валеры (моцнага целаскладу хлопец, ён заўсёды адставаў), нібыта тыя гончыя сабакі, вытыркнуўшы свае языкі, спрабуем за ім утрымацца. Здольнасці Васіля Новіка да кросавых дысцыплінаў здзіўлялі не толькі нас, спартсменаў, але і трэнераў. На агульных кантрольных трэніроўках па бегу на пяць кіламетраў, што праводзіліся адзін раз на тыдзень перад днём адпачынку, заўсёды першынствываў, акрамя аднаго разу, Васіль Новік. Толькі на адной з такіх прыкідак, прыклаўшы неверагодныя намаганні, нейкім чынам удалося-такі мне Васіля абыйсці. На трэніроўках на лыжаролерах хлопцы ўжо цягнуліся за мной, як не аднойчы адзначалі трэнеры, на лыжах у мяне быў не бегавы, а болей сілавы ход. У той час крыху пісаўшы вершы, песні, прыхапіў я з сабой на зборы ў спартыўны лагер у Паплавы, акрамя лыжаролераў ды спартыўнай формы, шасціструнную гітару. Маладыя гады, трэніроўкі, пражыванне з сябрамі ў палатцы, адпачынак, навакольныя маляўнічыя краявіды, песні пад гітару – гэта было цікава. Нажаль, запісы тых вершаў не збераглiся, але памятаецца песня пра трэніроўкі на матыў папулярнага ў тыя гады шлягера «Листья жёлтые», у якой ёсць такі прыпеў:

На лыжероллерах по асфальту мы гоняем,
километры всё считаем да считаем,
и от тренера не спрятаться, не скрыться,
лыжероллеры нам ночью будут сниться.

Напрыканцы тэрміна дзеяння спартыўнага лагера, у апошні вечар перад адпраўкай назаўтра дадому пасля месяца спякоты прайшоў невялікі дожджык, напоўніўшы вечаравае паветра вільгаццю і азонам. Раніцай наступнага дня адзін з выхаванцаў Анатоля Іосіфавіча Ігар Калінін, ідучы па сцежцы з сумкай з

рэчамі да аўтобуса і заўважыўшы наперадзе невялікую адзіную лужыну, разагнаўшыся, вырашыў яе пераскочыць. Патрапіўшы напрыканцы скачку на край той лужыны, паслізнуўшыся, прысеў у яе, запэцкаўшы порткі. Заўсміхаўшыся, сказаў, што ёсць яшчэ адны, сястра на ад'езд адпрасавала, згадзяцца во якраз, вярнуўся ў корпус пераапрануцца. Заўважыўшы Ігара ў чыстых портках, адпрасаваных ды абыходзячага збоку тую лужыну, усміхаючыся і круцячы галавой, мы, назіраючы, стоячы гуртом, зарагаталі. Выдатна адпрасаваныя, напэўна ў спешцы перад самым ягоным ад'ездам у лагер, вывернутыя навыварат порткі, стрэлкамі ўнутры калашынаў, выглядалі даволі бравурна, нібыта бадзёрай навіной ў модзе. Падыйшоўшы да нашага гурта, Ігар рагатаў разам з намі, казаўшы, маўляў, нічога, дадому дабяруся, нічога, дадому ж дабяруся і з гэткімі стрэлкамі.

Напрыканцы другога года навучання ў энергатэхнікуме Васіль Новік па прызыву пайшоў служыць у войска, патрапіўшы на тэрміновую службу ў ГСВГ. У зімовы перыяд, выступаючы на першынстве ГСВГ па лыжных гонках і праходзячы дыстанцыю на драўляных лыжах, у той час распаўсюджаны былі ўжо пластыкавыя, заняўшы другое прызавое месца, Васіль Новік выканаў нарматыў кандыдыта ў майстры спорту. Пры сустрэчы праз дваццаць два гады Васіль распавёў, што да майстра спорту крышачку не хапіла, да першага месца, некалькі секундаў. Атрыманае пасведчанне і адпаведны значок КМС праз месяц кімсьці быў выкрадзены. Даведаўшыся пра гэткае


*Першынства Ташкенцкага вышэйшага танкавага каманднага вучылішча. Шведская эстафета. Сёмы нумар – Васіль Новік. Ташкент, 1983 г.*

здарэнне, быў я вельмі здзіўлены, выпадак неардэнарны і незразумелы. Пад час тэрміновай службы вырашыўшы звязаць свой лёс з войскам, Васіль Новік паступіў на навучанне ў Ташкецкае вышэйшае танкавае каманднае вучылішча, актыўна і па заканчэнні ВВНУ увесь тэрмін службы займаўся фізкультурай і спортам, удзельнічаючы ў вайсковых спартыўных спаборніцтвах па розных відах спартыўных дысцыплінаў, прыстасоўваючы да заняткаў спортам асабістым прыкладам і сваіх падначаленых.



*Васіль Новік. Шведская эстафета. Ташкент, 1983 г.*



*Першынства Ташкенцкага вышэйшага танкавага каманднага вучылішча. Шведская эстафета. Фініш. 1-е месца – Васіль Новік. Ташкент, 1983 г.*

Пры маім навучанні, звестка ад аўтара, на чацвертым курсе энергатэхнікума, у зімовы перыяд выступаючы на першынстве ЦС ДСТ «Чырвоны Сцяг», што праводзілася ў той год ў г. Наваполацку, у складзе зборнай каманды Мінскага абласнога савета ДСТ, асноўны касцяк якой складаўся з моцных лыжнікаў-гоншчыкаў СК «Камвольшчык», старшыня СК і трэнер Віктар Іванавіч Юшкевіч пасля лыжнай гонкі на трыццаць кіламетраў звярнуўся да мяне з прапановай, маўляў, калі ёсць жаданне, Валеры, прайсці пяцідзесяцікіламетровую лыжную гонку, то мяне заявяць на гэтую дысцыпліну. Як выказаў думку Віктар Іванавіч, па ўзроўні

маёй падрыхтоўкі, каб у лыжнам спорце стаць мужыком, узросту быў я юніёрскага. Жаданне ў мяне было, па падрыхтоўцы адчуваў, што прайсці змагу марафон у пяцьдзесят кіламетраў, ды па тэрміну хуткай абароны дыплома па заканчэнні навучальнай установы, каб належна падрыхтавацца, адбыў я са спаборніцтваў раніцай наступнага дня. З сёмага паверху інтэрната, дзе пражывала наша каманда, аўтавакзал быў навідавоку і, увечары набыўшы білет да Мінска, на раніцу збіраючы свае рэчы і спартыўны інвентар, быў я ахоплены думкамі аб хуткім выпрабаванні, абаронай дыпломнага праекта, як выніка амаль трохгадовай вучобы ў навучальнай установе. Позна ўвечары хацеў памыцца, ды ў ванным пакоі адсутнічала халодная вада. Не разгубіўшыся, набраўшы ў ванну гарачай ды пачакаўшы, пакуль астыне, апаласнуўся. Хутка заснуўшы ды прачнуўшыся ў гадзіну ночы, пачуў, што дзесьці па суседству хтосьці прымае душ. З думкай, што во з вечара не было халоднай, ды наладзілі, заснуў. Прачынаючыся ў тры і чатыры гадзіны раніцы і штораз чуючы, што хтосьці прымае дзесьці душ, засынаў з думкай што, маўляў, рабіць ім ў начы няма чаго.

У амальна на  пятую гадзіну раніцы прачнуўся я ад таго, што ў дзверы ўвахода  моцна грукаталі дзяўчаты з шостага паверха, пытаючы, маўляў, ці гэта семсот адзінаццаты пакой і што там у вас здарылася, бо да нас зверху ад вас вада па сцяне працякае, нас затапляе. Ускочыўшы з ложка і выйшаўшы з пакоя на калідор двухпакаёвага нумара, ступіў я па вадзе – Божа, ратуй! Уключыўшы святло ў ванны пакой, заглянуў, а там поўна вады на падлозе, на плітцы – настолькі, што у калідор праз парог працякае і са шланга з дожджыка, што пакінуў я на ракавіне ўмывальніка ліецца вада і, трапляючы на сцяну, за якой я і адпачываў у сваім пакоі, сцякае акутат на падлогу. Кран халоднай вады адкрыў быў я, вады не было, ды не закрыў. Недарэчнасць атрымалася, уначы, прачынаючыся, думаў вось засада, што рабіць камусьці няма чаго. Закрыўшы той кран, падскочыўшы да дзвярэй

уваходу, шчолкнуў замок на адкрыццё і сігануў я ў ванны пакой. Напалову сонны, прысеўшы на кукішкі, абапёршыся спіной аб сцяну пачаў чэрпаць шклянкай з падлогі ваду і выбіраць у ванну. Дзяўчаты, ўвайшоўшы ў калідор, ужо не так эмацыянальна распавядалі, маўляў, ну, што тут у вас атрымалася, у нас вада зверху на калідоры па сцяне працякае, ды заўважыўшы мяне, соннага выбіраючага шклянкай ваду з падлогі, заўсміхаліся і выбеглі з нумара, зачыніўшы за сабой дзверы. Тут мяне ажно падкінула ўсяго, бо да адпраўкі аўтобуса на Мінск засталося трыццаць хвілінаў. Хутка апрануўшыся, ухапіўшы свае рэчы, лыжы, пабудзіў двух хлопцаў, што адпачывалі ў другім пакоі нумара. Кажу ім, маўляў, хлопцы, я тут гасцініцу затапіў, ды мне патрэбна на аўтобус на Мінск, хутка абарона дыплома, калі рамонт патрэбна будзе рабіць, то знойдзеце мяне, я ўсё аплачу, і, развітаўшыся, паімчаў я на аўтастанцыю да часу адбыцця аўтобуса.

Кіламетраў праз дваццаць пад гук рухавіка аўтобуса, хваляванне ад атрымаўшайся недарэчнасці з затапленнем гасцініцы змянілася на думкі аб абароне дыплома, як выніка амаль трохгадовага навучання ў навучальнай установе. Яшчэ некалькі гадоў запар, выступаючы на спаборніцтвах па лыжных гонках са спартсменамі ДСТ «Чырвоны Сцяг», хлопцы па-сяброўску калінікалі падкідвалі кпінкі ў мой бок, маўляў, я тут гасцініцу затапіў, калі спатрэбіцца, то рамонт аплачу. Жартавалі ўсё, рамонт заплачу са стыпендыі ў трыццаць пяць рублёў ды пяцьдзесят капеек даходу ў месяц, ды я не крыўдаваў, толькі ўсміхаўся разам з імі. Прадстаўнікі каманды і трэнеры ніколі мне і не нагадвалі пра атрымаўшуюся недарэчнасць, бо ненаўмысна атрымалася. Хлопцы казалі, што пасля заканчэння спаборніцтваў камандзе, каб выправіцца дадому, не падпісвалі камандзіровачныя лісты, пакуль не вычарпалі шклянкамі ваду з падлогі ў ванну. Гідраізаляцыя у тым ванным пакоі, відаць, зроблена была якасна, бо на шосты паверх працёк узровень вады, што набраўся вышэй парога. Да слова, перад абаронай дыплома загадчык аддзялення тэхнікаў-це-

платэхнікаў Яўген Пятровіч Архіпаў, на якім я навучаўся, сказаў мне, што гэта першы выпуск у навучальнай установе па дадзенай спецыяльнасці, складаючыся з дзвюх групаў на базе васьмі класаў і адной, нашай 12-78, на базе сярэдняй адукацыі і што будзе на абаронах дыпломаў прысутнічаць спецыяльная камісія з Масквы з Міністэрства энергетыкі, і ты, Скакун, як спартсмен, лыжнік-гоншчык і як выдатнік вучобы будзеш даваць задзел – абараняць дыпломны праект першым. З пастаўленай Яўгенам Пятровічам Архіпавым задачай справіўся я, абараніўшы свой дыпломны праект з адзнакай на "выдатна". На наступны год і на далейшыя перыяды выступленняў у спаборніцтвах па лыжных гонках былі пераадоленні марафонскіх пяцідзесяцікіламетровых дыстанцый, якія з'яўляюцца, з боку гледжання медыцыны, звышмаксімальнай нагрузкай на арганізм чалавека.

У тыя гады навучання, напярэдадні адных са спаборніцтваў па летняму першынству г. Мінска ў РСК «Раўбічы» па лыжаролерах і кросе, Ігар Калінін распавёў аднойчы на трэніроўках, што на лыжаролерах на спаборніцтвах будзе не як звычайна пятнаццаць кіламетраў, а чатыры колы па лыжаролернай трасе, дваццатка. Прыняўшы старт, разлічваючы на сваю падрыхтоўку, выкаціўшы першыя два колы лідэрам, у тым жа тэмпе пайшоў я на трэцяе кола, з разлікам на чацвёртым, апошнім, дадаць. Анатоль Іосіфавіч Драздоўскі, стоячы на дыстанцыі з секундамерам, падбадзёрваў мяне і параіў узмацніць тэмп, бо да майго лідэрства пачынаюць падбірацца супернікі. Крышачку я, з разлікам штурмаваць на апошнім чацвертым коле, тэмпу дабавіў, выйшаўшы на які, газаваў я на ўсю сваю моц, здзіўляючыся, што іду па дыстанцыі адзін, не прыкмячаючы ні ўдзельнікаў, ні трэнераў з секундамерамі. Пасля майго актыўнага фінішу падыйшоўшы да мяне адзін з суддзяў звярнуўся з прапановай, сказаўшы, вазьмі лыжную палку вось так, і паказаў, нібыта дрын які, і дай па галаве таму, хто ўвёў табе ў вушы, што трэба праходзіць чатыры колы. Зараз во, з цягам часу з ус-

мешкай успамін прыўзнімае настрой. Напрыканцы трэцяга круга той маёй лыжэролернай дваццаткі, павысіўшы тэмп свайго ходу да магчымага максімума, з разлікам на апошнія пяць кіламетраў, і праскочыўшы метрах у дваццаці ад фінішнага створа, што быў па правую ад мяне руку, знік я з відавоку суддзяў на фінішы па лыжаролернай трасе улева за бруствер стрэльбішча і аклікнуць ды прыпыніць мяне было ўжо немагчыма.



*Валеры Скакун. РСК "Раўбічы". Пачатак 1980-х гг.*

Анатоль Іосіфавіч Драздоўскі, на спаборніцтвах стрымана ўспрыняўшы атрымаўшуюся недарэчнасць ды дастаўляючы нас, сваіх выхаванцаў, да Мінска на сваім аўто, зрабіў нам па поўнай разборку палётаў. Ігар Калінін, пачуўшы за два тыдні ад кагосьці з таварышаў з іншай каманды пра дваццатку, перад стартам даведаўшыся пра дыстанцыю, прайшоў, як і патрэбна, тры кругі. Папярэдзіць мяне, стартаваўшага раней, не было магчымасьці. Пры пад'ездзе да Мінска афіцэр ДАІ, прыпыніўшы аўто і праверыўшы дакументы, сказаў Анатолю Іосіфавічу што з яго штраф пяць рублёў. Той пачаў абурацца, маўляў, які штраф, калі ўсё ў парадку. Афіцэр ДАІ усміхаючыся, паказаў далонню правай рукі на пасажыра спераду, на мяне,



*Юры Скакун, Аляксандр Кавалеўскі, Ігар Калінін. РСК "Раўбічы". Пачатак 1980-х гг.*

і дадаў, што ў вас пасажыр не прысцягнуты рамянём бяспекі. Кінуўшы погляд на мяне, Анатоль Іосіфавіч уздрыгануўся, і са словамі, дзень недарэчнасцяў, заўсміхаўшыся працягнуў для выплаты пяцірублёвую купюру. Атрымаўшы квітанцыю аб выплаце, прамовіўшы, што будзе напамінам аб сягоняшнім дні, паклаў яе ў бардачок аўто.

У перыяд падрыхтоўкі для адпрацоўкі вынослівасці праводзіліся працяжныя трэніроўкі. Перад адной з такіх трэніровак на маю прапанову Ігару Калініну зганяць на лыжаролерах цераз горад з Дражні да маёй вёскі Скарынічы, там падсілкавацца і назад, той пагадзіўся. З мікрараёна Дражня ў накірунку да плошчы Ванеева цераз аэрапорт, Курасоўшчыну, затым па Слуцкай шашы да в. Сенніца, там звярнуўшы на шашу на Прылукі праз тры кіламетры дабраліся мы да майго дома. Падсілкаваўшыся, крыху адпачыўшы, рушылі мы тым жа шляхам назад. Дабраўшыся да плошчы Ванеева, прапанаваў я Ігару пад'ехаць да тэхнікума тралейбусам, бо пачынаў ён ужо, што называецца, завязвацца, ды і мяне ўжо завязь стомленых мышцаў брала ў свой палон, але той адмовіўся. Каля прыпынку тралейбуса завода рухавікоў на зноў маю прапанову дабрацца тралейбусам наадрэз адмовіўшыся, Ігар, маладзейшы за мяне на гады два, сказаў, што мы павінны дайсці. Сам ужо вязаўшыся ўсімі мышцамі тулава, падпіхіваючы таварыша перад сабой на мост, дапамагаючы таму ўзняцца угору, скаціўшыся з вышыні да развязкі Круглай плошчы і павярнуўшы ўправа, праз чатырыста метраў дабраліся мы да месца прызначэння, пераадолеўшы на лыжаролерах адлегласць у сорак чатыры кіламетры. Перад наступнай працяжнай трэніроўкай на лыжаролерах Ігар Калінін, сказаўшы, што да маёй вёскі далекавата, прамовіў зганяць у мікрараён «Зялёны Луг», дзе ён пражываў, куды некалькі разоў мы і згойсалі.

Калі-нікалі з Ігарам Калініным, Васілём Новікам, Уладзімірам Кавалеўскім, Валянцінам Кугачам і іншымі хлопцамі, сабраўшыся гуртом дабіраліся аўтобусам, прыхапіўшы лыжа-

ролеры, на трэніроўку ў РСК «Раўбічы», як называюць яшчэ тыя мясціны, «Маленькую Швейцарыю». Анатоль Іосіфавіч Драздоўскі, працуючы трэнерам-выкладчыкам і з'яўляючыся няштатным карэспандэнтам газеты «Фізкультурнік Беларусі», раз-пораз пісаў для газеты артыкулы і змяшчаў там свае фатаздымкі. Мой фатаздымак у юнацкія гады , як і Валянціна Кугача, зроблены менавіта ім.



*Валеры Скакун.*
*Юнацкія гады*



*Валянцін Кугач.*
*Юнацкія гады*

Перад заканчэннем навучальнай установы Анатоль Іосіфавіч са словамі: «Вось так, Валера, на лыжах ходзяць сапраўдныя майстры,» – падаў мне фотаздымак Івана Палешчука, лыжніка-гоншчыка, Майстра Спорту СССР з СК «Камвольшчык» ДСТ «Чырвоны Сцяг». Класічны ход на лыжах Івана Палешчука прыкмеціў я, яшчэ быўшы на спартыўных зборах на першым снезе ў г. Апаціты, што на Кольскім паўвостраве, і, як і ўся падрастаючая моладзь, імкнуўся на трэніроўках, зачапіўся за больш вопытных

спартсменаў, прайсці ўслед, лыжа ў лыжу капіруючы яго манеру.

У часы адпачынку на спартыўных зборах альбо на спаборніцтвах, збіраючыся гуртом, маладзейшым цікава было паслухаць расповеды старэйшых, больш вопытных спартсменаў. Іван Паляшчук, інтэлегентны, цікавы распавядальнік, часам пры размовах у добрым настроі выказываў думку, што шкада, не браў



*На дыстанцыі – Майстар Спорту СССР Іван Паляшчук, ДСТ "Чырвоны Сцяг". 17 нумар – Яўген Стаўчыкаў, ДСТ "Чырвоны Сцяг". Паміж імі ўздоўж трасы – Майстар Спорту СССР Генадзь Унуковіч, ДСТ "Буравеснік". РСК "Раўбічы", напрыканцы 1970-х гг.*



*Адкрыццё спартакіяды працаўнікоў Мінскага камвольнага камбіната. Валянціна Мірончык, Іван Паляшчук. Пачатак 1980-х гг.*




*Спартакіяда БССР. Першынства ЦС ДСТ “Чырвоны Сцяг”. Зборная каманда Мінскага абласнога савета ДСТ “Чырвоны Сцяг”. Першы рад: Іван Паляшчук, трэцяя – Ганна Забеліч, за ёй – Міхась Раманчык. Чацвёрты ў першым радзе – Антон Кальчэўскі. Стаіць другім злева направа Валеры Скакун. Восьмы – старшыня СК “Камвольшчык”, трэнер Віктар Іванавіч Юшкевіч. Дзевяты – Васіль Офік, дзесяты – Іван Дзямко, дванаццаты – Віктар Бізюк. Г. Магілёў, 1982 г.*

вандроўніцы-гітары з сабой, песні паспявалі бы. У адно лета, калі былі на спартыўных зборах з лыжнікамі СК «Камвольшчык», з пражываннем у Астрашыцкім Гарадку ў хатцы рыбака, на трэніроўкі выбіраліся ў РСК «Раўбічы». Трэнерам з намі была Ганна Іванаўна Забеліч, Майстар Спорту СССР, скончыўшая актыўна выступаць на спаборніцтвах. Калі-нікалі праводзіць трэніроўкі пад’язджаў Іван Дзямко, Майстар Спорту СССР, да трэнерскай працы выдатны лыжнік-гоншчык.

У адзін з зімовых спартыўных сезанаў, выступаючы на абласным прафсаюзна-камсамольскім лыжным кросе, што праводзіўся ў г. Лагойску Мінскай вобласці, у гонцы на пятнаццаць кіламетраў з агульнага старта мае спадзяванні, маючыя падставы патрапіць у запаветную тройку прызёраў, ураз абламаліся за паўтара кіламетра да фініша. Марозны сонечны дзень, якасна



*Спартакіяда БССР. Першынства ЦС ДСТ "Чырвоны Сцяг". Валеры Скакун. Лыжная гонка на 15 км, г. Магілёў, 1982 г.*

прыгатаваная, з нарэзанымі ў дзве лыжні снегаходамі, траса, удалы старт і адрыў у тройцы лідэраў на дастатковую адлегласць, каб ужо і не сумнявацца ў поспеху, ды пашкодзіла мне выпадковасць. Праходзячы па трасе каля біятлоннага стрэльбішча і ідучы за крыху наперадзе выкатваючым Мікалаем Канашэнкавым з ДСТ «Чырвоны Сцяг» СК «Камвольшчык» і яшчэ адным хлопцам, зачапіўся я крапленнем левай лыжы за ледзь вытыркаючую з-пад снега металічную трубку для ўстаноўкі пад час спаборніцтваў па біятлоне агароджы стартавага гарадка, і мяне адкінула з трасы ўлева. Утрымаўшы раўнавагу, не паваліўшыся, патрапіў я левай лыжай у выбаіну так, што лыжа пад маёй вагой і ціскам выгнулася. Стаўшы на лыжню і скатваючыся з пакатага спуска ўніз, адчуў тармажэнне левай лыжай.

Мікалай Канашэнкаў, лідыруючы, паімчаў з яшчэ адным удзельнікам пераадольваць апошні перад фінішам пад'ём, а я, зняўшы лыжы, расторганы ад атрымаўшайся недарэчнасці, павярнуў на дарогу ўлева, што вяла да месца старта і фініша, знаходзячагася непадалёку. Левая мая лыжа, выгнуўшыся ў выбаіне, зламалася пад пяткай чаравіка. Ад пенапласта унутры лыжы адклеіўся верхні і ніжні пластык, акурат пад грузавой пляцоўкай левай маёй лыжы. Мікалай Канашэнкаў фінішаваў першым у той цікавай лыжнай гонцы. Падыйшоўшы насустрач мне ад стартавага гарадка Анатоль Іосіфавіч, пабачыўшы прычыну майго сыхода перад фінішам з дыстанцыі той гонкі, са

спачуваннем і шкадаваннем пакачаў галавой. Яно і зразумела, патрапіць у заветную тройку прызёраў – гэта вынік сумеснай працы настаўніка і спартсмена. Не атрымалася, і таму зараз, узгадваючы гэтую гонку, шкадую.

У той зімовы спартыўны сезон пры падрыхтоўцы да першынства ЦС ДСТ «Чырвоны Сцяг» зборную каманду Мінскага абласнога савета на апошнюю трэніроўку перад адпраўкай на першынства ў г. Магілёў завезлі аўтобусам у РСК «Раўбічы». Па плане трэніроўкі патрабавалася прайсці на лыжах тры кругі па пяць кіламетраў свабодным тэмпам. Нулявая тэмпература паветра, як звычайна, ускладніла падбор змазкі і, каб не губляць часу, ішлі члены каманды па лыжні нетаропка на падстрэльваючых на аддачу лыжах. Паскакаўшы з падстрэламі на першы пад'ём, паспрабаваў я ісці на лыжах угару, як на каньках, па трасе, добра прыгатаванай снегаходамі з двума нарэзанымі паралельнымі лыжнямі, папераменна адпіхваючыся на пад'ём лыжнымі палкамі. Пры пераадольванні трэцяга зацяжнога пад'ёма, праходзячы міма стаяўшых на трасе дзвюх нашых трэнераў, Івана Дзямко і Нячая, пачуў іхнюю між сабой гаворку, маўляў, глядзі вось, і так відаць магчыма на лыжах пад'ёмы пераадольваць.



*Спартакіяда БССР. Першынства ЦС ДСТ "Чырвоны Сцяг". Валеры Скакун. Лыжная гонка на 15 км. Г. Магілёў, 1983 г.*

На праходзячым у Магілёве першынстве ЦС ДСТ «Чырвоны Сцяг» на марафонскай дыстанцыі на пяцьдзесят кіламетраў з агульнага старта, напрыканцы другога кола ў пятнаццаць кіламетраў, ідучы ў




Спартакіяда БССР. Першынства ЦС ДСТ "Чырвоны Сцяг". Эстафета. Валеры Скакун – 3 этап, перадае эстафету Івану Дзямко – 4 этап. На дальнім плане чакае прыёму эстафеты сярод юніёраў Юры Скакун. Г. Магілёў, 1983 г.

групе лідэраў з Мікалаем Буянавым, Іванам Паляшчуком і яшчэ адным хлопцам, з'язджаючы са спуска разам з трыма ідучымі наперадзе гоншчыкамі, лыжы мае, зразумела, пайшлі ў накат. Прытармажваючы на разбітай, галалёднай лыжні, казырнуўшы лыжамі, паваліўся я на лыжню спіной. Узняўшыся, пакуль прыйшоў у нармальны стан, каб працягваць належна далей марафонскую гонку, абыйшоўшыя мяне даганяўцы паімчалі ўслед за лідарамі. Урэшце-рэшт раскаціўшыся па дыстанцыі, падабраўшыся да лідараў, дайшоў я да фініша той пяцідзесяткі. Па закачэнні той гонкі падыйшоўшы да мяне Віктар Іванавіч Юшкевіч са спачуваннем звярнуўся з пытаннем, маўляў, Валера, ты што паваліўся, на што я адказаў, відаць, не пашанцавала.

На наступны год, працаваўшы ў той час трэнерам-выкладчыкам Мінскай раённай ДЮСШ па лыжным спорце, дзе сам калісьці пачынаў займацца лыжным спортам, павёз я неяк сваіх выхаванцаў, хлопцаў ды дзяўчат, у Мінск для прыняцця старту з выхаванцамі, юнакамі і дзяўчатамі спартыўнай школы ДСТ «Чырвоны Сцяг». Працаваў я тады на базе Прылуцкай сярэдняй школы Мінскага раёна. Трэнер Нячай, што ў мінулым годзе на пад'ёме ў РСК «Раўбічы» стаяў разам з Іванам Дзямко, звярнуўся да мяне з пытаннем, маўляў, Валера, ну, як ты не дадумаўся тады, што вось так, як ты пераадольваў тыя пад'ёмы на трэніроўцы каньковым ходам, у Раўбічах атрымліваецца

значна хутчэй, чым класічным ходам. Потым дадаў, што вось калі б ты здагадаўся, у той год проста бы выдатна праскочыў па сваіх выніках праходжання дыстанцый на спаборніцтвах. Каньковы ход па лыжні ў лыжных гонках і з'явіўся акурат пад час пачатку маёй працы трэнерам-выкладчыкам, і пэўны тэрмін пасля яго з'яўлення распрацоўваліся патрабаванні і правілы, зразумела, пад уплывам узнікаючых пры карыстанні неардынарных выпадкаў.



*Валеры Скакун, Юры Скакун. Пачатак 1980-х гг.*

14.

На другі год маёй працы трэнерам-выкладчыкам па лыжным спорце на першынстве Мінскай вобласці на прызы газеты «Піянерская праўда», што праводзілася ў той год у п. Ратамка Мінскага раёна, пры тэмпературы паветра каля нуля градусаў выкарыстаў я для змазкі лыжаў сваім выхаванцам лыжную мазь «Тэмп» на тэмпературу паветра нуль – плюс два градусы. У выхаванцаў маіх, апрабуючых змазку, акурат перад стартам сталася, што тая падмярзае. Каб неяк выправіць становішча, хуценька замазаў я паверх мазі на нуль – плюс два маззю на тэмпературу на мінус адзін – мінус сем градусаў. Сталася так, што пасля накатанай лыжні з месца старта па трасе дыстанцыі паўсюдна была сыпучка, і, як бы памыліўшыся ў змазцы лыжаў сваім выхаванцам, са смазкай акурат я і падгадаў у той дзень спаборніцтваў. Як казалі потым мае выхаванцы, па трасе ва ўсіх на лыжах прастрэлы, не трымала змазка пры штуршку, мае ў пад'ёмы выбягалі без перашкодаў ды на сыпучай лыжні

падмярзаючая змазка, замазаная на тэмпературу мінус адзін – мінус сем градусаў вялікай шкоды на роўнядзі ды на спусках не наносіла, лыжы выкатвалі нядрэнна. Сярод пераможцаў ды прызёраў маіх выхаванцаў на тых спаборніцтвах не было, ды выступілі добра для ўзроўня сваёй падрыхтоўкі і тэрміну заняткаў спортам. Уладзімір Пятровіч Пачапінскі, працаваўшы ў той час старэйшым трэнерам Мінскай раённай ДЮСШ і выкладаючы лыжныя гонкі і біятлон на базе Самахвалавічскай сярэдняй школы Мінскага раёна, запытаў у мяне пасля спаборніцтваў пра змазку лыжаў сваім выхаванцам. Я і распавёў, што напачатку памыліўся, ды каб выправіць становішча, замазаў потым паверх іншай, амаль выпадкова атрымалася.

У адзін з зімовых сезонаў, перад адборачнымі абласнымі спаборніцтвамі на прызы газеты «Піянерская праўда», што праводзіліся ў Радашковічах, Уладзіміру Пятровічу Пачапінскаму пэтэлефанаваў з Лагойску Календа Уладзімір, маўляў, мы чэмпіёны мінулага года, і зараз у нас моцная каманда, і першынсвываць зноў будзем мы, і дадаў, што вам лавіць няма чаго, і не пераводзьце дарагія мазі. Уладзімір Пятровіч, паразважаўшы, што відаць і сапраўды, калі гэтак упэўнены лагойскія трэнеры, не пераводзіць мазі, і выкарыстаў для падрыхтоўкі лыжаў сваім выхаванцам савецкую лыжную мазь «Тэмп». Выхаванцы Уладзіміра Пятровіча пры праходжанні дыстанцый лыжных гонак на тых адборачных спаборніцтвах развілі гэткую хуткасць, што, па патрабаванні прадстаўнікоў каманды Лагойшчыны, судзейская калегія правярала запісы пікетаў аб праходжанні па дыстанцыі спартсменаў. Выхаванец Уладзіміра Пятровіча Ганчаронак Уладзімір заняў першае месца, выдатна ў асабістых гонках выступілі і астатнія члены каманды Самахвалавіцкай сярэдняй школы. На другі дзень у эстафетнай гонцы першымі сталі таксама выхаванцы Уладзіміра Пятровіча.

На рэспубліканскіх спаборніцтвах, што ў той год праводзіліся ў г. Орша Віцебскай вобласці, абышоўшы па выніках двух

дзён ва ўпартай барацьбе Віцебскі спецыялізаваны інтэрнат па зімовых відах спорта ў штогадовых спаборніцтвах на прызы газеты «Піянерская праўда», перамагла каманда з паселішча Самахвалавічы. На другі дзень спаборніцтваў у эстафетнай гонцы на апошнім этапе Віктару Мазуніну, ішоўшаму лідарам, зрабілі падставу, выставіўшы на сутыкненне хлапчука, але ў выніку падзення, калі парваўся пры сутыкненні раменьчык лыжнай палкі, то і гэта не пашкодзіў Віктару фінішаваць першым. Праз тры гады на першынстве Савецкага Саюза на прызы газеты «Піянерская праўда» у г. Салікамску Пермскай вобласці пасля першага дня спаборніцтваў каманда Самахвалавіцкай сярэдняй школы пад кіраўніцтвам Уладзіміра Пятровіча ішла на другім месцы, саступаючы першынства, па выніках праходжання асабістых лыжных гонак, камандзе Ленінграда. Па заканчэнні тых Усесаюзных спаборніцтваў выхаванцы Уладзіміра Пятровіча Пачапінскага, вучні Самахвалавіцкай сярэдняй школы Мінскага раёна, заняўшы ганаровае чацьвертае месца, заваявалі права Беларусі выстаўляць на наступны год на першынстве Савецкага Саюза па лыжных гонках на прызы газеты «Піянерская Праўда» дзве каманды ўдзельнікаў – посьпех выдатны.



*Першынства Цэнтральнай зоны Расіі. Першы глядзіць прама Уладзімір Пачапінскі. Першыя спаборніцтвы па лыжных гонках. Гонка на 3 км. Тульская вобласць, сярэдзіна 1960-х гг. Вучні 6 класа СШ*

Працуючы старшым трэнерам па лыжных гонках Мінскай РДЮСШ і выкладаючы лыжы і біятлон на базе Самахвалавіцкай сярэдняй школы, Уладзімір Пятровіч пранаваў мне ў адзін з сезонаў, працаваў я ў той час трэнерам-выкладчыкам па лыжным спорце той жа Мінскай

РДЮСШ на базе Прылукскай школы Мінскага раёна, выступіць за каманду Мінскага раёна па біятлоне на першынстве Мінскай вобласці ў г. Лагойску, на што я пагадзіўся. У першы дзень тых спаборніцтваў на дыстанцыі дзесяць кіламетраў з двума агнявымі рубяжамі, падоўгу выцэльваючы на лёжцы і на стойцы, губляючы час і адматаўшы на двух агнявых рубяжах сем штрафных кругоў па сто пяцьдзесят метраў, заняў я чацвертае месца, заімеўшы так званы драўляны медаль. На другі дзень спаборніцтваў перад гонкай, зноў жа, на дзесяць кілометраў з двума агнявымі рубяжамі выхаванцы Уладзіміра Пятровіча, выступаючыя па заліку юнакаў, Барысевіч Сяргей і Бортнік Грыша ды трэнер па біятлоне з ДСТ «Дынама» Лабанаў Міхаіл, з якім супрацоўнічала па біятлоне наша спортшкола, прапанавалі мне не выцэльваць мішэні на агнявых рубяжах, губляючы час, бо напрамазваю шмат, а, хуценька выстраляўшы пяць патрэбных патронаў ды адматаўшы штрафныя кругі, валіць усіх сваім выдатным ходам па лыжні. Па прыняццю старта, пасля першага агнявога рубяжа пры стральбе лежачы, адматаўшы чатыры штрафныя кругі па тых сто пяцьдзесят метраў, адну мішэнь неяк-такі я выбіў, выйшаў са стрэльбішча, павярнуў на пад'ём управа і на трасе мяне сустрэў трэнер ДСТ «Дынама» Міхаіл Лабанаў. Стоячы ўздоўж трасы ды махаючы правай рукой высока ўгору ды нізка долу, без галаўнога ўбора, высокі, моцны Лабанаў эмацыянальна падбадзёрваў мяне гучнымі выкрыкамі, маўляў, давай Валера, давай, ходам усім валіш. На другой стральбе са стаячага становішча, выпусціўшы, нібыта з кулямёта пяць патронаў і патрапіўшы-такі ў адну мішэнь, паімчаў я, адматаўшы яшчэ чатыры штрафныя колы па фінішнаму адрэзку дыстанцыі да заканчэння сваёй біятлоннай гонкі. Урэшце-рэшт, адматаўшы восем сваіх штрафных кругоў, заняў я, як і ў першы дзень спаборніцтваў, чацвёртае места на першынстве Мінскай вобласці.

Пасля майго фініша падыйшоў да мяне выхаванец Уладзіміра Пятровіча, выдатны біятланіст Барысевіч Сяргей са

здзіўленнем у пашыраных вачах і прамовіў, маўляў, ну, Валяр'ян, ну, ты даеш, паліваў на стрэльбішчы так, што і ў габарыты ўстановак не трапляў. Неўзабаве да стаяўшых гуртам і размаўляўшых са мной Барысевіча Сяргея, Грышы Бортніка і Міхаіла Лабанава ад непадалеку гутарыўшай групы біятланістаў і трэнераў адышоў, усміхаючыся, Уладзімір Пятровіч. «Бачыш, Валера, – прамовіў Уладзімір Пятровіч, – пазіраюць усім гуртом у наш бок, – то ж гэта я сказаў ім, што на наступны год навучу Скакуна па мішэнях сходу страляць, на што яны адказалі, што калі Скакуна навучыць страляць сходу, то нам на старт выходзіць не мае сэнсу.

У тыя гады на адной са спартакіядаў школьнікаў рэспублікі па біятлоне, што праводзілася ў РСК «Раўбічы», выступаючы ў складзе зборнай каманды Мінскай вобласці, выхаванец Уладзіміра Пятровіча Пачапінскага Барысевіч Сяргей заняў другое прызавое месца, а Каляда – пятае. Два біятланісты з Лагойска занялі ў асабістых гонках, адпаведна, адзінаццатае і семнаццатае месцы. У склад эстафетнай каманды, па прычыне, каб старт прынялі два біятланісты з Лагойска, Каляду не ўключылі. Уладзімір Пятровіч, падыйшоўшы да прадстаўнікоў і трэнераў каманды Брэсцкай вобласці і спытаўшы пра магчымасць выдатна выступіўшаму свайму выхаванцу прыняць старт за каманду Брэсцкай вобласці, на першым этапе атрымаў згоду. Апрануўшыся ў спартыўную форму брэсцкай каманды, Каляда з добрым ходам па лыжні, выбіўшы з шасьці патронаў пяць мішэняў на лёжцы і з сямі патронаў пяць мішэняў на стойцы, без штрафных колаў фінішаваў на сваім першым этапе першым, з адрывам у паўтары хвіліны ад завяршыўшай свой першы этап эстафеты на другім месцы каманды Віцебска. Па стартавым гарадку, што называецца, пайшоў шорах, маўляў, як гэта брэстчане змаглі з адрывам прабіцца ў лідэры першага этапу. Па праходжанні наступных этапаў той біятлоннай эстафеты брэсцкая каманда заняла месца, адпаведна ўзроўню падрыхтоўкі сваіх удзельнікаў.

Перад той эстафетнай гонкай да Уладзіміра Пятровіча Пачапінскага падыйшоў трэнер Алега Рыжанкова Перанечкін Анатоль Іванавіч з прапановай, каб Мінская вобласць прапусціла наперад магілёўцаў, каб тыя па заліку спартакіяды змаглі абыйсці каманду г. Мінска. Уладзімір Пятровіч пагадзіўся, і на апошнім этапе яго выхаванец Барысевіч Сяргей, дагнаўшы на трасе магілеўчаніна, узяўшы таго стрэльбу, каб той бег з палёгкай крыху хутчэй, цягнуў на сябе дзве, вярнуўшы пры падыходзе да стрэльбішча. На агнявым рубяжы наўмысна страляючага міма мішэняў Сяргея Барысевіча падтрымлівалі трэнеры з Лагойшчыны, маўляў, Сярога сабярыся, Сярога сабярыся, бывае ў біятлоне, што не ідзе стральба. На другім адрэзку дыстанцыі Сяргей Барысевіч зноў дапамагаў магілёўскаму хлопцу, несучы на сабе і таго зброю, ісці па дыстанцыі. На апошнім агнявым рубяжы, даўшы наўмысна стрэлы міма мішэняў, адматаўшы штрафныя круг, і Сяргей Барысавіч фінішаваў услед за магілеўчанамі. Анатоль Іванавіч Перанечкін, у свой час стварыўшы клуб біятланістаў, на самаакупнасці выхаваў сем чэмпіёнаў свету па біятлоне, што з'яўляецца вялікай заслугай і значным укладам у развіццё біятлона на Беларусі.



*Вячаслаў Талкачоў. Зона кубка СССР па біятлоне. Закарпацце, 1973 г.*

Першым з Беларусі Чэмпіёнам свету па біятлоне сярод юніёраў стаў Вячаслаў Талкачоў. Майстра Спорту СССР міжнароднага класа Вячаслаў Талкачоў першым з беларускай школы біятлона стаў чэмпіёнам спартакіяды народаў СССР. Член

зборнай каманды СССР па біятлоне з г. Клімавічы Магілёўскай вобласці Вячаслаў Талкачоў паспяховымі выступленнямі на спаборніцтвах самага высокага ўзроўню адзначыў новую веху развіцця біятлона ў рэспубліцы.

На праводзіўшымся ў г. Лагойску першынстве Мінскай вобласці па лыжных гонках сярод школьнікаў, у склад зборнай каманды Мінскага раёна ўваходзілі вучні Самахвалавіцкай СШ, дзе заняткі па лыжным спорце і біятлоне праводзіў Уладзімір Пятровіч Пачапінскі, вучні Сенніцкай СШ, дзе заняткі па лыжным спорце праводзіў Рыгор Мікалаевіч Скакун, вучні Прылуцкай СШ дзе заняткі па лыжным спорце праводзіў Валеры Уладзіміравіч Скакун і вучні Сцяпянскай СШ №2, дзе заняткі па лыжным спорце ад Мінскай раённай ДЮСШ, у дадатак да асноўнага месца працы, праводзіў Мэлс Харысавіч Ісхакаў.

Перспектыўныя выхаванцы Мінскай раённай ДЮСШ у летні перыяд праходзілі падрыхтоўку да зімовага спартыўнага се-



*Першынства г. Мінска сярод працаўнікоў вышэйшых школ і ўстаноў, працаўнікоў Міністэрства адукацыі. Злева направа: Рыгор Мікалаевіч Скакун, Анатоль Уладзіміравіч Бельшанаў, Уладзімір Пятровіч Пачапінскі, Анатоль Іванавіч Ягорчанка*



*Валеры Скакун з выхаванцамі, вучнямі Прылукскай СШ Мінскага раёна. РСК "Раўбічы". Сярэдзіна 1980-х гг.*

зона спаборніцтваў штогод у жніўні месяцы ў спартыўным лагеры на базе піянерскага лагера «Беларусь», што знаходзіцца непадалёку ад РСК «Раўбічы». Падрыхтоўка на спартыўных трасах рэспубліканскага спартыўнага комплекса, побач са знакамітымі спартсменамі, лыжнікамі і біятланістамі Савецкага Саюза, стымулявалі, падштурхоўвалі юных спартсменаў да актыўнага занятку спортам.



*Валеры Скакун з выхаванцамі, вучнямі Прылукскай СШ Мінскага раёна. РСК "Раўбічы". Сярэдзіна 1980-х гг.*

З тысяча дзевяцьсот восемдзесят сёмага года па дзве тысячы трэці год Уладзімір Пятровіч Пачапінскі, працуючы дырэктарам Мінскай раённай ДЮСШ аддзела адукацыі, актыўна ўдзельнічаючы ў выхаванні моладзі, працягваў выкладаць заняткі па лыжным спорце і біятлоне для вучняў сярэдніх школаў Мінскага раёна. З дзве тысячы трэцяга года Уладзімір Пятровіч Пачапінскі працаваў дырэктарам спецыялізаванай ДЮСШ алімпійскай рэзерва па кулявой стральбе

і стральбе з лука (зараз Цэнтральная СДЮШАР Мінаблвыканкама). З дзве тысячы чацвёртага па дзве тысячы адзінаццаты год Уладзімір Пятровіч Пачапінскі працаваў дырэктарам Мінскай гарадской спецыялізаванай ДЮШАР прафесійных саюзаў па барацьбе і таэквандо. Па выхадзе на пенсію, суддзя нацыянальнай катэгорыі па комплексных відах спорту, Уладзімір Пятровіч Пачапінскі, становучча ўплываючы на фарміраванне ў грамадстве здаровага ладу жыцця, актыўна прымае ўдзел у судзейскіх калегіях спартакіядаў галінаў вытворчасці і іншых спартыўных спаборніцтвах.



*Каманда спартсменаў птушкафабрыкі імя Крупскай. Падрыхтоўка да спаборніцтваў на першынства Мінскай вобласці па лыжных гонках на прыз Героя Сацыялістычнай працы Канстанціна Дубоўскага. Злева направа: 1 – заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь Леанід Канстанцінавіч Хоміч, 3 – Майстар Спорту СССР па веласпорце Марыя Шышла, 4 – Ганаровы Майстар Спорту СССР па лыжных гонках Аркадзь Кальцоў, 5 – сын Леаніда Канстанцінавіча Хоміча Яўген Хоміч, 6 – Майстар Спорту СССР па лёгкай атлетыцы Рыгор Сушко, 7 – Пётр Міронччык*

У семідзесятыя і васьмідзесятыя гады мінулага стагоддзя спартыўныя каманды прадпрыемстваў і установаў, актыўна ўдзельнічаючы ў штогадовых спартакіядах прафесійных саюзаў, праводзілі сур’ёзную падрыхтоўку да спаборніцтваў на першынства Мінскай вобласці па лыжных гонках на прызы Героя Сацыялістычнай працы Канстанціна Дубоўскага і да іншых раённых абласных і ўсесаюзных спа-

борніцтваў па разнастайных відах спорту.

У сярэдзіне васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя, працуючы трэнерам-выкладчыкам па лыжным спорце Мінскай раённай ДЮСШ, пры паступленні ў тысяча дзевяцьсот восемдзесят пятым годзе на навучанне ў БДІФК, на іспыце па літаратуры я напісаў на лісце адну з трох прапанаваных тэмаў сачынення, ды адчуўшы, што не атрымаецца штосьці скласьці, закрэсліўшы, напісаў другую (звестка ад аўтара). Разважаў хвілінаў дваццаць над тэмай, не ішла думка. Адна з праходзячых па зале выкладчыц, назіраючы за іспытамі, звярнулася да мяне з пытаннем, маўляў, што, малады чалавек, не атрымліваецца нічога, на што я і адказаў ёй, што так, не атрымліваецца. Выкладчыца, уважліва паглядзеўшы на мяне, прапанавала, маўляў, малады чалавек, калі вы ведаеце беларускую мову, то пішаце на рускай? Так, адказаў я, ведаю, а пра што пісаць, тэма была «Мой родны кут, як ты мне мілы», прыдзецца пісаць па паэме Якуба Коласа, а можа сваё што. Выкладчыца, уважліва паглядзеўшы на мяне, параіла пісаць штосьці па паэме Якуба Коласа і штосьці сваё і дадала, што галоўнае пісаць на беларускай мове, без памылак лаканічна, упэўнена ставячы знакі прыпынку. На наступны дзень, увайшоўшы ў напоўненую абітурыентамі лекцыйную залу, выкладчыкі перад выдачай абітурыентам пасведчанняў іспытаў з адзнакам, і звярнуліся да гаманлівай аўдыторыі, папрасіўшы цішыні, каб



*Пётр Мірончык*

зрабіць прыемную аб'яву. Пасля усталяваўшайся цішыні выкладчыца, што ўчора прапанавала мне пісаць па-беларуску, прамовіла, што за апошнія тры гады з усіх паступаючых да іх дзённікаў і завочнікаў знайшоўся адзін абітурыент, які напісаў сачыненне на беларускай мове, атрымаўшы адзнаку «чатыры». Зала, парушыўшы цішыню, загудзела, нібыта вулей, маўляў, а хто гэта, а хто гэта? Пасля паведамлення выкладчыцай майго прозвішча, мне давялося ўстаць з месца, каб абітурыенты пабачылі гэтакага неардынарца. Адзін з тагачасных маіх сяброў з кола зносінаў сярод спартсменаў, Майстар Спорту СССР па плаванню ў ластах, знаходзячыся у той момант непадалёку, пашыранымі ад здзіўлення вачыма гледзячы на мяне, прамовіў, маўляў, ну, Валер'ян, ну, ты даеш.

З маленства, захапляючыся чытаннем кніжак, у падлеткавым узросце зацікавіўшыся перыядычнай літаратурай, зачытваўся часопісамі «Маладосць» і «Юнацтва», і ў цяперашні час на маёй кніжнай паліцы ў шэрагу літаратурных выданняў рознага жанру маецца экзэмпляр часопіса «Маладосць» за май 1975 года, рарытэтны для нашага часу.



*Валеры Скакун. РСК "Раўбічы". Сярэдзіна 1980-х гг. Лета*

15.

З юначых гадоў не без уплыву тагачаснага савецкага тэлебачання, што мела агітацыйны і пазнавальны накірунак на станаўленне грамадства, зарадзілася ў мяне мара пабачыць Паўночную прастору. З сярэдніх класаў памятаю дакументальную кінастужку, у якой з вышыні птушынага палёту, дзе распасціраліся пад крылом самалёта краявіды зялёнага мора тайгі дыктар, дадаючы каментар, выказаў думку, што, аднойчы патра-

піўшага сюды, чалавека гэтыя мясціны альбо заўсёды будуць цягнуць да сябе, альбо ніколі больш тых таёжных мясцін ён не наведае. Першы раз патрапіўшы на спартыўныя зборы на першы снег пры навучанні ў дзевятым класе школы ў г. Краснакамск Пермскай вобласц, што на Сярэднім Урале з камандай студэнтаў БТІ па вяртанні праз дваццаць дзён дадому, пры размове з маці аб уражаннях ад той вандроўкі, выказаў я думку, што, калі вырасту, то на нейкі пэўны тэрмін адбуду на Поўнач папрацаваць.

У лета тысяча дзевяцьсот восемдзесят шостага года, быўшы ў адпачынку, цягніком дабраўшыся на Поўнач з квітком накіравання па размеркаванню па заканчэнні энэргатэхнікума, быў я прыняты на працу ў горадзе Саснагорску, Комі АССР, у цяперашні час Рэспубліка Комі, на мясцовую Цеплаэлектрацэнтраль. Чалавек – істота сацыяльная, і заўсёды, паўсюдна знаходзіцца ў коле зносінаў людзей па інтарэсах. З маленства захапляючыся заняткамі спортам і падпісаўшы дамову на тры гады працы, напачатку восені ў вольны час наведваўся ў СК «Хімік», дзе ў трэнажорнай зале займаўся гіравым спортам. Напрыканцы восені, удзельнічаючы ў спаборніцтвах па гіравому спорту на першынства Саснагорскага раёна, па сваёй вагавай катэгорыі заняў тады чацвёртае месца. З выпадзеннем снега на першых раённых спаборніцтвах па лыжным спорце ў эстафетнай гонцы чатыры па пяць кіламетраў, у складзе каманды Цеплаэлектрацэнтралі, выступаючы, як новенькі, на першым этапе, пасля выданнага мной фініша пры перадачы эстафеты на першым этапе падбеглі да мяне два трэнеры запыталіся, маўляў, ты хто такі, адкуль ты ўзяўся. Аддыхваючыся, я ім і адказаў, што з Беларусі прыбыў, на Цеплаэлектрацэнтралі працую. Яны мне і кажуць тады, што ў вас жа там снегу не бывае, на што я ім адказаў, што і снег ў нас на Беларусі зімою выпадае, і лыжнікі ў нас ёсць. З прапановай трэнераў праз тыдзень выступіць у складзе зборнай каманды Саснагорскага раёна на традыцыйных рэспубліканскіх спаборніцтвах «Сыктыўкарская лыжня», я пагадзіўся.

Неўзабаве калі праз некалікі дзён прыйшоў з працы, суседкі па інтэрнаце паведамілі, што да мяне заходзіў спартсмен з прапітай фізіяноміяй, хто такі, не назваўся ды па знешнім выглядзе, выразу твару бачна, што калісьці добра выпіваў, а зараз займаецца спортам. Што гэта быў Васіль Бярэзін, зразумеў я адразу. Дабраўшыся гарадскім аўтобусам да месца старта, на адкрыцці лыжнага спартыўнага сезона з Васілём Бярэзіным мы і пазнаёміліся. На дзесяць гадоў старэйшы па ўзросце за мяне, Васіль Бярэзін працаваў на лесабазе, нагружаў чыгуначныя вагоны лесам і піламатэрыяламі. Як потым Васіль распавядаў, родам ён з Пермскай вобласці і пад час навучання ў сярэдняй школе займаўся лыжнымі гонкамі. Перабраўшыся на жыхарства ў г. Саснагорск, ажаніўся, ды з чагосьці папіваў дзесяць гадоў запар ды болей з калегамі па працы па заканчэнні працоўнага дня. Казаў, здзіўляюся цяпер, як жонка мяне такога цярпела ў той час. Потым, распавядаў Васіль, штосьці на яго найшло, звярнуўся да інструктара па спорце свайго прадпрыемства з просьбай аб выдзяленні яму спартыўнага веласіпеда «Турыст» і, атрымаўшы жаданае, пачаў пасля працы выбірацца на велапрагулкі.

У адну з пятніц, па заканчэнні працоўнага дня, хлопцы, заходзячы ў службовы аўтобус паклікалі за сабой Бярэзіна паехаць з імі ў пасёлак нафтавікоў Ніжні Одэс, што ў пяцідзесяці пяці кіламетрах, за бухалавам. Бярэзін, матлянуўшы рукой наадрэз адмовіўся, сказаўшы што ёсць у яго іншыя цікавасці. Дома, падсілкаваўшыся, пакруціў Васіль педалі свайго веласіпеда па шашы ў накірунку на той жа пасёлак Ніжні Одэс. Дабраўшыся да месца прызначэння і ідучы да крамы, вёў веласіпед у руках, каб набыць ліманада, акурат і сустрэў там сваіх затарыўшыхся таварышаў па працы. Тыя, пабачыўшы Васіля з веласіпедам, пажартавалі, маўляў, Васіль, ты што, на ровары сюды прыкаціў, і пачуўшы ў адказ, што менавіта так, напачатку моўчкі паглядалі на дзівака з адвісшымі ад непаразумення сківіцамі, ды потым, парушыўшы маўчанне, хтосьці запытаўся, маўляў, Васіль, а ці не захварэў ты?

Яны прапанавалі яму вяртацца дадому тыя ж пяцьдзесят пяць кіламетраў аўтобусам і, не пагадзіўшыся, Васіль Бярэзін дадаў таварышам, што ён завязаў. У Саснагорску ў той час у зімовы перыяд працавалі дзве асветленыя лыжныя трасы, штодзённа да дзесяці гадзін вечара. Адна – даўжынёй у паўтары кіламетры ў мікрараёне Сасноўка, дзе я пражываў, другая – на лыжным асноўным гарадскім стадыёне, на ўскрайку старога горада, даўжынёй у пяць кіламетраў. Васіль Бярэзін, у мэтах падрыхтоўкі да спаборніцтваў па лыжных гонках выбраўшыся з дому, бягом пераадольваў чатыры кіламетры да лыжнага стадыёна. Там, набіраючы аб'ёмы, адматаўшы кругі на лыжах, бягом, з лыжамі ў руках пераадолеўшы чатыры кіламетры, вяртаўся дадому, робячы працу, што называецца, да знясілення. Калі-нікалі выбіраючыся разам на трэніроўкі і ўдзельнічаючы ў спаборніцтвах па лыжных гонках, распавёў я Васілю, што пры такіх перагрузках нельга дасягнуць добрых вынікаў і што рэгулярныя заняткі спортам патрабуюць сістэмнай падрыхтоўкі. Пагадзіўшыся з маімі прапановамі, Бярэзін у хуткім часе выказаў думку, што і не так стамляюць трэніроўкі, як раней, як вынікі праходжання дыстанцый лыжных гонак на спаборніцтвах пайшлі ўгару. Напрыканцы таго спартыўнага зімовага сезона Васіль Бярэзін першынстваваў на раённых спаборніцтвах па лыжных гонках сярод ветэранаў па ўзроставай групе, старэй трыццаці пяці гадоў.

На традыцыйна праводзячыйся перадазнавагодняй лыжнай эстафеце, па праграме раённай спартакіяды сярод прадпрыемстваў і устаноў, на першым этапе на дыстанцыі ў адзін кіламетр заўседы выступалі дырэктары. Дырэктар Цеплаэлектрацэнтралі Носаў Мікалай Іванавіч, у мінулым выдатны лыжнік-гоншчык, пад час навучання ў ВНУ выступаўшы за каманду лыжнікаў інстытута на ўніверсіядах рознага ўзроўню, на сваім першым этапе заўсёды лідэрстваваў з такім адрывам, што ў астатніх удзельнікаў нашай каманды Цеплаэлектрацэнтралі, выступаючых на трох этапах, не ўзнікала сумненняў у перамо-

зе. Пры жараб'ёўцы ўдзельнікаў на першынства Саснагорскага раёна па лыжных гонках інструктар па спорце ЦЭЦ заўсёды, як ён нам потым распавядаў, моўчкі ўсміхаючыся, назіраў за спрэчкамі прадстаўнікоў камандаў прадпрыемстваў і ўстановаў аб стылі праходжання дыстанцый, класічным альбо коньковым. Яны спрачаюцца, а інструктару нашаму, імя і прозвішча, нажаль, запамятаваў, як бы і справы не маецца да гэтага. Пры класічным стылі ў раёне заўсёды першынствуе Яўген Цімафееў, Валеры Скакун у прызёрах, а Аляксей Пахомаў у шасцёрцы мацнейшых, астатнія ж члены каманды, хлопцы ды дзяўчаты, заўсёды трапляюць у заліковую зону, пры коньковым першынствуе Валеры Скакун, Яўген Цімафееў – у прызёрах.

У лютым 1987 года прыбыўшы ў г. Сыктыўкар у складзе каманды Саснагорскага раёна на першынства Комі АССР з Яўгенам Цімафеевым, спазніўшыся да аўтобусаў, ад гасцініцы на агляд лыжных трасаў па прапанове Яўгена выправіліся грамадскім транспартам. Па прыбыцці ў раён птушкафабрыкі, дзе непадалёку пракладзены лыжныя трасы, Яўген прапанаваў не ісці ў абыход па шашы, а, спусціўшыся ў нізіну ды ўзняўшыся напрасткі ўгару, выйсці акурат да стартавага гарадка. У той нізіне снег аказаўся такі мяккі і столькі яго намецена было, што нам, каб не зарывацца амаль да пояса, давялося пэўную немалую адлегласць паўзці па пластунску, цягнучы побач з сабой лыжы, лыжныя палкі ды чаравікі. Пакуль мы ўзабраліся на гару, знайшоўшы самі сабе прыгоды, да стартавага гарадка, аўтобусы з удзельнікамі спаборніцтваў, агледзеўшых трасу, выправіліся назад да гасцініцы. Крыху прайшоўшы па стартаваму гарадку на лыжах, так і не агледзеўшы трасы, выбраліся мы з Яўгенам пехатой уздоўж шашы, пачало ўжо цямнець, да прыпынку грамадскага транспарту. На наступны дзень у гонцы на трыццаць кіламетраў коньковым ходам на Сыктыўкарскіх трасах з кваліфікацыяй перападу вышыні, пераадольваючы першы круг у пятнаццаць кіламетраў, знаёміўся я з рэльефнасцю дыстанцыі, на другім кру-

зе ўжо і прыкідваў, дзе прыбавіць хаду, а дзе паволі пераадольваць зацяжныя пад'ёмы з выкатамі, уздымаючыся вышэй і вышэй. Пасля гонкі на пятнаццаць кіламетраў класічным стылям і эстафетнай гонкі чатыры па дзесяць кіламетраў, у дзень адпачынку ўсе удзельнікі спаборніцтваў перад марафонскай гонкай на пяцьдзесят кіламетраў у мужчын і трыццаць у жанчын, праходзілі тэсціраванне на допуск у спартыўным дыспансеры. Азнаёміўшыся з рэльефнасьцю перапада вышыні сыктыўкарскіх трасаў пры праходжанні марафонскай дыстанцыі на пяцьдзесят кіламетраў, размяркоўваючы сілы, адчуваючы свой узровень падрыхтоўкі, на другой палове дыстанцыі развáжаў я пра сорак другі кіламетар, з якога на ўсіх папярэдніх марафонскіх дыстанцыях для мяне пачыналіся выпрабаванні маёй цярплівасці і важкай упартасці да дасягнення галоўнай мэты – дайсці да фінішу. Мінуючы шыльду, адзначаўшую праходжанне мной сорак другога кіламетра, пачала ў свой палон браць мяне стома. Як і звычайна, пачалі вязацца ў вузлы штуршковыя мышцы голені і ад лакцявога да плячавога сустава, прайшоўшы з кіламетар, адчуў пачатак завязкі мышцаў спіны. У вачах пачынала рабіць і за пяць кілометраў да фініша праз усталяваўшуюся пеляну толькі і разлічаў накатаную для канькавага хода лыжню, нібыта дарогу, па якой і патрэбна дайсці да фініша, не заўважаючы, як на пачатку марафонскай дыстанцыі, навакольных краявідаў.

У першай дэкадзе сакавіка прыбыўшы з камандай Сасна-горскай ЦЭЦ на першынства сярод энергетыкаў Комі АССР у горад Ухта па лыжных гонках і пабачыўшы размінаючыхся на лыжным стадыёне ўдзельнікаў спаборніцтваў, спартыўны азарт у членаў нашай каманды змяніўся на жаданне пабыць у ролях гледачоў. Брат мой Юра, быўшы ў адпачынку і завітаўшы да мяне на Поўнач пагасцяваць, прыбыўшы разам з намі на спаборніцтвы ды назіраючы за размінаючыміся нашымі супернікамі, прамовіў, маўляў, вам тут хлопцы лавіць няма чаго: на тваіх, Валера, «Тэлеханах», ды табе, Яўген, на тваіх старэнькіх «Рассігнолах».

Бачыце ж, што тут ўсе на новенькіх «Фішэрах» для канькавага хода ды ў «Адыдасах», не з вашымі прафсаюзнымі лыжнымі чаравікамі ды палкамі для канька з нарошчанымі пад растоўку алюмініевымі трубкамі змагацца з майстрамі. Выйшаўшы на старт, не апранулі мы з Яўгенам свае гоначныя камбінезоны вырашыўшы бегчы ў звычайных шарсцяных, выдадзеных нам прадпрыемствам для трэніровак, сіняга колеру касцюмах з нумарамі ўдзельнікаў спаборніцтваў, згодна жараб'ёўцы. Яўген Цімафееў, падыйшоўшы да мяне, стоячага на стартавай горцы, за трыццаць секунд да майго старту, прамовіў, як падалося мне, хвалюючыся, маўляў, нічога, Валера, як выступім, так выступім, на сваім узроўні падрыхтоўкі. Пасля праходжання той дыстанцыі ў дзесяць кіламетраў Яўген Цімафееў заняў трэцяе прызавое месца, а я ў той лыжнай гонцы першынстваваў.

На наступны дзень эстафетнай гонкі чатыры па пяць кіламетраў, выступаючы на першым этапе, да мяне звярнуўся старцер з каманды Пячорскай электрастанцыі, сказаўшы, што я за табой, Валеры, паспрабую утрымацца. Па заканчэнні свайго першага этапа да мяне, перадаўшага эстафету з унушальным адрывам ад другога месца, таварышу па камандзе Аляксею Пахомаву, падкаціўшы на лыжах, звярнуўся старцёр з Пячорскай каманды, аддыхваючыся, у добрым настроі прамовіўшы, што за мной ён на пачатку старта першага этапа трымаўся. Брат мой Юры, стаяўшы побач з Яўгенам Цімафеевым, усміхаючыся, жартуючы, выказаў сваё ураджанне, маўляў, трымаўся са старта этапа пры выхадзе з лыжнага стадыёна на пад'ём. Па выніках тых спаборніцтваў каманда лыжнікаў Саснагорскай цеплаэлектрацэнтралі заняла першае месца ў штогадовай зімовай спартакіядзе па лыжных гонках сярод энергетычных прадпрыемстваў Комі АССР, з удзелам камандаў з Сыктыўкара, Саснагорска, Інты, Пячоры і Варкуты. Па заканчэнні спаборніцтваў хлопцы і дзяўчаты з нашай каманды выказалі думку аб тым, што, пакуль я не з'явіўся да іх на працу, у спаборніцтвах па

лыжных гонках у рэспубліканскай спартакіядзе энергетычнай галіны вышэй чацвертага месца яны не ўзнімаліся.

У летні перыяд, працуючы на вытворчасці, мэтанакіраванай падрыхтоўкі да наступнага зімовага сезона не праводзілася, вольны час для падтрымкі фізічнай спартыўнай формы болей бавілі за заняткамі фізкультурай. Нярэдка ўтраіх: Яўген Цімафееў, Васіль Бярэзін ды я – выбіраліся пагойсаць на веласіпедах па горадзе альбо да Ухты, што ў васемнаццаці кіламетрах ад Саснагорска. Калі-нікалі пракатываліся да пасёлка нафтавікоў Ніжні Одэс, што на адлегласьці ад г. Саснагорска ў пяцьдзесят пяць кіламетраў. Падарожжа на веласіпедах вабіла прасціраўшыміся наўкол шашы навакольнымі краявідамі. Пры спуску пасля пад'ёму на ўзвышша ў нізіну векавыя магутныя сосны ды елкі змяняліся забалочанай паабапал шашы мясцовасцю, што парасла цэлымі купінамі травяністай расліннасці і дробнымі бярозкамі ды сасонкамі. Працякаючыя дзе-нідзе нізінай, рачулка альбо ручаёк прываблівалі ўвагу, ярка іскрыліся ў ясны бязвоблачны дзень водблескамі промняў сонца. Вяртанне назад да Саснагорска па прычыне, што геаграфічна дарога на Ніжні Одэс паступова ўздымаецца на ўзвышша, па часе займала на хвілінаў дваццаць пяць – трыццаць меней. За восем кіламетраў да горада пры вяртанні дадому, калі скатваліся дарогай з вышыні, адкрываўся воку ў нізіне захапляльны краявід пераменлівай рэльефнасці тайгі, што зачароўваў прыцягальнай, завараждваючай прыгажосцю. На даляглядзе з узвышша, групуючыся, хвойныя дрэвы, змяняючыся мноствам ліставых на хвойныя, так, што за імі ізноў ішлі ліставыя, ствараючы то святлейшыя, то цямнейшыя адценні зялёнага колеру. Так пераўтваралася стужка дарогі вяртання дадому ва ўваходжанне ў такі знаёмы свет твайго існавання, з дапаўненнем уражанняў ад выкатанага падарожжа на веласіпедзе.

У зімовы перыяд 1988 года на праходзячым у Сыктыўкары па тэрміну пасля Алімпійскіх гульняў першынстве Комі АССР

па лыжных гонках у апошняй дысцыпліне, марафонскай гонцы для мужчын на пяцьдзесят кіламетраў, для жанчын – на трыццаць кіламетраў, была заяўлена для ўдзелу, з мэтай кантрольнай трэніроўкі, зборная каманда СССР па лыжным спорце, акурат перад хуткім першынствам СССР па лыжных гонках. Да марафонскай дыстанцыі далучыліся і ветэраны спорта. Цікава было назіраць, як па-трапяткому раскатываліся ветэраны перад стартам, эмацыянальна-абуджана, з па-свойму свяціліся іскрынкі ў іх вачах, пасля выстрайваліся ў стартавыя шарэнгі, прадчуваючы дзеянне пераадольвання марафонскай дыстанцыі, нібыта вярталіся яны ў гады сваёй маладосці. Уразіў удзельнікаў алімпійскі чэмпіён, ляжны кароль  Мікалай Зімятаў, сціпла стаяўшы ў апошнім радзе стартуючых, які на звяртанне да яго суддзі-старцёра прайсці ў першую шарэнгу, адмовіўся, маўляў, ды я адсюль прыму старт. Удзельнікі, растуліўшыся, жэстамі прапанавалі прайсці наперад, ды Мікалай Зімятаў толькі з трэцяй прапановы суддзі-старцёра заняў месца на старце ў першай шарэнзе.

Старт на марафонскую дыстанцыю даваўся з дынамаўскага лыжнага стадыёна і, адматаўшы круг у дванаццаць з паловай кіламетраў лыжны, пелетон апошнія трыццаць сем з паловай кіламетраў пераадольваў па лыжні, пракладзенай па маляўнічай мясцовасці да асноўнага лыжнага стадыёна. Першыя дванаццаць з паловай кіламетраў, удала прыняўшы старт, з Яўгенам Цімафеевым мы пратрымаліся ў лідыруючым гурце разам з членамі зборнай. Надалей, зразумела, расклад на марафонскай дыстанцыі ўдзельнікаў пайшоў па ступені ўзроўню падрыхтоўкі. Для мяне, як і заўсёды на марафонскай дыстанцыі, пасля пераадолення сорак другога кіламетра, браўшыя ў палон выпрабаванні завяршыліся на пераадоленні фінішнай лініі. На той марафонскай дыстанцыі, фінішаваўшы з добрым вынікам, саступіў я па ходзе Мікалаю Зімятаву, прыйшоўшаму на фініш трэцім, пятнаццаць хвілін. Да мяне, зачахляючага свае лыжы «Тэлеханы», звярнуўся з пытаннем трэнер Ухцінскага раёна,

маўляў, Валеры, ты што, на гэтых самых лыжах і прайшоў марафон, я адказаў яму, што так. Ён ізноў спытаў у мяне, маўляў, і ў гэтых самых чаравіках, так, жэстам рукі паказваючы на свае так званыя прафсаюзныя лыжныя чаравікі сорак шостага памера з крапленнем скабой, прамовіўшы, пачаў я прыладжваць у чахол да лыжаў і бацінак свае лыжныя палкі. Трэнер ухцінцаў, перавёўшы погляд на фінішны калідор, каб нібыта кагосьці прыкмеціць сярод фінішуючых удзельнікаў, потым зноў глянуў на мяне і запытаў, маўляў, Валера, і што, і з гэтымі лыжнымі палкамі. Зразумеўшы пытанне, трымаючы левай рукой свае лыжныя палкі далонню правай рукі, усміхнуўшыся, паказаўшы на нарошчаныя пад растоўку для каньковага ходу алюмініевыя трубкі на вуглепластыкавыя лыжныя палкі, вытворчасці навапалацкага камбіната «Хімвалакно», адказаў, што так, на гэтых. Трэнер ухцінцаў, зноў перавёўшы погляд на фінішны калідор а потым на мяне, прамовіў, маўляў, ну, бульбаш, ну, ты даеш, і дадаў, зноў перавёўшы погляд на фініш, маўляў, а дзе ж мае майстры на «Фішэрах» у «Адыдасах» ды з «Эхселямі»?

У тысяча дзевяцьсот восемдзесят дзевятым годзе каманда лыжнікаў Саснагорскай ЦЭЦ, першынствуючы на спартакіядзе Комі АССР сярод прадпрыемстваў энергетычнай галіны, што ў той год праводзілася ў г. Саснагорску, прымала ўдзел у Першай працоўнай рэспубліканскай спартакіядзе прафсаюзаў, змагаючыся за права выступаць на Першай усесаюзнай працоўнай спартакіядзе.

У эстафетнай гонцы чатыры па пяць кіламетраў, стартуючы на першым этапе ў шэрагу шматлікіх камандаў, мне ўдалося-такі са старта вырвацца са стартавай паляны ў ліку першай дзесяткі ўдзельнікаў. Праз семсот метраў праходжання дыстанцыі, мінуючы мосцік над шашой і павярнуўшы ўправа па лыжні, нясучыся са стромнага спуска ўніз, напрыканцы і на выкаце на роўнядзь заўважыўшы, што ўдзельнікі, ідучыя першымі, пачалі завальвацца на лыжні ў агульную кучу пры тармажэнні



І-я Рэспубліканская спартакіяда прафсаюзаў. Яўген Цімафееў справа, з фізкультурнікам, працаўніком Саснагорскай ЦЭЦ. Г. Саснагорск, 1989 г.

на вялікай хуткасці. Я ўзяў ўлева, каб не далучыцца да ляжаўшых на лыжні наперадзе гоншчыкаў і тады інэрцыйнай сілай хуткасці адкінула мяне ўлева на стромны адхон, што парос гушчаром хмызняковай раслліннасці. Мякка пракаціўшыся на лыжах паверх хмызняку ды заваліўшыся набок, завіс я уніз галавой, затрымаўшыся лыжамі за галінкі. Ад відовішча, як нада мной, завісшым, зачапіушымся лыжамі за галінкі таго хмызняку ўніз галавой, праносяцца старцёры камандаў удзельнікаў першага этапу, заварочываючы ад месца завала ўлева і мільгацяць назвы лыжаў на калодках: «Трак», «Фішар», «Атомік», «Рассігнол», «Карэлія», – ды лыжныя камбінезоны розных колераў ды фасонаў, мяне разабраў смех. Патрапіўшыя на стромным адхоне на вершаліны хмызняку гоншчыкі, ўрэшце-рэшт завальваючыся набок, зачапіўшыся лыжамі за галінкі завісалі, як і я, уніз галовамі. Пасля завалу, у які патрапілі ўсе ўдзельнікі першага этапу, амаль без аніякай шкоды выбраўшыся з такой недарэчнасці, лыжны пелетон прауягваў рух па дыстанцыі. З тых спаборніцтваў удзельнікам, апрача вясёлых ўспамінаў, засталіся на памяць прыгожа аздобленыя памятныя вымпелы і эмблемы Першай рэспубліканскай працоўнай спартакіяды прафсаюзаў.

У тыя гады ў зімовы перыяд лыжнікі-гоншчыкі прымалі ўдзел у спаборніцтвах па зімовым шматбор'і, уключаючым падцягванне на перакладзіне, стральбу з дробнакаліберным зброі



*І-я Рэспубліканская спартакіяда прафсаюзаў. Валеры Скакун справа, з фізкультурнікам, працаўніком саснагорскай ЦЭЦ. Г. Саснагорск. Комі АССР. 1989 г.*

і лыжную гонку. У зіму 1989 года, выпраўляючыся ў складзе каманды Саснагорскага раёна ў г. Сыктыўкар на першынства Комі АССР па зімовым шматбор'і, падкінуў я кпінку ў бок таварыша па камандзе Яўгена Цімафеева, і той, пакрыўдзіўшыся, зачыніўся ў сваёй кватэры, пражывалі мы побач, а на цягнік трэба было шыбаваць уначы тры кіламетры да чыгуначнага вакзала пехотой. За сорак хвілінаў да адпраўкі цягніка Яўген, адчыніўшы дзверы сваёй кватэры са словамі: «Ты мяне прыкалываеш, ты мяне прыкалываеш,» – выйшаў на калідор, прыхапіўшы лыжы і сумку з рэчамі. Я толькі і адказаў яму, што ты мяне таксама прыкалываеш, ды я, успрымаючы з гумарам не толькі прыколы, а ў нейкім сэнсе і складанасці адносіны паміж людзьмі ў грамадстве. І панесліся мы з ім бягом з лыжамі ды сумкамі з рэчамі па вуліцам начнога спячага горада да чыгуначнага вакзала.

На пероне, далучыўшыся да групы членаў каманды і правадніцы з вагона, у які былі набыты білеты, што былі ў нашай кіраўніцы і якая яшчэ не прыбыла на вакзал, аддыхваліся ад забегу па горадзе на тры кіламетры пры поўнай экіпіроўцы лыжніка. Правадніца, звярнулася да нас і паведаміла, што зможа затрымаць цягнік яшчэ на хвіліну, і калі ў нас не будзе білетаў, прыйдзецца затрымацца на пероне. Усхваляваныя, мы, члены каманды, пераглянуліся паміж сабой. Неўзабаве правадніца,

звярнулася да нас, прамовіла, маўляў, гэта ваша кіраўнічка і, глянуўшы на перон убок вакзала, заўважылі мы нашу Алену, трэнера-выкладчыка ДЮСШ, якая на ўсю моц імчала па перону да нашага вагона з сумкай на левым плячы. Пад правай пахай яна трымала зачахлёныя лыжы і трасучы ўбок вагонаў цягніка кісцю правай рукі, трымаючы ў ёй нашы білеты, гучна на подбегу даючы каманду, маўляў, залазь, залазь, смакуючы напрыканцы выкрыкаў беларускае «зь». Пачуўшы ад нас у адказ, што так, наша кіраўнічка, правадніца са словамі залазьце-залазьце, смакуючы напрыканцы сваёй каманды беларускае «зьце», пачала па чарзе падпіхваць нас у плечы на прыступкі вагона. Апошняй з каманды, падпіхваемая ў плечы правадніцай, у тамбур вагона па прыступках заскочыла наша Алена.

На першынствах Комі АССР, што заўсёды праводзілася ў г. Сыктыўкары, па магчымасці, выступаючы для сябе на дамашніх спаборніцтвах, прымала ўдзел славутая савецкая лыжніца Раіса Смятаніна. Прыняўшы старт, з першага і да апошняга метраў дыстанцыі Раіса Смятаніна як класічным, так і канькобым стылем дэманстравала эталонны, без адзінай памарачкі, ход па лыжні. Было цікава назіраць як трапятка-хвалюючыся, з гонарам успрымала славутая лыжніца-гоншчыца, алімпійская чэмпіёнка, чэмпіёнка свету, стоячы на п’едэстале, узнагароду за першынства на чэмпіянаце роднай рэспублікі. Славутыя лыжнікі Васіль і Ніна Рочавы, у той час працаваўшыя трэнерамі-выкладчыкамі Сыктыўкарскай ДЮСШ, выхоўвывалі падрастаючых юнакоў і дзяўчат, разам з якімі гойсаў па лыжні Сыктыўкарскіх трасаў іхні хлапчук Васіль. З цягам часу уключаны ў зборную Расіі, сын знакамітых майстроў Васіль Рочаў выдатна выступаў на спаборніцтвах па лыжных гонках самага высокага ўзроўню.

На першынстве Комі АССР па лыжнах гонках у 1989 годзе, што зноў жа праводзілася на Сыктыўкарскіх трасах у марафонскай гонцы на пяцьдзесят кіламетраў з агульнага старта, як

і звычайна на такіх дыстанцыях, раскаціўшыся, ішоў я сваім тэмпам, трымаючыся ў гурце ўдзельнікаў адпаведнага ўзроўню падрыхтоўкі.

Па праходжанні дваццаць пятага кіламетра дыстанцыі двое хлопцаў з Усць-Цыльмы, абодвы ў лыжных камбінезонах чырвонага колеру, зраўняліся са мной, прапанаваўшы трымацца за імі, рэзка паскорыўшы ходу, паімчалі, аддаляючыся, наперад. Мне толькі і падумалася, што ранавата вы, хлопцы, узмоцнілі свой тэмп і прадоўжыў я пераадольваць другую палову марафонскай дыстанцыі ў тэмпе па адчуванню сваіх магчымасцей. Яшчэ пад час навучання ў сярэдняй школе, пры сумесных трэніроўках выхаванцаў Мэлса Харысавіча і Уладзіміра Пятровіча, Уладзімір Пятровіч Пачапінскі калі-нікалі раіў мне, што лепей, Валера, крышачку недабраць, чым перабраць.

Мінуючы шыльду на трасе, адзначаўшую пройдзеныя мной трыццаць пяць кіламетраў дыстанцыі, сярод траіх наперадзе ідучых удзельнікаў, збавіўшых тэмп, прыкмеціў я аднаго з тых двух хлопцаў у чырвонага колеру камбінезоне. Параўняўшыся, абыходзячы, прапанаваў паспрабаваць трымацца за мной, на што той, як і я на дваццаць пятым кіламетры, матлянуўшы галавой, адзначыў, што пойдзе сваім тэмпам. Працягваючы ісці па дыстанцыі пасля сорак другога кіламетра, мускулы мае пачалі вязацца



*Першынства Комі АССР па лыжных гонках. Валеры Скакун. Лыжная гонка на 30 км, г. Сыктыўкар, 1989 г.*



*Першынства Комі АССР па лыжных гонках. Валеры Скакун. Лыжная гонка на 15 км. Г. Сыктыўкар, 1989 г.*

ў вузлы і ў вачах з'явілася пялёнка, ды з чагосьці мне падумалася, а дзе ж той другі ў чырвонага колеру лыжным камбінезоне. Выкатваючы з лесу на паляну, мінаючы шыльду ў пройдзеных сорак пяць кіламетраў і павярнуўшы ўправа, заўважыў, што стаіць наперадзе сыйшоўшы з трасы па ходзе на левы бок, у маляўнічым месцы каля прыгожых бярозаў, добра мне знаёмы, той, другі бягун ў чырвоным колеры камбінезоне і, зразумеўшы, што мускулы ягоныя завязаліся на вузлы, перабраў, па ўсяму тулаву з ног да галавы, сцішыўшы ходу прапанаваў таму выцягвацца, паспрабаваць пайсці за мной. Той, гледзячы на мяне пашыранымі вачыма, нярвова ўздымаючы рукі ды тыркаючы лыжнымі палкамі ў снег, прамовіў, што не магу, не магу, мускулы ўсе скавала, не магу, не магу. Крыху мінаючы стоячага таварыша, на момант прыпыніўшыся, добра ведаючы, што гэтак рабіць нельга напрыканцы пяцідзесяцікіламетровай дыстанцыі, адчуў, як мае мускулы пачынаюць сковывацца, напрач вяжучыся ў вузлы. Уздзёргваючы рукі ўгару і ўтыркаючы раз-пораз лыжныя палкі

ў снег, затупаўшы на месцы нагамі і крыху нахіляючыся наперад тулавам, каб развязаць мускулы спіны і самаму не застацца гэтак жа скаваным стаяць, прадоўжыў паволі рух наперад, час ад часу ўздымаючы разам рукі і б'ючы палкамі ў снег. Я прапанаваў таварышу выцягвацца на лыжню, чапляючыся за мяне, бо на пад'ёме стаяць трэнеры, якія дадуць галушку хлеба з соллю альбо салявую таблетку. Соль разганяе назапашаную пры праходжанні марафонскай дыстанцыі у мышцах малочную кіслату, якая і выклікае іх скоўванне. Прадоўжыўшы ісці па дыстанцыі, азіраючыся, усё казаў я таварышу, каб выцягваўся, а той, стукаючы палкамі ў снег, усё мовіў, не магу, не магу, не магу, мышцы скавала, і пачаў, стоячы на месцы, падскокваць на лыжах. Азірнуўшыся яшчэ раз і крыкнуўшы таму, маўляў, давай, чапляйся, узрадавана заўважыў, што таварыш, у чарговы раз падскочыўшы на лыжах на месцы, ды тарганууўшы палкамі ў снег, каля прыгожых бярозаў рушыўшы-такі з месца, пачаў выбірацца на лыжню. Выправіўшы і сваё становішча, прадоўжыўшы ісці па дыстанцыі і ў некалькіх месцах на пяці застаўшыхся кіламетрах ужываў пададзеныя трэнерамі галушкі хлеба с соллю ды адну салявую таблетку, праз пелену ў вачах ледзь распазнаючы накатаную лыжню, напружаннем нерваў прымушаючы стомленыя, расслабленыя мышцы тулава, падаючыя эйфарыйна сігнал, што хопіць, дастаткова, мы адпрацавалі, пад падбадзёрванне трэнераў на трасе, дабраўся я да фініша той мара-



*Першынства Комі АССР па лыжных гонках. Яўген Цімафееў. Лыжная гонка на 15 км, г. Сыктыўкар, 1989 г.*

фонскай дыстанцыі. Пасля фініша жанчына, збіраючы нумары ўдзельнікаў, ветліва ўсміхаючыся, падзякавала мне за мае намаганні.

Хлопцы з нашай каманды паднесшы мне цёплую вопратку і тэрмас з гарачым чаем, прапанавалі прайсці ў цёплае памяшканне, на што я адмовіўся, сказаўшы, што дачакаюся фінішу двух таварышаў. Цёпла апрануўшыся, ужываючы з тэрмаса гарачы чай, назіраючы за фінішам удзельнікаў марафонскай дыстанцыі, убачыў праз пятнаццаць хвілінаў, калі ўжо знікла з вачэй маіх пялёнка, як з'явіўся на фінішы таварыш, той, што за пяць кіламетраў да заканчэння гонкі, стоячы скаваным у маляўнічым месцы каля прыгожых бярозаў, выцягнуўся за мной на трасу дыстанцыі. Здаўшы нумар удзельніка ветлівай жанчыне, як я заўважыў, праз пялёнку ў вачах прыкмеціўшы мяне, піўшага стоячы чай, не здымаючы лыжаў, наблізіўшыся со словамі падзякі, працягнуў мне руку, моцна маю паціснуўшы. Пры канькововым ходзе дыстанцыя ў пяць кіламетраў на асобных спаборніцтвах пераадольваецца меней, чым за пятнаццаць хвілінаў. Колькі часу дабіраўся я апошнія тыя пяць кіламетраў, і не ведаю, хвілінаў, магчыма, васемнаццаць-дваццаць, а калі дадаць яшчэ пятнаццаць, то атрымліваецца, што таварыш змагаўся з апошнімі тымі пяццю кіламетрамі пяцідзесяцікіламетровага марафона хвілінаў трыццаць пяць, вось гэта ўпартасць праз мэту – дайсці. Праз восем хвілінаў, абодва, цёпла апрануўшыся і ўжываю-



*Першынства Комі АССР па лыжных гонках. Трэці злева – трэнер Саснагорскай раённай ДЮСШ, Майтар Спорту СССР па лыжных гонках Аляксандр Ветраў з выхаванцамі, г. Сыктыўкар, 1989 г.*

чы з тэрмаса гарачы чай, дачакаліся мы на фінішы яшчэ аднаго свайго таварыша ў лыжным камбінезоне чырвонага колеру. З цягам часу, нажаль, імёны і прозвішчы тых хлопцаў з Усць-Цыльмы запамятаваў.



*Першынства Комі АССР па лыжных гонках. Выхаванец Аляксандра Ветрава. Лыжная гонка юніёраў, г. Сыктыўкар, 1989 г.*

16.

На пачатку сакавіка 1986 года Барысаўскім раённым спартыўным камітэтам і СК завода «Аўтагідраўзмацняльнік» праводзіўся, стаўшы традыцыйным, лыжны марафон на пяцьдзесят кіламетраў «Барысаўская лыжня». На той марафонскай дыстанцыі, пераадольваючы пяць кругоў па дзесяць кіламетраў, ідучы ў гурце лідэраў, напрыканцы другой дзесяткі ўзнімаючыся на пад'ём і абыходзячы двух наперадзе ідучых хлапчукоў, што пераадольвалі, па ўзросце, свой марафон на дзесяць кіламетраў, атрымалася невялікая недарэчнасць. Хлапчук, ішоўшы лыжа ў лыжу за таварышам, вырашыўшы перад фінішам таго абыйсці, рэзка прыняўшы ўлева і наступіўшы лыжай на маю правую лыжную палку, зламаў апорную лапку. Ад такога нечаканага здарэння, зразумела, у вачах маіх, гледзячы на таго застыўшага на месцы хлапчука, мільганула абурэнне, а хлапчук той, аддыхваючыся ды зжаўшыся сваёй невялікай постаццю ў камочак, спуджана, вінавата паглядаў на мяне. У імгненне зладзіўшы са сваімі эмоцыямі, нахіліўшыся, падняў я тую абламаную апорную лапку і прадоўжыў ісці па дыстанцыі, адпіхваючыся адной левай сваёй палкай. Напрыканцы пад'ёма

азірнуўшыся і прыкмеціўшы таго хлапчука ідучым па лыжні да фініша свайго дзесяцікіламетровага марафона, я супакоіўся, ненаўмысна атрымалася. Неўзабаве адзін з трэнераў з ДСТ «Чырвоны Сцяг» падаў мне сваю лыжную палку крыху меншай растоўкі, з якой я і прайшоў да фініша тры кругі па дзесяць кіламетраў. На той марафонскай дыстанцыі, патрапіўшы ў шасцёрку прызавых, заняўшы пятае места, акрамя памятнага медаля, дыплома з часам праходжання той дыстанцыі і прызавой вазы для кветак, ва ўспамінах застаўся хлапчук, выпадкова наскачыўшы мне на лыжную палку і спадзяванне, што з цягам часу ён забыўся на імгненне абурэння ў маіх вачах, а калі і ўспомніць мяне, таго дзядзьку са зламанай лыжнай палкай, то няхай з гумарам і ўсмешкай.

Пра правядзенне лыжнага марафона «Барысаўская лыжня-1986» паведаміў мне, у той час працаваў я трэнерам-выкладчыкам па лыжным спорце Мінскай раённай ДЮСШ, мой трэнер пад час навучання ў энергатэхнікуме Анатоль Іосіфавіч Драздоўскі, які таксама прайшоў тыя пяцьдзесят кіламетраў марафонскай дыстанцыі. Пасля свайго фініша, праз сем хвілінаў, з адыходзячай ўжо плёнкі з маіх вачэй, дачакаўся я фініша свайго сябра з п. Юбілейны Лінніка Уладзіміра. Выдатны мастак-аматар, у свой час скончыўшый БПІ, пад час навучання ў ВНУ на высокім узроўні выступаўшы на ўніверсіядах па лыжных гонках і біятлоне. Гледзячы на разгублена варочаўшага галавой па баках пасля фініша марафонскай дыстанцыі Уладзіміра, звярнуўся та таго, прапанаваўшы прайсці да каментатарскага аўто і атрымаць памятны медаль і дыплом удзельніка дыстанцыі з часам праходжання. Уладзімір, запытаўшы ў мяне, Валера, ты дзе, і закруціў наўкол галавой, трымаючы рукі перад сабой, грэбаючы імі ў паветры, дадаючы, маўляў, плёнка ў вачах, дай мне руку. Працягнуўшы сябру руку, давёў я яго да каментатарскага аўто. Неўзабаве, усміхаючыся, са словамі, праходзіць Уладзімір Ліннік, а тым часам упарадкоўваў свой спартыўны інвентар.

З першага праходжання лыжнага марафона «Барысаўская лыжня» у 1986 годзе, яшчэ ў трох, адным ў 1996 годзе і ў двух, ужо на пачатку дваццаць першага стагоддзя, пашанцавала мне прымаць удзел. Падтрымліваючы сувязь з Мікалаем Канашэнкавым, менавіта цераз яго і даведваўся я пра правядзенне лыжнага Барысаўскага марафона. Выдатна прыгатаваная траса, маляўнічая мясцовасць, высокі ўзровень правядзення спаборніцтваў прываблiваюць прыняць у іх удзел як актыўных спартсменаў, так і ветэранаў лыжных гонак, для якіх жаданне пабыць у атмасферы спартыўных спаборніцтваў па праходжанні марафонскай дыстанцыі рэалізуецца болей не на ўзрозні функцыянальнай падрыхтоўкі, а на падставе мышачнай памяці.

Адзін з былых выхаванцаў Уладзіміра Пятровіча Пачапінскага Юры Гардзеюк, працуючы пэўны тэрмін радыёмантажнікам на Мінскім авіярамонтным прадпрыемстве ў 1997 годзе, тры гады як зволіўшыся, station: становіся на прапанову

Прыняўшы старт у агульным гурце ў некалькіх тысяч удзельнікаў, цалкам захапіўшыся святам спорта з традыцыйна высокім узроўнем правядзення штогадовых марафонскіх прабегаў, арганізаваных на належным узроўні пунктаў харчавання, пад падбадзёрванне гледачоў паабапал праходзячай па прыгожым, добраўпарадкаваным вуліцам Франкфурта-на-Майне трасы, Юры Гардзеюк без цяжкасцяў пераадолеў дзесяць, дванаццаць, затым і пятнаццаць кіламетраў марафонскай дыстанцыі. Пераадолеўшы ў адным накірунку дваццаць кіламетраў, Юры, адчуўшы, што ногі пачынаюць здаваць і ад назапашанай арганізмам малочнай кіслаты мышцы пачынаюць вязацца ў вузлы, ды, не маючы магчымасці дабрацца да месца старта і фініша іначай, чым пераадольваючы сваім ходам тыя дваццаць два астатнія кіламетры адлегласці па дыстанцыі марафона. З такімі ж удзельнікамі, падсілкоўваючыся на пунктах харчавання, чарадуючы хаду з бегам, Юры Гардзеюк паспяхова дабраўся да фінішнай стужкі. Першую амаль палову дыстанцыі Юры пераадолеў за адну гадзіну пяцьдзесят хвілінаў. Другую палову дыстанцыі працяжнасцю ў дваццаць два кіламетры сто пяцьдзесят метраў Юры на мышачнай памяці, семнаццаць гадоў актыўна не займаючыся спортам, у жаданні – дайсці, пераадольваў тры гадзіны запар. Уклаўшыся па часе ў кантрольны заліковы нарматыў пераадолення марафона для ўдзельнікаў у пяць гадзінаў, Юры Гардзеюк вяртаўся дадому на набытым у Германіі аўтамабілі з цікавага падарожжа ў Франкфурт-на-Майне, паспяхова пераадолеўшы там дыстанцыю штогадовага традыцыйнага марафона.

У дзевяностыя гады дваццатага стагодзя па тэлебачанню ў навінах спорта прыемна было пачуць пра поспехі беларускага лыжнага спорту, у якіх дыктар паведамляў, што ў Мурманску, на Свяце Поўначы, у лыжнай гонцы класічным стылем на пяць кіламетраў і на марафонскай дыстанцыі вольным стылем на пяцьдзесят кіламетраў сярод ветэранаў, старэй за трыццаць пяць гадоў, першынстваваў беларускі лыжнік Уладзімір Крыцкі з

Магілёва. Майстар спорту СССР, выступаўшы за ДСТ «Чырвоны Сцяг» і ў свой час уваходзячы ў зборную каманду Беларусі, Уладзімір Крыцкі і ў цяперашнія гады падтрымлівае выдатную спартыўную форму і паспяхова ўдзельнічае ў спаборніцтвах па лыжных гонках.

17.

Дырэктар спецыялізаванай ДЮСШ алімпійскага резерва Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Мэлс Харысавіч Ісхакаў, Майстар Спорту СССР па лыжных гонках, у семідзесятыя і васьмідзесятыя гады мінулага стагоддзя, выкладаў і заняткі па лыжным спорце на базе Сенніцкай сярэдняй школы Мінскага раёна ад Мінскай раённай ДЮСШ. Свой першы лыжны марафон на пяцьдзесят кіламетраў праходзіў пад час навучання ў Беларускім дзяржаўным інстытуце фізічнай культуры, удзельнічаючы ва Усесаюзных студэнцкіх гульнях у Каўгалава, што пад Ленінградам. У тыя гады навучання ў БДІФК, актыўна выступаючы на спаборніцтвах markup рознага ўзроўню, у адзін з зімовых спартыўных сезонаў Мэлс Харысавіч Ісхакаў прайшоў дзевяць лыжных марафонаў на пяцьдзесят кіламетраў. Вытрымліванне гэтакай колькасьці звышмаксімальных нагрузак на арганізм за адзін зімовы сезон спаборніцтваў сведчылі аб высокай ступені ўзроўню падрыхтоўкі і дасканалым майстэрстве спартсмена.

Пад час навучання ў ВНУ, удзельнічаў ў матчавай сустрэчы паміж Беларускім дзяржаўным ІФК і Смаленскім ІФК у г. Смаленску ў 1967 годзе. Таварыш па камандзе Дзіма Банадышаў, стартаваў наперадзе Мэлса Харысавіча Ісхакава. Смаленскія лыжныя трасы – з вялікімі перападамі вышыні, напрыканцы стромнага спуска, дзе лыжня выходзіла на агароджу з паваротам на дзевяноста градусаў улева, не здолеўшы упісацца ў той паварот, страціўшы раўнавагу, таварыш забурыўся па лыжні ў снег, крыху адрыхтаваўшы тую агароджу. Узняўшыся і пераблытаўшы далейшы накірунак руху па дыстанцыі, пайшоў на-

сустрэч удзельнікам, ідучых са стромы. Мэлс Харысавіч, прыкмеціўшы наперадзе таварыша, што заблытаўся і прыняўшага старт перад ім, здалёку набліжаючыся хутка да таго, са стромы пачаў аклікваць гучнымі выкрыкамі, маўляў, Дзіма, Дзіма, Дзіма, Дзіма. Банадышаў, на выгукі, ўзняўшы галаву і заўважыўшы імчаўшага з гары па лыжні на яго Ісхакава, паспеў-такі саскочыць набок і за пранёсшымся міма з гары таварышам па камандзе прадоўжыў далейшы рух па лыжні ў патрэбным пакірунку пераадолення дыстанцыі той лыжнай гонкі.

Удзельнічаючы ў 1970 годзе у чэмпіянаце Беларусі па ДСТ «Ураджай» у г. Магілёве, у эстафетнай гонцы чатыры па дзесяць кіламетраў, выступаючы на другім этапе і прыняўшы эстафету ад таварыша па камандзе, з першага этапа на пятым месцы, праз тры кіламетры Ісхакаў выйшаў ў лідэры. За васемсот метраў да фініша, лідыруючы з унушальным адрывам, стварыўшы задзел для наступнага этапа. На развілцы ў дзве лыжні, налева да фініша, управа да стартавага гарадка, стоячы на левай лыжні усміхаючыся трэнер магіляўчан падаў Ісхакаву думку аб змене трасы перад фінішам. Мэлс Харысавіч, павярнуўшы на правую развілку на лыжні і з’явіўшыся у стартавам гарадку не з таго боку пад заўвагі таварышаў па камандзе, маўляў, Мэлс, не па той лыжні фініш, не па той лыжні фініш, вярнуўся на развілак лыжні і праз патрэбныя васемсот метраў перадаў эстафету пятым, прайшоўшы лішку ў чатырыста метраў дыстанцыі.

Пад час службы ў войску перад першынствам Чырвонасцяжнай Беларускай ваеннай акругі па лыжных гонках, праходзячы падрыхтоўку да спаборніцтваў у Заслонава, на першынства Акругі каманду лыжнікаў выправілі дабірацца да месца правядзення спаборніцтваў цягнікам без суправаджаючага, даўшы загад на прыпынках з цягніка не выходзіць, па прыбыццю на месца прызначэння сустрэнуць. На прыпынку станцыі Віцебск аднаму з членаў каманды, у склад якой уваходзіў і Ісхакаў Мэлс Харысавіч, закарцела, выйшаўшы на перон прагу-

ляцца ў вайсковай форме па чыгуначным вакзале. Патрапіўшы на патруль, збіральнік уражанняў падставіў усіх членаў каманды. Для высвятлення мэты камандзіроўкі вайсковыя спартсмены былі затрыманыя камендатурай, правялі ноч на гаўпвахце. Пасля вырашэння пытання станоўча, раніцой прыбыўшы з вайсковай часткі афіцэр-маёр даставіў іх да месца спаборніцтваў. Не адпачыўшы, выйшаўшы на старт лыжнай гонкі, спартсмены паказалі па праходжанні дыстанцыі адпаведныя вынікі. Неабдуманыя паводзіны аднаго з таварышаў адмоўна паўплывалі на выступленне ўсіх членаў каманды.

Пад час працы дырэктарам Рэспубліканскай ДЮСШ алімпійскага рэзерва Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Мэлс Харысавіч Ісхакаў быў удастоены ганаровага звання Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь за вялікі ўклад у развіццё



*Рэспубліканская спартакіяда школьнікаў па лыжных гонках. Злева направа: Галоўны суддзя спаборніцтваў Мэлс Харысавіч Ісхакаў, галоўны сакратар Станіслаў Міхайлавіч Дуброўнік, старшыня аддзела фізкультурнага выхавання Міністэрства адукацыі Яўген Мікалаевіч Ворсін (спіной), таварыш Рольбін, рэферэнт Савета Міністраў БССР Уладзімір Іосіфавіч Макейчык. РСК "Раўбічы", 1985 г.*

фізкультуры і спорту ў краіне.

Суддзя усесаюзнай катэгорыі, Мэлс Харысавіч Ісхакаў працаваў у судзейскай калегіі на спаборніцтвах «Дружба 1984», калі каманда СССР не прымала ўдзелу ў алімпійскіх гульнях у Лос-Анжэлесе (ЗША).



*Рэспубліканская спартакіяда дапрызыўнай і прызыўнай моладзі па зімоваму шматбор'ю ГПА. Судзейская калегія. З мікрафонам – Галоўны суддзя спаборніцтваў Мэлс Харысавіч Ісхакаў. РСК "Раўбічы", 18-21 лютага 1988 г.*

Працуючы ў Галоўнай судзейскай калегіі на Гульнях добрай волі «Масква 1986», у Галоўнай судзейскай калегіі на Гульнях добрай волі 1994 года ў Санкт-Пецярбургу, на этапах Кубка свету па лыжных гонках, у судзейскіх калегіях спартакіядаў народаў СССР, на чэмпіянатах свету і Еўропы па біятлоне ў РСК «Раўбічы», першынствах Беларусі, Мэлс Харысавіч Ісхакаў разам з калегамі бескампрамісна, бесстаронна, з прафесійным майстэрствам аказвае і робіць станоўчы ўплыў на выхаванне падрастаючай моладзі, фарміруючы ў грамадстве прыхільнасць да здаровага ладу жыцця.

У апошнія гады Мэлс Харысавіч Ісхакаў пэўны тэрмін працаваў дырэктарам новапабудаванага спартыўнага комплекса Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта. У цяперашні час, у дзве тысячы пятнаццатам годзе, працягваючы высакародную справу па выхаванню моладзі, Мэлс Харысавіч Ісхакаў працуе ў названым Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце інструктарам-метадыстам па спорце першай катэгорыі.

# ЗМЕСТ

У зацяненні выпрабаванняў лёсу.
*Уступны артыкул Вячаслава Корбута ... 3*

Выпадковы сведка.
*Аповесць ... 5*

Яны.
*Аповесць ... 15*

Калымскі вернісаж.
*Аповесць ... 25*

Добразычлівасць расамахі.
*Аповесць ... 49*

За зацяненнем Поўначы.
*Аповесць ... 59*

Не сцірае час сляды.
*Аповесць-расповеды ... 185*

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**СКАКУН Валеры Уладзіміравіч**

**ЗА ЗАЦЯНЕННЕМ ПОЎНАЧЫ**

Проза

Адказны за выпуск *Зміцер Вішнёў*
Рэдактары: *Вячаслаў Корбут, Інга Вінарская*
Карэктар *Хрысціна Лісічкіна*
Камп'ютарная вёрстка, дызайн: *Інга Вінарская*

Падпісана ў друк 18.12.2014 г. Фармат 84x108 1/32.
Папера афсетная. Друк лічбавы. Ум. друк. арк. 13,44.
Ул.-выд. арк. 10,25. Наклад 200 асобн. Замова № 3594.

Выдавец ПВУП «Галіяфы».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы і распаўсюджвальніка друкарскіх выданняў № 1/48 ад 03.10.2013.
Вул. Брылеўская, 11-44, 220039, г. Мінск.

Паліграфічнае выкананне ТАА «Поликрафт».
ЛП № 22330/466 от 21.04.2014.
Вул. Кнорына, 50, 220103, г. Мінск.



***Скакун***
***Валеры Уладзіміравіч***

*нарадзіўся 17 мая 1961 года ў вёсцы Асавы Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў Сенніцкую СШ Мінскага раёна, Мінскі энергетычны тэхнікум ў 1981 годзе.*

*Працаваў па кантрактах на Поўначы, у Якуціі, у Казахстане на Байкануры, ва Узбекістане. З 2005 года працуе ў Беларусі.*

*Паэт, празаік, бард. Піша на беларускай і рускай мовах. Аўтар кніг: «Мяне вецер шукае» (2000 год, вершы), «Набытак» (2006 год, вершы), «На виражах судьбы» (2009 год, вершы), «Паўночны варыянт» (2012 год, проза). У цяперашні час жыве ў п. Дружны Пухавіцкага раёна.*

ISBN 978-985-7021-88-8
9 789857 021888

Валеры Скакун За зацяненнем Поўначы